Болбас, В. С. Народная педагогіка Мазырскага Палесся / В. С. Болбас, І. С. Сычова. — Мазыр : Белы Вецер, 2012. — 246, [2] с. — Бібліяграфія: с 236—247, 203 назв.




## УВОДЗІНЫ

Канец XX – пачатак XXI стагоддзя адзначаны бурным усплёскам этнанацыянальных працэсаў, якія ахапілі ўсе бакі жыццядзейнасці грамадства і вывелі праблемы этнасу ў шэраг глабальных праблем планеты.

Прагназуемая ў папярэднія дзесяцігоддзі "інтэрнацыяналізацыя" культур сёння аспрэчана сапраўдным "этнічным рэнесансам", воплескам зацікаўленасці ў аднаўленні "сувязі часу", духоўных традыцый продкаў, пераемнасці ў культурным развіцці без чаго яно практычна і немагчыма. Чалавецтвам усвядомлена, што наяўнасць разнастайных індывідуальных, рэгіянальных, сацыяльных, этнічных, канфесійных і іншых адрозненняў з'яўляецца абавязковай умовай існавання і развіцця кожнага індывіда і цывілізацыі ў цэлым. Любыя спробы іх нівеліравання, уніфікацыі вядуць да незаменных страт ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Паводле тэорыі Л.М.Гумілёва сама гісторыя чалавецтва ўяўляе сабой паслядоўны ланцуг шматлікіх этнагенезаў.

Абгрунтаваная патрэбамі развіцця сучаснай педагагічнай тэорыі і практыкі цікавасць да традыцыйнай народнай культуры ў апошні час небеспадставна скіроўвае ўвагу даследчыкаў да вывучэння яе рэгіянальных

асаблівасцей, што ў адпаведнасці з прынцыпам культуразгоднасці выхавання павінна павысіць эфектыўнасць апошняга.

Рэгіянальная этнапедагогіка развіваецца ў рэчышчы этнапедагогікі, галіны агульнай педагогікі. Яна абагульняе мясцовыя педагагічныя традыцыі, якія раскрываюць новыя грані выхаваўчай дзейнасці беларускага народа. Гэта дазволіць знайсці рацыянальны падыход да інтэграцыі запазычанага вопыту, устанавіць аптымальныя суадносіны агульнадзяржаўнага і рэгіянальнага кампанента ў змесце адукацыі, аб’яднаць інтарэсы розных пакаленняў. І пакуль традыцыйная культура існуе ў натуральным, жывым бытаванні, патрабуецца яе комплекснае вывучэнне прадстаўнікамі сацыяльна-гуманітарных навук, сярод якіх рэгіянальная этнапедагогіка з’яўляецца адной з самых маладых.

Неабходнасць падобных даследаванняў тлумачыцца полікультурным характарам сучаснага грамадства: рэспубліку насяляюць розныя народы і этнічныя групы, якія адрозніваюцца па ўкладу жыцця, асаблівасцях гаворкі, канфесіянальнай прыкмеце і інш. Выхаванне моладзі павінна ажыццяўляцца з улікам рэгіянальных асаблівасцей, паколькі чалавек не можа існаваць па-за культурай, перш за ўсё таго рэгіёна, дзе ён нарадзіўся і вырас.

На беларускіх землях з сівой мінуўшчыны па шэрагу сацыяльна-культурных характарыстык выдзяляецца Палессе, а ў ім Мазырска-Прыпяцкі рэгіён. Сістэматычнае вывучэнне яго самабытнай матэрыяльнай і духоўнай культуры распачалося ў ХІХ стагоддзі такімі этнографамі, як З.Я. Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі), А.К. Кіркор, П.М. Шпілеўскі, М.В. Радзевіч, А.Н. Шыманоўскі і было прадоўжана ў ХХ ст. Е.А. Раманавым, У.Г. Пяткевічам, Я.Ф. Карскім, Іосіфам і Эмай Яленскімі, А.К. Сержпутоўскім, М.В. Доўнар-Запольскім, І.А. Сербавым. У савецкі час гэтай праблеме прысвяцілі свае працы В.К. Бандарчык, І.М. Браім, М.Я. Грынблат, Г.М. Курыловіч, Н.І. Лебедзева, З.Я. Мажэйка, Л.А. Малчанава, І.Д. Назіна, М.Ф. Піліпенка, С.Ф. Цярохін і інш. У сучасны момант актыўныя даследаванні вядуць многія навукоўцы. Сярод іх А.В. Гурко, А.У. Гурко, К.П. Кабашнікаў, Г.І. Каспяровіч, Л.В. Ракава, Я.Н. Сахута, І.У. Чаквін, І.Ф. Штэйнер і інш.

Навукоўцамі па крупіцах сабраны і сістэматызаваны многія набыткі самабытнай матэрыяльнай і духоўнай культуры палешукоў. Але як паказваюць фальклорныя экспедыцыі, што пастаянна арганізуюцца ў апошні час Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя І.П. Шамякіна (ды і не толькі ім), скарбонка народнай мудрасці і шматвяковага вопыту з’яўляецца невычарпальнай і будзе пастаянна ў якасці жыватворнай крыніцы наталяць пазнавальную прагу нашчадкаў, аказваць практычную дапамогу ва ўдасканаленні асобы і грамадства. Важна таксама зазначыць, што аналіз

духоўнай спадчыны Мазырскага Палесся з маральна-выхаваўчага пункту гледжання пакуль што не праводзіўся ў гісторыка-педагагічнай навуцы.

Я.Ф. Карскі адносіў Прыпяцкае Палессе да прарадзімы славянскіх народаў. У сілу прыродна-кліматычных і сацыяльна-палітычных фактараў у пойме ракі Прыпяць існавала свая замкнёная прастора з даволі нязначным уплывам звонку. Тут была сфарміравана непаўторная традыцыйна-пабытовая культура, найважнейшым аспектам якой з'яўляецца педагагічны.

Навуковыя крыніцы сведчаць, што многія пакаленні палешукоў адрозніваліся глыбокім разуменнем жыцця, сапраўднай, а не паказной выхаванасцю. Духоўнасць і сёння не страчана людзьмі, нягледзячы на культурныя і эканамічныя змены, экалагічную катастрофу, якія змянілі ўклад жыцця.

Назапашаны шматвяковы вопыт гадавання дзяцей, які беражліва захоўваўся і перадаваўся з пакалення ў пакаленне, стварыў трывалы падмурак грамадскага суіснавання і засцерагаў ад непрадуманых новаўвядзенняў у выхаваўчай справе. Як перасцярога для сучасных рэфарматараў гучаць такія педагагічныя пастулаты народнай мудрасці: "Адзін добры вопыт важней сямі мудрых павучанняў", "Навуку вывучай і дзедава слова не забывай".

Геаграфічныя межы дадзенага даследавання ахопліваюць тэрыторыю, якая ўключае Петрыкаўскі, частку Жыткавіцкага, частку Брагінскага, Мазырскі, Калінкавіцкі, Хойніцкі, Лельчыцкі, Нараўлянскі і Ельскі раёны. Многія жыхары гэтых раёнаў пасля катастрофы на ЧАЭС пражываюць у г. Мазыры і Мазырскім раёне. Патрабаванні да выхавання асобы, якія склаліся ў рэгіёне, стагоддзямі адаптаваліся да мясцовых умоў: прыродна-геаграфічных, сацыяльных, рэлігійных, этнічных. На аснове пазнання рэгіянальных традыцый адбываецца асэнсаванне і нацыянальнага, і агульначалавечага педагагічнага вопыту, і, наадварот, праз вывучэнне культур народаў свету раскрываецца непаўторнасць свайго, мясцовага, звыклага.

Актуальнасць гісторыка-педагагічнага даследавання арганізацыі народнага выхавання на Мазырскім Палессі вызначаецца наступнымі супярэчнасцямі:

– паміж зместам асноўных дзяржаўных дакументаў (Закон Рэспублікі Беларусь "Об основах государственной молодежной политики", "Кодекс Республики Беларусь об образовании") у якіх прыярытэтнай задачай з'яўляецца выхаванне моладзі адпаведна менталітэту і традыцыям беларусаў, і недахопам навуковых ведаў і рэкамендацый па арганізацыі выхавання ў канкрэтных рэгіёнах;

– паміж неабходнасцю забяспечваць прафесійную педагагічную адукацыю настаўнікаў для школ Палескага рэгіёна, якія павінны мець

дастатковы ўзровень падрыхтоўкі да работы з улікам рэгіянальных традыцый, этнапсіхалагічных асаблівасцей вучняў, ажыццяўляць вучэбна-выхаваўчую работу на этнакультурнай аснове і абмежаваным характарам інфармацыі пра светапогляд беларусаў-палешукоў, адсутнасцю тэарэтычных даследаванняў і навукова-метадычных матэрыялаў у галіне рэгіянальнай этнапедагогікі;

– паміж непазбежнасцю ва ўмовах працэсаў глабалізацыі і выпрацоўкі адзіных еўрапейскіх адукацыйных стандартаў ажыццяўляць мадэрнізацыю айчыннай сістэмы адукацыі і неабходнасцю захавання яе нацыянальнай і культурнай адметнасці, што магчыма праз асэнсаванне рэгіянальнага выхаваўчага вопыту і выкарыстанне інавацыйных педагагічных тэхналогій, заснаваных на паўнацэннай адаптацыі традыцыйнай і сучаснай культур.

З улікам вышэйназваных супярэчнасцей вызначана праблема даследавання: выявіць і ахарактарызаваць працэсы і фактары, якія абумовілі эфектыўнасць народнага выхавання, раскрыць яго рэгіянальныя адметнасці. Яго вынікі ляглі ў аснову прапануемай манаграфіі.

# ГЛАВА 1
# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ВЫВУЧЭННЯ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ МАЗЫРСКАГА ПАЛЕССЯ

## 1.1 Гістарыяграфія, фактаграфія і метадалогія даследавання

Выхаваўчыя традыцыі карэнных жыхароў Прыпяцкага Палесся бяруць выток у глыбокай старажытнасці: масавае засяленне ўзбярэжжа ракі Прыпяць датуецца 8-5 тыс. г. да н.э. Адна з самых ранніх стаянак знаходзіцца каля в. Юравічы ў Калінкавіцкім раёне, дзе людзі жылі 24–26 тыс. г. назад.

Археалагічныя помнікі, выяўленыя на тэрыторыі Мазырскага раёна, сведчаць, што на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся ў перыяд жалезнага веку пражывалі плямёны, прадстаўнікі мілаградскай (7–3 ст. да н.э.) і зарубеніцкай (3 ст. да н.э. – 5 ст. н.э.) археалагічных культур. Своеасаблівасць археалагічных культур выяўляюць старажытныя прылады працы, пахавальны інвентар і абрады.

Плямёны мілаградскай культуры пакінулі на Прыпяцкім Палессі два тыпы паселішчаў: умацаваныя (гарадзішчы) і адкрытыя (селішчы). Яны займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй, паляваннем і рыбалоўствам. Развіваліся рамёствы: апрацоўка жалеза, бронзаліцейная вытворчасць, прадзенне, ткацтва. У ходзе раскопак знойдзена шмат упрыгожанняў і вырабаў з гліны, што сведчыць аб развіцці ганчарства і кавальства. Установлена, што “рэлігійныя ўяўленні плямёнаў мілаградскай культуры базіраваліся на абагаўленні сіл прыроды, прычым культ сонца займаў цэнтральнае месца, былі таксама культы каня, каровы, мядзьведзя, ваўка і інш.” [65, с. 427–428].

Старажытныя стаянкі, гарадзішчы і селішчы, крамянёвыя прылады працы, зброя, кераміка 7-4 ст. да н.э., характэрныя для плямён мілаградскай культуры, знойдзены археолагамі каля вёсак Загорыны, Лубня, Майсееўка, Ясенец Мазырскага раёна. Да зарубеніцкай культуры, прадстаўнікі якой таксама займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рамёствамі [65, с. 237], адносіцца паселішча каля в. Акулінка [107, с. 258-264]. Заняткі і светапогляд першых насельнікаў Мазыршчыны, абумоўленыя прыродай і геаграфічным становішчам, вызначалі матэрыяльную і духоўную культуру Палескага краю і ў значна пазнейшыя часы.

Выхаванне адбывалася пераважна ў працэсе ўключэння падрастаючага пакалення ў працоўную дзейнасць у залежнасці ад полу і ўзросту. У гэты час склаўся *матрыярхат*, дзеці належалі да роду маці. Рэлігійныя вераванні базіраваліся на абагаўленні сіл прыроды (культ сонца), татэмізме (культы каня, каровы, мядзведзя, ваўка і інш.) [65, с. 427–428]. Багатымі былі ўяўленні пра замагільнае жыццё, складанымі пахавальныя абрады. Курганы насыпалі да XIII ст., нягледзячы на распаўсюджанне хрысціянства [109].

У VIII–IX ст. тэрыторыю Прыпяцкага Палесся засялялі *дрыгавічы*, якія мелі сваё палітычнае аб’яднанне, “княжанне”. У ”Аповесці мінулых часоў” яны названы сярод іншых славянскіх пляменаў: “*а друзии седоша межю Припетью*

*и Двиною и нарекошася дреговичи*” [58, с. 140]. Дрыгавічы займаліся земляробствам, агародніцтвам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам, прадзеннем, ткацтвам.Назіраўся высокі ўзровень развіцця рамёстваў: жалезаапрацоўчага, ювелірнага, касцярэзнага, гарбарнага, ганчарнага, дрэваапрацоўчага. На Мазырскім Палессі шмат населеных пунктаў з назвай Рудня, паколькі тут залягае жалезная руда. Былі распаўсюджаны жаночыя ўпрыгожанні: шкляныя пацеркі, бронзавыя скроневыя кольца, пярсцёнкі, бранзалеты.

Гістарычныя факты аб рассяленні славянскіх плямёнаў знаходзяць пацверджанне ў народным паданні “Палешукі і палевікі”, запісаным А. К. Сержпутоўскім [132, с. 79-81]. У творы адлюстраваны працэс распаду сямейных абшчын і асаблівасці засялення забалочаных палескіх абшараў.

Старажытныя магільнікі, гарадзішчы і селішчы дрыгавічоў (8–11ст.) выяўлены археолагамі каля наступных населеных пунктаў Мазырскага раёна: былая вёска Кімбараўка, вёскі Барыскавічы, Лешня, Скрыгалаў [107, 262]. У курганным магільніку X-XII ст. каля в. Надаткі, які належаў дрыгавічам, знойдзены ліраподобная спражка, тканіны, скроневыя кольца, падвескі-пацеркі, пярсцёнак, складная арнаментаваная расчоска [107, 263].

Назву вёскі Стрэльск народная памяць звязвае са старажытным пагранічным пасяленнем стральцоў [94, с. 74]. Паводле гістарычных знаходак, гэта старажытнае гарадзішча, умацаванае ровам і валам, абмежаванае ярамі [107, 264]. Магільнік з трупаспаленнем каля вёскі Слабада належаў палянам, што ў пэўнай ступені пацвярджае як апавяданне летапісца аб рассяленні славянскіх плямёнаў.

Паходжанне назвы “дрыгавічы” навукоўцы знаходзяць і ў літоўскай, і ў беларускай мове (літоўскае drëgnas – сыры, вільготны; балар. дрыгва – топкае нізкае месца, балота). “Дреговичи, обитавшие в южной части нынешней территории Белоруссии, были славянской этнической общностью, образовавшейся в результате смешения славян с балтами” [159, с. 33]. Установлена таксама распаўсюджанасць балтыйскіх, славянскіх і агульнаеўрапейскіх гідронімаў на Усходнім Палессі.

На тэрыторыі пражывання дрыгавічоў заснаваны наступныя гарады: у X ст. – Тураў, у XI ст. – Брэст, Пінск, Мінск, XII ст. – Слуцк, Клецк, Рагачоў, Мазыр і інш. У другой палове X ст. землі дрыгавічоў увайшлі ў склад Кіеўскай Русі, дзе ў канцы X ст. узнікла Тураўскае княства. У перыяд феадальнай раздробленасці тэрыторыя ўваходзіла ў склад Тураўскага (Турава-Пінскага) княства, Мазырскае Палессе – Кіеўскага княства [202, с. 507].

Першыя летапісныя звесткі аб Мазыры (назва ўтворана ад “мазур” – назвы этнічнай групы насельніцтва паўночна-усходняй часткі Польшчы або “масыр” – вільготнасць, вільготнае месца) адносяцца да 1155 года, калі кіеўскі князь Юры Даўгарукі перадаў яго чарнігаўскаму князю Святаславу Ольгавічу. Валодалі ім у розныя часы кіеускія і маскоўскія князі, доугі час горад знаходзіўся ў Тураўскім княстве. У 1240 – 1241гг. Мазыр быў разбураны і спалены мангола-татарамі. У 1413 Мазыр увайшоў у склад Мінскага ваяводства

(падзялялася на 3 паветы: Мінскі, Рэчыцкі, Мазырскі) у складзе сярэдневяковай дзяржавы Вялікага княства Літоўскага.

Адным са старэйшых населеных пунктаў Мазыршчыны з'яўляецца мястэчка Скрыгалаў, якое ўпамінаецца ў 1240. Скрыгалаў (ад імя літоўскага князя Скрыгайла, якому Вялікі князь Літоўскі Ягайла ў 1387 годзе перадаў большую частку Палесся).

Вёска Скрыгалаў, на сённяшні дзень размешчаная ў Мазырскім раёне, лічылася мястэчкам, двойчы ў год тут праводзіліся кірмашы 9 мая і 6 снежня, якія прымяркоўваліся да святаў каляндарнага цыкла. Рыначны гандаль наладжваўся і кожную пятніцу. Мясцовыя жыхары гандлявалі збожжам, бульбай, жывёлай, гарэлкай, рамесніцкімі вырабамі, рыбай, лесам і прадуктамі яго здабычы – смалой, дзёгцем, паташом, шкіпінарам.

З 1432 года вядомы Міхалкі, Мялешкавічы; з 1509 г. – Барбароў (Бабічы); з 1515 — Прудок; з 1725 — Балажэвічы [156].

Жыхары Цэнтральнай Беларусі называлі сваіх паўднёвых суседзяў палешукамі, а тые іх – палянамі. Найменне карэнных жыхароў Палесся, у гістарычных крыніцах упамінаецца ў 1613 г. у адносінах да насельнікаў узбярэжжа Прыпяці. Існавалі лакальныя назвы: палешукі-багнюкі, палешукі-гэтуны, палешукі-гідуны, палешукі-зюзюны, палешукі-сакуны і інш. [202, с. 378]. Своеасаблівасць рэгіёну адзначаецца яшчэ ў XIII ст, тэрмін “Палессе” сустракаецца ў Іпацьеўскім летапісе 1276 г., адначасова са з'яўленнем тэрміна “Белая Русь”. Палессе (балцкае Pala, Pelese – балота, балоцісты лес; слав. лес, лясістая мясцовасць сярод балот) – гісторыка-геаграфічная і этнаграфічная вобласць у басейне ракі Прыпяць (верагодна ад “припечь” – пясчаны, прагрэты сонцам бераг). [104, 308].

У крыніцах XVII–XVIII стст. існуюць розныя варыянты ў вызначэнні рэгіёну, стабільна называючы Палессем тэрыторыю Папрыпяцця. Прыпяцкае Палессе ўваходзіла ў склад ВКЛ у складзе Мінскага, Навагрудскага і Брэсцкага ваяводстваў. пры гэтым на тагачасных геаграфічных картах яно вылучаецца ў асобную гістарычную правінцыю. Пасля другога падзелу Рэчцы Паспалітай (1793) Прыпяцкае Палессе адышло да Расіі ў складзе Мінскай губерніі. У XVIII–XIX стст. тэрмін захоўваецца і папулярызуецца пісьменнікамі і даследчыкамі-этнографамі ў значэнні часткі Беларусі: беларускае Палессе, украінскае Палессе і інш.

Поўдзень Беларусі адрозніваўся ад паўночнага рэгіёна ў сферах матэрыяльнай культуры: распаўсюджаннем асаблівага тыпу сахі, якая атрымала назву палескай, формай гумна, адсутнасцю ў пабудовах лазні; духоўнай культуры: развітымі формамі каравайных абрадаў, іх значнасцю ў вясельным цыкле, своеасаблівасцю каляндарнай абраднасці, адметнасцю мясцовых палескіх гаворак у галіне лексікі і фанетыкі [159].

Даследаванні археолагаў, якія маюць справу найперш з прадметамі матэрыяльнай культуры, не могуць узнавіць выхаваўчы працэс і метады народнай педагогікі таго часу, эмацыянальна-псіхалагічныя адносіны да дзяцей у прешабытным грамадстве, але, выяўляючы дасягнуты грамадствам ўзровень

развіцця, характарызуюць змест навучання і выхавання, аб'ём ведаў неабходны для захавання і перадачы наступным пакаленням сацыяльнага вопыту.

Выхаванне ў дапісьмовы перыяд адбывалася пераважна ў працэсе ўключэння падрастаючага пакалення ў працоўную дзейнасць дарослых у залежнасці ад полу і ўзросту. У народнай педагогіцы феадальнага перыяду пераважае сямейнае выхаванне, але паступова адбываецца саслоўная дыферэнцыяцыя выхавання: пануючых класаў, вайсковага саслоўя, рамеснікаў, сялян. Існуюць традыцыі агульныя для беларускага этнасу: дзядзькаванне, кумаўство. Аддаючы дзяцей на выхаванне ў сем'і сялян ("*дзядзькаванне*"), прадстаўнікі прывілеяваных саслоўяў ставілі за мэту фарміраванне ў нашчадкаў працавітасці, непераборлівасці ў ежы, фізічнай загартоўкі, адданасці роднай зямлі.

Вусная творчасць і метафарычны ўзровень мовы захоўвае старажытныя сямейныя традыцыі. На Мазырскім Палессі распаўсюджана народная песня аб ператварэнні дзяўчыны ў зязюлю: "*маці аддала, вугавор дала, сем год не бувацi.// Церпела я год, церпела я два, дай не вуцерпела, // Ператварылась серай зеўзюляй, к роду палецела*" [36]. Сюжэт ілюструе забарону для маладой жанчыны некаторы час (7 гадоў) бачыцца са сваёй сям'ёй і адказнасць брата за сямейнае жыццё і паводзіны сястры.

У народнай педагогіцы феадальнага перыяду пераважае сямейнае выхаванне, але паступова адбываецца саслоўная дыферэнцыяцыя выхавання: пануючых класаў, вайсковага саслоўя, рамеснікаў, сялян. Існуюць традыцыі агульныя для беларускага этнасу: дзядзькаванне, кумаўство. Цаніліся працавітасць, фізічная загартоўка, адданасць роднай зямлі.

Першыя археалагічныя даследаванні Мазырскага Палесся належаць У.З. Завітневічу (1853–1927), педагогу і даследчыку старажытнасці, аўтару кніг "У археалагічнай экскурсіі ў Прыпяцкае Палессе" (1890), "Другая археалагічная экскурсія ў Прыпяцкае Палессе" (1891). Даследаваннем Мазыршчыны займаюцца аматары-краязнаўцы (А.Р. Бобр, М.А. Капач), археалагічныя экспедыцыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі [79].

Лёс або месца нараджэння многіх выдатных дзеячоў беларускай культуры перыяду сярэднявечча і эпохі Адраджэння звязаны з Мазырскім Палессем. Гэта вядомы асветнік Кірыла Тураўскі (1130–1182), пісьменнік-мемуарыст Паліп Казімір Абуховіч, мысліцель-атэіст Стэфан Лован [80]. Творы палітычнай сатыры XVII ст. "Прамова Мялешкі" і "Ліст да Абуховіча" належаць выхадцам з Мазыршчыны, у іх прысутнічаюць рэаліі мясцовага жыцця [58].

Адным з самых славутых сыноў Палескай зямлі з'яўляецца Кірыла Тураўскі (1130-1182). Погляды айчыннага асветніка на выхаванне асобы, былі ў многім сфарміраваны на аснове ідэй фальклору, захоўвалі сувязь з набыткамі народнай педагогікі [80].

Жыхары Мазыршчыны былі неабыякавымі да асветы і кніг. Сярод адукаваных людзей з XII па XVIII стст. былі папулярны энцыклапедычна-дыдактычныя зборнікі "Пчала", "Тайна Тайных", "Аповесць аб трох каралях-валхвах", "Дыоптра"). Вядомы Мазырскі спіс "Александрыі" – рамана пра

палкаводца Аляксандра Македонскага перапісаны мясцовым дзякам у 1697 годзе [136, с. 11]. З Мазырскай шляхты паходзілі Паліп Казімір Абуховіч, вядомы дзяржаўны дзеяч і пісьменнік-мемуарыст, а таксама мысліцель-атэіст другой паловы XVI ст. земскі суддзя Мазырскага павета Стэфан Лован (Ян Лавейка).

Творы палітычнай сатыры XVII ст. *“Прамова Мялешкі”* і *“Ліст да Абуховіча”* належаць выхадцам з Мазыршчыны, у іх прысутнічаюць культурна-гістарычныя рэаліі жыцця Палесся. Мова патрыятычнага твора “Ліст да Абуховіча” багата аздоблена народнымі выразамі: “увалявся есь в великую славу як свиня у грась” [58, с. 679], “у обмовах людзких и у срамоти седзиць як дзяцел у дупли” [58, с. 679], “што б за тое баба кому пупа не резала” [58, с. 679].

У тэксце “Прамовы Мялешкі” згадваецца дамавы (“и сам дидко не упилнуеть” [58, с. 676]), называюцца традыцыйныя стравы: “гуска з грыбъками, качка з перчиком, печонка з цыбулею или чосныком” [58, с. 676]. Прамова Івана Мялешкі, пасла ад Мазырскага павета на Варшаўскім сейме ў 1589 г., дзе ён выказаўся супраць рашэння Люблінскай уніі аб далучэнні зямель Усходняга Палесся да Кароны Польскай, прасякнута ідэяй адданасці спрадвечным звычаям дзядоў, жаданнем захаваць іх у сямейным жыцці і на дзяржаўным узроўні, у складзе ВКЛ.

“Статутаў Вялікага княства Літоўскага” (1588) – дакумент эпохі і грамадскай думкі, які дзейнічаў на Беларусі, у тым ліку і на Мазырскім Палессі да 1840 года і рэгламентаваў жыццё многіх пакаленняў. З сярэдневяковага звода законаў можна даведацца аб асновах прававога, маральнага, эканамічнага, грамадзянскага і патрыятычнага выхавання, развіцці прыродаздабываючых промыслаў. Адным з самых распаўсюджаных промыслаў на Мазырскім Палессі з’яўлялася бортніцтва – старажытны промысел усходніх славян, які вядомы з IX стагоддзя.

Бортнікі здабывалі мёд для панскай гаспадаркі, мелі пэўныя перавагі над іншымі катэгорыямі залежных сялян, нават галоўшчына за забойства бортніка была вышэй, чым за звычайнага цяглага чалавека. Адпаведна высока цаніліся і бортныя дрэвы, борці, якія пазначаліся спецыяльнымі знакамі – “знаменами”, за крадзёж пчаліных сем’яў прадугледжвалася смяротнае пакаранне. Гэта сведчыць аб вялікім значэнні промыслу ў гаспадарчым жыцці: здабыванне прадуктаў пчалярства з’яўлялася крыніцай дабрабыту і матэрыяльнага дастатку для многіх сямей. У Статуце адзначаецца, што нярэдка бортныя дрэвы служылі сродкам разліку за даўгі, выступалі ў якасці пасагу: “иж пчолы для недостатку дани продаеть або по дочце дасть зятю дерево зо пчолами у чужое село” [180, с. 272]. Нават гаспадар пушчы не меў права чыніць шкоду бортнаму дрэву, якое ахоўваецца законам. У сваю чаргу і ўладальнік борцяў павінен захоўваць правілы паводзін у лесе: “собаки ему не брати, ани рогатины, ани жадное стрельбы, чым бы мел в з веру шкоду учынити” [180, с.270].

Догляд пчол, з’яўляючыся справай сямейнай, прадугледжваў перадачу назапашанага вопыту наступным пакаленням. Гэты занятак садзейнічаў фарміраванню назіральнасці, цярплівасці, далікатнасці, адчуванню прыродных рытмаў. Акрамя таго, для славянскіх народаў пчаліны рой лічыўся сімвалам

калектывізму, руплівай працы, разумнай арганізацыі жыцця. Веды, неабходныя ўменні і навыкі, а таксама бортніцкія замовы перадаваліся па мужчынскай лініі.

Звесткі перыяду знаходжання Мазырскага Палесся ў складзе Вялікага княства Літоўскага пададзены ў сацыяльна-палітычным трактаце Міхалона Літвіна "Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян" (надрукаваны на лацінскай мове ў 1615 годзе ў Швейцарыі). Даследчык знаходзіць падабенства мясцовых вераванняў і звычаяў з агульнаеўрапейскімі [95, с. 43]. М. Літвін пакінуў апісанне занятку, у якім прымалі ўдзел дзеці: збіранне яек і развядзенне ў няволі дзікіх птушак. Трактат сведчыць, што ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся працэс выхавання быў уключаны як у працоўныя заняткі, так і ва ўзаемадзеянне чалавека з прыродным асяроддзем.

Міхалон Літвін, аўтар сацыяльна-палітычнага трактата "*Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян"* разглядае Палессе як неад'емную частку сярэдневяковай дзяржавы, Вялікага княства Літоўскага. Лаканічна апісвае аўтар мясцовую прыроду, расказвае пра традыцыйныя заняткі насельніцтва: бортніцтва, паляванне, развядзенне і адлоў баброў, паведамляе пра асаблівасці надзвычай багатага веснавога лову рыбы на Прыпяці каля Мазыра. Па яго словах, у лясах шмат зуброў, аленяў, коз, дзікоў. "Птиц удивительно много, так что мальчики весною наполняют лодки яицами уток, диких гусей, журавлей, лебедей, и потом их выводками наполняются птичьи дворы" [95, с. 63], – піша М. Літвін, пакінуўшы сведчанне занятку, у якім прымалі ўдзел дзеці: збіранне яек і развядзенне ў няволі дзікіх птушак. Гэта пацвярджае, што ў народнай педагогіцы Палесся працэс выхавання спрадвеку быў уключаны як у працоўныя заняткі, так і ў актыўнае узаемадзеянне чалавека з прыродным асяроддзем.

М. Літвін зазначае, што людзі, якія жывуць на берагах Дняпра, Сожа, Пцічы, Гарыні, Піны і іншых малых і вялікіх рэк з малых год прывыкаюць плаваць, лавіць рыбу, паляваць. Пастаянныя практыкаванні спрыяюць адточванню і загартоўцы прыроджаных фізічных дадзеных і асаблівасцей характару: спрыту, сілы, смеласці, стойкасці і самаахвярнасці. З тых, хто прывык да небяспекі вырастаюць дужыя і смелыя салдаты, здольныя абараніць дзяржаву. Верны вайсковай тэме М. Літвін падкрэслівае значэнне буйных рэк, як важных прыродных аб'ектаў для абароны ад нападаў татар, а таксама ў выхаванні будучых воінаў. Для яго дзяцінства, праведзенае ў пушчы або на берагах вялікіх і малых рэк, выступае як элемент спартанскага і рыцарскага выхавання, што ўтрымліваюцца ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся і былі запатрабаваны ў перыяд войн.

Аўтар трактата "Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян" прыводзіць прыклады падабенства язычніцкіх вераванняў і звычаяў, славянскага і рымскага пантэонаў: "*древних Римскихъ обычаевъ, которые не такъ давно вышли у насъ изъ употребленія, каковы именно: сожиганіе мертвыхъ, гаданія по внутренностямъ и по полету птицъ, ..., поклонение Эскулапу, который почитается въ виде змія. Почитаются также священные пенаты, лары, души усопшихъ, горы, пещеры, озера, рощи*" [95, с. 43].

Трактат “Аб норавах літоўцаў, татараў і масквіцян” – адзін з нямногіх дайшоўшых да нас твораў айчыннага пісьменства, дзе відавочца расказвае пра жахі татарскай навалы. Сведчанні аб нападах крымскіх, нагайскіх і перакопскіх татараў захаваліся ў гістарычных крыніцах, у фальклоры, мове (урочышча татарскі брод каля вёскі Мялешкавічы, расліна татарнік – аер) і ў памяці беларусаў-палешукоў. Адпаведна народнаму паданню, у назве адной з вёсак Мазыршчыны – Акулінка, увекавечана імя мужнай жанчыны Акуліны, якая кінулася на татар з віламі, каб абарніць дачку і дзяцей ад здзекаў. Акуліна была ўзята татарамі ў палон і тым самым уратавала родную вёску ад поўнага знішчэння [94, с. 69].

Шмат гераічных падзей адлюстравана ў назвах населеных пунктаў Мазыршчыны: Булаўкі (ад булава, баявая дубіна), Бібікі (паводле народнай этымалогіі паходзіць ад заклiку: “*Бі, бі кіем!”),* Іпагорскія лянкі (імя міфічных волатаў, якія абаранялі Палескую зямлю ад мангола-татараў) [94]. Уся гісторыя Палескага краю з’яўлялася прыкладам мужнага змагання за свабоду, за магчымасць вольна жыць і працаваць на сваёй зямлі. Элементы спартанскага і рыцарскага выхавання, якія прысутнічаюць у народнай педагогіцы, былі запатрабаваны ў перыяд войн.

У народнай педагогіцы феадальнага перыяду пераважае сямейнае выхаванне, але паступова складваецца выхаваўчая культура пануючых класаў, вайсковага саслоўя, рамеснікаў, сялян, адбываецца дыферэнцыяцыя этнічных выхаваўчых традыцый. Разам з тым існуюць традыцыі агульныя для беларускага этнасу: дзядзькаванне, кумаўство. Здабыткі народнай педагогікі асэнсоўваюцца прадстаўнікамі магнатаў і шляхты як вартыя пераймання. Аддаючы, згодна звычаю, дзяцей з прывілеяваных саслоўяў на выхаванне ў сем’і сялян (“дзядзькаванне”), бацькі ставілі за мэту фарміраванне ў нашчадкаў працавітасці, непераборлівасці ў ежы і адзенні, фізічнай і маральнай загартоўкі, адданасці роднай зямлі, далучэнне да народнай творчасці. Выяўлены сведчанні, што на Мазырскім Палессі гэты звычай у некалькі іншай інтэрпрытацыі захаваўся практычна да нашага часу [86].

На светапогляд мясцовага насельніцтва, адукацыю і выхаванне значна ўздзейнічалі рэлігія, шматнацыянальны і шматканфесійны склад насельніцтва. Паводле друкаваных крыніц, на Мазыршчыне дзейнічалі наступныя рэлігійныя ордэны: езуіты, бернардынцы, цыстэрцыянцы, базыльяне, францысканцы, жаночы ордэн марнавітак і інш. [156]. Пабудаваныя прадстаўнікамі названых канфесій касцёлы, цэрквы і манастыры мелі свае навучальныя ўстановы і адыгрывалі пэўную ролю ў станаўленні адукацыі на Палессі.

Першая навучальная ўстанова на Мазыршчыне створана езуітамі. Гэты каталіцкі ордэн актыўна дзейнічаў на Палессі, як і ў многіх краінах свету. У 1673 – 1674 у Юравічах, тым больш што непадалёку ад Мазыра, за 25 кіламетраў, намаганнямі Марціна Тураўскага, заснавана іезуіцкая місія. У 17-30 гадах XVII ст. езуіцкі быў касцёл пабудаваны ў Мазыры. У канцы XVII ст прыхадское вучылішча дзейнічала ў Мазыры і царкоўнае – ў Гурынах (Гурыны – польскае гура) [156].

У сваю чаргу на дзейнасць школ, якія ўзніклі як рэлігійныя, але развіваліся на мясцовай глебе, аказвала ўплыў народная культура. У большасці навучальных устаноў з часоў сярэднявечча да канца XIX стст. шырокае распаўсюджанне меў школьны тэатр, прадстаўленням якога ўласцівы выхаваўчы змест, а ў інтэрмедыях – пастаноўках паміж асноўнымі дзеяннямі выкарыстоўваліся і народныя тэатральныя традыцыі.

Мэтанакіраванае даследаванне народнай культуры Мазырскага Палесся пачалося ў *эпоху Асветніцтва* (1773 г. – пачатак XIX ст.), падтрымлівалася педагагічнай грамадскасцю, як найбольш адукаванай часткай інтэлігенцыі. Навучальныя ўстановы Палескага рэгіёну ўваходзілі ў Віленскую навучальную акругу, якая ўключала Віцебскую, Гродзенскую, Мінскую (Мазырскі павет з'яўляўся часткай Мінскай губерніі), Магілёўскую, Валынскую, Падольскую, Кіеўскую губерніі. Віленскі універсітэт з'яўляўся адукацыйна-асветніцкім і культурным цэнтрам беларускіх, літоўскіх і украінскіх зямель. Пасля другога падзелу Рэчцы Паспалітай (1793) Прыпяцкае Палессе адышло да Расіі ў складзе Мінскай губерніі, і вывучэннем рэгіянальнай народнай спадчыны займаліся расійскія вучоныя, пераважная большасць якіх выйшлі з асяроддзя мясцовых настаўнікаў.

Студэнтамі ўніверсітэта былі створаны навукова-асветніцкія таварыствы філаматаў і філарэтаў, якія дзейнічалі ў 1817-1823 гг. Філаматам і філарэтам уласціва ашчаднае стаўленне да міфалогіі, фальклору, роднай мовы, заклік да народнасці. Членамі аб'яднання распрацавана "Інструкцыя ў збіранні звестак для вывучэння парафій". Рэкамендавалася фіксаваць звычаі, норавы і забабоны прадстаўнікоў шляхецкага, сярэдняга і трэцяга саслоўяў: асаблівасці адзення, мэблі, жылля, папулярныя танцы, гульні, значэнне сямейных свят і абрадаў, верванняў. Гэта садзейнічала вывучэнню беларускай народнай культуры і нацыянальных традыцый. Ставілася пытанне аб выхаванні ў адзінстве з культурна-гістарычным развіццём, прыродай, побытам народа. Паколькі ў Вільні вучыліся прадстаўнікі Мазыршчыны (у прыватнасці, удзельнікам філамацкага руху быў паэт і філолаг, знаўца ўсходніх моў Фелікс Кулакоўскі – родам з Мазыра, пазней сасланы ў Сібір), то можна меркаваць, што запісы рабіліся і на Палессі, але архіў філаматаў пакуль не апублікаваны.

Філамат Ян Чачот (1796–1847 гг.) – адзін з першых беларускіх фалькларыстаў, руплівы збіральнік песень, паданняў, казак, прыказак, дыялектызмаў. Аналізаваў народную творчасць з мовазнаўчых і маральна-асветніцкіх пазіцый. Ян Чачот не застаўся абыякавым да гераічнай гісторыі палескага краю. У яго цыкле "Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 года" адлюстравана бітва з татарамі на рацэ Акунёўка, упамінаюцца Прыпяць і Мазыр. Рэчкі Акунёўка няма на сучаснай карце, але народная памяць захоўвае назву паселішча, разбуранага ў войнах: Вокунь-гарадок – Акунёўка. Гісторыкі пацвярджаюць існаванне старажытнага гарадзішча, якое датуецца ранні́м жалезным векам, эпохай Кіеўскай Русі (VIII-XII ст.). На ускраіне вёскі Акулінка, якая ўзнікла значна пазней, знаходзіцца два магільнікі і гарадзішча, ўмацаванае двухмятровым валам і паўтарамятровым ровам [107, с 69].

Славяназнавец З.Я. Даленга-Хадакоўскі (1784–1825) праводзіў раскопкі, рабіў запісы фальклору, абрадаў, мясцовых дыялектаў на Мазырскім Палессі.

У вывучэнне краю значны ўклад унёс А. Г. К. Кіркор (1812–1886 гг.) – аўтар большасці артыкулаў аб рэгіёне ў выданні "Живописная Россия" [101]. Даследчык апісвае мазырскія кірмашы, якія праводзяцца 6 студзеня і 6 жніўня, і на якія прыязджаюць купцы з Прусіі і Познані. У цэнтры Палесся гандлююць буйной рагатай жывёлаю – таварам, коньмі, птушкай і рознай дробнай жыўнасцю, збожжам, бульбай, лёнам, пянькою, салам, рыбаю і тлушчам, рамесніцкімі вырабамі, скурамі, лесам і прадуктамі яго здабычы – смалой, дзёгцем, паташом, шкіпінарам. Карысталіся папулярнасцю сохі і іншыя гаспадарчыя прылады, якія мясцовыя сяляне вырабляюць з жалезнай руды. Аўтар піша, што мяшчане займаюцца рыбалоўствам на Прыпяці, вырабам скур. Мазырскія скуры карыстаюцца вядомасцю і адрозніваюцца трываласцю вырабу. Рыначны гандаль у горадзе наладжваўся кожную пятніцу. Кірмашы праходзяць вельмі ажыўлена, з удзелам усіх слаёў насельніцтва, якія жывуць даволі ізалявана, але маюць патрэбу ў культурным жыцці.

Даследчык справядліва адзначае, што сама прырода ўказала палешуку асноўныя заняткі і шляхі для пераадолення цяжкасцей. Хаты сялян курныя, але прасторныя, разам жыве вялікая сям'я, часта тут жа ўтрымліваецца і жывёла. Светапогляд палешукоў аўтар характарызуе як кансерватыўны, верны запаветам продкаў як у святах і абрадах, так і ў вядзенні гаспадаркі: "Рэлігійны, набожны, але не можа адмовіцца ад прымхаў і забабонаў, паэтычнага погляду на жыццё і прыроду, якое захавалася з глыбокай старажытнасці" [101, с. 345].

Палескую кулінарыю і ежу палешукоў даследчык вызначае як найбольш вытанчаную ва ўсёй Беларусі, багатую рыбай, дзічынай, грыбамі і ягадамі: "Вот почему у него за обедом вы встретите дикую утку, рябчика, бекаса, куропатку" [101, с. 346]. Мясцовыя гаспадыні маюць свае сакрэты прыгатавання уюноў, рыбы, што жыве ў балотнай дрыгве і нявядомая ў ў іншых мясцінах.

Оскар Кольберг (1814–1890) польскі этнограф, фальклярыст, кампазітар, настаўнік музыкі. Збіраў фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы ў Польшчы, Літве, на Беларусі, Украіне, у Венгрыі. Аўтар шматтомнай працы "Народ. Яго звычаі, лад жыцця, мова, паданні, прыказкі, абрады, забабоны, забавы, песні, музыка і танцы", якая напісана ў 1857–1890 гадах і ўключае каля 40 тамоў. Адзін з тамоў мае назву "Беларусь – Палессе", у ім змешчаны беларускі матэрыял, у тым ліку з ваколіц Мазыра і Рэчыцы. Аўтар абагуліў уласныя і сабраныя іншымі даследчыкамі звесткі пра адзенне, заняткі і промыслы, гандаль, архітактуру, светапогляд і духоўную культуру беларусаў-палешукоў. У 1889 годзе выдаў зборнікі "Казкі з Палесся", "Вясельныя звычаі і абрады з Палесся". Даследаванні О. Кольберга ўзбагачаны падрабязнай бібліяграфіяй, нотнымі запісамі народных танцаў і песень. Па матывах народных песень і танцаў кампазітарам зроблены апрацоўкі, напісана опера.

Павел Міхайлавіч Шпілеўскі (1823–1861 гг.) быў заклапочаны нізкім узроўнем культурна-гістарычнай памяці, адсутнасцю з боку адукаваных людзей увагі да духоўнай спадчыны беларускага народа, якая, на яго думку, па

самабытнасці не саступала культуры старажытных грэкаў і рымлян у сферы міфалогіі, мовы, святаў і абрадаў. Ён пісаў: “Нас интересуют верования древних греков и римлян, мы пишем об их нравах, мифологии, языке, даже пиршествах и обедах; отчего же не писать о родной Белоруссии, которая так богата своими самобытными нравами, мифологией, языком и, наконец, игрищами и празднествами?” [200, с. 5]. Вучоны адзначаў працаздольнасць, уменне пераадольваць цяжкасці, кемлівасць, бескарыслівасць, сціпласць беларускага народа. Выступаў за распаўсюджанне асветы, паляпшэнне становішча народных настаўнікаў.

У той час афіцыйнай з’яўлялася канцэпцыя “заходнерусізма”, паводле якой беларускія землі разглядаліся як спрадвечна рускія, народу адмаўлялася ў праве на ўласную гісторыю, культуру, нацыянальную самасвядомасць. Даследаванні П. Шпілеўскага адлюстроўваюць узровень навукі і грамадска-палітычныя погляды таго часу, цікавыя найперш багатым фактычным матэрыялам, назіраннямі за побытам. Назвы іх даюць уяўленне аб інтарэсах аўтара ў сферы народнай культуры: “Мозырщина”, “Белорусские народные поверья”, “Народные пословицы с объяснением происхождения и значения их”, “Исследования о вовколаках на основании белорусских поверий”, “Белорусские пословицы”, “Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках” и др.

Для разумення народнай культуры Мазырскага Палесся, у тым ліку выхаваўчых традыцый, уяўляе цікавасць нарыс П. Шпілеўскага “Мозырщина”. Аўтар адносіць да Мазыршчыны як Мазыр і яго ваколіцы, так і Тураў, Петрыкаў, Давыд-Гарадок. Даследчыка цікавіць гісторыю краю, стан матэрыяльнай і духоўнай культуры. У пошуках самабытнасці П. Шпілеўскі звартаецца да гістарычных крыніц, археалагічных сведчанняў дахрысціянскай эпохі, аналізуе беларускую мову, якую адносіць да найбольш архаічных сярод славянскіх, характарызуе як “язык древнеславянский” [200, с. 100]. Даследчык адзначае, што Палессе было вядома ў старажытнасці пад назвай “зямлі “Вудзінаў і Неўраў” [200, с. 98].

Вучоны захапляецца гераічнай гісторыяй Мазыршчыны, мужнасцю яе жыхароў пры змаганні з мангола-татарамі. Аўтар узнаўляе легенду пра двух братоў, гандляроў рыбіным тлушчам і мясцовую чараўніцу, што тлумачыць паходжанне назвы горада Мазыра і найбольш значных узвышшаў у яго ваколіцах.

П. Шпілеўскі спыняецца на знешнім выглядзе і адзенні жыхароў Мазырскага Палесся: абутку, вопратцы, галаўных ўборах прадстаўнікоў розных саслоўяў. Падарожнік асабліва адзначае прыгажосць жаночых спадніц-андаракоў і спецыфіку іх афарбоўкі з дапамогай мясцовай фарбы, чарвецу, сакрэт прыгатавання якой невядомы ў іншых месцах. Апісвае багаты таварамі мазырскі кірмаш, працоўныя заняткі сялян (земляробства, жывёлагадоўлю, пчалярства, рыбалоўства) і мяшчан (выраб скур, пашыў ботаў, агародніцтва). Падрабязна характарызуе даўні занятак палешукоў, догляд лясных дзікіх пчол у калодах – бортніцтва.

Падарожнік занатоўвае асаблівасці патрыярхальнага побыту сялян і заўважае, што мясцовыя сяляне – гэта добры, сумленны, рэлігійны народ, працавіты, прывязаны да родных мясцін. Вялікія сялянскія сем'і жывуць у цесных курных хатах, таму малыя і дарослыя рады выйсці ў лес, на прыроду, якая адрозніваецца багаццем і першазданнай прыгажосцю.

П. Шпілеўскі заўважае, што на Мазыршчыне, аддаленай ад сталічных гарадоў і адукацыйных цэнтраў, добра захаваліся дахрысціянскія вераванні, бачыць у іх вытокі светапогляду палешукоў. Ён адзначае шырокае распаўсюджанне на Мазыршчыне паданняў пра ваўкалакаў, увогуле веры ў магчымасць пераўтварэння чалавека ў звяроў і птушак, таксама разнастайнасць народнай медыцыны і магіі, здольнасць да якіх прыпісваецца найперш дударам, пастухам і млынарам. У гэтым аўтар "Мозырщины" бачыць праяўленне невуцтва і забабонаў, "умственного неразвития и темноты" [199, с. 216].

П. Шпілеўскі не абмінае ўвагай найбольш распаўсюджаныя ў гэтым краі хваробы дзяцей і дарослых, у прыватнасці, вядомы з творчасці М.А. Някрасава ("Железная дорога") каўтун, маладаследаваную медыкамі хваробу насельнікаў палескіх балот, пра якую мясцовыя жыхары гавораць шэптам, каб "не ўкасалася", якую адухаўляюць і спосабамі лячэння якой традыцыйна валодаюць толькі найбольш спрактыкаваныя палескія знахары.

Падарожнічаючы ўніз па Прыпяці, П. Шпілеўскі становіцца сведкам святкавання Купалля на Тураўшчыне, фіксуе звычай мясцовых мельнікаў у Купальскую ноч прыварожваць рыбу, Вучоны-этнограф адзначае веру палешукоў у здольнасць раслін і дрэў пераходзіць з месца на месца, танцаваць і гаварыць паміж сабой у гэты час. Здзіўляецца іх жаданню знайсці папараць-кветку, не столькі для таго, каб атрымаць матэрыяльнае багацце, а найперш, каб навучыцца разумець мову прыроды.

Педагог і этнограф М.В. Радзевіч (1838–1917 гг.) нарадзіўся ў Мазыры, працяглы час працаваў на розных пасадах у Віленскай навучальнай акрузе. У артыкуле "Беларускія народныя школы" стварыў тыповую карціну дзейнасці пачатковых школ, дзе адзначаў такія якасці сялянскіх дзяцей, як шчырасць, сумленнасць, сціпласць, дапытлівасць, імкненне да ведаў [66, с. 211–216].

З.Ф. Радчанка (1839–1916 гг.) нарадзілася на Гомельшчыне, збірала народныя песні, у якіх першая адзначыла двухгалоссе, фіксавала не толькі тэкст, але і музычнае суправаджэнне.

І. І. Радкавец (1849 г. – ?) нарадзіўся і працаваў на Палессі, з'яўляўся карэспандэнтам П.В. Шэйна, запісаў вясельны абрад у Мазырскім павеце, які надрукаваны ў кнізе П.В. Шэйна "Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю" (т. 3, 1902 г.).

А.Н. Шыманоўскі (1850–1918 гг.) педагог, этнограф, выпускнік Мазырскай гімназіі. Аўтар рукапіснага зборніка "Мінская губерня і яе народная творчасць у сувязі з апісаннем народных свят і абрадаў" (1898 г.).

На Гомельшчыне нарадзіўся вядомы педагог, этнограф і фалькларыст Е. Р. Раманаў (1855–1922 гг.). Цікавасць да народнай творчасці беларусаў-палешукоў вызначыла сферу яго прафесійных інтарэсаў.

Польскі даследчык Ч.Г. Пяткевіч (1856–1936 гг.) – аўтар грунтоўнай манаграфіі “Рэчыцкае Палессе”, якая складаецца з трох частак: “Матэрыяльная культура”, “Духоўная культура”, “Грамадская культура” [164]. Пры гэтым традыцыі народнай педагогікі спецыяльна не вылучаны, а з’яўляюцца састаўной часткай этнаграфічных запісаў, што ўскладняе іх разуменне.

Частка І “Матэрыяльная культура” складаюць наступныя раздзелы: “Збор дзікіх пладоў, іх спажыванне і кансерваванне”. “Паляўніцтва”. “Бортніцтва”. “Пастухоўства і гадоўля жывёлы”. “Раслінаводства”. “Нарыхтоўка прадуктаў харчавання”. “Апрацоўка драўніны”. “Бондарства”. “Стальмахоўства, калёсніцтва”. “Будаўніцтва”. “Апрацоўка валакна”. “Апрацоўка скуры і воску”. “Кавальства”, “Грэблі, масты і дарогі”.

Частка ІІ “Духоўная культура: “Арыентацыя ў прасторы і меры”. “Лічэнне”. “Час”. “Нябесныя целы”. “Атмасфера і метэаралогія”. “Агонь”. “Вада”. “Зямля”. “Расліны”. “Жывёлы”. “Чалавек”. “Гігіена”. “Ахова здароўя”. “Хрысціянскія вераванні”. “Рэлігійнае жыццё”. “Дэманы, чорт, скарбы, пераходныя грошы”. ”Чары”. “Музыка і танцы”. “Веды пра псіхічнае жыццё”. “Прыказкі і іншыя гутарковыя звароты”.

Частка ІІІ Грамадская культура: “Кірмашы”. “Карчма”. “Пазыка”. “Этыка” (“Кража”. “Круцельства”. “Абшуканства”, альбо “падманка”, “Брахня, хлусня”. “Клятвапарушэнне”. “П’янства”. “Помста (мста)”. “Астрог”. “Забойства”.

Вядомы славяназнаўца Я.Ф. Карскі (1861–1931 гг.), аўтар шматтомнай працы “Беларусы”, прытрымліваўся тэорыі аб прыпяцка-карпацкай прарадзіме славян, якая і сёння не абвергнута, ускосна пацвярджае даўнасць мясцовых выхаваўчых традыцый.

У вывучэнне Палесся значны ўклад унёс род мазырскіх шляхціцаў Яленскіх (Іосіф Яленскі, Антон Яленскі, Эма Яленская), якія былі неабыякавымі да праблем народа, мовы, працы, народнага мастацтва.

Э. Яленская (1864–1919 гг.) нарадзілася і доўгі час жыла на Палессі (в. Камаровічы Петрыкаўскага раёна), сабрала і выдала на польскай мове народныя казкі, прыказкі, загадкі. Даследчыца адзначае тонкі эстэтычны густ палескіх жанчын, іх працавітасць, акуратнасць. Ёю зроблена падрабязнае апісанне мясцовага вяселля. Працы Эмы Яленскай “Вёска Камаровічы ў Мазырскім павеце”, “Палескі фальклор” выдадзены на польскай мове.

А.К. Сержпутоўскі (1864–1940 гг.) – арганізатар этнаграфічных экспедыцый па Палессю. Вывучэнню традыцыйнай культуры рэгіёна прысвечаны навуковыя даследаванні: “Беларусы-палешукі” (1908 г.), “Земледельческие орудия Белорусского Полесья” (1910 г.), “Бортничество в Белоруссии” (1914 г.), “Сказки и рассказы белорусов-полешуков” (1911 г.) і інш. У кнізе “Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў” (1930 г.) вылучаны самастойныя раздзелы: “Чараватасць”, “Раджанне”, “Хрысціны”, “Гадоўля дзяцей”, “Гадоўля падшпаркаў і іх жытка”, “Жыццё моладзі” і інш.

Этнограф, настаўнік па прафесіі, А. Сержпутоўскі ставіў перад сабой і часткова даваў адказ на пытанне: як удаецца простым сялянам выхаваць дзяцей

ветлівымі, працавітымі, паслухмянымі. У працах А. Сержпутоўскага можна часткова знайсці адказы на гэтыя пытанні. На першае месца ён ставіў сямейнае выхаванне, прыклад бацькоў, далучэнне дзяцей змалку да працы. Даследчык адзначаў, што важныя пытанні вырашаліся на сямейным савеце, дзе прысутнічалі і дзеці. Паводле назіранняў А. Сержпутоўскага, палешукі выхоўвалі дзяцей у строгасці, патрабавальнасці, пры неабходнасці ўшчувалі, нават каралі. Не забывалі пахваліць за руплівасць, працавітасць, паслухмянасць, пры магчымасці ўручыць падарунак, што мела добры выхаваўчы эфект. На Палессі цаніліся такія маральныя якасці як сумленнасць, адкрытасць, сціпласць і сарамлівасць. Велімі істотным быў уплыў грамадскай думкі, суседзяў і аднавяскоўцаў. У большасці дзеці раслі паслухмянымі, працавітымі, дапамагалі выхоўваць малодшых, весці гаспадарку, былі ветлівымі з суседзямі.

Бацькі сур'ёзна адносіліся да гульняў і забаў: маці вучылі дзяўчынак выпякаць з пяску бліны, прасці і такаць, шыць адзенне для лялек. Хлопчыкі будавалі з лучыны дамы, з вецця – шалашы, імітавалі касьбу, складалі стагі з саломы. Развіццю кемлівасці садзейнічалі лічылкі, загадкі. Значнае месца займалі гульні, фізкультурныя практыкаванні, спорт. Дзяцей вучылі катацца на санках, лыжах, плаваць, хадзіць на хадулях, куляцца праз галаву, скакаць праз канавы, бегаць навыперадкі, кідаць мяч, кола. На Купалле дарослыя і моладзь скакалі праз касцёр, перацягвалі канат, паднімалі цяжкасці, танцавалі. Дзеці не мелі добрай вопраткі і абутку, але раслі загартаванымі, працавітымі, кемлівымі, хутка ўступалі ў самастойнае жыццё.

Пры гэтым даследчык не абыходзіць і адмоўныя прыклады ў сямейных узаемаадносінах: недастатковая ўвага да дзяцей, ужыванне ў іх прысутнасці нецэнзурнай лексікі і г.д.

Вучоны распрацаваў праграму "Элементарнае выхаванне", якая ўключала наступныя раздзелы: "1) задачы выхавання; 2) бацька і маці – галоўныя выхавацелі; 3) дзіця пачынае гаварыць; 4) цацкі, гульні, падарункі, сіла ласкі і любві; 5) пачатак вучобы, адукаванне, настаўнік і настаўніца; 6) адносіны бацькоў і дзяцей у сям'і" [114, с. 217]. Праграма не была ў поўнай меры рэалізавана, асобныя фрагменты знаходзяцца ў Архіве Расійскага этнаграфічнага музея ў Санкт-Пецярбургу. Сярод дарэвалюцыйных даследаванняў, менавіта запісы К. Сержпутоўскага, зробленыя з захаваннем мясцовых асаблівасцей гаворкі, захоўваюць найбольш багатую і аб'ектыўную інфармацыю аб выхаваўчых традыцыях беларусаў-палешукоў.

М.В. Доўнар-Запольскі (1867–1934 гг.) – гісторык, этнограф, фальклярыст, ураджэнец Гомельшчыны, вучыўся ў Мазырскай прагімназіі. Збіраў народную творчасць. Распрацоўваў праграмы этнаграфічнага вывучэння Беларусі. Аўтар прац: "Беларускае вяселле і вясельныя песні" (1888 г.), "Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках" (1893 г.), "Песні пінчукоў" (1895 г.), "Звычаёвае сямейнае права сялян Мінскай губерні" (1897 г.), "Рытуальнае значэнне каравайнага абраду ў беларусаў" (1900 г.) і інш. Для этнапедагогікі цікавы як даследчык сямейнага звычаёвага права беларусаў.

І.А. Сербаў (1871–1943 гг.) – аўтар кніг "Паездкі па Палессі. 1911 і 1912 гг." (1914 г.) і "Беларусы-сакуны" (1915 г.). У даследаваннях падкрэслівае працавітасць, ветлівасць, сумленнасць, жыццёвую мудрасць палешукоў [172, с. 47]. У назве "Беларусы-сакуны" адлюстравана празванне жыхароў узбярэжжа Прыпяці, якое характарызуе іх паводле асаблівасці гаворкі, а менавіта ўжывання канчаткаў зваротных дзеясловаў, што захоўваецца да нашых дзён. Вучоны аналізуе асаблівасці паводзін і светапогляду палешукоў, апісвае этнаграфічныя тыпы тутэйшага насельніцтва, традыцыйныя касцюмы і прадметы побыту. Тэма выхавання непасрэдна не закранаецца, кнігі маюць характар падарожных нарысаў.

І.А. Сербаў апісвае мястэчкі Тураў, Петрыкаў, вёскі Вялікі і Малыя Аўцюкі, фатаграфуе (сярод палешукоў гэты працэс лічыцца шкодным, атаясамліваецца з сурокам) этнагарафічныя тыпы тутэйшага насельніцтва, традыцыйныя касцюмы і прадметы побыту. Вучоны захапляецца прыгажосцю Мазыра і яго наваколля – "Палескай Швейцарыі", што, як заўважае аўтар, так не падобна на самотныя, глухія нізіны Палескага краю.Назіральны падарожнік вымушаны згадзіцца і з мясцоваю прыказкаю: "Мозырь – якъ пузырь: кругомъ горы и вода, а посереди голь да беда..." [171, с. 50].

Н.Я. Васільева (1874–1880 гг.) настаўнічала на Палессі, супрацоўнічала з П.В. Шэйнам. Вядомы артыкулы аб жыцці і побыце сялян: "Нататка пра побыт сялян Мазырскага павета", "Веснавыя песні і абрады ў вёсках Мазырскага павета", "Кірмашы ў Мазырскім павеце", "Вытрымкі з жыцця беларускай жанчыны", якія былі надрукаваны ў 1877–1881 гг. у газетах "Минские губернские ведомости " і "Виленский вестник". Матэрыялы вызначаюцца ўвагай да этнаграфічных дэталей, але некалькі спрошчаным разуменнем сацыяльнага жыцця і духоўных запатрабаванняў народа, адзначаюцца тужлівая тэматыка народных спеваў, нізкі ўзровень народнай музыкі, цяжкае жыццё прыгонных сялян.

К. Машынскі (1887–1959 гг.) – польскі і беларускі этнограф, фалькларыст, мовазнаўца. Ім зроблена апісанне вясельнага абраду ў вёсцы Дарашэвічы, якое ўвайшло ў акадэмічны збор беларускага фальклору [90, с. 416–430]. У 1914 г. быў у экспедыцыі ў Мазырскім павеце, матэрыялы якой абагулены ў манаграфіі "Усходняе Палессе: Этнаграфічныя матэрыялы" (Варшава, 1928 г.) [203].

На рубяжы XIX–XX стст. у Мазыры дзейнічала народніцкая арганізацыя "Трудовая воля", часткай яе праграмы была краязнаўчая тэматыка. Дапамогу ў зборы матэрыялаў нарадавольцам аказвалі мясцовыя настаўнікі [156, с. 69].

У пачатку XX стагоддзя Мазыр – даволі буйны горад. У ім пражывала каля 8 тыс. чалавек, дзейнічала 5 навучальных устаноў з 430 навучэнцамі.

У 1803 у горадзе адкрыта павятовае вучылішча. У пачатку XIX ст. яно ператворана ў дваранскае двухкласнае вучылішча, дзе выкладаліся закон Божы, расійская і польская мовы, арыфметыка, геаметрыя, гісторыя, чыстапісанне, чарчэнне, маляванне. У 1830 г. вучылішча становіцца пяцікласным, да названых прадметаў дадаюцца французсая і нямецкая мовы, фізіка. Вучылішча

было размешчана ў доме Фелікса Кяневіча, кіраўніка паўстання 1831 г. на Мазыршчыне.

У 1859–1917 у Мазыры адкрыта мужчынская гімназія (з 1865 – класічная; з 1873 па 1909 – прагімназія), якая з'яўлялася культурна-адукацыйным цэнтрам рэгіёна. Пры гімназіі дзейнічала нядзельная школа для навучання чытанню і пісьму ўсіх жадаючых. Мазырскую гімназію праславілі яе выпускнікі: гісторык і этнограф Мітрафан Доўнар-Запольскі, даследык культуры народаў Поўначы Эдуард Пякарскі, беларускі пісьменнік Сяргей Палуян і многія іншыя.

У Мазыры развівалася і жаночая адукацыя: жаночы чатырохкласны пансіён Асоўскай (1855 г.), Мазырскі прыватны жаночы пансіён (1863 г.), прыватнае двухкласнае жаночае вучылішча (1872 г.), жаночая гімназія (1911 г.).

У горадзе дзейнічалі прыватнае ніжэйшае вучылішча, ніжэйшая рамесная школа (1907 г.), дзе выкладаліся закон Божы, руская мова арыфметыка, чарчэнне, маляванне, тэхналогія апрацоўкі металаў, слясарная справа.

У многанацыянальным Палескім краі працавалі таксама яўрэйскае вучылішча з сумесным навучаннем, яўрэйская талмуд-тора і 30 хедэраў – пачатковых яўрэйскіх школ. Хедэр быў адкрыты і ў мястэчку Скрыгалаў.

Паводле друкаваных крыніц і архіўных дакументаў, на Мазыршчыне ў 1861 г. пачалі дзейнічаць вучылішчы для сялянскіх дзяцей у вёсках – Гурыны, Барбароў, Скрыгалаў, Мялешкавічы. У 1863 г. у Скрыгалаве адчынена народнае вучылішча, дзе ў 1878/1879 гг. навучальным годзе вучылася 27 дзяцей, у наступным годзе – 35, з яіх 31 вучань – хлопчыкі. У 1863 г. – прыходская школа (пазней ператворана ў народнае вучылішча) адчынена ў в. Мялешкавічы (вучыліся 41 хлопчык і 6 дзяўчынак). У 1864 г. ва ўсіх школах раёна ў сукупнасці вучылася 426 вучняў, у тым ліку 28 дзяўчынак. Пасля паўстання 1861 г., у 1864 г., было забаронена выкладанне польскай мовы, што выклікала адкрыццё тайных польскіх школ [156, с. 94-97].

У 1865 г. школы адкрыліся ў вёсках Міхалкі (56 вучняў), Слабада (52 чалавекі). У в. Слабада ў 1876 г. адкрыта царкоўна-прыхадская школа. У 1883 г. – народныя вучылішчы ў наступных населеных пунктах: Скрыгалаў, Слабада Скрыгалаўская, Міхалкі, Мялешкавічы. У 1890 г. адкрыта школа ў в. Балажэвічы. Настаўнікамі на Мазырскім Палессі працавалі пераважна выпускнікі Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Выкладаліся – Закон Божы, руская мова і пісьмо, чытанне, славянская мова і чытанне, арыфметыка, спевы.

У пачатку XX ст. адкрыліся аднакласныя народныя вучылішчы ў наступных вёсках Мазыршчыны: Балажэвічы, Бярозаўка, Бібікі, Васькаўка, Глініца, Жахавічы, Кустаўніца, Прудок, Раманаўка, Махнавічы, Лешня, Малы Бакавец, Казіміраўка (1913 г.), Антонаўка і Зімовішчы (1916 г.) [156, с. 86]. У в. Махнавічы ў сялянскай хаце адчынілі школу, дзе займалася 20 хлопчыкаў і некалькі дзяўчынак. У 1914 г. дзейнічалі аднакласныя народныя вучылішчы ў вёсках Балажэвічы, Бярозаўка, Бібікі, Глініца, Казіміраўка, Кустаўніца, Лешня, Малы Бокаў, Махнавічы, Мялешкавічы, Прудок, Раманаўка, Слабада Скрыгалаўская, Скрыгалаў [156].

Запісы этнографаў і сведчанні сучасных інфарматараў пацвярджаюць, што ў сельскай мясцовасці дзяцей не вельмі ахвотна пасылалі ў школу. Па-першае, не бачылі ад вучобы хуткай аддачы, карысці для простага чалавека; па-другое, не хацелі адрываць дзяцей ад нялёгкай штодзённай працы ў сям'і, дзе высока цаніўся кожны работнік; па-трэцяе, існаваў недавер да афіцыйных улад, часткай якіх з'яўлялася школа. Вучобе перашкаджалі хваробы, эпідэміі, адсутнасць абутку і адзення, аддаленасць ад месца жыхарства, неабходнасць дапамогі ў хатняй гаспадарцы [156, 138-139]. Мала было сярод вучняў дзяўчынак, якія дапамагалі ткаць, прасці, глядзець дзяцей. Большасць жаночых работ, звязаныя з апрацоўкай пражы і вырабам адзення для вялікіх сем'яў была надзвычай працаёмкай і прыпадала на зіму, час заняткаў у школе. У аддаленых ад павятовага горада Мазыра населеных пунктах навучаннем пры царкоўных прыходах было ахоплена нязначная колькасць дзяцей, пісьменнасць насельніцтва не перавышала 1-4% [156, с. 62-63].

У лістападзе 1917 года на Мазыршчыне ўстаноўлена Савецкая ўлада. У 20-я гады XX стст. на Мазырскім Палессі, як і па ўсёй Беларусі, ажыццяўлялася палітыка беларусізацыі, адкрываліся школы з выкладаннем на дзяржаўных мовах і мовах нацыянальных меншасцей (беларускай, рускай, яўрэйскай, польскай, укранскай, нямецкай). Пры школах і сельсаветах ствараліся краязнаўчыя таварыствы і гурткі, праводзілася навукова-даследчая работа: збор слоў, казак, песень, выяўленне помнікаў старажытнасці, вывучэнне хатніх рамёстваў, вуснай народнай творчасці, традыцыйнай харавой, музычнай і драматычнай культуры.

Актыўна дзейнічала Мазырскае Акруговае Таварыства Краязнаўства пад кіраўніцтвам А.Я. Крукоўскага. Вынікі работы арганізацыі рэгулярна асвятляліся ў часопісе "Наш край". У справаздачы за 1928 год указваецца, што на тэрыторыі Мазырскай акругі сабрана 518 запісаў народнай творчасці. Называюцца імёны збіральнікаў, каля 40 чалавек – пераважна настаўнікі, дадзена справаздача па раёнах. Адзначаецца, што Мазырская акруга адзіная, дзе збіральніцкая праца ахапіла ўсёе раёны [198]. У гэтай дзейнасці актыўны ўдзел прымалі настаўнікі і вучні. Сабраныя матэрыялы дапамагалі наладзіць выхаваўчую работу, наблізіць навучанне, якое вялося на аснове адзінага комплексу "жыццё дзіцяці і акружаючага асяроддзя", да штодзённых інтарэсаў дзяцей, свету прыроды і традыцыйных заняткаў мясцовага насельніцтва.

М. Касяровічам у артыкуле "Для чаго і як вывучаць быт дзяцей" пастаўлена пытанне аб дыферэнцыяваным падыходзе да запісаў фальклору, фіксацыі праяў матэрыяльнай і духоўнай культуры ў жыццядзейнасці асобных узроставых груп, распрацавана праграма вывучэнне побыту дзяцей, дадзена ўзроставая перыядызацыя, канкрэтныя рэкамендацыі для збіральнікаў. Адзначаецца неабходнасць вывучаць асаблівасці гаворкі і складці слоўнік мовы дзяцей, апісаць побыт, працы і забавы, даць усебаковую характарыстыку дзіцячай творчасці, дзейнасці дзіцячых устаноў і арганізацый і г.д. [115]. Гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі выяўленню традыцый народнай педагогікі, але

кароткія тэрміны і трагічныя вынікі працэсу беларусізацыі не дазволілі ажыццявіць задуманае.

Матэрыялы, сабраныя супрацоўнікамі і добраахвотнымі памочнікамі Інбелкульта, не ўвайшлі ў навуковы ўжытак – загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны або знаходзяцца ў архівах суседніх краін. Такі ж лёс напаткаў і “Краёвы слоўнік Мазыршчыны” А.Я. Крукоўскага, што мог бы ўзбагаціць уяўленні аб выхаваўчай лексіцы Мазырскага Палесся.

Такім чынам, вывучэнне рэгіянальнай культуры праводзілася ў складаных гістарычных умовах, пераважна ў рамках этнаграфічных, гісторыка-культурных даследаванняў, што не садзейнічала мэтанакіраванаму збору і сістэматызацыі этнапедагагічных матэрыялаў.

Па сведчаннях інфарматараў, у даваенны і пасляваенны час дзецям забаранялася ўдзельнічаць у народных святах (Каляды, Вялікдзень), хадзіць на вячоркі, што парушала пераемнасць традыцый. У школе з вучнямі і іх бацькамі праводзілі растлумачальную работу, маглі выключыць з піянерскай, камсамольскай арганізацый або са школы. Па гэтай прычыне традыцыі народнай педагогікі Мазырскага Палесся ў галіне масавага эстэтычнага выхавання, што абапіраліся на народныя святы і абрады, паступова знікалі. З развіццём прамысловасці, зменай форм уласнасці на зямлю і заняпадам шэрагу традыцыйных для палешукоў працоўных заняткаў значна змяніўся змест працоўнага выхавання моладзі.

З пачатку XX ст. і да сучаснасці на Палессі працягваецца перыяд паступовага, але няўхільнага заняпаду традыцыйнага ладу жыцця, арганічнай і неад’емнай часткай якога з’яўляюцца ідэі народнай педагогікі. У межах XX ст. вылучаюцца трагічныя даты: 1917–1920 гг.; 1937 г.; 1941–1945 гг.; 1986 г., якія ў сукупнасці прывялі да вялікіх чалавечых ахвяр, значных і неадноўных страт у галіне духоўнай і матэрыяльнай культуры. Але, як самаарганізаваная сістэма, народная педагогіка імкнецца да развіцця і запаўнення белых плям, спрацоўвае за кошт яшчэ існуючых сувязей паміж асобнымі часткамі.

Як выяўлена ў ходзе дадзенага даследавання, рэгіянальныя выхаваўчыя традыцыі дасюль існуюць у штодзённым побыце, перадаюцца вусна, з пакалення ў пакаленне. Назіраецца ўстойлівасць у грамадскай свядомасці ідэй маральнага выхавання, народных метадаў і прыёмаў догляду немаўлят. Праз сямейнае выхаванне, грамадскія традыцыі, выкананне аўтэнтычнага фальклору народная педагогіка ўключана ў сучасны педагагічны працэс.

Менавіта ў другой палове XX ст. праведзены маштабныя даследаванні народнай культуры Беларусі ў цэлым і Мазырскага Палесся ў прыватнасці. У савецкі перыяд яе вывучалі В.К. Бандарчык, І.М. Браім, М.Я. Грынблат, Г.М. Курыловіч, Н.І. Лебедзева, Л.А. Малчанава, І.Д. Назіна, М.Ф. Піліпенка, С.Ф. Цярохін і інш., у наш час – А.В. Гурко, А.У. Гурко, К.П. Кабашнікаў, Г.І. Каспяровіч, В.С. Новікава, І.У. Чаквін, І.Ф. Штэйнер і інш.

Традыцыйная культура беларусаў усебакова разглядаецца ў выданнях энцыклапедычнага характару, работах прадстаўнікоў розных галін гуманітарных ведаў: Г.А. Барташэвіч, Н.С. Гілевіча, В.У. Дадзёмавай,

Э.К. Дарашэвіча, С.Ф. Дубянецкага, Т.В. Валодзінай, І.В. Казаковай, М.С. Кацара, І.І. Крука, У.М. Конана, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак, А.С. Ліса, Я.Ю. Ленсу, А.Ю. Лозкі, З.І. Мажэйка, А.С.Майхровіча, М.Ф. Піліпенкі, М.Ф. Раманюка, Э.Р. Сабаленкі, Я.М. Сахуты, В.Я. Фадзеевай, А.С. Фядосіка, Т.І. Шамякінай, В.І. Ялатава. Толькі працы па выніках вывучання беларускай народнай творчасці, выдаваемая Нацыянальным інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы, складае каля 50 тамоў. У іх змяшчаецца найбольш поўнае апісанне абрадаў, асноўных жанраў аўтэнтычнага фальклору, зробленае этнографамі і фальклarыстамі XIX–XX стст. ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, у тым ліку і на Мазырскім Палессі. Аднак звесткі па народнаму выхаванню, якія дэ-факта прысутнічаюць у названым і многіх іншых выданнях, не распрацаваны, не ўведзены ва ўжытак і праблемнае поле этнапедагогікі, што ўскладняе тэарэтычную і практычную работу на этнакультурнай аснове.

Спецыяльнае этнапедагагічнае даследаванне выхаваўчых традыцый Мазырскага Палесся не праводзілася. Вывучэнне народнай культуры ў мінулым і сёння ажыццяецца пераважна этнографамі і фалькларыстамі. Іх даследаванні, улічваючы сінкрэтызм народна-педагагічных ведаў, з’яўляюцца каштоўным эмпірычным матэрыялам для этнапедагогікі, але ахопліваюць абмежаванае кола тэм і не даюць адказу на многія пытанні, якія вырашае этнапедагогіка як навуковая дысцыпліна. Гэта прыводзіць да адставання ў галіне этнапедагагічных даследаванняў і стварае цяжкасці ў практычнай арганізацыі выхаваўчай работы на этнакультурнай аснове.

Фундаментальнае вывучэнне беларускай народнай педагогікі пачынаецца з выданнем манаграфіі Г.П. Арловай “Беларуская народная педагогіка” (Мн., 1993). Упершыню ў айчыннай навуцы аўтар даследуе беларускую народную педагогіку ў цэласным выглядзе: вызначае сутнасць народнай педагогікі, спосабы, прыёмы і сродкі выхавання, асноўныя выхаваўчыя ідэі (працоўнае, разумовае, маральнае, рэлігійнае, эстэтычнае, патрыятычнае, фізічнае выхаванне), аналізуе педагогіку маленства, дзяцінства і юнацтва [63].

Узаемасувязь паміж народнай і навуковай педагогікай раскрываецца ў пазнейшых работах Г.П. Арловай: “Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы” (Мн., 1995), “Народная педагогика как фактор развития теории нравственного воспитания” (Віцебск, 1996), “Преемственность народной и научной педагогики в развитии теории нравственного воспитания” (Витебск, 2000), “Этнопедагогика: теория нравственного воспитания” (Витебск, 2001) [64; 153; 154; 155]. Прафесар Г.П. Арлова ўзначальвае Віцебскую навуковую школу этнапедагогікі, у рамках якой распрацоўваюцца разнастайныя пытанні арганізацыі народнага выхавання: маральнага выхавання (А.Э. Крываносава), маральнага і фізічнага здароўя асобы (А.Л. Міхайлава), эстэтычнага выхавання (С.Р. Туболец) [124; 143].

Айчыннымі даследчыкамі праводзяцца як тэарэтычныя даследаванні ідэй народнай педагогікі, так вызначаны і прыкладныя напрамкі выкарыстання народнага выхаваўчага вопыту ў сучасным вучэбна-выхаваўчым працэсе:

К.А. Кулінковіч “Этнічная педагогіка беларусаў” (Мн., 1993); В.А. Салееў “Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы” (Мн., 1994); С.В. Снапкоўская “Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: з гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст.” (Мн., 1995); В.П. Канаш “Выхаваўчая работа ў школе на аснове каляндарнай абраднасці беларусаў (Мн., 1995); В.П. Канаш “Выхаванне на традыцыях народнай педагогікі : Я.Колас “Новая зямля” (Мн., 1996); “Народная педагогіка беларусаў” (У.М. Конан, В.С. Болбас, П.Г. Ляўта і інш.) (Мн., 1996); Г. А. Барташэвіч “Этнапедагогіка беларусаў” (Мн., 1996); А.А. Грымаць, Л.В. Варанецкая “Беларуская народная педагогіка: тэорыя і практыка” (Мн., 1996); “Народная педагогіка беларусаў” (А.А.Грымаць, Л.М.Варанецкая, У.В.Пашкевіч) (Мн., 1999); І.І. Калачова “Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапед. спадчына народаў Беларусі” (Мн., 1999); “Ад добрага кораня – добры парастак: этнапед. традыцыі беларусаў у выхаванні дзяцей” (Мн., 1999); Л.В. Ракава “Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы” (Мн., 2000); І.І. Сучкоў “Фальклорны тэатр і выхаванне асобы” (Мн., 2001); С.П. Жлоба “Народная педагогика Полесья (по материалам этнографических исследований)” (Брест, 2002); В.С. Болбас “Этычная педагогіка беларусаў” (Мн., 2004); В.С. Болбас “Этыка-педагагічная думка Беларусі: са старажытнасці да XVIIIст.” (Мн., 2004); Л.Н. Воронецкая, Ю.В. Мелешко “Народная педагогика” (Мн., 2007); В.У. Буткевич, Ю.С. Любимова “Эстетическое воспитание младших школьников средствами народного декоративно-прикладного искусства” (Мн., 2008); І.І. Калачова “Этнакультурныя працэсы ў гарадской сям’і беларусаў у апошняй трэці XX — пачатку XXI ст.” (Мн., 2009) і інш. [102; 111; 149; 170; 181]

Назапашаны народам педагагічны вопыт захоўваецца і праяўляецца ў самых разнастайных з’явах жыцця і формах светапогляду (рэлігійны, міфалагічны, жыццёва-практычны, мастацкі), што патрабуе яго інтэрпрэтацыі і абагульнення на шырокай метадалагічнай базе сацыяльна-гуманітарных навук.

Метадалогія даследавання ўключае 4 узроўні: філасофскі, агульнанавуковы, канкрэтна-навуковы, тэхналагічны (методыка і тэхніка даследавання). Аснову складаюць агульнафіласофскія прынцыпы гістарызму, навуковасці, аб’ектыўнага падыходу да вывучэння і творчага выкарыстання педагагічнай спадчыны, прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцей, разумення гісторыка-педагагічнага працэсу як неад’емнай часткі культурнага развіцця, вывучэння педагагічных з’яў у іх дыялектычным адзінстве, сувязі з практыкай; палажэнні аб ролі народа ў стварэнні духоўнай культуры, аб адносінах да спадчыны мінулага.

Улічваючы неадназначнасць народнага светапогляду, з сучасных метадалагічных арыенціраў выбрана герменеўтыка. Яна ўжыта для інтэрпрэтацыі фальклорных тэкстаў, дзе слова мае не толькі прамы, але і глыбокі сімвалічны сэнс, недаступны літаральнаму разуменню.

Сярод базавых агульнанавуковых падыходаў выкарыстаны: гістарычны, сінергетычны, сістэмны (сістэмна-структурны). Гістарычны падыход дапамагае вызначыць спецыфічныя адметнасці, умовы і фактары станаўлення народнай

педагогікі Мазырскага Палесся, асэнсаваць узаемасувязь мінулага, сучаснага і будучага ў фарміраванні асобы і этнічнай супольнасці. Сінергетычны падыход як міждысцыплінарны забяспечвае больш глыбокае разуменне народнай педагогікі з улікам працэсаў самаарганізацыі, самаразвіцця, сістэмнасці, цэласнасці, нелінейнасці. Прасочваецца карэляцыя сінергетыкі з наступнымі ідэямі народнай педагогікі Мазырскага Палесся: цыклічнасць, кругазварот нараджэння і смерці; глыбінная ўзаемасувязь выпадковага і неабходнага, рацыянальнага і ірацыянальнага; адзінства тэорыі і практыкі, выхавання і самавыхавання; фарміраванне асобы на працягу ўсяго жыцця; адухаўленне прыроды і ўспрыняцце чалавека як часткі сусвету [119].

Даследаванне абапіраецца на сістэмны падыход, што дазваляе выявіць структуру народнай педагогікі, устанавіць адносіны паміж яе элементамі і падсістэмамі, а таксама паміж выхаваўчай сістэмай і знешнім (прыродным, сацыяльным) асяроддзем. Народная педагогіка Мазырскага Палесся разглядаецца як састаўная частка беларускай народнай педагогікі, што складаецца з рэгіянальных падсістэм, якія жывяць яе і ўзбагачаюць. Адначасова яна даследуецца як абасобленая самаарганізаваная сістэма (яе падсістэмы – мэта, прынцыпы, метады, формы, сродкі выхавання), якой уласцівы варыятыўнасць, стабільнасць, прагназуемасць, пераемнасць. Выхаванне чалавека аналізуецца, як цэласны працэс, які не мае ўзроставых абмежаванняў.

Канкрэтна-навуковую метадалогію складаюць асноўныя палажэнні гісторыі педагогікі і этнапедагогікі, ідэі гуманізацыі і этнапедагагізацыі выхавання. Метадалагічнымі арыенцірамі выбраны этнапедагагічны і культуралагічны падыходы, улічваліся – аксіялагічны, цывілізацыйны, асобасны, дзейсны. Даследаванне абапіраецца на канцэптуальныя ідэі класікаў педагогікі А. Дыстервега, К.Дз. Ушынскага аб самабытнасці педагагічных культур, аб культуразгоднасці і народнасці выхавання [98; 188; 189].

Этнапедагагічны падыход (Г.П. Арлова, Г.А. Барташэвіч, В.С. Болбас, Г.Н. Волкаў, А.А. Грымаць, І.І. Калачова, Т.С. Камарова, В.С. Кукушын, Л.В. Ракава, В.А. Салееў, С.В. Снапкоўская, Я.І. Сярмяжка) улічвае прыналежнасць дзіцяці да пэўнага этнасу і ажыццяўленне арганізацыі выхавання на аснове нацыянальнай культуры. Выкарыстаны два існуючыя падыходы да раскрыцця сутнасці даследуемых этнапедагагічных з'яў – спецыфічны (эмік) і агульны (этык). Вывучэнне рэгіянальных педагагічных з'яў ажыццяўлялася з дапамогай этнаграфічных даследаванняў, знутры сістэмы, таму з'яўляецца спецыфічным.

Культуралагічны падыход (А.Г. Асмолаў, Я. М. Бабосаў, У. С. Біблер, У. С. Давідовіч Э.К. Дарашэвіч, К.У. Гаўрылавец, У. П. Зінчанка, Т.В. Катовіч, Л.Н. Коган, У.М. Конан, А. М. Лявонцьеў, А.І. Ляўко, В. М. Мяжуеў, В.П. Старжынскі, І.І. Цыркун) дазваляе разглядаць народную педагогіку, па-першае, як неад'емную частку народнай культуры беларусаў-палешукоў, па-другое, як састаўную частку агульначалавечага выхаваўчага вопыту. Прызнаецца раўнапраўе культур у рамках адзінай гуманістычнай сістэмы каштоўнасцей пры разнастайнасці этнакультур і этнічных асаблівасцей.

Методыка і тэхніка даследавання ўключае комплекс тэарэтычных метадаў: вывучэнне і гісторыка-педагагічны аналіз літаратуры, праблемны аналіз крыніц, навуковае мадэліраванне, аналіз і сістэматызацыя з'яў і фактаў традыцыйнай культуры рэгіёна, кантэкстуальны аналіз фальклорных тэкстаў, семантычны аналіз мясцовай дыялектнай гаворкі.

У ходзе даследавання абагулены значны па аб'ёму рэгіянальны эмпірычны матэрыял як апублікаваны, так і неапублікаваны. Па-першае, ажыццяўлялася мэтанакіраванае апытванне мясцовых жыхароў, запіс фальклору і вусных апавяданняў выхаваўчай тэматыкі. Пры зборы матэрыялаў выкарыстоўваліся метады інтэрв'ю, гутаркі, назірання.

Па-другое, праводзілася работа з запісамі фальклору Усходняга Палесся, сабраных у архіве лабараторыі славістыкі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Выкарыстаны матэрыялы рэгіянальнага архіва Гомельскай вобласці, вучэбна-навуковай лабараторыі Беларускага фальклору філалагічнага факультэта БДУ. Вывучаліся экспазіцыя і фонды Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея "Палеская веда", матэрыялы Дзяржаўнага занальнага архіва ў г. Мазыры, краязнаўчага аддзела Цэнтральнай Мазырскай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна.

Па-трэцяе, выяўлены і адабраны ў навуковай літаратуры ўзоры вуснай народнай творчасці беларусаў-палешукоў, рэгіянальныя звычаі і абрады. Фальклорныя крыніцы выкарыстаны ў той ступені і ў такім аб'ёме, наколькі гэта неабходна для характарыстыкі народнага светапогляду, раскрыцця сэнсу таго або іншага выхаваўчага фактару. Відавочна, што немагчыма ахапіць увесь масіў фальклору, але пры гэтым, калі ўстаноўлены прынцып або метад выхавання справядлівы, то ён з'явіцца асновай для абагульнення новых фактаў.

У аснову даследавання пакладзены ўласныя запісы аўтараў і студэнтаў МДПУ імя І.П. Шамякіна; выкарыстоўваліся ўсе даступныя матэрыялы як сучасныя, так і даследчыкаў мінулага; вывучаліся працы па этнаграфіі і фалькларыстыцы, этыцы і эстэтыцы, культуралогіі і міфалогіі, гісторыі і мовазнаўству, якія ўтрымліваюць фактычны матэрыял або паглыбляюць разуменне законаў развіцця традыцыйнай культуры.

*Храналагічныя межы даследавання* ўмоўна вызначаны з пачатку XIX ст. і да пачатку XXI ст., да сучаснасці, паколькі да гэтага перыяду адносяцца важнейшыя этнаграфічныя даследаванні рэгіёна. Пры гэтым улічваецца, што народная педагогіка функцыяніруе аналагічна фальклору (калектыўнае аўтарства, вусная перадача, сінкрэтызм), таму ўстанавіць яе дакладную перыядызацыю не ўяўляецца магчымым.

Існуе неадназначнасць падыходаў у вызначэнні этнапедагагічных паняццяў, найперш, "народная педагогіка" і "этнапедагогіка". Таму на аснове вывучэння навуковых крыніц вызначаны ключавыя тэрміны, якія ўжываюцца ў даследаванні.

Больш дакладнай уяўляецца трактоўка прафесара Г.П. Арловай, якая вызначае народную педагогіку як "сукупнасць і ўзаемазалежнасць уяўленняў,

поглядаў, меркаванняў, перакананняў, ідэй, навыкаў і прыёмаў народа ў галіне выхавання, адлюстраваных у народнай творчасці” [63, с. 7].

Этнапедагогіка – галіна навуковых даследаванняў, што займаецца вывучэннем народных выхаваўчых традыцый, асаблівасцямі сацыялізацыі асобы ў традыцыйных культурах народаў свету.

Такая трактоўка дазваляе пазбегнуць полісеміі паняццяў і стасуецца з пазіцыяй, калі этнапедагогіка разумеецца як напрамак у даследаванні сацыялізацыі і адукацыі [158, с. 329]. У прыватнасці, Г.Н. Волкаў вызначае этнапедагогіку як навуку аб эмпірычным вопыце этнічных груп у выхаванні і адукацыі дзяцей, аб маральна-этычных і эстэтычных поглядах на спрадвечныя каштоўнасці сям’і, роду, племені, народнасці, нацыі [87, с.5].

Азначэнняў тэрміна “рэгіянальная этнапедагогіка” намі не выяўлена, таму ён абгрунтоўваецца з улікам папярэдніх дэфініцый.

Рэгіянальная этнапедагогіка – накірунак у этнапедагагічных навуковых даследаваннях, што вывучаюць і абагульняюць народныя выхаваўчыя традыцыі карэнных насельнікаў пэўнага рэгіёна.

Патрабуе азначэння паняцце “традыцыйная культура рэгіёна” (рэгіянальная традыцыйная культура), якое ў сваю чаргу складаецца з шэрагу асобных паняццяў, у прыватнасці: рэгіён, традыцыя, культура.

Гісторыка-этнаграфічны рэгіён – гэта рэгіён, які вылучаецца на пэўнай тэрыторыі паводле комплексу этнакультурных прыкмет: асаблівасцей этнічнай гісторыі, характару рассялення, гаспадарчых заняткаў і прылад працы, народнай архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, традыцыйнага адзення, фальклору, мясцовых гаворак і інш. [202, с. 153]. На тэрыторыі сучаснай Беларусі вылучаецца шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, сярод якіх і Усходняе Палессе, дзе існуюць больш дробныя адзінкі – Мазырскае (Петрыкаўскі, Жыткавіцкі, Брагінскі, Мазырскі, Калінкавіцкі, Хойніцкі, Лельчыцкі, Нараўлянскі і Ельскі раёны), Тураўскае і Прыпяцкае Палессе.

Паводле адміністрацыйнага падзелу савецкага часу Мазырскае Палессе ўваходзіла ў склад Мазырскай акругі з цэнтрам у Мазыры (існавала ў 1924-1930 г., 1935-1938 г.) уключала 10 раёнаў: Азарыцкі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Капаткевіцкі, Каралінскі, Лельчыцкі, Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Тураўскі; гарады Мазыр, Калінкавічы, Петрыкаў і 4 мястэчкі Жыткавічы, Капаткевічы, Нароўля, Тураў. Згодна БелСЭ, Палескай вобласць існавала з 15.1.1938 па 8.1.1954 і ўключала 17 раёнаў: Брагінскі, Васілевіцкі, Глускі, Даманавіцкі, Ельскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Камарынскі, Капаткевіцкі, Лельчыцкі, Мазырскі, Нараўлянскі, Акцябрскі, Парыцкі, Петрыкаўскі, Тураўскі, Хойніцкі. З 20.91944 Глускі, Акцябрскі, Парыцкі раёны перададзены ў Бабруйскую вобласць. Самабытнасць краю выяўлены ў такіх хрэстаматыйных творах беларускай літаратуры, як “Людзі на балоце” Івана Мележа, “Зямля пад белымі крыламі” Уладзіміра Караткевіча, “Неруш” Віктара Казько.

Традыцыя (ад лат. traditio — перадача) – спосаб перадачы этнічнага вопыту з пакалення ў пакаленне ў выглядзе звычаяў, парадкаў, правіл паводзін [169, с. 156].

Рэгіянальныя выхаваўчыя традыцыі – у вузкім сэнсе – народная мудрасць аб выхаванні, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне праз мову і фальклор, звычаі і абрады, нормы і стэрэатыпы паводзін, што захоўваюць этнічныя рэгіянальныя адметнасці; у шырокім – механізм самазахавання і рэгенерацыі народнай педагогікі.

Этнолагамі вылучаюцца некалькі тыпаў культур: *архаічная* (культура першабытных паляўнічых і збіральнікаў), *традыцыйная* (даіндустрыяльная, стабільная, сінкрэтычная (чалавек – частка прыроды і грамадства, культура не дзеліцца на асобныя сферы, у тым ліку не вылучаецца і выхаваўчая дзейнасць), непісьмовая, вопыт перадаецца праз шматлікія паўторы дзеянняў (рытуал) і тэкстаў (міфалогія, фальклор), традыцыі ўспрымаюцца як закон продкаў, асноўны занятак – земляробства або жывёлагадоўля) і *сучасная* (арыентаваная на навацыі, рацыяналізм, індывідуалізм, тэхнічныя сродкі масавай камунікацыі) [169, с. 110]. Як правіла, у грамадстве назіраецца сінтэз элементаў названых тыпаў культур, што неабходна ўлічваць у працэсе выхавання.

Народная культура ўключае *культуру духоўную* (веды, працоўныя навыкі, традыцыі і звычаі, розныя віды мастацтва і народнай творчасці, уяўленні і вераванні) і *культуру матэрыяльную* (сукупнасць матэрыяльных каштоўнасцей – прылады працы, жыллё, адзенне, ежа, транспарт, культавыя і бытавыя рэчы, прадметы мастацтва), якія існуюць у арганічным адзінстве [202].

Такім чынам, традыцыйная культура рэгіёна – сукупнасць матэрыяльнай і духоўнай культуры этнасу або яго часткі, якая сфарміравалася ў спецыфічных умовах канкрэтнага рэгіёна пры даіндустрыяльнай, сельскагаспадарчай вытворчасці, вызначаецца ўстойлівасцю і вуснай, непісьмовай перадачай з пакалення ў пакаленне, пры гэтым захоўваючы мясцовую адметнасць, што вылучае культуру дадзенага рэгіёна сярод іншых.

У межах дадзенага даследавання паняцці “традыцыйная культура” і “народная культура”, па-сутнасці, з’яўляюцца сінонімамі. Адпаведна, “традыцыйнае выхаванне” як састаўная частка традыцыйнай культуры беларусаў-палешукоў – сінонім тэрміна “народнае выхаванне”.

Тэрмін “выхаванне” (ад дзеяслова “хаваць”) разглядаецца ў шырокім сэнсе, як перадача і захаванне біялагічнага роду, духоўных і матэрыяльных рэгіянальных здабыткаў. Пры гэтым лексема “выхаванне” практычна не ўжываецца ў мясцовай гаворцы, дзе ў адносінах да дзяцей паўсямесна гавораць *“гадаваць”* у значэнні вырасціць, выкарміць; а таксама *“глядзець”*, *“глядзець дзіця”* – няньчыць, не спускаць з вачэй, кантраляваць, апекаваць. Гэта пацвярджаюць і сучасныя запісы, і матэрыялы А.К. Сержпутоўскага [173]. Рэгіянальныя слоўнікі фіксуюць: *“вуховаць”* – захаваць, не даць загінуць, зберагчы [183, с. 181]; *“годованец”*, *“годованік”*, *“годованіца”*, *“годованка”* – выхаванец, выхаванка [183, с. 209]; *“годоваць”* – выкормліваць, вырошчваць, выхоўваць [183, с. 210]; *“годоўля”* – выхаванне, догляд, кармленне [183, с. 210].

Народнае выхаванне на Мазырскім Палессі – арганізацыя гадавання, навучання, нагляду, дзе гадаванне – забеспячэнне фізічнага і духоўнага развіцця дзяцей у сям’і да паўналецця, уступлення ў шлюб; навучанне – працэс

набыцця жыццёва-практычнага вопыту і рэгіянальнага светапогляду ў сям'і, сацыяльным асяроддзі; нагляд – кантроль і ацэнка штодзённых паводзін, учынкаў і выказванняў выхаванца ў сям'і або соцыуме ў адпаведнасці з патрабаваннямі народнай маралі.

Большасць навукоўцаў слушна лічаць, што народная педагогіка не з'яўляецца апрацаванай і завершанай сістэмай, а ўяўляе сукупнасць усіх эмпірычных ведаў (аб прыродзе, грамадстве, розных відах дзейнасці і г.д.) [149, с.5]. У цэлым пагаджаючыся з гэтым меркаваннем, адзначым, што ў даследаванні народная педагогіка Мазырскага Палесся разглядаецца як закрытая самаарганізаваная сістэма ў традыцыйнай культуры рэгіёна.

Такім чынам, народная педагогіка Мазырскага Палесся – рэгіянальна адметная сістэма поглядаў на выхаванне, якая выражае спецыфіку светапогляду і ладу жыцця беларусаў-палешукоў, перадаецца ў побыце, традыцыях, народнай творчасці, міжасабовых зносінах прадстаўнікоў розных пакаленняў і рэалізуецца ў практычнай арганізацыі выхавання ва ўмовах дадзенага рэгіёна.

Канцэптуальныя (ад лат. conceptio – адзіная задума, сістэма) асновы народнай педагогікі Мазырскага Палесся – гэта яе асноўныя складаемыя: ідэал, мэта, змест, заканамернасці і прынцыпы, метады і сродкі выхавання, якія забяспечваюць цэласнасць і функцыянаванне эмпірычнай рэгіянальнай сістэмы выхавання. Выяўленне і сістэматызацыя канцэптуальных асноў народнай педагогікі Мазырскага Палесся без парушэння яе самабытных характарыстык з'яўляецца адной з задач дадзенага, тэарэтычнага даследавання.

Адметнасці традыцыйнай культуры рэгіёна, якія аказалі істотны ўплыў на працэс выхавання, прадстаўлены ў табліцы 1.1.

**Табліца 1.1 – Асаблівасці рэгіянальнай традыцыйнай культуры Мазырскага Палесся, якія аказалі ўплыў на арганізацыю выхавання**

| Рэгіянальныя адметнасці Мазырскага Палесся | Значэнне для народнай педагогікі |
|---|---|
| **Народная гаворка, мясцовы дыялект** | Мазырскія гаворкі складаюць асобную групу паўднёва-заходняга дыялекту беларускай мовы, маюць архаічныя рысы (наяўнасць дыфтонгаў і назоўнікаў клічнага склону, няпоўнае аканне, адметныя формы зваротных дзеясловаў і дзеясловаў будучага часу, “саканне” і г.д.) і з’яўляецца нашай жывой гісторыяй. Менавіта мова дазволіла вучоным (Я. Карскі, П. Шпілеўскі) вызначыць межы рассялення этнасаў і субэтнасаў у межах сучаснай Беларусі і Украіны.<br>На Мазырскім Палессі, больш чым у іншых рэгіёнах, распаўсюджаны родавыя і сямейныя мянушкі, які нярэдка замяняюць імя і прозвішча, з’яўляюцца элементам пераемнасці, культуразгоднасці выхавання.<br>Родная мова, мясцовая дыялектная гаворка – гэта інструмент ажыццяўлення разумовай, пазнаваўчай і выхаваўчай дзейнасці, арганізацыі працы і сацыяльнага жыцця, сродак этнічнай ідэнтыфікацыі, трансляцыі менталітэту і г.д.<br>Па важнасці для ажыццяўлення выхаваўчага ўздзеяння і забеспячэння жыццядзейнасці дзіцяці, якое валодае толькі мясцовым дыялектам, раўназначна аперацыйнай сістэме (не праграме) для работы камп’ютэра. Зварот нават на блізкай мове (дыялекце) не будзе ў поўнай меры зразуметы дзіцям, а змяненне фанетычнага ці інтанацыйнага гучання можа даць іншы выхаваўчы эфект. |
| **Гісторыя рэгіёна, гістарычныя звесткі** | Палессе – гісторыка-этнаграфічны і прыродна-геаграфічны рэгіён у басейне ракі Прыпяць. Упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе 1276 года. У крыніцах XVII–XVIII стст. існуюць розныя варыянты ў вызначэнні рэгіёну, стабільна называючы Палессем тэрыторыю Папрыпяцця.<br>Па тэрытарыяльнай прыкмеце вылучаюцца Пінскае, Брэсцкае, Мазырскае, Валынскае; па этнічнай – Беларускае, Польскае, Украінскае, |

| | |
|---|---|
| | Расійскае. Беларускае Палессе займае тэрыторыі Гомельскай (Усходняе Палессе) і Брэсцкай (Заходняе Палессе) абласцей.<br>Палешукі – найменне карэнных жыхароў Палесся, якое ў гістарычных крыніцах упамінаецца ў 1613 г. у адносінах да насельнікаў узбярэжжа Прыпяці. Існавалі лакальныя назвы: палешукі-багнюкі, палешукі-гэтуны, палешукі-гідуны, палешукі-зюзюны, палешукі-сакуны і інш. [202, с. 378]. Пры гэтым тэрмін “паляшук” з’яўляецца экзаэтнонімам і як саманазва мясцовымі жыхарамі ўжываецца рэдка [73]. |
| **Тыповыя рысы і антрапалагічныя адметнасці мясцовага насельніцтва** | Яшчэ ў XX ст. П.В. Баброўскі, М. Доўнар-Запольскі, Ю. Талька-Грынцэвіч фіксавалі антрапалагічныя адметнасці палешукоў ад беларусаў і ўкраінцаў, палескі варыянт усходнеславянскага антрапалагічнага тыпу вызначаецца і сучаснымі навукоўцамі (рост, форма галавы, насавы паказчык і інш.) [74]. Гэта сведчыць аб наяўнасці ўстойлівых шлюбных сувязей у межах рэгіёна, якія ўзмацнялі культурнае і лінгвістычнае адзінства паміж людзьмі, забяспечвалі пераемнасць светапогляду і падыходаў да выхавання дзяцей. |
| **Духоўная культура** | Большасць даследчыкаў лічаць, што фальклорная традыцыя Палесся практычна не спазнала неславянскіх знешніх уплываў і з’яўляецца эталонам для аднаўлення агульнаславянскага фальклорнага фонда.<br>На Мазыршчыне зафіксаваны разнастайныя дахрысціянскія калядныя абрады з Казой, Вялікдзень, валачобны абрад, прысвечаны сям’і і дзецям, У жывым бытаванні захоўваюцца абрады памінання продкаў, падзелу бабінай кашы і каравайны абрад, як найбольш істотная частка структуры Палескага вяселля. Вылучаюцца лакальныя варыяцыі народных напеваў: Тураўскі, Петрыкаўска-Мазырскі, Ніжняпрыпяцкі і інш.<br>Эстэтычны густ і майстэрства палескіх жанчын характарызуе багацце і разнастайнасць народнага адзення: Брагінскі, Калінкавіцкі, Турава–Мазырскі народныя строі.<br>Пашыраны вячоркі, попрадкі, якія адлюстроўваюць грамадскі характар выхавання. |

| | |
|---|---|
| | Дзіця ад нараджэння заглыблена ў атмасферу народнага мастацтва, у выніку выхоўваецца як носьбіт традыцый сваёй мясцовасці. |
| **Народны каляндар** | Уключаў практычна-карысныя веды агратэхнічнага, метэаралагічнага і медыцынскага характару. Дзяленне і вызначэнне часу адбывалася па сонцу, зорках, месяцу. Сонечны, сутачны час вызначаўся па паводзінах жывёл і птушак, найперш крыку пеўня. Архаічнымі спосабамі арыентацыі ў часе да нашых дзён на Палессі карыстаюцца дзеці-пастушкі – знаходжанне сонца фіксуецца па ценю чалавека або пастушынай палкі.<br>Паводле дадзеных Ч. Пяткевіча, беларусы-палешукі год дзеляць на чатыры пары (перамены): “У гаду чатыры перамены, таксама як на сьвеці чатыры бокі: вясна, лета, осень і зіма. Год складаецца з 12 месяцаў, назвы якіх паходзяць пераважна ад гадавых святаў і пастоў. Суткі маюць чатыры перамены: ранак, дзень, вечар і ноч. Перад ранкам, то шчэ е досьветак, зара, сьвет, а ўжэ як сонца ўзойдзе, то настае ранак. Зімою большую ўвагу звяртаюць на ноч, чым на дзень; дзеляць яе таксама на 4 пары: вечар, ад змяркання і больш-менш да гадзін 12; поўнач – гадзін 12–1; і глобасьць – 2 гадзіны. Першыя пеўні – ад 2 да 3 |
| | гадзін; другія пеўні – ад 3 да 5 гадзін раніцы” [164, с. 281]. Палешукам добра вядомы сузор’і Вялікая Мядзведзіца (Воз, Вазок, Карэц), сузор’е Арыёна (Касар альбо Матавіла) і Пляяды (Рэшата).<br>У паўсядзённым жыцці перавага аддавалася не сонечнаму, а месячнаму календару, які адпавядае і асноўным перыядам унутрыўтробнага развіцця дзіцяці. Палешукі вылучалі асобныя квадры, маладзік, стары, поўню, сходнія дні. На маладзіку нельга выконваць шмат дзеянняў, разам з тым на маладзіку добра: перасаджваць дрэвы і іншыя расліны, бо лепш прымуцца; стрыгчы валасы і інш. Найбольш спрыяльны час – перыяд поўні. У поўню лепш за ўсё распачынаць і працягваць заняткі, якія прадугледжваюць накапленне розных запасаў, што б усюды было поўна ўсякага |

| | |
|---|---|
| | дабра. Апошняя квадра неспрыяльная для размнажэння, сяўбы збожжа. Месячны каляндар – неад'емная частка традыцыйнай культуры рэгіёна. |
| **Прырода Мазырскага Палесся** | Пры наяўнасці рэк, азёр, балотаў развіваліся водныя шляхі зносін, адбывалася калектыўнае ўзвядзенне грэбляў, гацей. Дзяцей з ранніх год вучылі кіраваць лодкай, чаўном, карыстацца кладкамі, брадамі, асцярожна паводзіць сябе ў забалочанай мясцовасці. Гэта фарміравала сілу, спрыт, назіральнасць.<br>Прырода перашкаджала раўнамернаму рассяленню (спалучэнне вялікіх паселішчаў на берагах рэк і невялікіх вёсачак па 5–10 хат, засценкаў і хутароў-выселак) насельніцтва і паўнацэннай камунікацыі, што абумовіла ізаляцыю мясцовых жыхароў як у межах рэгіёна, так і краіны, дзяржавы [178]. Такім чынам, выхаваўчыя традыцыі Мазырскага Палесся на доўгі час з'явіліся закансерваванымі, пазбаўленымі знешняга ўплыву. |
| **Адметнасць земляробства ў рэгіёне** | Забалочанасць глебы, вясеннія разлівы рэк прыводзілі да цяжкасцей у развіцці земляробства. На адзін двор прыходзілася 10–30 дробных участкаў ворнай зямлі, раскіданых сярод балот і лясоў. Для апрацоўкі ўчасткаў зямлі палешукі сем'ямі і цэлымі вёскамі перапраўляліся з аднаго вострава на другі, ставілі куралі і паслядоўна апрацоўвалі зямлю, такім чынам і збіралі ўраджай. Гэта спрыяла калектывізму, адзінству вялікіх палескіх родаў.<br>Ворная зямля з'яўлялася сапраўднай сямейнай каштоўнасцю. У земляробстве спалучаліся трохполле, лясная аблога і лядная (падсечна-агнявая) сістэмы земляробства. Зямлю апрацоўвалі з дапамогай палескай сахі, якая прыстасавана для пары валоў, масіўная і па спосабу апрацоўкі зямлі бліжэй да плуга [161]. Такім чынам, земляробства патрабавала фізічных намаганняў, калектыўнай, мужчынскай працы, таму пажаданым было нараджэнне хлопчыкаў. |
| **Арганізацыя жывёлагадоўлі** | На Мазыршчыне абшырныя сенакосы, па прычыне чаго мясцовыя жыхары трымалі вялікую колькасць буйной рагатай жывёлы – |

| | |
|---|---|
| | тавару. Атрымалі распаўсюджанне свінагадоўля (выпас свіней у лесе або на астравах без нагляду) і развядзенне водаплаваючых птушак. Дзеці прымалі самы актыўны ўдзел у доглядзе і пасьбе жывёлы. Дзяўчаты з малых год засвойвалі сакрэты захавання і прыгатавання мясных прадуктаў, хлопчыкі – павінны ўмець забіць, асмаліць, разабраць кабана, часткай рытуалаў з'яўлялася калядное гаданне па вантробах жывёл. Развіваліся рамёствы па апрацоўцы скуры. |
| **Спецыфіка развіцця народных рамёстваў і промыслаў** | Паўсямеснае распаўсюджанне прыродаздабываючых рамёстваў і промыслаў забяспечвала выхаванне дзіцяці ў адзінстве з роднай прыродай, праз глыбокае пазнанне яе законаў. У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся школа прыроды не была штучна прыстасавана да дзіцяці, загартоўка адбывалася ў натуральных і суровых умовах. |
| **Народная кулінарыя, асаблівасці харчавання** | На Мазырскім Палессі пашырана бортніцтва, рыбалоўства, збіральніцтва. Таму ў рацыёне палешукоў мясныя і рыбныя прадукты, мёд, арэхі, ягады і грыбы прысутнічалі ў большай меры, чым у рацыёне жыхароў іншых рэгіёнаў Беларусі. Дастатковае паступленне бялковай ежы спрыяла фізічнаму развіццю дзяцей.<br>Асноўныя перыяды харчавання дзяліліся на пост і мясаед. У сутках вылучаліся: сьняданьне, 7–8 гадзін раніцы; абед, 11–12 гадзін апоўдні; полудзень, 3–4 гадзіны папалудні; вячэра, 7–8 гадзін вечара [164, с. 281]. Агульнаславянскія стравы (каша, хлеб, бліны, сыр, масла, яечня) складалі аснову паўсядзённага і святочнага стала [146]. Харчаванне дзяцей уключала кармленне грудзьмі (нават да 2–3 год) і ранняе прывучэнне да паўсядзённай ежы. |
| **Народная медыцына: лячэнне і прафілактыка захворванняў** | Лячэнне распаўсюджаных у вільготным клімаце хвароб (раўматызм, ліхаманка, каўтун), а таксама спосабы іх прафілактыкі грунтуюцца на глыбокім веданні лекавых уласцівасцей роднай прыроды, веры ў сілу слова і ўвазе да псіхалагічнага стану, што дазваляе палешукам захоўваць здароўе да глыбокай старасці. |
| **Матэрыяльная культура, жыллё, арганізацыя сям'і** | Палешукі клапаціліся аб знешнім выглядзе і даўгавечнасці жылля. Асаблівую ролю |

| | |
|---|---|
| | адыгрывалі наступныя складаемыя традыцыйнага інтэр'еру: печ, лучнік, парог і прызба. Сваё селішча – увасабленне сямейных каштоўнасцей, таму нованароджанага мэтанакіравана далучалі да роднай хаты.<br>У забудове назіраецца адсутнасць лазняў, што павышае значэнне натуральнай загартоўкі арганізма (купанне ў рэках, азёрах). Сенцы прыстасоўваліся для спання ўлетку.<br>Характэрны трохпакаленныя сем'і, таму вопыт перадаваўся не толькі ад бацькоў, але і праз пакаленне, што з'яўляецца найбольш эфектыўным. |

## 1.2 Народны выхаваўчы ідэал і менталітэт беларусаў-палешукоў

Народны выхаваўчы ідэал (фр. ideal; ад грэч. idea – ідэя, першавобраз, узор) – гэта выпрацаванае стагоддзямі ўяўленне аб дасканалым чалавеку, узор, мера народнага выхавання. Ён адказвае на пытанне: якім, адпаведна ўяўленням беларусаў-палешукоў, павінен быць сапраўдны чалавек?

Зыходзячы з агульнанародных уяўленняў, у кожнай сям'і на эмпірычным узроўні ацэньвалася, наколькі псіхічна і фізічна здаровым (удалым – няўдалым) нарадзілася дзіця, ці апраўдала ў будучым спадзяванні блізкіх. Сямейны ідэал – рэальная або ўяўная асоба, чый лёс бацькі жадаюць увасобіць у будучыні сваіх дзяцей, на каго хочуць бачыць іх падобнымі. Да карэкцыі ўяўленняў аб ідэальнай асобе свайго часу прыводзяць войны, прыродныя катастрофы, змена форм уласнасці на зямлю і інш.

Выхаваўчы ідэал народнай педагогікі Мазырскага Палесся не распрацаваны тэарэтычна, але імпліцытна прадстаўлены ў вуснай народнай творчасці, радзінна-хрысцінным і вясельным абрадах [90; 165]. Ідэал выяўляецца ў патрабаваннях да выбару спадарожніка жыцця, а рэальна дасягнуты вынік выхавання ўвасоблены ў канкрэтных асобах – маладой і маладога.

Фактычна ў народнай педагогіцы існуюць два ўзаемазалежных ідэалы – ідэал дзяўчынкі, дзяўчыны, маладзіцы, жанчыны і ідэал хлопчыка, юнака, мужчыны. У агульных рысах хлопец – дбайны і надзейны гаспадар, галава будучай сям'і, прадаўжальнік роду, абаронца Айчыны; дзяўчына (дзеўка) – паслухмяная, умелая, старанная гаспадыня, захавальніца сямейных традыцый. Лічылася, што да паўналецця, стварэння сям'і (па сведчанні даследчыкаў жаніліся ў 16–20 гадоў) маладыя людзі павінны адпавядаць ідэальным уяўленням народа: засвоіць сістэму духоўна-маральных і мастацка-эстэтычных каштоўнасцей і культуру паводзін, навучыцца правільна і прыгожа выказваць свае думкі, паважаць старэйшых, авалодаць працоўнымі ўменнямі і навыкамі адпаведна свайму полу. Асноўным пры заключэнні шлюбу было рашэнне бацькоў: *"Замуж выходзілі па дагавору между бацькамі, дзеці павінны былі саглашацца. Было вялікім грахом пайсці супраць бацькоў"* [10]. Такім чынам лічылася, што бацькі як людзі сталыя, вопытныя здольны вызначыць, ці адпавядае абраннік або абранніца ідэальным народным уяўленням.

Пры выбары пары высока цаніліся розум, здароўе, фізічная сіла, прыгажосць, адсутнасць фізічных і псіхічных недахопаў, што забяспечвала працяг роду. Для дзяўчыны знешнія дадзеныя з'яўляліся больш істотнымі, чым для юнака. У народнай культуры Мазырскага Палессяназіраецца ўслаўленне натуральнай, прыроднай, а не штучнай, набытай жаночай прыгажосці: *"От,*

*харошая дзеўка, хоць вады напіцца"*, альбо: *"харошая, проста кроў з малаком, як зорка, як сонейка яснае"* [164, с. 558]. Тонкі стан, чорныя бровы, чырвоныя шчокі – прыкметы фізічнага здароўя. Дзявочая каса – адзнака знешняй і ўнутранай прыгажосці, маральнай, фізічнай і інтэлектуальнай дасканаласці, увогуле жаночай і чалавечай сутнасці: *"Дзявочая каса – краса. Каса асцерагае дзеўку ат усялякаго ліха"* [173, с. 162]. У працэсе выхавання прыродныя дадзеныя ўзбагачаліся ўмельствам, эстэтычным густам, веданнем традыцый.

На Мазырскім Палессі маральныя якасці чалавека, (працавітасць, шчырасць, сціпласць, праўдзівасць) традыцыйна ацэньваюцца вышэй за знешнасць, па прычыне яе недаўгавечнасці, зменлівасці: *"Краса да вянца, а жыць да канца"* [18]. Перавага аддаецца ўнутранай прыгажосці, духоўным якасцям індывіда: *"Не шукай красаты, а шукай дабраты"* [197, с. 65]. Звяртаецца ўвага на даволі частую неадпаведнасць знешнасці і сутнасці: *"На ліцо – яйцо, а ў сярэдзіне – баўтун"* [197, с. 144].

Адметнасць рэгіянальнага выхаваўчага ідэалу праяўляецца ў наяўнасці калектыўнага, грамадскага паняцця – *"слава"*, што характарызуе як узровень выхаванасці індывіда (розум, характар, цнатлівасць, культуру паводзін), так і ацэньвае заслугі роду, да якога ён належыць. Дзеці, падлеткі, якіх на вёсцы ведалі па мянушках, сямейных празваннях, стараліся паводзіць сябе так, каб не зняславіць годнасць сям'і і ўласную. Маладыя людзі імкнуліся ўзяць жонку або выйсці замуж за хлопца з *"харошага, добрага роду"* – заможнага, працавітага, шануемага, паважанага людзьмі. Пры ўступленні ў шлюб нават калі хлопец або дзяўчына самі характарызаваліся станоўча, але былі з роду (кагалу, кодла – родзічы па ўсіх лініях) няўдалага, гультаяватага, сварлівага, то шанцы іх парадніцца з прыстойнай сям'ёй значна памяншаліся: *"Нехай не берэ тэе дзеўкі, бо плохе когало тэ"* [184, с. 176]. Заўважаецца ўстойлівасць звычаю да нашых дзён: *"Добрая слава даражэй за багацце"* [21]. Такім чынам, выхаваўчы ідэал абагульняе ўяўленні не толькі аб дасканалай асобе, але і ідэальных сям'і і родзе, сукупнасці ідэальных якасцей прадстаўнікоў дадзенага рэгіёна.

Менавіта малады (князь) і маладая (княгіня) на вяселлі дэманструюць дасягнуты родам, сям'ёй і індывідам узровень – мэту выхавання, пры гэтым уступленне ў шлюб – важнейшая ўмова і паказчык сацыяльнага сталення асобы. І калі "ідэал – сумарнае, сінтэтычнае ўяўленне аб мэтах народнага выхавання" [87, с. 47], то мэта народнага выхавання – шматбаковае развіццё і выхаванне дзіцяці на аснове традыцыйнай культуры рэгіёна, у выніку чаго на працягу жыцця адбываецца ўвасабленне народнага ідэалу ў рэальных асобах юнака (мужчыны) і дзяўчыны (жанчыны).

Ідэал і мэта маюць практычную скіраванасць. Народная педагогіка з дзяцінства рыхтавала чалавека да пераадолення практычна любых цяжкасцей і

выпрабаванняў, будучага самастойнага працоўнага жыцця і асноўных сацыяльных роляў: па-першае, клапатлівага сына або дачкі, які дагледзіць бацькоў у старасці; па-другое, добрага сем’яніна, мужа або жонкі, які выгадуе сваіх дзяцей, каб не перарвалася сувязь пакаленняў; па-трэцяе, сумленнага працаўніка, які забяспечвае дабрабыт сям’і, шануе маці-зямлю, ведае акружаючую прыроду; па-чацвёртае, надзейнага члена сельскага калектыву, які валодае народным мастацтвам, захоўвае спрадвечныя традыцыі, дружна жыве з суседзямі і здольны прыйсці на дапамогу.

У традыцыйнай культуры рэгіёна, у прыватнасці, у вясельным і радзінна-хрысцінным комплексах абрадаў, дзе вызначаюцца пажаданая колькасць і пол, фізічныя і маральныя якасці нашчадкаў, даволі выразна акрэслены умовы нараджэння ідэальнага, здаровага дзіцяці. Па-першае, каб дзіця нарадзілася здаровым і разумным, каб яму спрыяла ўдача, бацькі, блізкія і асабліва маці (пачынаючы ад вяселля, затым у перыяд цяжарнасці і пакуль дзіцяці не споўніцца год) павінны прытрымлівацца сістэмы рэгіянальных забарон і рытуалаў. Па-другое, пажадана, каб маладыя бацькі былі здаровымі, мелі добрую спадчыннасць і адпаведны мясцовым умовам менталітэт, каб дзіця не наследавала псіхічных або фізічных недахопаў і адмоўных рыс характару. Па-трэцяе, істотны род, сям’я, слава роду з бацькоўскага і мацярынскага боку, паколькі дзіця можа *“удацца”,* нарадзіцца падобным не толькі непасрэдна на сваіх бацькоў, але і на больш аддаленых продкаў, грахі продкаў ці адсутнасць благаславення шлюбу з таго або іншага боку будуць *“засціць сцежку”*, жыццёвы шлях дзіцяці. Па-чацвёртае, пажадана нарадзіцца ў добрую гадзіну, спрыяльны прыродны час адпаведна мясцоваму календару.

Выхаванне чалавека абумоўлена ўздзеяннем разнастайных фактараў (прычын, умоў), якія вызначаюць і ўзровень развіцця асобы, і вынікі выхаваўчай дзейнасці, і далейшы жыццёвы шлях. Паводле аналізу мясцовых уяўленняў, вылучана сукупнасць наступных фактараў: унутраныя, знешнія і ірацыянальныя.

Унутраныя фактары: спадчыннасць, прыроджаныя псіхічныя і фізічныя індывідуальныя асаблівасці і пол выхаванца, у тым ліку сацыяльная спадчыннасць: вопыт продкаў, паводзіны і маральныя задаткі, характэрныя для прадстаўнікоў пэўнага роду; асабістая актыўнасць асобы, якая праяўляецца ў практычнай, працоўнай, гульнёвай, сацыяльнай, мастацкай дзейнасці.

Знешнія фактары: прыроднае асяроддзе і месца пражывання: прыродна-геаграфічнае палажэнне рэгіёна, акружаючая прырода, клімат, характар працоўнай дзейнасці і побыту, уключанасць дзяцей і падлеткаў у вытворчыя адносіны, натуральны характар гаспадаркі, тып паселішча (хутар, засценак, сяло); сямейнае і грамадскае выхаванне (сямейныя звычаі і традыцыі, шлюбны

ўзрост, род, сям'я, тып сям'і і яе склад, колькасць дзяцей у сям'і, псіхалагічны клімат сям'і, побытавыя і гігіенічныя ўмовы пражывання, рэлігійная прыналежнасць, родныя, сваякі, хросныя; аднагодкі, аднавяскоўцы, становішча выхаванца ў полаўзроставай іерархіі, маральныя каштоўнасці, этнічныя адметнасці, характар навучання і асаблівасці перадачы рэгіянальнага жыццёва-практычнага вопыту; роля дзяцей і моладзі ў звычаях і абрадах).

Адметнасць народнай педагогікі Мазырскага Палесся вызначаюць ірацыянальныя фактары – лёс ("планіда"), доля (нядоля), шчасце ("талан") або іх адсутнасць: *"Доля добрая, та й жытка добрая"* [173, с. 283]. У значэнні доля, лёс, шчасце, удача ў рэгіёне ўжываюцца словы *"доля"*, *"планіда"* (*"пламета"*), *"талан"* (*"таланіць" – "не таланіць"*): *"такі мой талан"* [130, с. 132]), *"с такой пламетой чалавек нарадзіўся"* [186, с. 55].

Па народных уяўленнях, магчымыя варыянты развіцця падзей запраграмаваны лёсам: *"кожын чалавек ці рано, ці позно мае тое перажыць, што яму назначано"* [173, с. 64], хаця і могуць быць скарэкціраваны ў ходзе абрадаў. Таму просьба аб шчаслівай долі нованароджанага – стрыжнёвая ідэя радзіннага абраду, аб сямейным шчасці – вясельнага і г.д.

Доля і нядоля – важнейшыя катэгорыі народнай культуры, у якіх асэнсоўваецца індывідуальны лёс як частка цэлага, агульнага для роду, сям'і, соцыуму шчасця [176, с. 113]. Доля нованароджанага ўяўляецца ў выглядзе прыгожай дзяўчыны: *"Адна спляла вянок з асату да з чартапалоху да й кажэ: "Ось, такая жытка будзе таго чалавека, якого я буду доля". – Другая спляла вянок з калітак да з веццяя. А я ж, – кажэ, – доля рыбака да ахвотніка. – Трэйцяя ж самая гожая спляла сабе вянок з каласоў жыта й пшаніцы да й убрала яго рознымі кветкамі. – Я ж, – кажэ, – доля гаспадара"* [173, с. 284].

Беларусы-палешукі вераць, што выпадковасць, добрая або ліхая гадзіна, прысутнасць або адсутнасць шанцавання, спрыяльныя або неспрыяльныя падзеі сямейнага жыцця аказваюць значны ўплыў на лёс чалавека. Падобна казачнаму герою, кожны чалавек штодня знаходзіцца на раздарожжы, перад выбарам, што асабліва актуальна ў лёсавызначальныя моманты жыцця: выбар мужа або жонкі, прафесіі і інш. І нават, калі знешнія і ўнутраныя фактары спрыяюць развіццю асобы, але доля ліхая, то чалавек можа зрабіць памылковы выбар, трапіць у цяжкую сітуацыю.

У этнапедагагічных даследаваннях ірацыянальныя фактары асобна не вылучаюцца, але ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся, яны, безумоўна, улічваюцца. На ірацыянальныя фактары чалавек імкнуўся аказваць пэўны ўплыў, але і яны вызначалі якім народзіцца дзіця, ці зможа ў поўнай меры рэалізаваць свой жыццёвы патэнцыял.

Уяўленні беларусаў-палешукоў аб дасканалым чалавеку абумоўлены менталітэтам і нацыянальным характарам, адпаведна, ідэальныя якасці, якія найлепш адпавядаюць мясцовым умовам жыцця, паступова замацоўваюцца ў менталітэце. У агульных рысах менталітэт (ад познелат. mentalis – разумовы) – гэта спецыфіка разумовай, інтэлектуальнай дзейнасці; нацыянальны характар – своеасаблівая сукупнасць розных псіхалагічных рысаў і якасцей, што ўласцівы большасці прадстаўнікоў пэўнай нацыянальнай супольнасці. У шырокім сэнсе менталітэт разумеецца як спецыфіка светаўспрымання, грамадскай свядомасці, агульны разумовы інструментарый дадзенага грамадства; у вузкім – вопыт продкаў, калектыўнае неўсвядомленае, асновы нацыянальнага характару і светаўспрымання, найбольш глыбінная, малазмяняемая частка сацыяльнай інфармацыі [127, с. 147 ].

Рэгіянальныя адметнасці менталітэту жыхароў Мазырскага Палесся сфарміраваліся пад уплывам акружаючай прыроды, працоўных заняткаў і спосабу вядзення гаспадаркі, рэлігіі, сацыяльных і гістарычных умоў. Значнае ўздзеянне на менталітэт беларусаў-палешукоў аказалі наступныя фактары: прыродна-геаграфічны, генетычны, рэлігійна-канфесійны, гаспадарча-эканамічны, гісторыка-палітычны. Прыродна-геаграфічны абумовіў пэўны ландшафт і спрыяў ізаляцыі рэгіёна; генетычны – адлюстроўвае этнічную гісторыю тутэйшага насельніцтва, якое сфарміравалася ў выніку змяшэння славянскіх і балцкіх плямёнаў і вядома як летапіснае племя дрыгавічоў; гаспадарча-эканамічны ўказвае на натуральны характар гаспадаркі ў даволі суровых прыродных умовах; гісторыка-палітычны – гэта гісторыя Мазыршчыны, якая неаднаразова спустошвалася захопнікамі, уваходзіла ў склад розных дзяржаў, але тым не менш яшчэ ў XIII ст. вызначалася як самастойная геаграфічная і этнаграфічная вобласць у басейне ракі Прыпяць.

Этнапсіхолагамі вылучаюцца наступныя нацыянальна-псіхалагічныя асаблівасці: матывацыйна-фонавыя (своеасаблівасць жыццёвай матывацыі, адносін да працы, да радзімы; ступень выражанасці і спецыфікі ў спалучэнні і праяўленні працаздольнасці, дзелавітасці і асцярожнасці, патрыятызму); інтэлектуальна-пазнаваўчыя (характар арганізацыі разумовай дзейнасці, хуткасць разумовых аперацый, ступень вынаходлівасці, гнуткасці, лагічнасці, абстрактнасці мыслення; глыбіня, актыўнасць успрыняцця, яркасць уяўлення, канцэнтрацыя ўвагі); эмацыянальна-валявыя (дынаміка працякання пачуццяў, асаблівасці выказвання эмоцый; устойлівасць, працягласць валявых намаганняў); камунікацыі і паводзін (характар узаемадзеяння паміж людзьмі, ступень аб’яднання або адчужанасці, сацыяльныя адносіны) [125, с. 106–110]. Акрамя таго, логіка мыслення дэтэрмінавана структурай мовы, характар успрыняцця колераў – роднай прыродай і інш.

Як выяўлена, менталітэт часткова наследуецца ад продкаў, а часткова набываецца ў працэсе выхавання. Пры гэтым этнічная прыналежнасць фарміруецца на працягу 3-5 гадоў пасля нараджэння на аснове зносін [158, с. 330]. Дзіцяці жадаюць вырасці як дзед, як бацька, або быць як маці, бабуля, так свядома або несвядома менталітэт перадаецца дзецям і ўнукам.

Менталітэт і нацыянальны характар уласцівыя ўсяму беларускаму народу, а прадстаўнікоў пэўнага рэгіёна ці этнічнай групы могуць вылучаць асобныя ментальныя або псіхалагічныя адметнасці. Пры гэтым мясцовае, рэгіянальнае часцей за ўсё праяўляецца не ў сутнасці (большасці беларусаў уласцівы дабрыня, гасціннасць, працалюбства), а ў форме, спалучэнні, глыбіні, у матывах дзейнасці і характары валявых праяўленняў.

Пры разнастайнасці індывідуальнасцей нейкая асаблівая настойлівасць, цягавітасць, зацятасць і ўпартасць вызначае карэнных насельнікаў Палесся, што накладвае адбітак на любыя праяўленні характару і эмоцый, якія характарызуюцца не столькі знешнімі паказчыкамі, колькі глыбінёй і ўстойлівасцю. Нездарма ўхвалялася цярпенне, якое дазваляла пераадолець любыя перашкоды: *"За цярпенне дае бог спасенне"* [113, с. 231].

Паляшук, паводле народных параўнанняў, працавіты *"як мурашка"* і цягавіты *"як вол"*. Працавітасць, любоў і прывычка да працы – рысы характару, перададзеныя на генетычным узроўні і адшліфаваныя ў супрацьстаянні з прыродай, са складанасцямі грамадскага жыцця. Для беларуса-палешука працавітасць – гэта карпатлівасць, цярплівасць, спрыт, настойлівасць, акуратнасць, грунтоўнасць, дакладнасць, здольнасць даводзіць справу да канца.

Працавітасць фарміравалася ў ходзе сямейнага выхавання, ва ўмовах натуральнай гаспадаркі, занятасці земляробствам, жывёлагадоўляй і не менш працаёмкімі народнымі рамёствамі і промысламі [152]. Аб складанасцях гаспадарчай дзейнасці сведчаць назвы населеных пунктаў Мазыршчыны: Забалацце, Зялёны Мох, Падлядзічы, Каменская Рудня, Вялікія і Малыя Зімовішчы, Млынок і інш. [94]. Ідэал чалавека-працаўніка адлюстраваны ў народнай творчасці: *"Каваль Багатыр"*, *"Музыка і чэрці"*, *"Іванка-Прастачок"* [174].

Асаблівасці геаграфічна-кліматычных умоў садзейнічалі фарміраванню ў жыхароў Палесся такіх якасцей, як упартасць, цягавітасць, вынослівасць. Адсутнасць бяскрайніх прастораў, сцісласць навакольнага асяроддзя спарадзілі ў палешукоў такія якасці, як стрыманасць, нерашучасць, меланхалічнасць, кансерватызм, насцярожанасць, замкнёнасць. Больш чым у іншых беларусаў у свядомасці насельнікаў Палесся істотнае месца займаюць міфалагічна-містычныя, ірацыянальныя ўяўленні і ўсялякія забабоны, прымхі. Палешукі досыць асцярожна адносяцца да ўсяго новага. Даследчыкі адзначаюць

прыкметную “спавернутасць” менталітэту нашых продкаў да мінулага, былых нормаў жыцця і традыцый [99, 80].

У характары палешукоў прысутнічае кансерватызм, імкненне прытрымлівацца заведзенага спрадвеку парадку, асцярожныя адносіны да новага, невядомага. І.А. Сербаў адзначае адасобленасць кожнага населенага пункта і нежаданне палешукоў падпарадкоўвацца знешняму ўплыву [172]. Гаворку і адзенне нетутэйшага чалавека мясцовыя жыхары пастаянна высмейваюць, падкрэсліваюць крыўднымі мянушкамі, пакуль адрозненні не зраўнуюцца. Кансерватызм гарантаваў пераемнасць выхаваўчых падыходаў як у межах канкрэтнага пакалення, так і на працягу гістарычнага шляху этнасу.

Людзі сталага веку імкнуцца ўсё даводзіць *“да ладу”*, захоўваць строгую паслядоўнасць у гаспадарчым, сацыяльным і сямейным жыцці, а ў выхаванні – павучаць, настаўляць. У народных гаворках існуюць выразы *“парадкаваць”, “ладаваць”*, *“даводзіць да ладу”*, што характарызуюць і правілы этыкету, і патрабаванні народнай педагогікі: *“давесці дзяцей да ладу”* – значыць выхаваць, паставіць на ногі, навучыць рамяству, жаніць. Гэта ідэя закладзена ў дзіцячым фальклоры: забаўлянках, кумулятыўных песнях і казках [15].

Лад, парадак забяспечваўся традыцыйнай сістэмай рэгламентацый і забарон, якія дапамагалі ўпарадкаваць сусвет і чалавечае жыццё: кантраляваць свае дзеянні, прадбачыць магчымыя вынікі выхавання, праграмаваць будучыню дзяцей (калі.., то...). Парушэнне парадку (работа ў дні рэлігійных святаў, незахаванне чарговасці выхаду замуж паміж сёстрамі) здольна спарадзіць непажаданыя змены ў лёсе чалавека або сям’і, выклікаць прыродныя катаклізмы (буру, град), хваробы і эпідэміі. З менталітэту вынікае важнейшы пастулат народнай педагогікі: калі дзеці не будуць слухацца і паважаць бацькоў, выконваць правілы паводзін, то парушыцца спрадвечны лад жыцця. Адсюль строгасць, патрабавальнасць да дзяцей і асабліва падлеткаў, якія наўмысна або ненаўмысна могуць нанесці шкоду сабе і сваёй сям’і.

Ідэя парадку, строгай паслядоўнасці закладзена ў мясцовым дзіцячым фальклоры: “– Ласачка-ласачка, дзе ты була? / – У бога була. / – Што рабіла? / – Кросёнца ткала. / – Што заткала? / – Кусочок сала. / – Дзе тэе сало? / – Кошачка ўкрала. / – Дзе тая кошачка? / – Падпеч палезла. / – А дзе той падпеч? / – Агонь спаліў. / – А дзе той агонь? / – Вада заліла. / – А дзе тая вада? / – Вол папіў. / – А дзе той вол? / – На мора пайшоў. / – А дзе тое мора? / – Краскамі зарасло. / – А дзе тые краскі? / –Дзяўкі парвалі. / – А дзе тые дзяўкі? / – Панічы пабралі. / – А дзе тые панічы? / – На войну пашлі. / – А дзе тая вайна? / – Няма” [47].

Імкненне кантраляваць сацыяльнае жыццё, дамовіцца з сіламі іншасвету (дамавы, русалкі), вытлумачыць незразумелыя з’явы прыроды (навальніца,

засуха) сфарміравала такую адметнасць светапогляду як вера ў ірацыянальнае, міфалагічнае і нават містычнае. Блізкія і далёкія суседзі лічылі палешукоў чарадзеямі, што адзначаў яшчэ Герадот у 513 годзе да н. э., характарызуючы неўраў, насельнікаў басейна р. Прыпяці [136, с. 7]. Пазней да язычніцкіх уяўленняў дапасаваліся хрысціянскія, пры гэтым апытанне сведчыць, што і ў наш час прымхі і забабоны займаюць у свядомасці беларусаў-палешукоў больш істотнае месца, чым у жыхароў іншых рэгіёнаў, асабліва пры цяжарнасці і доглядзе дзяцей да года.

Некаторая замкнёнасць, недаверлівасць вылучае карэнных насельнікаў Палесся сярод суседзяў. Адасобленасць краю абмяжоўвала міжасабовыя зносіны і кантакты. Палешукі, у большасці людзі гаваркія, кемлівыя, разважлівыя, пры сустрэчы з незнаёмымі актыўна цікавяцца навінамі, але не вельмі любяць гаварыць пра сябе, дэманстраваць турботы і эмацыянальныя перажыванні: *“Як на душы, нікому не кажы”* [113, с. 248]. Гістарычныя падзеі савецкага перыяду (калектывізацыя, рэпрэсіі, нямецкая акупацыя) садзейнічалі ўзмацненню гэтых якасцей. З дзяцінства фарміруецца стрыманасць у гаворцы, асцярожнасць у выбары знаёмстваў: *“Язык – наш ворог”* [113, с. 248].

Сціпласць, сарамлівасць, эмацыянальная стрыманасць – адметныя якасці дарослых і асабліва дзяцей, што заўважана даследчыкамі і настаўнікамі, якія прыязджалі працаваць у гэтыя мясціны. Патрабаванні да дзяцей на Мазырскім Палессі вызначаліся строгасцю, асабліва пры незнаёмых, каб не падумалі, што дзеці дрэнна выхаваныя, што бацькі ім патураюць. У прысутнасці чужых людзей дзецям забаранялася перашкаджаць дарослым (*“лезці ў вочы”*, *“блутацца пад рукамі”*), таму яны звычайна знаходзіліся на печы, за печчу або на вуліцы: *“Госці ў хату – дзеці на печ”* [23]. У выніку дапытлівасць і адкрытасць, уласцівыя дзецям, спалучаліся са сціпласцю і сарамлівасцю, недаверлівасцю і насцярожанасцю да малазнаёмых.

Цярпімасць, імкненне жыць у згодзе з роднымі і суседзямі – характэрная рыса народнага светапогляду: *“Адна рука ў далоні не плешча”* [69, с. 172], *“К суседзям — не мучыцы, то попелцу”* [69, с. 168]. Ворныя землі на Мазыршчыне былі раскіданы паміж балот і лясоў, што патрабавала пры іх апрацоўцы калектыўных намаганняў. Калі спадала вада ў рэках, палешукі перасяляліся на астравы, працавалі на сенажацях, рыбачылі, нарыхтоўвалі лясныя дары. Ізаляванае жыццё спрыяла адзінству сем’яў і родаў, аб’яднанню людзей: *“Гуртам і ў бядзе лягчэй”* [69, с. 168], *“Дзе дружна, там і хлебна”* [69, с. 168].

У цэлым для жыхароў рэгіёна характэрны камунікабельнасць, даверлівыя адносіны да акружаючых. Даследчыкі звярталі ўвагу на той факт, што палешукі не замыкалі хат, без нагляду пакідалі ў полі на ноч земляробчыя

прылады. Яшчэ ў сярэдзіне XX стагоддзя, калі гаспадары знаходзіліся ў агародзе або нават ішлі ў лес, то дзверы закладалі толькі “на клямку”: *“Дзьверы ноччу астаўлялі адкрытые, на кручок не закрываліся; удзень палачкаю налажвалі, што нема дома”* [47]. У гэтым не толькі адзнака беднасці (маўляў, няма чаго красці), але і асаблівасць народнай маралі, яе абшчынна-таварысцкая арыентацыя, вера ў справядлівасць і праўдзівасць чалавечых узаемаадносін. І.А. Сербаў пісаў: *“сакуны честный и добросовестный народ. Если да слово или поклялся, то не изменит обещанию. Нет супружеской неверности, пьянства, воровства”* [172, с. 47].

Палешукі вядомы гасціннасцю, добразычлівасцю, нават самаахвярнасцю ў адносінах да сяброў: *“Для друга – і валы з плуга”* [36]. Як правіла госцю прапаноўвалася лепшае: *“Людзі ў хаце – Бог у хаце”* [22]. У час абеду жанчыны звычайна не садзіліся за стол, таму што імкнуліся лепш пачаставаць гасцей [114, с. 41]. А. Кіркор апісвае багатыя мазырскія кірмашы (6 студзеня і 6 жніўня), якія праходзяць ажыўлена, з удзелам усіх слаёў насельніцтва, што жывуць даволі ізалявана, але маюць патрэбу ў зносінах [101, с. 345].

Калектывізм, дружба, узаемадапамога – асаблівасць менталітэту, характэрная для жыхароў поўдня Беларусі, якая падтрымлівалася старажытнымі народнымі звычаямі – сябрына, бонда, талака. Сябрамі лічыліся бортнікі, у якіх пчаліныя раі пераляталі ад аднаго да другога. Палешукі вераць, што пчолы вядуцца толькі ў сумленных людзей, таму перш чым даглядаць пчол, трэба памірыцца з суседам, ачысціць думкі. Бонда – звычай дзяліцца з суседзямі здабыткамі сваёй працы – мясам, рыбай, мёдам, садавінай, гароднінай, што паляпшала ўзаемаадносіны і забяспечвала будучы прыбытак. Талака – сумесныя работы па рыццю студняў, узвядзенню грэбляў і лазняў. Сябрына ўстанаўлівалася, калі на вяселлі маладым дарылі коней, кароў, авечак і ад іх быў прыплод: *“У нас на вяселлі маладым даруюць паўкаровы ці якога-небудзь жыўёла, паўкалоды пчол або што другое, каб быць сябрамі, бо чым больш сяброў, тым лягчэй жыць на свеце і ў радасці, і ў горы”* [173, с. 144].

Прыродныя і сацыяльныя ўмовы комплексна ўздзейнічаюць на фарміраванне асобы. Знаходжанне сам-насам з першазданнай прыродай, дзе чаргуюцца ўзвышшы і нізіны, узбярэжжы рэк і балоцістыя мясціны, дзе ў лясах водзяцца драпежнікі (воўк, мядзведзь, балотная рысь), садзейнічала развіццю назіральнасці, навыкаў арыентацыі ў прасторы, самастойнасці паводзін: *“Недахоп назіральнасці ў сярэдняга мужчыны можна сустрэць даволі рэдка, а ў паляўнічага ці ў пастуха – ніколі”* [164, с. 528].

Насельнікі лясных вёсак і хутароў складалі з пушчай адно непадзельнае цэлае ў духоўным і матэрыяльным плане: лес ратаваў мясцовых жыхароў ад

шматлікіх захопнікаў, з дрэва будавалася іх жыллё, выраблялiся посуд, абутак, элементы адзення, на абедзенным стале пастаянна прысутнічалі дары лесу. Адпаведна ў характары палешукоў прысутнічаюць знешняя пасіўнасць і ўнутраная сіла, стойкасць, прывязанасць да таго месца, дзе нарадзіліся.

Беларусы-палешукі захоўваюць "дзіцячы", непасрэдны погляд на свет. Даследчыкі адзначаюць іх добрую памяць і творчыя здольнасці, багатую фантазію [101, с. 317]. Інтуіцыя праяўляецца ва ўвазе да дэталяў, душэўных перажыванняў, сімпатыі і антыпатыі з першага знаёмства, прадчуванні гора ці, наадварот, шчасця – *"душа чуе"*, *"душа баліць"* [164, с. 535].

Этнапсіхолагі адзначаюць, што менавіта эмацыянальная блізасць паміж чалавекам і маляўнічай, але някідкай палескай прыродай спрыяла развіццю засяроджанасці на ўнутраных перажываннях, выпрацавала мяккасардэчнасць, гуманнасць, міласэрнасць [99]. І менавіта палеская прырода садзейнічала асабістаму і калектыўнаму мастацка-эстэтычнаму развіццю – песеннай, паэтычнай творчасці, у якой сканцэнтраваны ідэі народнай педагогікі.

Палешукоў адрознівае любоў да народнага мастацтва і асабліва народнай песні. У песнях перадаюцца глыбокія асабістыя пачуцці, прысутнічае адчуванне каштоўнасці чалавечага жыцця. На Мазырскім Палессі спрадвеку папулярны не толькі тужлівыя працоўныя песні аб цяжкай жаночай долі, але і жартоўныя творы, што характарызуюць мудрасць і аптымізм народа [77].

Схільнасць мясцовых жыхароў да іроніі і самаіроніі характарызуюць народныя жарты і анекдоты: *"Манька, калінка, а ці мыешся ты? /Мыюся, мыюся. /А дзе? У рэчцы, каласок. /А зімой жа? /Дак колькі тае зімы!.."* [57, с. 225]. Адметнасцю народнага выхавання з'яўляецца фарміраванне ўяўленняў аб ідэальнай асобе ад супрацьлеглага, з дапамогай камічнага, метадам асуджэння і высмейвання. Мясцовы гумар мяжуе з сарказмам: *"особенно высмеивают хвастунов, неумелых и ленивых, нерях"* [172, с. 39]. Народны антыідэал выражаны ў калядных песнях і розыгрышах. Славу беларускага Габрава маюць палескія вёскі Вялікія і Малыя Аўцюкі ў Калінкавіцкім раёне.

Вызначальная роля ў выхаванні дзяцей адпаведна народнаму ідэалу належыць сям'і. У дзецях увасабляюцца рысы і бацькоў, і народа ў цэлым: *"Які цесля – такі клін, які бацька – такі сын"* [113, с. 247]. У агульных рысах сапраўдны паляшук і сёння свядома або несвядома з'яўляецца носьбітам наступных рыс і якасцей: сціплы, эмацыянальна стрыманы ў выказванні асабістых перажыванняў і чулы, *"жаласлівы"* да чужой бяды; сумленны, справядлівы і прынцыповы, але асцярожны, умее трымаць язык за зубамі, не адразу адкрывае душу чужому чалавеку; камунікабельны, але не любіць пустой балбатні; разумны і кемлівы, але не дэманструе гэта адкрыта, часцей *"сабе на ўме"* і выглядае прастачком; крытычна адносіцца да ўсяго новага, шануе славу

свайго роду і імкнецца хоць у нечым жыць як жылі дзяды і прадзеды; калі і не ўжывае, то добра ведае сваю гаворку і мясцовыя мянушкі, па якіх беспамылкова адрознівае сваіх ад чужых; любіць сваё селішча, акружаючую прыроду і жыве ў родных мясцінах нават пасля Чарнобыля; цярплівы і настойлівы, працуе самааддана ў любой сферы, але цэніць працу найперш сялянскую, фізічную; на генетычным узроўні любіць зямлю і пакутуе ад адсутнасці кантакту з прыродай; ведае цану здароўю, але па прычыне апантанасці працай не беражэ сябе, не вельмі давярае дактарам і крытычна ставіцца да фізкультуры, лечыцца пераважна па сямейных рэцэптах або ў бабкі-шаптухі; даволі рэлігійны, баіцца граху, але пры гэтым верыць у сны і наканаванасць лёсу, рыхтуецца да смерці і трымае дома вузельчык на смерць ці нават труну на гарышчы; любіць жыццё і лічыць самагубства вялікім грахом, клапоціцца найперш пра блізкіх, сее жыта, хоць збіраецца паміраць; ашчадны, цэніць дастатак, імкнецца назапасіць на чорны дзень, каб не ісці ў позычкі; не давярае зробленаму чужымі рукамі і, пераўжыўшы не адну галадоўку, мае схільнасць рабіць харчовыя запасы; любіць і разумее малых дзяцей і надзвычай прымхлівы ў адносінах да іх здароўя; рэдка гаворыць аб любві да блізкіх, але здольны аддаць за іх жыццё. Спалучэнне дадзеных ментальных уласцівасцей дазваляе мясцовым жыхарам не толькі выжыць, але стварыць сям’ю і эфектыўна працаваць ва ўмовах дадзенага рэгіёна, на роднай зямлі.

Асноўныя нацыянальна-псіхалагічныя асаблівасці і рысы характару беларусаў-палешукоў, якія аказалі ўплыў на працэс выхавання, прадстаўлены ў табліцы 1. 2.

**Табліца 1.2 – Нацыянальна-псіхалагічныя асаблівасці беларусаў-палешукоў і іх уздзеянне на працэс выхавання**

*“Дакапацца да глыбіні душы палешука, да яго псіхічных перажыванняў неймаверна цяжка. Нягледзячы на тое, што па сваёй натуры паляшук гаварлівы, парою амаль як дзіця, аднак перад староннімі адкрываецца неахвотна альбо пагружаецца ва ўпартае маўчанне, якое нялёгка пераламаць”.*
Часлаў Пяткевіч

<table>
<tr><th colspan="10">Фактары, якія аказалі ўплыў на менталітэт беларусаў-палешукоў</th></tr>
<tr><td colspan="2">прыродна-геаграфічны</td><td colspan="2">генетычны</td><td colspan="2">рэлігійна-канфесійны</td><td colspan="2">гаспадарча-эканамічны</td><td colspan="2">гісторыка-палітычны</td></tr>
<tr><td colspan="10">Нацыянальна-псіхалагічныя асаблівасці і рысы характару</td></tr>
<tr><td colspan="10">1. жыццёва–матывацыйныя асаблівасці: жыццёвая матывацыя, адносін да працы, да радзімы; ступень выражанасці і спецыфікі ў спалучэнні і праяўленні працаздольнасці, дзелавітасці і асцярожнасці, патрыятызму</td></tr>
<tr><td colspan="3">Працавітасць, карпатлівасць, любоў і прывычка да працы, ашчаднасць, гаспадарлівасць</td><td colspan="7">Паляшук ад нараджэння цягавіты “як вол” і працавіты “як мурашка”, непераборлівы ў ежы, непатрабавальны да ўмоў жыцця. Дзяцей змалку, мэтанакіравана і настойліва прывучаюць да працы. Адносіны да працы вызначаюць каштоўнасць асобы: “Працавіты працавітаму не роўны: адзін такі старатлівы, што працуе, працуе, томіцца, да няма ніякага спору ў яго рабоці, а другі, здаецца, мала робіць бэз ніякае вытугі, да глядзіш і толькі дзівуешся, адкуль у яго той спор бярэцца. Шчасьлівы той хадзяін, у каторага кожны сем’янін мае такую вартасьць. Як жа ў сям’і ўсе працавітыя-няспорнікі, нацца ўсе робяць, а спору няма ў рабоці, то найбольшае няшчасьцьце. Ось хто шчасьлівы ў нашом сяле: Есіп Карнееў, бо мае жонку працавітую, як мурашачка, сам працавіты, як вол, дак можна спадзявацца, што і дзеці, калі падрастуць, то будуць працавіты і будзе спор у працы. А брат яго Дзямід?! Добра кажуць, што няма роду без вырадка: сам ануча, жонка труцень” [164, с.560].<br>“Сакуны поразительно трудолюбивы и выносливы. Кажется, им нет ни дня, ни ночи. Около третьих «пеўнеў» они уже на ногах и остаются на работе до позднего вечера, то в поле с волом, то на поплаве с</td></tr>
</table>

| | |
|---|---|
| | косой, то в лесу с топором. Женщины в трудолюбии не уступают мужчинам. Если нет работы дома или в поле, они с лукошками за плечами шарят по зарослям, собирают грибы или ягоды” [172 с.38]. |
| **Кансерватызм, асцярожныя адносіны да ўсяго новага, невядомага** | І.А. Сербаў пісаў: “всё свое родное хорошо и красиво, а все чужое худо и безобразно – представляет характерную черту полешука. Он скорее позаимствует для себя что-нибудь новое у далеких чужих, нежели у близких своих. Таким образом, люди веками живут бок-о-бок друг с другом и все-таки не сливаются в одну общую массу, все еще делятся на мелкие общины с резко выраженным самобытным житейским укладом” [172 с. 15-16]. Кансерватызм блакіраваў новаўвядзенні, гарантаваў пераемнасць выхавання як у межах канкрэтнага пакалення, так і на працягу гістарычнага шляху этнічнай супольнасці. |
| **Імкненне да ладу, спрадвечнага парадку, строгасць, патрабавальнасць, суровасць у адносінах паміж членамі сям’і** | Палешукам уласцівы дакладнасць і пунктуальнасць, захаванне строгай паслядоўнасці ў побыце, сямейным і сацыяльным жыцці, утрыманне жылля і гаспадаркі ў пэўным парадку: чаргаванне працы і адпачынку, іерархія ўзаемаадносін паміж старэйшымі і малодшымі ў сям’і, выкананне мужчынскіх і жаночых работ і інш. Адпаведна калі дзеці не будуць слухацца і паважаць бацькоў, выконваць іх патрабаванні, то парушыцца спрадвечны лад жыцця.<br>У выхаванні гэта праяўляецца ў імкненні павучаць, настаўляць, кантраляваць, строга і патрабавальна ставіцца да дзяцей і асабліва падлеткаў, якія па няведанню або іншых прычынах могуць нанесці шкоду сабе і сваёй сям’і.<br>Для сямейнага выхавання характэрны сапраўдная або паказная строгасць, патрабавальнасць, імкненне не дапускаць празмернага пеставання дзяцей, якім забаранялася перашкаджаць дарослым: “лезці ў вочы”, “блутацца пад рукамі”. Адпаведна мясцовым звычаям, пяшчоту да дзіцяці магла публічна выказваць толькі маці і то гадоў да шасці, не больш.<br>Падобныя адносіны ў сям’і адабраліся і заахвочваліся грамадскай думкай, таму сапраўдныя пачуцці да блізкіх |

| | |
|---|---|
| | нярэдка прыхаваны за знешняй грубасцю і насмешкамі: “Таму малады хлопец, які нядаўна быў звязаны з нарачонаю як роўны з роўнаю і нават праяўляў у нейкай меры сваё рыцарства, стаўшы яе мужам, робіцца грубым. Расказваюць, што адзін маладажон, застаўшыся як малодшы сын на бацькаўшчыне, адкроіўшы падчас абеду дзве танюсенькія лустачкі хлеба, падае іх бацькам са словамі: – Мама альбо тата, барждэжэй бяры, бо зломіцца! А затым, адваліўшы тоўстую скібу, кінуў яе жонцы, буркнуўшы: – На, удавіся! Таўшчыня лусты пераконвае, што сын больш дбае пра жонку, чым пра бацькоў, але звычай вымушае замаскаваць добры намер варварскім выкрыкам” [164, с. 528]. |
| **Пачуццё мясцовага патрыятызму, адданасць роду, сям’і, асабістая сціпласць, адносіны да жыцця і смерці** | У характары беларусаў-палешукоў у высокай ступені праяўляецца прывязанасць да свайго селішча, роднай хаты, таго месца, дзе чалавек нарадзіўся. Патрыятызм мясцовых жыхароў вызначаецца лакальным, абмежаваным, сямейна-родавым характарам, чаму спрыяла ізаляванае жыццё, неабходнасць ва ўзаемадапамозе. Адданасць роднаму дому, продкам, бацькоўскай зямлі, спалучанасць чалавека з роднай зямлёй і акружаючай прыродай мэтанакіравана фарміравалася з першых хвілін з’яўлення дзіцяці на свет як рацыянальнымі, так і ірацыянальнымі метадамі і сродкамі.<br>“Сакуны умный и пытливый народ. Спокойствие п добродушие их поразительно. При встрече сакуны с мягкою улыбкою говорят «добрыдень». а «жанчыны» молча кланяются.<br>“Сабраўшыс у празьник пыд вечар на прызьбя пагукать миж сабой”, мужчины и женщины разрешают все текущие дела, с эпическим спокойствием относясь к самым необычайным событиям или явлениям природы, приговаривая: “на сьветя – як на рэшатя”, т.-е. все в мире преходяще” [172, с. 39]. |
| ***2. эмацыянальны-валявыя асаблівасці*****:** дынаміка працякання пачуццяў, адметнасць выказвання эмоцый; устойлівасць, працягласць валявых намаганняў | |
| **Цярпенне,** | Пры разнастайнасці індывідуальнасцей нейкая |

| | |
|---|---|
| **цягавітасць, настойлівасць у дасягненні мэты** | асаблівая цярплівасць, настойлівасць, цягавітасць, зацятасць і ўпартасць вызначае карэнных насельнікаў Палесся. Сіла волі і вытрымка праяўляюцца ў практычна ў любой дзейнасці: у працы, у вучобе, у пераадоленні жыццёвых перашкод.<br>Настойлівасць мяжуе з упартасцю, у залежнасці ад тэмпераменту спалучаючыся з задуменнай меланхалічнасцю або флегматычнай марудлівасцю. Ч. Пяткевіч так апісвае мясцовага жыхара Піліпа Кулідку: “Бывала, што толькі задумае, тое і зробіць, чы то ў дварэ, на полі, на ярмалку, чы дзе хоч дзесяць разоў робіць, а як трэба, то дзесяць разоў бурае, дай зноў робіць, покуль не стане па яго волі. Як толькі што не ўдасца, то ён сам да сябе гаворыць: “Ах ты, нячыстая сіла, думаеш, што я табе падамся? Брэшаш! Ты ўпярод здохнеш, а такі будзе па-маёму” [164, с. 533]. |
| **Эмацыянальная стрыманасць, мяккасардэчнасць, развітыя інтуіцыя і ўяўленне, творчыя здольнасці** | Для беларусаў-палешукоў характэрны эмацыянальная стрыманасць у выказванні асабістых перажыванняў і чуласць, “жаласлівасць” да чужой бяды, эмпатыя, павышаная эмацыянальнасць. Гэта сведчыць аб перавазе інтравертнасці, псіхалагічнага пачатку ў выхаванні.<br>Мясцовых жыхароў вызначае любоў да народнай песні, чуллівасць да музыкі, асабліва ігры на скрыпцы. Менавіта ў народных песнях і танцах паляшук без залішняй сарамлівасці перадае глыбокія асабістыя перажыванні: “Дзявочыя імёны, напр., Ганна, Параска, Аксіньня ці іншыя, здаўна даюць існуючым песням пад іншымі назвамі, паколькі яны падабаліся дзяўчатам з гэтымі імёнамі ў дадзенай вёсцы. Парою і мужчына выбірае сабе мелодыю з рэпертуару “музыкі”, завучы яе сваім танцам (мой танец), тады назва: Іванаў танец, Нічыпараў танец – усталёўваецца ў вёсцы на доўгія гады. Таму на ігрышчах часта можна пачуць: – Дзядзечка-музыка, – просіць дзяўчына, – заграй Ганну, Параску і г.д.; альбо голас маладога хлопца ці нават саліднага, у веку, гаспадара: – Заграй маго танца, заграй Іванаваго танца і г.д.” [164, с. 526]. |
| **Адмоўныя рысы** | Пазайздросціць, на думку палешука, тое самае, што |

| | |
|---|---|
| **характару: зайздрасць, гняўлівасць, злосць** | зачараваць. Адсутнасць шанцавання, хвароба лічацца вынікам людской зайздрасці. Таму дзяцей да года неахвотна паказваюць чужым. "Зайздроснае вока" – адна з распаўсюджаных у дзіцячым асяроддзі дражнілак, абзывалак.<br>Беларусы-палешукі лічаць, што кожны мае злосць, але выяўляе яе па-рознаму. Адрозніваюць чалавека запальчывага і таго, якому трэба добра дасадзіць, закрануць за жывое, каб выклікаць гнеў. Пераважае першы тып, апошні ж лічыцца больш небяспечным, помслівым. У большасці мясцовыя жыхары крыўду трымаюць у сабе і перажываюць глыбока, пры гэтым не злапамятныя. Пры канфліктах з дзецьмі непасрэдна выказваюць незадаволенасць, але хутка супакойваюцца, абыходзячыся пагрозамі. "Нежанаты жонку б'е, а бяздзетны – дзяцей" – заўважана народам. |
| ***3. інтэлектуальна-пазнаваўчыя асаблівасці*: характар арганізацыі разумовай дзейнасці, хуткасць разумовых аперацый, ступень вынаходлівасці, гнуткасці, лагічнасці, абстрактнасці мыслення; глыбіня, актыўнасць успрыняцця, яркасць уяўлення, канцэнтрацыя ўвагі** | |
| **Добрая памяць, назіральнасць, самастойнасць, прыродны, практычна-скіраваны розум, схільнасць да іроніі і самаіроніі** | Як правіла, паляшук, які з дзяцінства прывык знаходзіцца сам-насам з першазданнай суровай прыродай, добра арыентуецца ў прасторы, праяўляе назіральнасць, адказнасць і самастойнасць паводзін. Спрактыкаваны, разумны і кемлівы, ён не дэманструе свае веды адкрыта, часцей "сабе на ўме" і выглядае прастачком.<br>У большасці мясцовыя жыхары маюць добрую памяць, прыродны, практычна-скіраваны розум, схільны рабіць абагульненні, якія заснаваны на багатым жыццёвым вопыце. Характарызуючы беларусаў-палешукоў, даследчыкі адзначаюць: "А между тем в этом народе испокон века таилось много творческих сил, воображение было живое, ум от природы сосредоточенный, склонный к гипотезам, к неестественным предположениям, к своеобразным истолкованиям" [101, с. 317].<br>Палешукі віртуозна ўжываюць прыказкі і прымаўкі, з дапамогай якіх трапна высмейваюць асабістыя і чужыя |

| | |
|---|---|
| | недахопы, найперш ляноту. “Сем лет прала, сем лет ткала, тры дні шыла, а да абеду знасіла” [164, с. 548]. Асаблівасцю народнага выхавання з’яўляецца фарміраванне ўяўленняў аб ідэальнай асобе ад супрацьлеглага, з дапамогай камічнага, метадам асуджэння і высмейвання. |
| **Рэлігійнасць, вера ў ірацыянальнае, міфалагічнае** | Мясцовых жыхароў вылучае шчырая, нефармальная веру ў Бога, якая выступае ў якасці голасу ўласнага сумлення, маральнага абавязку перад вышэйшымі сіламі, людзьмі і самім сабой. Гэта аказвае ўплыў на фарміраванне светапогляду дзіцяці і выбар метадаў выхавання. Далёка не кожнага палешука можна назваць рэлігійным: “– Як ета — гаворыць жонка мужу — сягоня такое вялікае сьвята, а ты выбіраешся з сваею пукаўкаю (стрэльба) у лес? /– А што ж я буду рабіць?/– Як што? А ў цэркву, то ж усе людзі ідуць. /– Няхай ідуць: ім весела ў цэркві, а мне ў лесі, слухаючы, як дразды шчабечуць, салавейкі пяюць або як кулічкі заводзяць: “Ото людзі! Ото людзі!” / – Бэзбожнік ты! Табе нацца сьвяцей птушыны віск, чымся набожныя песьні, чымся Божае слово, што бацюшка чытае? Ось ужэ і звоняць! / – Няхай сабе балабаняць, а для мяне справядлівы звон – як сабака зайца гоніць; набожная песьня – калі салавейка пее, а сьвятое слова – кулічкова гутарка. /– Брашы, брашы! На том сьвеці надзенуць пішчык на твой паганы язык. /– Брахня там, дзе звоняць, выюць да мармычуць, а ў лесі – Божая праўда. [164, с. 534-535]. Жанчыны больш рэлігійныя чым мужчыны, але пры гэтым шчыра верац у сны, варажбу, наведваюць бабак-шаптух. У цэлым прыкметы і павер’і займаюць у свядомасці беларусаў-палешукоў больш істотнае месца, чым у светапоглядзе жыхароў іншых рэгіёнаў. І сёння справядлівая заўвага І.А.Сербава “До какой степени крепко сакуны верят еще в разные заклятия и чародейства, видно из того, как чародеи и шептуны хранят в строжайшей тайне свои заговоры и заклинания” [172, с.47]. |
| **Сумленнасць, справядлівасць,** | Палешукоў вызначае асаблівая прынцыповасць і патрабавальнасць да свайго маральнага аблічча, сіла і |

| | |
|---|---|
| **прынцыповасць, праўдзівасць** | глыбіня маральных пачуццяў – моцных эмацыянальных перажыванняў, што ўзнікаюць у чалавека ў сувязі з адпаведнасцю або неадпаведнасцю яго паводзін агульнапрынятым патрабаванням. Для народнага выхавання характэрна арыентацыя не на знешнюю, паказную маральнасць, а на унутраную, глыбокую духоўнасць – голас сумлення, павышаную маральную адказнасць, веру ў справядлівасць. Няпраўда, крыўда маральнага характару супрацьпастаўляецца праўдзе і лічыцца грахом. Мана, падман на бытавым ўзроўні – з’ява даволі распаўсюджаная і мае назву брахня ці хлусьня [164]. |
| ***4. асаблівасці камунікацыі і паводзін***: характар узаемадзеяння паміж людзьмі, ступень аб’яднання або адчужанасці, сацыяльныя адносіны | |
| **Гасціннасць, таварыскасць** | Палешукі вядомы самаахвярнасцю ў адносінах да сяброў: “Для друга – і валы з плуга”. Вылучаюцца здольнасцю падзяліцца не лішкамі чаго-небудзь, а апошнім рублём ці кавалкам хлеба. Госцю прапаноўваецца лепшае, выконваюцца ўсе яго жаданні. У час абеду жанчыны звычайна не садзяцца за стол, таму што імкнуцца лепш пачаставаць гасцей. Дзеці не знаходзяцца ў хаце, каб не перашкаджаць. Такія адносіны да госця з’яўляюцца не прыніжэннем, а агульнапрынятай формай ветлівасці. |
| **Калектывізм, камунікабельнасць, узаемадапамога, даверлівыя адносіны да акружаючых, цярпімасць, імкненне жыць у згодзе з роднымі і суседзямі** | Для жыхароў поўдня Беларусі характэрны калектыўная праца, узаемавыручка ў вядзенні гаспадаркі. якія падтрымліваліся старажытнымі народнымі звычаямі – сябрына, бонда, талака.<br>Мясцовыя жыхары не замыкалі хат, нават калі працавалі далёка ад дому, без нагляду пакідалі ў полі на ноч земляробчыя прылады. У гэтым не толькі адзнака беднасці (маўляў, няма чаго красці), але і асаблівасць народнай маралі, яе абшчынна-таварысцкая арыентацыя, давер да тых, хто жыве побач.<br>Палешукі даволі камунікабельныя, маюць пастаянную патрэбу ў зносінах (кірмашы, вячоркі, калектыўная праца), але не любіць пустой балбатні, па прычыне чаго могуць здавацца неразгаворлівымі. Гэта рыса тлумачыцца тым, што пры знаходжанні сам-насам з |

| | |
|---|---|
| | прыродай або ў час напружанай, пераважна фізічнай працы, няма месца пустым размовам. Таму аддаецца перавага практычным метадам навучання, паказу. |
| **Замкнёнасць, сціпласць, сарамлівасць, недаверлівасць да малазнаёмых, асцярожнасць у выказваннях** | Мясцовы жыхар неахвотна і не адразу адкрывае душу чужому чалавеку (хто ведае, што ў каго на ўме?), але гэта зацікаўлены і ўважлівы слухач, які па-майстэрску пераводзіць размову на справы субяседніка, каб і пра навіны даведацца, і самому не прагаварыцца. І абасобленасць краю, і гістарычныя падзеі савецкага перыяду (калектывізацыя, палітычныя рэпрэсіі, нямецкая акупацыя) садзейнічалі ўзмацненню гэтых якасцей. Даследчыкі адзначаюць сціпласць, сарамлівасць мясцовых дзяцей. Іх прывучаюць больш слухаць і менш гаварыць, не расказваць пра ўзаемаадносіны ў сям'і, што паступова пераходзіць у звычку. Мэтанакіравана фарміруюцца стрыманасць у гаворцы, асцярожнасць у выбары знаёмстваў. |

## 1.3 Змест народнага выхавання

Адпаведна рэгіянальнаму разуменню тэрміна “выхаванне” як забеспячэнню гадавання, навучання, нагляду, пры з’яўленні дзіцяці на свет і да паўналецця перад кожнай сям’ёй стаяць наступныя выхаваўчыя задачы: па-першае, выгадаваць (забяспечыць комплекснае фізічнае, духоўнае, эмацыянальнае развіццё); па-другое, навучыць (культуры паводзін, далучыць да працы, народнай творчасці); па-трэцяе, вывесці ў людзі (падрыхтаваць да самастойнага жыцця, садзейнічаць стварэнню сям’і). Задачы рэалізуюцца ў змесце выхавання.

Пад зместам выхавання ў народнай педагогіцы разумеецца сістэма ведаў, перакананняў, практычных уменняў і навыкаў, якасцей асобы, устойлівых звычак паводзін, якімі павінен валодаць выхаванец. На эмпірычным узроўні змест народнага выхавання ўключае маральнае, працоўнае, разумовае, фізічнае, экалагічнае і эстэтычнае развіццё асобы. Усе складаемыя зместу разглядаюцца ва ўзаемасувязі, паколькі розум, дабро і прыгажосць, патрыятызм, праца і фізічнае развіццё ў народнай педагогіцы непадзельныя.

Адметнасць зместу выхавання на Мазырскім Палессі абумоўлена характарам навакольнай прыроды і працоўнай дзейнасці, пэўнай сацыяльнай ізаляцыяй рэгіёна, архаічнымі элементамі светапогляду і побыту. Змест народнага выхавання мае пераважна вопытны, прыкладны характар і ў значнай ступені самаарганізаваны, дзякуючы дакладна зададзенаму рытму традыцыйнага ладу жыцця. Перадача падрастаючаму пакаленню сацыяльнага вопыту ажыццяўляецца праз працу, сумесную дзейнасць дзяцей і дарослых, у ходзе выканання даручэнняў, знаёмства з народнай творчасцю. Змест канкрэтызаваўся з улікам мясцовых, сямейных і асабістых магчымасцей, але, у цэлым, адлюстроўваў абагулены калектыўны вопыт выхавання.

Выразна выяўляецца ўзроставае і асабліва полаўзроставае раздзяленне зместу выхавання. У змесце народная педагогіка Мазырскага Палесся захоўвае і перадае з пакалення ў пакаленне архетыповыя мадэлі мужчынскіх і жаночых паводзін. Стратыфікацыя па ўзросту адпавядала сацыяльнай ролі выхаванца, узроўню яго працоўнай падрыхтоўкі. Пры гэтым перыяд дзяцінства ў мінулым на Мазырскім Палессі быў некалькі карацейшым, сем’і стваралiся ў даволі раннім узросце: *“Мая сестра замуж вышла ў 17 лет, а ему было 16, у свекрові жылі, рабілі на полі ўсе. Багато было сыноў, усего раджоных было 11, жывых – 7, па аднаму не було”* [47]. У ходзе гутарак са старэйшымі жыхарамі Мазыршчыны ўстаноўлена, што важнейшым з’ўлялася маральнае і працоўнае

выхаванне. Асаблівая ўвага надавалася захаванню здабыткаў папярэднікаў: *“Як рабілі нашы дзяды, так і нам трэба ўступіць у іх сляды”* [113, с. 169].

Стрыжнем народнай педагогікі Мазырскага Палесся з’яўляецца ***маральнае выхаванне***, фарміраванне асобы з высокім духоўна-маральным узроўнем. Пры вывучэнні маральнай і духоўнай культуры Мазырскага Палесся вядомы беларускі этнограф XIX ст. І.А. Сербаў адзначаў, што маральна-духоўныя якасці і чысціня нораваў беларусаў-сакуноў павінны стаць прыкладам-арыенцірам для ўсіх жыхароў Расійскай імперыі [172]. Высакародства палешукоў, на яго думку, пераўзыходзіць лепшыя ўзоры аналагічных якасцей еўрапейскіх рыцараў сярэднявечча.

Найважнейшым складаемым змястоўнага напаўнення выхаваўчых мэт на Мазырскім Палессі з’яўляецца развіццё абшчынна-таварыскай, калектывісцкай арыентацыі кожнага індывіда. Не зусім спрыяльныя ўмовы для арганізацыі земляробства і жывёлагадоўлі садзейнічалі аб’яднанню людзей у пэўныя супольнасці, каб разам ладзіць штодзённы побыт. “*Калі робіш у купе, не баліць у пупе*” [162, с. 204], “*Адным пальцам вузел не завяжаш*” [13], – прыходзілі да высновы нашы продкі.

Хрысціянства хоць і надало новае гучанне калектывізму, саборнасці, але разам з тым закладвала падмурак развіцця ідэй індывідуалізму, бо адбывалася ўзвышэнне кожнага індывіда. Хрысціянскія запаветы звернуты перш за ўсё да ўнутранага свету чалавека, да яго ўласнага сумлення. На Палессі ж як нідзе ў іншых месцах хрысціянскае веравучэнне прымалася дапасавана да язычніцкіх уяўленняў. Тут уласная годнасць, асабістае шчасце разглядаліся толькі ў рэчышчы імкнення да агульнага дабра, задавальнення інтарэсаў канкрэтнага грамадства: “*Адзін з’еш хоць вала – адна хвала*”, “*За агульным сталом яда смачней*” [56].

З язычніцкіх часоў каштоўнасць чалавека праяўлялася не толькі і не столькі ў тым, што ён прадстаўляе сабой як канкрэтны індывід, а што ён уяўляе сабой як часцінка пэўнай супольнасці. Асабістыя якасці не сказаць, што не цаніліся, а разглядаліся з пункту гледжання іх вартасці для ўсяго грамадства. Прыродна-геаграфічныя і кліматычныя ўмовы ў дапаўненне гістарычным абставінам развілі і сфарміравалі калектывісцкую арыентацыю палешукоў да вельмі высокага ўзроўню. Само паняцце дабра разглядалася як карысць для іншых. “*Худо таму хто не робіць дабра нікаму*” [50], – перасцерагалі палешукі. Фальклорная скарбонка народнай мудрасці напаўняла выхаваўчыя пастулаты канкрэтным зместам аб перавазе калектыўнага ладу жыцця. У адной з казак, запісанай А.К. Сержпутоўскім на Палессі, гэта гучыць так: “*І пачаў Асілак навучаць, каб людзі жылі ў згодзе да ў ласцэ. Тады, кажа, ніякае ліха з імі не*

*справіцца, бо згодная грамада, бы адзін вялікі чалавек, вялікі багатыр, дужэйшы за ўсіх багатыроў*” [174, с. 89].

Нават адраджэнчаскія павевы Рэнесансу з іх накіраванасцю да індывідуальнасці значна ў меншай ступені закранулі Палессе ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны. Калектыўны лад жыцця нарадзіў цікавыя формы яго арганізацыі. Так, сход аднавяскоўцаў вырашаў не толькі праблемы агульныя для ўсіх жыхароў, а мог прымаць рашэнні ў дачыненні да асобнай сям’і і канкрэтнага чалавека.

Падмацаваная асноўнымі пастулатамі хрысціянскай этыкі схільнасць да агульнага дабра з сівой мінуўшчыны з’яўлялася характарыстычнай якасцю сапраўдных палешукоў і вызначала іх адносіны паміж сабой. Чалавекалюбства распаўсюджвалася не толькі на блізкіх, аднавяскоўцаў, аднаверцаў, а і на прадстаўнікоў іншых народаў, людзей другіх веравызнанняў. Наведвальнікі вёсак, што размясціліся сярод непраходных балот, адзначалі шчырую гасціннасць іх жыхароў. “*Госць у хаце – Бог у хаце*” [162, с. 345], – лічылі палешукі. Гаспадар гатоў быў апошнім падзяліцца са сваім госцем.

Як у іншых народаў грамадскае ўладкаванне ва ўяўленні жыхароў Палесся павінна грунтавацца на справядлівасці, якая выступала рэгулятарам чалавечых узаемаадносін і арыенцірам іх удасканалення. Найважнейшай жа маральнай якасцю кожнага індывіда павінна быць праўдзівасць. Яе выхаванню ў народзе ўдзялялася значная ўвага. Ва ўяўленні палешукоў альтэрнатывы гэтай якасці няма і не можа быць: “*Не чын паважаюць, а чалавека па яго праўдзе*” [21], “*Праўдаю найдалей дойдзеш*”, “*Раз няпраўда ці ашука, а сумленню на век мука*” [22].

Больш чым у іншых насельнікаў беларускіх зямель маральна-духоўная існасць палешукоў праяўляецца ў тым, што высокім этычным пачаткам напоўнены не толькі людскія адносіны, а і адносіны да жывой і нежывой прыроды. “*Хто заб’е бабра, не будзе мець дабра*” [113, с. 244] – узор такіх адносін. Арганічная злучанасць з прыродай спарадзіла ў нашых продкаў яе адухаўленне, а само жыццё ў навакольным прыродным асяродзі набывала маральны сэнс. На звяроў, птушак і розных іншых жывых істот паляшук у поўным сэнсе гэтага слова глядзіць, як на братоў меншых. Дрэвы, расліны таксама адухаўляюцца, надзяляюцца пэўнымі чалавечымі якасцямі. Вельмі часта ў народным фальклоры прадстаўнікі жывой і нежывой прыроды як носьбіты вартасных арыентацый, характэрных для грамадства, выступалі ў якасці ідэала маральнага ўдасканалення. Ужываючы сучасны лексікон можна сцвярджаць, што экалагічны аспект маральнага выхавання на Мазырскім Палессі адпавядаў самым высокім меркам і сёння з’яўляецца ўзорам беражлівых адносін да прыродных багаццяў.

Палешукі былі арганічна злучаны са сваімі мясцінамі, роднай зямлёй, любым куточкам. Іх патрыятызм мае больш абмежаваны характар, чым у прадстаўнікоў іншых народаў. Звычайна ён зводзіцца да паняцця навакольнай рэчаіснасці. Радзіма, Бацькаўшчына прадстае ў якасці "*роднага краю*", "*мілага куточка*", "*сваёй вёскі*", "*бацькоўскай хаты*". Лакальная абмежаванасць патрыятызму палешукоў дапаўнялася лірычным характарам, які праяўляўся ў замілаванні навакольнымі краявідамі: "*Кожнаму свой куток мілы*" [49], "*Родная зямелька як зморанаму пасцелька*" [1], "*Родная зямелька мякчэй за чужую пярыну*" [19], "*Няма смачней вадзіцы як з роднае крыніцы*" [56]. Іншыя ж мясціны не толькі не вабілі, а нават выклікалі адмоўныя адносіны, выступалі ў якасці "*чужой, нялюбай старонкі*": "*У чужым краю песні не пяю*" [113 с. 243], "*На чужыне і лаза вочы дзярэ*" [56)]. Нічым нельга было спакусіць палешука пакінуць землі продкаў. "*Бацькаўшчыну не купляюць і не прадаюць*" [163, с. 156], – катэгарычна заключалі на Палессі.

Маральны ідэал палешукоў уяўляў сабой шматбакова развітую дабрачынную, цнатлівую асобу з высокім узроўнем духоўнасці. Цікава адзначыць, што побач з агульнапрынятымі маральнымі якасцямі такімі, як добразычлівасць, міласэрнасць, сумленнасць, сціпласць, даверлівасць, абавязковасць, надзейнасць, памяркоўнасць, разважлівасць, цярплівасць, паслухмянасць акцэнтавалася ўвага і на пачуцці ўласнай годнасці, бо лічылі, што "*хто гнецца, таго і гнуць*" [113 с. 244], а залішняя цярплівасць можа перайсці ў раз'юшаны гнеў. Так, адкрытая пагроза гучыць у адным з загавораў, запісаным у Лельчыцах: "*Вынь зубу з рыбу, з кошчэй, з машчэй, з румяное крыві, а не то возьму меч і твая галава з плеч*" [51].

Маральнае выхаванне дзяцей з першых дзён ажыццяўлялася ў сям'і, характарызавалася апорай на станоўчае ў чалавеку, пераемнасцю маральных традыцый, носьбітамі якіх з'яўляюцца прадстаўнікі старэйшага пакалення. Сярод блізкіх людзей закладваліся такія якасці, як шчырасць, сумленнасць, гасціннасць, таварыскасць, калектывізм, міласэрнасць, працавітасць, добразычлівасць, адказнасць, самастойнасць, павага да бацькоў і старэйшых.

Бацькі імкнуліся садзейнічаць узаемаразуменню: *"каб дзеці не біліся паміж сабой, нада тры разы памяняць абутак усіх дзяцей у сям'і, а пад раніцу скласці ўсё разам, прыгаворваючы: каб этай обуві ў адном месце стаяць, так дзецям у сагласіі бываць"* [10]. Лічылася, што *"толькі тыя браты й сёстры будуць кахаць і згодно жыць, якія ат першаго да апошняго гойдаліса ў вадной калысцы"* [173, с. 181].

На Мазырскім Палессі і выхаваўчая дзейнасць бацькоў, і вынікі сямейнага выхавання, а таксама паводзіны дзяцей і дарослых ацэньваліся і кантраляваліся грамадскай думкай: *"Сам ганіць, да народ хваліць"* [113, с. 214].

Калі дзеці парушалі мараль, то ў гэтым вінавацілі маці: *“Нарадзіла, ды не навучыла”* [14]. У народных гаворках *“надукованы”* – гэта добра выхаваны, а нетактоўны чалавек, прасцяк – *“простолыка”*, *“простолыковаты”*: *“Простолыковаты шчо думае, тэ і говорыць”* [186, с. 228].

Павага да бацькоў, клопат пра іх у старасці – аснова сямейнай маралі. Вакол дзяцей стваралася адпаведная атмасфера, насычаная настаўленнямі падобнымі наступнаму:

*Бацьку з маткай любі,*
*Людным будзеш тады.*
*Дзеда з бацькам шануй,*
*Так і дзетак гадуй* [49].

Непаважлівыя адносіны да бацькоў прыраўноўваліся да самага цяжкага граху, і лічылася, што гэта прывядзе да згубных наступстваў: “*Хто бацьку і маці зневажае, той дабра не знае*” [56]. Нават дарослыя дзеці, якія мелі сваіх дзяцей, ва ўсім безадгаворачна слухаліся састарэлых бацькоў. Паўсямесна дзеці звярталіся да бацькоў на *“Вы”*: *“Вы тато”*, *“Вы мамо”*. Звычай існаваў у даваенны і пасляваенны час, захоўваецца ў зваротах паміж людзьмі старэйшага пакалення. Мясцовыя жыхары прыгадваюць: *“З намі жыў дзед, мацерын бацька, можа гадоў за 90 яму было. Звярталіся да яго “дзеду” і на “вы”* [51]. Малодшым рэкамендавалася вучыцца ў старэйшых: *“Дзе стары бурчыць, малады прамаўчыць”* [9]. Нават дарослыя сыны і дочкі, якія мелі сваіх дзяцей, па важных справах радзіліся з бацькамі. Ацэнка непавагі да бацькоў як вялікага граху адлюстравана ў казках і паданнях (*“Стары бацька”*, *”Шануй старога, як дзіця маленькае”*, *“Бацькаў дар”*, *“Палешукі і палевікі”*).

Састаўной часткай сямейна-побытавай культуры з’яўляліся нормы паводзін за сталом. Перад тым як сесці за стол і ўстаць з-за яго было прынята чытаць малітву. Прыёмы ежы адбываліся пры ўмове прысутнасці ўсёй сям’і, асабліва старэйшых мужчын: *“Дзед у полі валамі арэ, прыедзе, толькі тагды сядаем за стол”* [15]. Парадак мела размяшчэнне за сталом: *“Уперад за бацьку за стол не садзіся”* [8]. Малыя дзеці ў многіх населеных пунктах за агульны стол не дапускаліся: *“Елі на столочку, панімалі, што там наша месца”* [49]. Правілы ўжывання ежы засвойваліся з дзяцінства: *“Не можна есці лежачы, бо будзеш валачашчым без прытулку”* [173, с. 106], *“Не еж пака не памыўся, а то на том свеце палы лізаць будзеш”* [7]. Ежа або харч па царкоўных і народных уяўленнях не павінна быць празмернай, сэнсам жыцця. Непрыгожым для дзяцей і дарослых лічылася есці на вуліцы, у градах, хаваючыся: *“з рукава”*, *“з хвартуха”* і інш. Жанчыне, маці належала значная роля ў арганізацыі харчавання сям’і, перадачы дзецям лепшых народных звычаяў, захаванні ахайнасці, гасціннасці.

Правільныя адносіны да хлеба – паказчык выхаванасці, сталасці асобы на Мазырскім Палессі, бо *“хлеб – бацько, хлебам жывуць людзі”* [173, с. 96]. Паўсямесна лічыцца, што не ўмыўшыся, грэх есці хлеб і нават дакранацца да яго нячыстай рукою [164, с. 351]. Хлебам нельга забаўляцца: вылепліваць з яго нейкія фігуркі, тым больш рабіць галачкі і кідацца імі ў кагосьці *“грэх над хлебам знушчацца”* [164, с. 544]. У дачыненні да хлеба нават толькі адсутнасць пашаны лічыцца грахом. У народзе існуе павер’е, што госць, які пагарджае дадзеным яму на дарогу хлебам, сам будзе ў хуткім часе як жабрак прасіць хлеба [164]. Дзецям і моладзі прывівалі адпаведныя народнаму светапогляду адносіны да хлеба: *“Ек упадзе хлеб, то подымі да поцолуй”* [187, с. 240]. Дарослым лічыўся чалавек, які меў *“свой хлеб”* – асабісты заробак; *“пайсці на свой хлеб”* – пачаць жыць самастойна [187, с. 240-241].

Беларусам-палешукам уласціва шчырая, нефармальная веру ў Бога, якая не столькі падпарадкоўваецца царкоўна-абрадавым прадпісанням, колькі выступае ў якасці голасу ўласнага сумлення, маральнага абавязку перад вышэйшымі сіламі, людзьмі і самім сабой, што яшчэ больш уздымала ролю маральнага выхавання. “*Бог з пугаю не стаіць, як хочаш можаш жыць*”, – заключалі ў народзе [113, с. 227]. Інфарматыры паведамляюць, што большасць цэркваў пасля вайны была разбурана, але рэлігійныя патрабаванні выконваліся: *“Дзед, яму было каля ста гадоў, ставіў дзяцей на калені і вучыў хрысціцца, чытаць “Отча наш”* [51]. Хрысціянства арганічна дапасоўвалася да аўтарытарных пастулатаў народнай педагогікі, падкрэсліваючы яе самабытнасць.

На Палессі народныя вераванні, існаваўшыя з часоў язычніцтва, арганічна пераплячаліся з асноўнымі пастулатамі хрысціянскага веравучэння. Асабліва яскрава гэта праяўляецца ў патрабаванні актыўна-дзейснай пазіцыі асобы ў жыцці: “*Меней словам, болей справай*” [49]. Калі маральнасць не ўвасаблялася ў канкрэтных справах, то яна ператваралася ў этыкетную манернасць, якая не высока цанілася ў народзе. Так, напрыклад, якой бы лірычнасцю не характарызаваўся патрыятызм палешукоў, а ўсё ж, у рэшце рэшт, адносіны да радзімы характарызаваліся добрымі для яе справамі. “*Той Бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць*” [21], – катэгарычна заключалі ў народзе.

Рэгулятарам народнай маралі і выхаваўчых падыходаў з’яўляецца паняцце “<u>грэх</u>”, якое ў значнай ступені адрозніваецца ад царкоўных прадпісанняў. На яго аснове з дзяцінства фарміравалася свядомасць палешука, маральныя паняцці і перакананні, разуменне дабра і ліха, праўды і крыўды. На Мазырскім Палессі грэх разумеецца ў некалькіх вядучых аспектах: па-першае, гэта адказнасць перад уласным сумленнем; па-другое, сорам перад блізкімі і

людзьмі, сярод якіх жывеш, з якімі сустракаешся кожны дзень, і якія могуць адвярнуцца ў выпадку непрыгожага ўчынку; па-трэцяе, разуменне граху, страху перад судом божым, пакараннем вышэйшымі, нябачнымі, але магутнымі сіламі, на пачатку язычніцкімі, прыроднымі (маці-зямля, агонь, вада), а затым – язычніцкімі і хрысціянскімі ў сукупнасці.

Вызначаюцца нават ступені граху: *вялікі грэх, грэх, грашно* [164, с. 546]. Няпраўда, *крыўда* маральнага характару супрацьпастаўляецца праўдзе, як вышэйшаму праяўленню маральнасці і лічыцца грахом. Мана, падман на бытавым узроўні – з'ява даволі распаўсюджаная і мае назву *брахня* ці *хлусня.* Клятвапарушэнне, крыўда, падпальванне і выдзіранне пчолаў – *вялікі грэх* [164, с. 422]. Зайздрасць, гнеў неахайнасць, абгавор блізкіх і бязбожжа – грахі, якія абцяжарваюць сумленне. Грэшнікаў не прымае зямля, іх чакаюць цяжкія пакуты на гэтым і тым свеце: пчаладзёр і пасля смерці не можа нідзе схавацца ад укусаў пчол [164, с. 422]; *"Лень, гультай ляжыць голы пад варацьмі замісь падваротніцы"* [164, с. 423]. *"Не плюй ў агонь,* – перасцерагаюць дзяцей, – *бо на том сьвеці будзеш лізаць гарачую скавараду"* [164, с. 303–304].

Такія паняцці, як *грэх, сорам* адлюстроўвае абрад пасаду маладой на дзяжу, што меў пэўныя рэгіянальныя адрозненні: *"Свекруха ўжэ ўносіць дзежу з цестом. Еслі ты чэсна, так пераступі ў хату цэраз дзежу, а ні чэсна – абайдзі дзяжу. Тады знаюць, што ўжэ не чэсна. Граху баяліса"* [15]. Гарантам праўдзівасці дзяўчыны выступала народная мараль: па-першае, ацэньвалася яе асабістая жаночая сутнасць і цнатлівасць; па-другое, дабрачыннасць роду і сям'і (*"слава" – "няслава"*); па-трэцяе, маральны ўзровень усяго сельскага калектыву, які прадстаўляла маладая. Пакаранне за грэх магло датычыцца як вінаватага, так і яго сям'і, дзяцей і нашчадкаў. Яно распаўсюджвалася на сяло і ўсю грамаду, як адказных за маральныя якасці кожнага. Град і прыродныя бедствы, хваробы і эпідэміі лічыліся вынікам нараджэння пазашлюбнага дзіцяці, наўмыснага забойства дзіцяці і інш.

Па сведчанні этнографаў, паляшук, калі адчувае сябе скампраметаваным у вачах грамадскай думкі амаральным учынкам, кажа, што мае запарушанае вока – *"око запарушано"* [164, с. 546]. Нават пакаяўшыся і атрымаўшы прабачэнне, грэшнік пакутліва перажывае сваю віну. Гэта сведчыць аб глыбіні маральных пачуццяў – моцных эмацыянальных перажываннях, што ўзнікаюць у чалавека ў сувязі з адпаведнасцю або неадпаведнасцю яго паводзін агульнапрынятым патрабаванням. Ва ўсходняй культуры палескаму *"око запарушано"* адпавядае паняцце *"страта твару"*, у агульнаславянскай – паралелей не выяўляецца, што падкрэслівае асаблівую прынцыповасць і патрабавальнасць палешука да свайго маральнага аблічча: *"Беднасьць сораму не знае...ока не запарушае"* [164, с.595].

Для народнага выхавання характэрна арыентацыя не на знешнюю, паказную маральнасць, а на ўнутраную, глыбокую духоўнасць, нярэдка прыхаваную за знешняй грубасцю і сарамлівасцю, уласцівай беларусам-палешукам. Асаблівая ўвага надаецца перажыванням *"у душы"*: *"крывіць душою"* – быць крывадушным, няшчырым; *"ласіная душа"* – вельмі добры чалавек [164, с. 599]. Сумленнасць, сіла маральных пачуццяў фарміраваліся з дзяцінства, хаця былі і выключэнні з агульнага правіла. Пра такіх палешукі гавораць: *"Плюй у вочы, то ён скажа, што дождж ідзе"* [164, с. 587], *"Вачэй пазычыў у сабакі, што так безстыдна глядзіш мне ў вочы?"* [164, с. 530].

На Мазырскім Палессі выклікаюць асуджэнне такія рысы характару, як гняўлівасць і асабліва ганарыстасць (гордасць): *"Крукам носа не дастанеш"* [113, с. 115], *"Горды ды ўпарты – нічога не варты"* [113, с. 193]. Палешукі пераканаsuccessfully, што той, *"хто на гэтым свеце б'е людзей – на тым таўчэ каменне. Настырнёны (запальчывы, задзірысты) пер'е скубе"* [164, с. 422]. Пры тым, што мясцовыя жыхары – людзі ашчадныя, гаспадарлівыя, кожную трэску ў двары стараюцца пусціць у справу, сур'ёзным недахопам лічылася празмерная скупасць: *"Шчодрага пракаўтнуць, а скупога праплююць"* [113, с. 246].

Асуджалася сварлівасць, брыдкаслоўе, грубасць, асабліва жаночая, паколькі маці аказвае непасрэднае ўздзеянне на духоўную атмасферу ў сям'і, выхаванне дзяцей. У паўсядзённым жыцці выкарыстанне мата на Палессі табуіруецца, што тлумачыцца бояззю словам абразіць маці-зямлю і продкаў, у доме – Дамавіка, у лесе – Лесавіка, у полі – Палевіка, увогуле пазбавіцца дапамогі добрых сіл і апекуноў чалавека і сям'і і трапіць пад уладу нячысціка, злых сіл. Верылі, што Вадзяны топіць тых, хто ўжывае лаянкавыя словы, муціць ваду, працуе ў нядзелю, не прытрымліваецца пастоў [175, с. 396–400].

Сярод адметных маральных патрабаванняў, характэрных пераважна для Мазырскага Палесся – адносіны да зайздрасці і *"зайздроснага вока"*. Няшчасце ў гаспадарцы, адсутнасць шанцавання, хвароба дзіцяці часта лічыцца вынікам людской зайздрасці: *"Нехта пазавідуваў дзіцятка"* [164, с. 572]. Немаўлят, таксама іншых маладых істот, якія толькі што з'явіліся на свет, першыя ўсходы жыта або лёну неахвотна паказваюць чужым, баючыся, каб наўмысна або не, не пазайздросцілі здароўю, удачы, будучаму ўраджаю. *"Зайздроснае вока"* – адна з распаўсюджаных у дзіцячым асяроддзі дражнілак, абзывалак.

Як сведчаць дадзеныя этнографаў, дзеці ў большасці палескіх сем'яў выраслі працавітымі, гаспадарлівымі, сумленнымі, добразычлівымі [171]. Шляхам тлумачэнняў, прыкладаў з жыцця, забарон, рэлігійных вераванняў у дзяцей замацоўвалася разуменне такіх паняццяў, як грэх, сорам, праўда і крыўда, фарміраваліся адносіны да клятвапарушэння, крадзяжу, п'янства,

ашуканства. Асноўная ўвага звярталася на замацаванне звычак паводзін, якія знаходзілі ўвасабленне ў адабраемых акружаючымі ўчынках выхаванцаў.

Народная творчасць, казкі і песні сямейна-бытавой тэматыкі – маральны кодэкс народа, іх асноўныя тэмы: жыццё нявесткі ў сям'і мужа, адносіны замужняй дачкі і бацькоў, скаргі ўдавы на сваё жыццё, сіроцкія песні пра горкую долю дзяцей-сірот і нявесту-сірату, узаемаадносіны беднага і багатага братоў, беднай і багатай сясцёр, крыўда маці на раўнадушша і няўдзячнасць дзяцей. Казкі і гісторыі з жыцця (*"Ад крадзенага не пасыцееш"*, *"Не блiснула, а грымнула"*), прыказкі пераконвалі, што трэба жыць сумленна: *"Лепш сваё латанае, чым чужое хватанае"* [55], *"Калі хочаш прапасці – пачні красці"* [9].

Народная мараль не толькі рэгулюе асабістыя і грамадскія адносіны ва ўсёй разнастайнасці, але ўздзейнічае на гармонію сусвету: *"Калі зорка падае па небу доўга і не гасне зразу, то памёр добры чалавек, яго душа ляціць і свеціцца. Калі падае хутка і гасне – памёр грэшны, злы чалавек"* [148, с. 220-221].

Сур'ёзную ўвагу ўдзялялі на Мазыршчыне ***разумоваму выхаванню***, што заключалася ва ўвазе бацькоў да інтэлектуальнага развіцця дзяцей, удасканаленні памяці, лагічнага мыслення, фарміравання пазнаваўчых інтарэсаў і схільнасцей. Змест разумовага выхавання быў накіраваны не толькі на засваенне традыцыйнай сумы ведаў, гаспадарчых, бытавых уменняў і навыкаў, але і на агульнае развіццё асобы: перадачу вопыту працоўнай дзейнасці і чалавечых зносін, разуменне разнастайных жыццёвых з'яў.

Высока ацэньваўся прыродны розум. Мноства парад і забарон існавала для цяжарных жанчын, каб забяспечыць нараджэнне разумнага патомства. З ранняга ўзросту дзіця знаёмілі з навакольным светам, вучылі лічэнню і арыфметычным дзеянням, узбройвалі ведамі ў вобласці народнай метэаралогіі, медыцыны і інш. На развіццё інтэлектуальных здольнасцей непасрэдна накіраваны загадкі, задачы-загадкі. Многа фальклорных твораў даказваюць перавагу розуму над іншымі чалавечымі якасцямі: "*Не сілай, а розумам*" [34], "*Рукі да работы, ногі да ахвоты, галава да ўсяго*" [55].

На ранніх этапах прасочваецца ўзаемасувязь маральнага і разумовага выхавання, паколькі родавыя, сямейныя грахі – сур'ёзная перашкода для нараджэння здаровых дзяцей. Адпаведна пры добрай спадчыннасці і пры ўмове захавання бацькамі норм народнай маралі, увасобленай у шэрагу рэгіянальных перасцярог, дзеці народзяцца разумнымі і здаровымі. З гэтай мэтай цяжарным паўсюдна забаранялася падстрыгаць валасы, каб не адрэзаць розум або язык (мову) дзіцяці. Валасы цесна звязваліся з разумовым развіццём, здароўем, лёсам, адыгрывалі важную ролю пры змене сацыяльнага статусу: першая стрыжка дзіцяці ў гадавалым узросце, абрад пострыгу ў княжацкім асяроддзі, продаж касы нявесты [68]. Існавала перакананне, што розум і ўменне прыгожа,

складна гаварыць – узаемазвязаны. Дэфекты вымаўлення – паказчык невысокага разумовага развіцця: *“Які розум, такая і гаворка”* [72, с. 159]. Адпаведна зычны голас сведчыць аб здароўі, удачы, розуме [175, с. 510].

Цанілася добрая памяць, паколькі традыцыйная культура рэгіёна заснавана на запамінанні, вуснай перадачы. На Мазырскім Палессі ўжываюцца словы *“памецьˮ*, *“пам’яцьˮ*, *“пам’ятацьˮ*, *“помніцьˮ*, *“паметліву”* [186, с. 10–11]. Існавалі шматлікія способы забеспячэння разумовага развіцця. Асабліва баяліся пэўнымі дзеяннямі выклікаць страту памяці або *“зашыць памяць”* дзіцяці: *“трэба добра глядзець, што б дзіця не ўдарылася цеменем, бо пам’яць у яго прападзе”* [164, с. 563]. Калі нараджалася дзіця, то яму і бацькам жадалі: *“Каб свой розум і навукі далі сыну сілу ў рукі”* [4].

Для народнай педагогікі Мазырскага Палесся характэрна досыць ранняе праяўленне клопату аб фарміраванні інтэлекту дзіцяці. Народныя кумулятыўныя казкі, дзіцячыя песні і забаўлянкі не толькі знаёмяць з побытам, але і дапамагаюць зразумець прычынна-выніковыя сувязі паміж разнастайнымі рэаліямі жыцця [15]. Варыянты забаўлянкі *“Сарока-варона”* запісаны ў розных населеных пунктах Мазыршчыны (Дадатак А). Для іх характэрна прысутнасць элементаў гумару, эмацыянальнасць, павучальная скіраванасць.

Палешукі, з іх прыродным, практычна-скіраваным розумам, схільнасцю да іроніі і самаіроніі любяць і ўмеюць загадваць народныя загадкі, якія з’яўляюцца эфектыўным сродкам разумовага выхавання. У мясцовых загадках закранаюцца філасофскія пытанні жыцця і смерці, долі і нядолі, сумлення, шчасця і гора: *“Што люблю – не куплю, чаго не любіш – не прадам”* (маладосць не купіш, старасць не прадасі) [69, с. 178]. Загадкі актывізуюць памяць, назіральнасць, уяўленне, вучаць дзяцей знаходзіць падобнае ў аддаленых прадметах і з’явах. Выхаваўчыя традыцыі Мазырскага Палесся ўтрымліваюцца ў загадках сямейна-побытавай тэматыкі: *“Чатыры чатырначкі, пятая – лубеначка, шостая – жывеначка”* (дзіця ў калысцы) [69, с. 178].

Працэс разгадвання загадкі разглядаецца сучаснымі даследчыкамі як прысваенне этнічнаадпаведнай карціны свету свайго або іншага народа тым, хто разгадвае загадку, перш за ўсё дзіцём. Дыяпазон “зразумеласці” загадкі знаходзіцца ў адваротна-прапарцыянальнай залежнасці ад ступені яе насычанасці канкрэтнымі прадметнымі вобразамі, рэаліямі мясцовага жыцця. Таму для сучасных дзяцей працэс разгадвання народных загадак можна разглядаць як своеасаблівыя ўводзіны ў працэс пазнання рэгіянальнай культуры.

Падлеткам давалі арыфметычныя веды, вучылі лічэнню пры дапамозе рысак, гарохавін, бабоў ці фасолін. Развіццю матэматычных здольнасцей спрыялі мудрагелістыя народныя задачы-загадкі: *“Ішло сем баб, у кожнае бабы*

*па сем кіёў, на кожном кію па сем сукоў, на кожном суку па сем кашалёў, у кожном кашалю па сем кошак, у кожнае кошкі па семера кацянят. Сколькі ўсяго будзе?"* [164, с. 276]. Рашэнне падобных задач фарміравала цікавасць да інтэлектуальнай дзейнасці, садзейнічала павышэнню разумовай культуры.

Высока ацэньваўся прыродны розум: *"Не даў бог розуму, то і каваль не скуе"* [186, с. 307], *"Рукі да работы, ногі да ахвоты, галава да ўсяго"* [9]. У выхаванцаў фарміравалася крытычнае мысленне, самастойнасць думак і ўчынкаў: *"Людзей слухай, а свой розум май"* [186, с. 307]. Аднак не адмаўлялася магчымасць *"узяцца за розум"* – адумацца; падкрэслівалася неабходнасць *"набрацца розуму",* жыццёва-практычнага вопыту, навучыцца: *"Хай бу ты пашоў об людзей поцёрса, розуму набраўса"* [186, с. 307], *"Навука не ходзіць па лесе, а ходзіць па людзях"* [31]. Разумелася бесперапыннасць працэсу выхавання: *"Век жыві, век вучыся, а дурным памрэш"* [113, с. 158].

Лічылася, што навучанне эфектыўна толькі пры пэўным узроўні разумовага развіцця і падмацаванае асабістым жаданнем выхаванца: *"Добра даць спосаб за жывою галавою"* [113, с. 209], *"Дурня вучыць – толькі гнабіць"* [14]. Палешукі перакананы: калі няма розуму ў галаве, сэнсу (*"тоўку"*) у гаворцы, то не будзе і спору ў працы: *"У чыёй гаворцы няма тоўку, той бэз тоўку і ўсё робіць, бо сам кругом бэзтаўковы"* [164, с. 561].

Акрамя паняцця *"розум"* для характарыстыкі разнастайнай інтэлектуальнай дзейнасці ўжываюцца наступныя лексемы: *"клёк"* (*"нема клёку"* няма развагі, розуму ў галаве); *"панталык"* (*"збіць з панталыку"* – страціць паслядоўнасць у разважаннях і дзеяннях); *"глузд"* – розум, здольнасць разумець: *"На мой глузд, то я не жыла б з ім"* [183, с. 203]); *"самовіты", "самовіты чалавек"* – самастойны ў думках і ўчынках, *"несамавіты"* – адпаведна наадварот; *"цікаву"* – у значэнні мудры, панятлівы; *"хітры"* – у значэнні кемлівы, дасціпны; *"скеміць"* – зразумець [187, с. 40].

Шырока ўжываюцца паняцці *"дурань"*, *"дурны"* – чалавек, інтэлект якога абмежаваны ад нараджэння: *"Дурань дурнем родзіцца і дурнем паміpae"* [164]. Паступова ўзмацняючы гэту якасць, кажуць: *"вялікі дурань"*, *"дурніла"*, *"дурнішча"*; ідыёт – *"бажавольны"* [164, с. 540]. *"Дурак"*, *"дурко"*, *"дурніло"*, *"дурніца"*, *"дурнота"*, *"дурны"*, *"дуроваты", "дурэнь"* [184, с. 46–47].

Палешукі адрозніваюць недахоп розуму ад прыроды: *"Лоб што лапата, а ума не багата"* [8] і па прычыне маладосці, адсутнасці жыццёвага вопыту: *"Дурны, бо яшчэ малады"* [164, с. 540]. Можа назірацца і часовая адсутнасць розуму, выкліканая хваробай, псіхалагічнымі прычынамі: *"Калі мацi дурненькая?/ – Тагды, калі яе дзіцятка маленькае"* [164, с. 540].

У народнай гаворцы *"дурны"* – гэта і дрэнна выхаваны, не здольны зразумець законаў народнай маралі, без прымусу паводзіць сябе адпаведна

грамадскім патрабаванням: *"Разумнае дзіця баіцца гразы, а дурное – лазы"* [32, с. 135]. Казачны дурань – разумны ў абліччы дурня, сапраўдную сутнасць якога не могуць распазнаць нават блізкія, паколькі ён дэманструе свой розум і веданне маральных норм толькі ў крытычных сітуацыях.

З павагай адносіліся палешукі да ведаў, навукі: *"Вучоны водзіць, а нявучаны за ім услед ходзіць"* [55]. Запісаны замовы, накіраваныя на паляпшэнне вучобы [34]. Але не ўхвалялася адукацыя без разбору і практычнага прымянення (*"Паляшуцкая лаціна"*, *"Аб хлопцу вельмі разумным"*).

Для мясцовых жыхароў каштоўнасць мае не столькі адукацыя, начытанасць, колькі здаровы практычны розум – *"рассудак"*, здольнасць правільна ацаніць сітуацыю або інтэлектуальна-маральны ўзровень чалавека і яго ўчынкаў [164]. У народных казках вядучай якасцю героя з'яўляюцца жыццёвая мудрасць, разважлівасць, а недахоп сілы кампенсуецца кемлівасцю, гумарам [69].

Аснова народнай педагогікі Мазырскага Палесся – ***працоўнае выхаванне*** падрастаючага пакалення. Больш чым у дапамогу вышэйшых сіл і ўласнае шчасце палешукі верылі і вераць у стваральную працу, штодзённую работу, чалавечы труд: *"Працуй, нябожа, то й Бог паможа"* [164, с. 560].

Няпростыя ўмовы жыццядзейнасці абумовілі фарміраванне ў мазырскіх палешукоў незвычайнае працалюбства, вынослівасць, цярплівасць. Наданне гэтым якасцям істотнай грамадскай значнасці пэўным чынам фарміравала змест традыцыйнага народнага выхавання. Практычна на кожным этапе сталення дзяцей вылучаліся канкрэтныя выхаваўчыя задачы. Стрыжнем і важнейшым змястоўным напаўненнем народнага выхавання заўсёды з'яўлялася **працоўнае выхаванне**. Падрыхтоўка да працы, выхаванне працай і ў працы, якімі быў напоўнены штодзённы побыт, дазваляе многім даследчыкам увогуле народную педагогіку лічыць педагогікай працы [63, с. 57]. Хаця трэба адзначыць, што такі падыход назіраецца не ва ўсіх людскіх супольнасцях. Гісторыя асобных народаў дае нам прыклады, дзе ў якасці прыярытэтных маглі вылучацца іншыя бакі жыцця грамадства, і нават грэблівыя адносіны да працы, у першую чаргу фізічнай, калі апошняя разглядалася ў якасці пакарання за шматлікія правіннасці. Падобных праяў у палешукоў ніколі не назіралася. Каляндарна-абрадавая паэзія Мазырскага Палесся, якая грунтавалася на прыроднай аснове, самае пачэснае месца адводзіць працы і адпаведным адносінам да яе. У іерархіі маральных каштоўнасцей бясспрэчны прыярытэт аддаваўся працалюбству. Прычым, адносіны да працы напаўняліся высокім этычным сэнсам: "*Менш гавары, ды больш рабі*" [113 с. 234], "*Работа хлеб салодзіць*" [113, с. 239], "*Работа чалавека лечыць*" [113 с. 240], "*Хто з работай дружыць той жыве і*

*не тужыць*” [22], “*Хто працуе, таму і шанцуе*” [1]. Станоўчыя адносіны фарміраваліся толькі да агульна карыснай, стваральнай працы.

У палешукоў уключэнне дзяцей у працоўную дзейнасць адбывалася паступова, пачынаючы з самага ранняга дзяцінства. Ужо пяцігадовыя дзеці мелі пэўныя пастаянныя і часовыя даручэнні, такім чынам гэта была не “гульня ў працу”, а рэальная вытворча-карысная працоўная дзейнасць. З ростам дзяцей іх удзел у вядзенні гаспадаркі пашыраўся і паглыбляўся. Ужо ў падлеткавым узросце яны нароўні з дарослымі былі ўключаны практычна ва ўсе віды працоўнай дзейнасці, валодалі пэўнымі прафесійнымі ўменнямі і навыкамі. Ранняе далучэнне дзяцей да працы садзейнічала таксама фарміраванню ў іх грамадска-значных, маральна-валявых, інтэлектуальна-разумовых, эстэтычных, фізічных і іншых якасцей.

Значэнне працы ў народнай педагогіцы непарыўна звязана з маральнасцю, з разуменнем сэнсу жыцця. Праца – не толькі абавязак і выток матэрыяльнага дабрабыту, але і крыніца душэўнай раўнавагі і фізічнага здароўя: *“Работа чалавека лечыць”* [113, с. 240]. Праца мае не толькі выразны практычны, але і педагагічны сэнс: інтэлектуальна, маральна і эмацыянальна развівае асобу, садзейнічае фарміраванню інтарэсаў, здольнасцей.

Непасрэдна ў працы выхоўваліся важнейшыя чалавечыя якасці: калектывізм, дысцыплінаванасць, беражлівасць, ашчаднасць, гаспадарлівасць, самастойнасць, вынаходлівасць, стараннасць, сумленнасць, дабрыня, павага да бацькоў, любоў да роднага дома, зямлі, прыроды, радзімы. Часткай сямейнага выхавання было аказанне рэгулярнай дапамогі састарэлым, нядужым бацькам і сваякам, якія ў сілу ўзросту не могуць паўнацэнна працаваць.

У значэнні “працаваць” у рэгіёне ўжываюцца пераважна выразы *“рабіць”*, *“рабацяга”*, *“рабацяшчы”* [130, с. 116], *“трудзіцца” “трудзімы”* і *“трудзяшчы”*: *“Трудзяшчы бацько робіў, а нетрудзяшчы сын спожывае”* [187, с. 155]. Словы *“праца”*, *“працаваць”* сустракаюцца ў мясцовых прыказках і прымаўках, якія захоўваюць даўнія лексічныя пласты: *“Бэз працы не есьці калачы”* [164, с. 560]. Для характарыстыкі набытых практычных навыкаў і ўменняў выкарыстоўваюцца словы *“умелы”*, *“умець”*, *“веды”*, *“ведаць”*, *“знаць”*, *“навука”*, *“вучоба”*, *“навучка”* – навык, уменне [185, с. 117].

Працоўнае выхаванне і сацыялізацыя моладзі адпавядалі ўзросту, інтэлектуальнаму развіццю: *“– Мой хлопец хоць малы, да ўжэ цяміць, чаго трэба наўчыцца, што б быць добрым хадзяінам. / – І мой меншы трохі цяміць, серадольшы ўжэ багата чаго ўмее рабіць, а большы, то ўсё знае”* [164, с. 74].

У змесце працоўнага выхавання рэалізавана наступная сукупнасць кампанентаў – авалоданне асновамі ведаў аб прыродзе і чалавеку; развіццё здольнасці выкарыстоўваць гэтыя веды на практыцы; сфарміраванасць матываў

працоўнай дзейнасці, разуменне неабходнасці з малых год працаваць дзеля дабрабыту сям'і і ўласнага; наяўнасць уяўленняў аб спецыфіцы працоўных заняткаў, характэрных для мужчыны або жанчыны. Істотную ролю адыгрывала развіццё фізічных сіл і якасцей, якія забяспечвалі працаздольнасць чалавека ў дастаткова суровых прыродных умовах рэгіёна.

На Мазырскім Палессі была запатрабавана высокая культура працы. Цаніліся не толькі стараннасць (*"стараплівы"*), але і прыродныя здольнасці да той ці іншай дзейнасці, валоданне мясцовымі рамёствамі на ўзроўні майстэрства, спор, поспех у працы: *"Працавіты працавітаму не роўны: адзін такі стараплівы, што працуе, працуе, томіцца, да няма ніякага спору ў яго рабоці, а другі, здаецца, мала робіць бэз ніякае вытугі, да глядзіш і толькі дзівуешся, адкуль у яго той спор бярэцца"* [164, с. 560]. Заахвочваліся ініцыятыўнасць, імкненне працаваць сумленна, якасна, даводзіць справу да канца, творча выкарыстоўваць набытыя веды: *"Умеламу рукі не баляць"* [5]. Праяўленне гультайства, абыякавасці да выканання працоўных абавязкаў у беларусаў-палешукоў выклікае суровае асуджэнне: *"Пустадомак! Хадзяйства зьвёў на сабаку, а цяпер пойдзеш у старцы"* [164, с. 620].

Змест працоўнага выхавання вызначаўся асноўнымі працоўнымі заняткамі (земляробства і жывёлагадоўля), прыродаздабываючымі промысламі (паляўніцтва, рыбалоўства, бортніцтва, збіральніцтва) і народнымі рамёствамі (кавальства, ганчарства, бондарства), якія развіваліся на Мазырскім Палессі і былі самым цесным чынам узаемазвязаны з прыродай і геаграфічным палажэннем краю. Сярод найбольш значных прыродных фактараў – лясныя масівы, балоты, водная сістэма Прыпяці і яе вытокаў.

А. Кіркор адзначае, што асноўныя працоўныя заняткі ўказала палешуку сама прырода. На кірмашах гандлююць буйной рагатай жывёлаю – таварам, коньмі, птушкай і рознай дробнай жыўнасцю, збожжам, бульбай, лёнам, пянькою, салам, рыбаю і тлушчам, рамесніцкімі вырабамі, лесам і прадуктамі яго здабычы – смалой, дзёгцем, паташом, шкіпінарам. Мяшчане актыўна займаюцца рыбалоўствам і гарбарствам – вырабам скур, якія адрозніваюцца якасцю і трываласцю [101, с. 346].

Практычна ўсе палешукі станавіліся рыбакамі: вучыліся абыходжанню з лодкамі і чаўнамі, асвойвалі выраб спецыяльных прылад (кош, комля) для лоўлі рыбы ў балоцістых мясцінах. З малых гадоў гэтай справай займаліся дзеці, што пашырала іх веды аб роднай прыродзе, загартоўвала, развівала фізічна. Жанчыны валодалі сакрэтамі прыгатавання адмысловых мясцовых далікатэсаў: сушаныя уюны, боршч з уюнамі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне.

Мазыршчына заўсёды славілася бондарамі, будаўнікамі, цеслярамі. Масавае распаўсюджанне атрымаў выраб прылад працы, посуду з дрэва, лазы,

бярosты, лыка, лубу – ступы, кросны, лыжкі, дзежкі, кадушкі, бочкі, вёдры, кублы, корабы, кошыкі, вяроўкі і інш. Падлеткі дапамагалі нарыхтоўваць лазу, ліпавую кару, бяросту, клёпку, дровы, лучыну; плялі лапці, кашалі, кошыкі.

Дзеці змалку большасць часу праводзілі на прыродзе, прымалі актыўны ўдзел у нарыхтоўцы сыравіны, зборы дароў лесу. Як сведчыць праведзенае апытанне, на Мазырскім Палессі і сёння канчаткова не знік адзін з самых старажытных промыслаў усходніх славян – бортніцтва, вядомае з IX стагоддзя. Веды, неабходныя ўменні і навыкі, а таксама бортніцкія замовы перадаваліся пераважна па мужчынскай лініі [35]. Гэты занятак садзейнічаў фарміраванню назіральнасці, цярплівасці, далікатнасці, адчуванню прыродных рытмаў.

Былі запатрабаванымі і спецыялізаваныя заняткі: печніка, ганчара, млынара, гарбара, каваля: *“У каваля рукі ў золаце”* [114, с. 132]. Гэтым прафесіям можна было навучыцца як ад майстра, так і ў сям’і: *“Бацька бочкі рабіў, пасуду на гуркі, муку. Дзед быў і музыкант, і бондар, і столяр”* [24]. Практычныя ўменні высока ацэньваліся народам: *“Рамяство плячэй не абцягвае”* [69, с. 167]. На Мазырскім Палессі назапашаны пэўны аб’ём ведаў і вопыт навучання па кожнай з названых прафесій і традыцыйных заняткаў.

Змест працоўнага выхавання дыферэнцыраваны па полу і ўключае выхаванне будучага гаспадара або гаспадыні, здольнага да самастойнай дзейнасці ва ўмовах патрыярхальна-натуральнай гаспадаркі. Мужчына – гэта ў будучым кваліфікаваны работнік, хлебароб і жывёлавод, а дадаткова – бондар, плотнік, рыбак, бортнік. Жанчына – памочніца мужа, якая даглядае грады, займаецца вырошчваннем садавіны і гародніны, нарыхтоўкай грыбоў і ягад, а таксама клапатлівая маці і гаспадыня, якая корміць, абшывае, абмывае сям’ю.

Гістарычна змест залежаў ад мясцовых умоў і змен у арганізацыі працы, эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў. Як правіла, падлеткі дапамагалі бацькам: *“У сям’і было чацвёра дзяцей, памагалі па хазяйству, кажны сваю работу знаў: палолі, бралі ягады і грыбы, жалі серпом, рыхтавалі дровы і лучыну”* [44]. Па сведчаннях інфарматараў, у пасляваенны час мяжа паміж мужчынскімі і жаночымі работамі была значна размыта, у асірацелых сем’ях, дзе старэйшымі былі дзяўчаты, ім даводзілася выконваць усе цяжкія работы: і араць, і касіць, і рыхтаваць дровы; у сваю чаргу хлопцы-падлеткі дапамагалі палоць, жаць, прасці і нават ткаць.

Сялянскія дзеці шмат часу аддавалі працы на зямлі, што садзейнічала іх усебаковаму развіццю: узбагачала духоўна, развівала фізічна, далучала да народнай творчасці. Працоўнае выхаванне актуалізавалася народным мастацтвам: ткалі і пралі – спявалі, жалі – спявалі, працавалі ў полі – выконвалі песні палольныя, касецкія, бралі ягады – выконвалі песні ягадныя. Рытм дапамагаў хутка набыць працоўныя ўменні і навыкі. Самая цяжкая праца

станавілася пасільнай, калі выконвалася размерана, спалучалася з народнай песняй. Лічылася, што без песні праца будзе неэфектыўнай: *“Калі жанцы жнуць та пяюць, та ў іх работа хутчэй ідзе, калі ж жанцы жнуць да жупяць, та работа не мае спору, бо яны жнуць як мокрае гарыць”* [173, с. 97]. Народная песня садзейнічала самавыражэнню чалавека ў працы.

У першую чаргу фізічная, земляробчая праца разглядалася палешукамі як істотная для чалавека. Разумовая праца ў пэўнай ступені недаацэньвалася. Праца духоўных асоб і чыноўнікаў супрацьпастаўлялася традыцыйным сялянскім заняткам, лічылася спосабам заробку грошай або марнавання вольнага часу. Паны і падпанкі, папы і ксяндзы, якія не разумеюць што да чаго ў штодзённай сялянскай працы – аб’ект пастаянных кпінаў у народных казках, жартах і анекдотах: *“Як пан шэршню кланяўся”*, *“Мужык і пан”* [69].

Шмат клопату праяўлялі палешукі аб здароўі дзяцей, і хоць фізічнае **выхаванне** як правіла не вычлянялася ў самастойны працэс, але і ў гульнях, і ў працы, якія былі насычаны ўсемагчымымі фізічнымі нагрузкамі, гартаваліся і развіваліся хлапчукі і дзяўчынкі. Здароўе разглядалася, як натуральны прыродны стан чалавека, аснова чалавечага жыцця, працяг роду і стварэнне матэрыяльнага дастатку. Міхалон Літвін, аўтар сацыяльна-палітычнага трактата “Аб норавах татар, літоўцаў і маскавіцян”, надрукаванага ў 1615 годзе, зазначае, што людзі, якія жывуць на беразе ракі Пціч з малых гадоў прывыкаюць плаваць, лавіць рыбу, паляваць. Пастаянныя практыкаванні спрыяюць адточванню і загартоўцы прыроджаных фізічных якасцей і асаблівасцей характару: спрыту, сілы, смеласці, стойкасці і самаахвярнасці. З тых, хто прывык да небяспекі, вырастаюць дужыя і смелыя воіны, здольныя абараніць дзяржаву [4, 48].

***Фізічнае выхаванне*** ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся ў значнай меры з’яўляецца састаўным элементам працоўнага жыцця на ўлонні прыроды і побыту: *“Грэе не шуба, а праца”* [69, с. 167]. Як фізічна значныя, прыгожыя і карысныя разглядаюцца наступныя заняткі: калоць (рубаць, секчы) дровы, касіць, араць. Спецыяльна арганізаваныя гульні спартыўнага характару прымяркоўваліся да народных святаў, а ў буднія дні не практыкаваліся. Паводле даўніх уяўленняў *“гэто цепер людзі здрабнелі ды сталі нядужыя, а даўней былі такія вялізныя, бы дуб, да дужыя, што хацелі з Богам дужацца”* [173, с. 72]. Шырока бытуе павер’е, што *“людзі будуць радзіцца ўсё меньшыя да меньшыя, а перад самым канцом сьвета стануць такія маленькія, што дванадцаць чалавек у адной печы памесьцяцца і будуць ўсе разам хлеб малаціць”* [164].

Увасабленнем фізічнай моцы лічыцца дуб: *“Хто будзе спаць на дубовых дошках, той будзе даўгавечны й здаравенны, бы дуб”* [173, с. 56]. Ідэалам здароўя выступае родная прырода: *“Будзь здароў, як мядзьведзь”* [164, с. 612].

У народзе цаніліся фізічная моц і даўгалецце, што патрабавала захавання фізічнай і разумовай актыўнасці, умення ва ўмовах цяжкай фізічнай працы і адсутнасці медыцынскай дапамогі прадухіліць разбурэнне здароўя. Здароўе ставіцца вышэй за іншыя каштоўнасці: *“Здаровы багатаму варт”* [113, с. 173]. Усталявалася перакананне, што чым больш чалавек працуе, тым ён здаравейшы, прыстасаваны да пераадолення цяжкасцей: *“Маці жала, радзіла, пераначавала, дзень дома пабула і пашла работаць. Што большэ жэншчына робіць, то легчэ ражаць яна будзе”* [47].

Лічыліся, што фізічнае і псіхічнае здароўе будучага пакалення трэба фарміраваць нават яшчэ да нараджэння. Пры стварэнні сям’і прад’яўляліся патрабаванні да здароўя маладых: *“Дзеўка пойдзе на рэчку плацце праць. Жаніх ходзіць, выглядае, як прыйдзе з рэчкі і палезе на печ, то не бярэ, к другой пойдзе”* [89, с. 325]. Працэс прання бялізны з’яўляўся сапраўдным фізічным выпрабаваннем для дзяўчыны. Бялізну залівалі гарачай вадой з попелам і замочвалі ў жлукце, а затым выпалосквалі на рэчцы ці ў любым бліжэйшым вадаёме, білі пранікам, выкручвалі з дапамогай спецыяльнага калка, убітага на беразе. Асаблівай фізічнай загартоўкі гэты працэс патрабаваў зімой, у люты мароз, калі менавіта і стараліся памыць бялізну, каб яна добра вымерзла [164, с. 361-362]. Так ва ўмовах традыцыйнай культуры рэгіёна ставілася і даступнымі сродкамі вырашалася задача загартоўкі моладзі, а ў будучым – нараджэння здаровага патомства.

Здароўе нованароджанага – дар прыроды, падмурак, што забяспечвае выхаванне дасканалай, гарманічна развітай асобы. У народным разуменні здаровае дзіця – гэта разумнае, эмацыянальна развітае, вясёлае, моцна збітае, рухавае дзіця, якое хутка расце, рэагуе на слова, музыку, рытм, назіральнае, знаходлівае – *“як кроў з малаком”* [113, с. 177]. Па народных перакананнях, здаровыя дзеці нараджаюцца ў бацькоў не проста фізічна моцных, а тых, якія прытрымліваюцца правіл маралі. Адпаведна здароўе і знешні воблік выхаванца маглі змяняцца ў залежнасці ад паводзін, адносін да акружаючых, да прыроды.

Фізічная загартоўка дзяцей ранняга ўзросту ўяўляла сінтэз з народнай медыцынай і магіяй. Існавалі хваробы, якія ўспрымаліся не як фізіялагічны працэс, а тлумачыліся ірацыянальнымі прычынамі: *“пярэпалах”*, *“урок”*, “*прыстрэк”*, *“падзіў”*, *“каўтун”*, *“падучая хвароба”* (*“прычына”*, альбо *“насланне”*) [164, с. 388]. Універсальным сродкам для захавання фізічнага і псіхічнага здароўя, асабліва дзяцей ранняга ўзросту, лічыўся сон [22].

На Мазырскім Палессі сфарміравалася адметная культура аховы здароўя. Лячылі звіх, абмаражэнне, апёк: *“Мёдам лячылі кашаль, апёкі, страўнік”* [35], *“Калі заболее взрослы, его садзілі ў печ, што б ён пропоцел”* [51]. Палешукі верылі, што неабходна жыць у адзінстве з прыродай: *“Калі дзіця доўга не ходзіць, бацькі выносяць яго на ўзаранае поле, садзяць на ралі й абсяваюць кругом каноплямі. Калі каноплі ўзойдуць, та дзіця хутко пойдзе”* [173, с. 184].

Для прафілактыкі захворванняў і ўмацавання здароўя практыкавалася купанне ў крыніцах, скокі праз агонь. Найбольш распаўсюджана рытуальнае біццё галінкамі вярбы: *“Не я б’ю. Вярба б’е. За тыдзень-Вялікдзень, будзь здароў, не ўмірай, Вялікадня дачакай. Ужо недалеча чырвона яйка. Будзь здаровы як вада! Будзь багаты, як зямля!”* [46]. Каб быць здаровым і прыгожым (харошы, красны) качаліся па юраўскай расе, умываліся святой вадой [137, с. 107]. Абавязковай умовай захавання здароўя ўласнага і членаў сям’і з’яўляецца выкананне забарон ткаць, працаваць у святочныя дні.

Істотным паказчыкам фізічнага выхавання з’яўляюцца мясцовыя традыцыі прыгатавання ежы. Асноўныя перыяды харчавання дзяліліся на пост і мясаед. У сутках вылучаліся: *снеданне,* 7–8 гадзін раніцы; *абед*, 11–12 гадзін апоўдні; *полудзень*, 3–4 гадзіны папалудні; *вячэра,* 7–8 гадзін вечара [164, с. 281]. Большасць старажытных агульнаславянскіх страў (хлеб, бліны, сыр, масла, яечня) складалі аснову паўсядзённага і святочнага стала. У мясцовай кулінарыі паслядоўна выражана адзінства з роднай прыродай: пераважае раслінны пачатак, прыхільнасць да страў са злакавых культур, садавіны і гародніны, малочных і мясных прадуктаў, рыбы і дароў лесу. У рацыёне палешукоў больш істотнае месца, чым у іншых рэгіёнах, займалі мясныя і рыбныя стравы, грыбы. Ежа была найбольш прыродаадпаведнай, як вынік працы і дар роднай зямлі, захоўвала лекавыя ўласцівасці прадуктаў. Харчаванне дзяцей уключала кармленне грудзьмі і ранняе прывучэнне да паўсядзённай ежы: *“Боршч, каша, верэнікі з грушамі, галушкі, малако кіслае, кулеш, крупнік, булён з маком і сем’ем, камакі з сем’ем канапляным, наліснікі”* [36].

Жыццё ў акружэнні лясоў, у драўляных, экалагічна чыстых будынках аказвала натуральнае ўздзеянне, загартоўвала цела. У халодны час сям’я спала на нарах – пол, полік; старэйшыя – на печы; маладзейшыя – на лавах. Выкарыстоўваліся падушкі, дзяругі, сяннік (сяльнік) або мяшок, напханы сенам. Улетку, асабліва ў спякотны час, дзецi і дарослыя спалі ў сенцах, у клеці, пад паветкай, у гумне на саломе, на свежым сене [164, с. 368–370]. У адносінах да падлеткаў фізічнае выхаванне не вычлянялася ў самастойны працэс, але паўсядзённае жыццё было максімальна насычана фізічнымі нагрузкамі.

Хлопчыкі і дзяўчынкі з ранняга дзяцінства прымалі ўдзел у самастойна арганізаваных гульнях і забавах на ўлонні прыроды. Зімой – катанне на санках, самаробных лыжах і каньках: *“У лёд забівалі палку і круцілі, седалі з двух бакоў. Канькі дзераўяные хлопцы рабілі”* [49]. Вясной ладзілі арэлі: *“Бралі берозу, парылі і закручвалі і звязвалі провалакаю, клалі доску – кладзь”* [49]. Фізічнай падрыхтоўкі патрабавала гульня *“Скокалкі”* (дзяўчаты адначасова падскоквалі на розных канцах адной дошкі), прымеркаваная да свята *“Саракі”* [3].

Сярод гульняў спартыўнага характару на Мазырскім Палессі распаўсюджаны *“Крэглі”*, *“Рухі”*, *“Клёк”*, *“Свінка”*, *“Лапта”*, *“Гула”*, *“Качанне кола”*, *“У Чорнага пня”* [92]. Мясцовыя інфарматары прыгадваюць гульні *“У чыжыка”*, *“У Казла”* [6]. Летам гулялі *“У хованкі”*, *“У Пекура”*, *“У квача”*. Гульні падраздзяляліся на хлапечыя і дзявочыя: *“У Пекура хлопцы гулялі, а дзеўкі – не”* [1]. У Нараўлянскім раёне вядома гульня *“Баланды”*, якая складалася з двух этапаў, што мелі самастойныя назвы *“немец”* і *“зямлянка”* [3]. Летам вольны час выпадаў рэдка, таму часцей забавы арганізоўваліся ў ходзе пасьбы буйной рагатай жывёлы (тавару, худобы), паходаў у лес, на рэчку.

Гульні з мячом, зімовыя забавы патрабавалі не толькі трэніроўкі, але і вырабу інвентару: мячоў, санак, канькоў. Майстэрства гэта перадавалася ў дзіцячым асяроддзі ад старэйшых – малодшым: *“У кам’яча гулялі, станавіліся ўсе кругом і кідалі. У лесе на берозе расла губа, яе абразалі і рабілі кам’яч”* [51]. Старэйшыя вучылі малодшых плаваць, хадзіць на хадулях, куляцца праз галаву, скакаць праз канавы, бегаць навыперадкі, кідаць мяч, кола.

Нярэдка ў спаборніцтвах прымалі ўдзел і дарослыя мужчыны, што надавала гульням характар вясковага спартыўнага свята, як у в. Махнавічы: *“Мужчины деревни выливали большую гирю, ее называли “бабой”. Каким был вес гири, никто сказать не может. В деревне проживало около 500 жителей, из них “бабу” поднимало только три человека. Соревнования проходили каждый год весной”* [25].

Недахопам фізічнага выхавання, асабістай гігіены з’яўлялася адсутнасць у рэгіёне лазняў або іншых прыстасаванняў для рэгулярнага мыцця ўсяго цела: *“Дома ў печы нагрэла вады, развела да й памуласа. Чысты чацвер, хадзілі ў брод, у грэблю хадзілі купацца”* [24]. Гэты факт пацвярджаецца як археалагічнымі раскопкамі, так і даследчыкамі Палесся 30-ых гадоў XX ст. [128]. Сучасныя інфарматары паведамляюць, што мыліся да значных гадавых святаў, абавязкова два разы на год – да Каляд і да Вялікадня: *“Мыліся ў хатах до восхода сонца, убіралі в среду”* [137, с. 107]. Усталявалася меркаванне, што чалавек, які толькі што памыўся, можа лёгка *“падхапіць”* хваробу, паддаецца ўрокам, таму частае мыццё цела не адабралася. На купанне ў адкрытай вадзе існавала шэраг абмежаванняў: як варона схаваецца ў жыце, да Іллі і інш.

Толькі для немаўлят рабілася выключэнне. Дзяцей купаюць у начоўках, у цёплай вадзе, нагрэтай у печы з дабаўленнем лугу або лекавых траў, выціраюць ручніком. *"Дзіцятка – ета ангелочак кволенькі, дак яго трэба часьценько купаць у чысьценькай, цёпленькай вадзічцы, абціраць мякенькім рушніком, покуль не акрэпне да не падрасьце"* [164, с. 353], – лічыцца на Мазырскім Палессі. Па меры падрастання купаюць усё радзей, а 3–4-гадовае дзіця – толькі перад вялікімі святамі, у лепшым выпадку – раз на месяц [164, с. 351-355].

Летам дзеці і моладзь часта і ахвотна купалася ў рэках і азёрах, загараючы да чарнаты. У населеных пунктах, размешчаных на берагах рэк і азёр, вырастала нямала адважных плыўцоў. Але далёка не ўсе палескія вёскі маюць месцы зручныя для купання, таму дзеці купаюцца ў копанках, ямах, дзе капаюць гліну, *"бавяцца і качаюцца ў лужынах пасля ліўневага дажджу, выкарыстоўваючы гліну і гразь замест мыла. Старэйшыя, пазіраючы на гэта, кажуць: Усё адно што дзеці, што сьвіньне, бо і тыя, і тыя качаюцца ў гразі"* [164, с. 355]. З сучасных пазіцый такія працэдуры не адрозніваліся гігіенічнасцю, але ў цэлым садзейнічалі загартоўцы арганізма.

Асаблівасці побыту сфарміравалі ў даследчыкаў наступнае меркаванне пра палешукоў і Палессе: *"Бань сдесь не существует, живут грязно, не умываются и не чешутся. Свиньи, собаки, волы, гнездо бусла, оборванные, колтуноватые ребятишки. – вот картина деревень Полесья"* [160, с. 10]. Адпаведна і ўяўленні народа аб гігіене, зафіксаваныя даследчыкамі мінулага, не заўсёды супадаюць з агульнапрынятымі сёння: *"Хустачку-насоўку і прыбіральню паляшук расцэньвае як панскую выдумку і нават пасмейваецца: Тое, што мужык кідае да долу, пан носіць у кішэні, а што мужык за вуглам кідае сьвіньням, тое пан, схаваўшыся, нюхае сам"* [164, с. 367].

Фізічнае выхаванне – неад'емная частка народнай педагогікі Мазырскага Палесся, дзе яскрава праяўляюцца адметнасць светапогляду і спосабу жыцця беларусаў-палешукоў. Здароўе асабістае, дзяцей і членаў сям'і для палешука – вынік дабрачынных паводзін. Прырода і побыт – асноўныя сродкі фізічнага выхавання. Працоўна-фізічнае развіццё, прыродаадпаведная ежа і спартанскія ўмовы пражывання садзейнічалі фізічнай загартоўцы.

Змест экалагічнага выхавання на рэгіянальным узроўні ўключаў засваенне сістэмы эмпірычных ведаў аб прыродных працэсах і з'явах, удзел у разнастайных відах прыродакарыстальнай дзейнасці, фарміраванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды.

На Мазырскім Палессі былі назапашаны практычна-карысныя веды агратэхнічнага, метэаралагічнага і медыцынскага характару. Істотнымі з'яўляліся звесткі, якія садзейнічалі вызначэнню тэрмінаў сельскагаспадарчых

работ, збору дзікарастучых пладоў, палявання і лоўлі рыбы. Дзяцей прывучалі арыентавацца ў зменах надвор'я: *"Пчолы лётаюць непадалёк ад вулля – будзе дождж, залятаюць далёка ў поле – чакай добрага надвор'я"* [7]; абагульняць, рабіць вывады:*"Калі грыбна, то і хлебна"* [7]. Арыентаванне ў забалочанай лясістай мясцовасці па сонцу і зорках – значная частка рэгіянальных здабыткаў.

Усе веды практычнага характару перадаваліся вусна, вобразнай, вершаванай моваю, што садзейнічала запамінанню: *"Прыйдзе Мікола – выпусціць мошак з прыпола. Прыйдзе Пятро – сабярэ мошак у вядро. Прыйдзе Пятрок – адарве лісток. Прыйдзе Ілля – вышчыкне й два. Прыйдзе Спас – бяры рукавіцы пра запас"* [69, с. 166]. Трансляцыя ведаў ажыццяўлялася ад маці – дачцэ, ад бацькі – сыну, ад дзеда – унуку. Старэйшыя імкнуліся захаваць і перадаць нашчадкам народны каляндар, каб дапамагчы пазбегнуць неўраджаю, непажаданых наступстваў прыродных стыхій: марозу, засухі і інш.

У народным выхаванні асэнсоўвалася неабходнасць клопату аб роднай прыродзе. Вялікім грахом лічылася зняважліва абыходзіцца з зямлёй (біць калом, розгай, бізуном, калупаць нагой, чапаць зямлю ў перыяд зімовага сну), што вызначала этыку і эстэтыку паводзін [173, с. 50-54]. Беларусы-палешукі лічылі зямлю жывой істотай, якая надзялялася чалавечымі якасцямі і несла ў сабе жаночы пачатак: *"Зямля адна на свеце, яна наша матка, бо ўсе мы ат яе радзіліса. Усіх яна й прыме, як мы памром"* [173, с. 47].

Палеская прырода з'яўлялася і крыніцай матэрыяльнага дабрабыту, і вытокам натхнення: вызначала месца правядзення і сюжэты для дзіцячых гульняў, вобразы і ўзоры для народнай творчасці; матэрыял для вырабу адзення, абутку, дзіцячых забавак. Цацкі рабілі з дрэва, гліны, кудзелі, саломы, воўны, што садзейнічала прыродазгоднасці выхавання. Выкарыстоўваліся лучынкі, драўляныя цуркі, кавалкі тканіны, яйкі свойскіх птушак, шышкі, жалуды, ягады рабіны, кветкі: *"Браты рабілі самаробныя цацкі: ліпавыя свістулькі, лукі са стрэламі, драўляныя сані, рагаткі. Дзяўчаты – лялькі з кукурузных пачаткаў, вышывалі"* [13]. Любімымі заняткамі дзяцей з'яўляліся віццё вянкоў, назіранне за бягучымі па небе воблакамі і інш.

Міфалагічныя ўяўленні, адухаўленне прыроды з'явіліся асновай экалагічнага мыслення ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся. Вешчымі, а значыць недатыкальнымі, лічацца сярод палешукоў жаваранак, бусел, сойка, сарока, салавей, сава, варона, галка. Разнастайныя міфы сямейнай і маральна-побытавай тэматыкі прысвечаны зязюлі. Гэта вешчая птушка – прадказальніца будучага. Па народных уяўленнях не толькі зязюля кукуе, але і кожны чалавек, якога спаткала няшчасце: жонка па мужу, дзяўчына – па жаніху. Бусел для беларусаў-палешукоў – святая птушка, пасяліўшыся на хаце яна адганяе

маланку, чары, град, спрыяе багаццю. Зрабіць шкоду буслу – грэх, што можа выклікаць няшчасце, пажар, смерць, калецтва, слепату і глухату ў дзяцей [137].

Пакараннем за няправільныя адносіны да прыроды (разбурэннем гнёздаў ластавак дзецьмі) маглі быць набытыя асаблівасці знешнасці, якія несумяшчальны з народнымі ўяўленнямі аб прыгажосці: з’яўленне рабаціння, барадавак. На Мазыршчыне распаўсюджана легенда аб няшчаснай маці, у якой хварэла дачка, пры гэтым хвароба – пакаранне за амаральны ўчынак, разбуранае ў час цяжарнасці птушынае гняздо [137, с. 161].

Сярод насякомых, якія шануюцца на Мазырскім Палессі, божая кароўка (петрык) і пчала або пчолка. Існуе сапраўдны культ пчалы: *“Забіць птушку – грэшно ці велікі грэх, – але наўмыснае забойства пчалы – гэта вельмі вялікі грэх; нават ненаўмысна забіць пчалу лічыцца злачынствам”* [164, с. 310]. Выключная працавітасць пчол і іх здольнасць заўсёды знаходзіць дарогу ў свой вулей выступаюць узорам працоўнага і патрыятычнага выхавання.

Самай значнай у жыцці палешука сярод свойскіх жывёл з’яўляецца карова: *“Калі добрая карова, дык і ўся сям’я здарова”* [69, с. 166]. Забароны, якія датычацца цельнай каровы раўназначны клопату пра цяжарную жанчыну [164, с. 334–335]. Дзеці, якія на Мазырскім Палессі звычайна выконвалі функцыі пастухоў, добра ведалі асаблівасці догляду жывёлы.

У дзіцячым асяроддзі папулярны заклічкі – паэтычныя звароты-просьбы дзяцей да прыродных аб’ектаў і стыхій: сонца, месяца, дажджу, птушак і насякомых: *“Петрык, петрык, ляці на небка, там твае дзеткі ядзяць катлеткі, усім па адной, а табе ні адной”* [30]. У іх утрымліваецца вопыт народа аб прыкметах і зменах надвор’я, які лёгка засвойваецца ў паэтычнай форме: *“Бусел, бусел, калода, скажы, якая будзе пагода?”* [30]. Этнолагі адзначаюць, што анімістычныя ўяўленні народаў свету, у тым ліку і славянскіх, – з’ява, дэтэрмінаваная культурай і выхаваннем, распаўсюджаная вельмі шырока, але не паўсямесна [140]. Абапіраючыся на анімізм, старажытны міфалагічны светапогляд, які знаходзіць падтрымку ў псіхічнай прыродзе дзіцяці, народная педагогіка Мазырскага Палесся прывучала ўспрымаць навакольную прыроду як адухоўлены аб’ект, фарміравала вобразнае мысленне.

У народнай творчасці захаваліся ўяўленні пра пераўтварэнне душы чалавека ў звяроў і птушак, дрэвы, кветкі, камяні, рэчкі [148]. Пераўтварэнні адбываліся ў выпадку праклёну, каб пазбегнуць непажаданага шлюбу, як расплата за парушэнне норм маралі: *“Нахіліўшыяся над вадой вербы – гэто праклятыя Богам тыя мацеры, што страцілі сваіх дзяцей”* [173, с. 57]. Паводле мясцовых паданняў, часцей за ўсё збывалася пракляцце маці: “*Паданне аб рацэ Чэрчень*”, “*Матчына пракляцце”* [69, с. 196-198]. Адухаўленне рэчак, азёраў, лясоў выхоўвала гуманныя адносіны да іх.

***Эстэтычнае выхаванне*** характарызуе адносіны палешукоў да прыгожага, духоўнае развіццё асобы ў шырокім сэнсе. Народная творчасць Мазыршчыны, незалежна ад жанру і спосабу перадачы інфармацыі, мае выразную павучальную скіраванасць. Увогуле любая дзейнасць можа ацэньвацца як з'ява эстэтычная: *"Працуеш і смак чуеш"* [197, с. 77].

Многіх даследчыкаў захапляюць адносіны палешукоў да прыгожага. Эстэтыка прысутнічала практычна ўсюды: у штодзённым побыце, святах, ва ўсіх элементах матэрыяльнай і духоўнай культуры. Сялянамі ўпрыгожваўся сам будынак хаты: канёк даху, аканіцы, ганак, вароты. У хаце такую ролю выконвалі фіранкі на вокнах, ручнікі з узорамі, тканыя дываны і інш. Аздабляліся разьбой прылады працы, мэбля, посуд. Асаблівая роля ў эстэтычным выхаванні належыць народнаму святочнаму касцюму. Наогул, прыгожыя рэчы, зробленыя бацькамі ці далёкімі продкамі, захоўваліся ў сям'і як рэліквія. Фарміраванне эстэтычнага густу было не самамэтай, а падпарадкавана задачы далучэння да дабрадзейнасці. Добрае і прыгожае ў народзе былі тоеснымі паняццямі.

У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся адсутнічае раздзяленне эстэтычнага і мастацкага выхавання, таму асобна можна вылучыць музычна-эстэтычнае, харэаграфічна-эстэтычнае, песенна-эстэтычнае выхаванне. Патрабаванні да эстэтычнага развіцця даволі высокія, падкрэсліваецца яго залежнасць ад інтэлекту: *"Дурнога салаўя – дурная песня"* [72, с. 153].

Змест эстэтычнага выхавання ахопліваў многія аспекты, быў шматфункцыянальным і прадугледжваў веданне асноўных цыклаў народнай творчасці, засваенне народнага этыкету, авалоданне ведамі і навыкамі ў галіне народных рамёстваў. У яго ўваходзілі: каляндарна-абрадавая паэзія, якая падзяляецца на зімовы, веснавы, летні, восеньскі перыяды; сямейна-абрадавая паэзія (радзінная, вясельная, пахавальныя галашэнні); пазаабрадавая паэзія (песні пра каханне, сямейная лірыка, балады і прыпеўкі); дзіцячы фальклор і народная проза (калыханкі і забаўлянкі, заклічкі, дзіцячыя песні, лічылкі і гульні, казкі пра жывёл, чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя, жарты і анекдоты, легенды і паданні); дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (разьба па дрэве, ганчарства, ткацтва, вышыўка, пляценне, размалёўка, кавальства, народная архітэктура); народны этыкет (эстэтыка жылля і адзення, нормы харчавання і адпачынку, правілы паводзін, сямейна-побытавая культура).

Разнастайныя віды і жанры народнага мастацтва паводле гісторыка-педагагічнай класіфікацыі з'яўляюцца састаўнымі часткамі зместу эстэтычнага выхавання, сістэмай даступных народу "вучэбных прадметаў", дзе ў вобразнай форме ўвасоблены спрадвечны сацыяльны вопыт. Усе кампаненты выступалі ва ўзаемасувязі, часткай народных святаў былі не толькі песня, але і

харэаграфічная культура, народны тэатр, у значнай ступені – народная музыка. Змест залежаў ад распаўсюджанасці вуснай народнай творчасці ў населеных пунктах Мазыршчыны. У пэўнай вёсцы маглі больш разгорнута адзначаць тое або іншае свята, што вызначалася традыцыямі, але назіралася паўсямесна.

Змест эстэтычнага выхавання ў значнай меры быў абумоўлены ўзростам, палавой прыналежнасцю, сацыяльным статусам, прафесіяй. Аб узроставай дыферэнцыяцыі сведчыць існаванне дзіцячага фальклору, які ўзнаўляўся для самых маленькіх дарослымі, а затым самімі дзецьмі малодшага ўзросту. Роля дзяцей у абодвух абрадавых комплексах даволі выразна акрэслена. У малодшым узросце яны часцей з’яўляліся аб’ектамі абраду (радзіны), яго сведкамі або пасіўнымі ўдзельнікамі (вячоркі). Падросшы, падлеткі маглі як самастойна выконваць абрады (абходы двароў, валачобніцтва, калыханне на арэлях), так і ўдзельнічаць у іх разам з дарослымі (вяселле, жніва), у выніку чаго адбываліся перадача і засваенне традыцыйнай культуры рэгіёна.

У карагодах і гульнях удзельнічалі дзеці і моладзь абодвух палоў. Траецкія абрады спраўляліся пераважна дзяўчатамі, у абрадзе калядавання заўважаецца больш актыўная роля хлопцаў, мужчын. Апавядальнікамі народных казак, легенд і паданняў, знаўцамі прыказак з’яўляліся людзі сталыя.

У традыцыйнай культуры рэгіёна мела месца своеасаблівая песенная школа, народная сістэма навучання спевам. Спяваць вучылі маці, бабуля або старэйшыя дзеці, а недзе з 5-6 гадоў дзеці выконвалі свае песні самастойна, чаму спрыяла ўзнікненне вулічных хораў. Народныя дзіцячыя песні насычаны камічнымі сітуацыямі: *“Ду-ду, ду-ду, сядзіць голуб на дубу”* [30]. У іх дзейнічаюць жывёлы і птушкі, у паводзінах якіх ўвасабляюцца рысы чалавечага характару, адлюстраваны народныя ўрачыстасці (сватанне, вяселле, улазіны). Дзеці ахвотна спявалі абрадавыя і пазаабрадавыя песні, якія аказвалі ўплыў на іх эмацыянальнае развіццё. Народныя песні: *“Цячэ рэчанька-невялічанька”*, *“А ў полі бероза”*, *“Отдала мене маці”* [22] раскрываюць складаныя ўзаемаадносіны паміж маці і дачкой, свякрухай і нявесткай, мужам і жонкай.

Эстэтычнае выхаванне моладзі адбывалася пры засваенні рэпертуару народных танцаў: *“Чобаты”*, *“Нарэчанька”*, *“Кросны”*, *“Юрачка”*, *“Крыжачок”*, *“Матлёт”*, *“Полькі”* (*“Дзедушка”*, *“Калхозна”*, *“Бонцікава”*) [24], якім уласцівы жыццярадасны, энергічны характар. Выяўляецца наяўнасць масавых і сольных, жаночых і мужчынскіх, змешаных танцаў і карагодаў, танцаў з удзелам дзяцей. Народнае мастацтва садзейнічала самавыражэнню, таму папулярныя танцы і песні на Мазыршчыне атрымлівалі ўласныя імёны асоб, якім падабаліся. Хлопцы і нават мужчыны аддавалі перавагу пэўным танцавальным мелодыям: *“Іванаў танец”*, *“Нічыпараў танец”* [164, с. 520].

Палешукі перакананы, што ўмельства да танцаў у дзяўчат з’яўляецца прыроджаным. Па сведчанні большасці інфарматараў, народным танцам ніхто спецыяльна не вучыў: “*У чыёй хаці нема мацеры дома, то сабіраюцца і выбіваюць*” [22]. Навучанне ажыццяўлялася метадам пераймання “*Танцавалі кадрылі, полькі. Вучыліся адзін за адным, перадавалі*” [1]. Знаходзіліся аматары займацца з дзецьмі, у тым ліку людзі з абмежаванымі магчымасцямі: “*Поля нас вучыла танцаваць, была яна як дзеці, барабаніла, дзецей няньчыла*” [51].

Дасканалыя па форме, вобразныя і лаканічныя, творы народнай харэаграфіі лёгка засвойваліся дзецьмі праз перайманне і прыклад старэйшых удзельнікаў, прывучылі эмацыянальна адгукацца на музыку і песню: “Была ў нас гульня Падаляначка – браліся ў круг, выбіралі дзяўчынку, яна танцавала ў цэнтры, астатнія спевалі: Дзе ты була, падаляначка? / Дзе ена ўпала, да землі прыпала. / Уставай, уставай падаляначка, / Вытры вочкі як масляначка. / Берыся ў бокі і танцуй свае скокі. / Як будзеш убіраць, выбірай себе апяць” [47]. Удзел у музычных гульнях дазваляў пазней арганічна ўключацца ў маладзёжныя забавы, традыцыйныя абрады, паколькі творы народнай харэаграфіі характарызуюцца адзінствам, паўтаральнасцю 2-3 асноўных музычна-пластычных формул, якія ствараюць магчымасці для разнастайных варыянтаў, цікавыя і дзецям, і дарослым, спрыяюць масаваму выкананню.

Музыка ва ўсходне-палескай традыцыі лічылася мужчынскай справай, жанчына, якая іграе на музычным інструменце, – нонсенс для народнай культуры. Вялікай павагай карысталіся менавіта самадзейныя музыкі, якія не ведалі нотнай граматы, імправізавалі па слыху, што патрабавала і прыродных здольнасцей, і вялікага цярпення. Музычнае майстэрства выступала ў якасці паказчыка рознабаковага развіцця чалавека: “*І швец, і жнец, і на дудзе ігрэц*” [197, с. 73]. Даследчыкі адзначаюць выключную чуллівасць, аж да слёз, палешукоў да музыкі, асабліва ігры на скрыпцы [164]. Казка *“Музыка”*, запісаная А.К. Сержпутоўскім на Мазырскім Палессі, сведчыць, што народная музыка аказвае моцнае ўздзеянне на чалавека, лечыць душу і цела. У дзіцячым асяроддзі мелі пашырэнне музычныя забаўкі, выкананне мелодый на самаробных інструментах з пер’я, саломы, інвентару: “*Гралі на грэбені, самі ад сябе вучыліся. Іграць на грэбні – гэто такая дзецкая забава*” [49].

На змест эстэтычнага выхавання значны ўплыў аказалі народныя рамёствы: разьба па дрэву, цяслярства, лазапляценне, бондарства, кавальства і інш. Жаночымі заняткамі з’яўляліся прадзенне, ткацтва, шыццё адзення. У рэгіёне вядомы асноўныя віды ткацтва: пераборнае, шматнітовае, бранае, узорнае, закладное, *“пад палатно”* [202, с. 495–496]. Працэс ткацтва, складаны і працаёмкі, з’яўляўся народнай школай працоўна-эстэтычнага выхавання.

У аснове эстэтыкі народных рамёстваў – народны арнамент, узрост якога вызначаецца тысячагоддзямі. Мовай арнаменту выказаны асноўныя ідэі народнага светапогляду (дабро і зло, жыццё і смерць), распрацавана тэма сям'і, маці і дзяцей [117]. Эстэтыку палескай хаты немагчыма ўявіць без рушнікоў, просцілак, накідак на падушкі, падзорнікаў і інш. Непаўторнай прыгажосцю вылучаюцца Турава-Мазырскі, Калінкавіцкі і Брагінскі народныя строі.

Глыбокі сэнс існуе ў размяшчэнні арнаменту на адзенні: характар узораў, колер і месца іх лакалізацыі адлюстроўвае сямейнае, сацыяльнае становішча, садзейнічае здароўю і працаздольнасці чалавека. Белы, чырвоны і чорны – асноўныя колеры народнага касцюма, арнаменту, і пры гэтым іх адносяць да універсальных колераў чалавечай культуры. Даследчыкі адзначаюць, што чалавецтва карыстаецца адзіным колеравым спектарам, але кожны народ стварае ўласную мадэль свету, у якой пэўныя колеры могуць адсутнічаць або наадварот, дэталізавацца, што звязана з прыродай, гістарычна-культурным развіццём. "Тут трэба заўважыць, што паляшук умее вызначаць толькі некаторыя фарбы: белую, чорную, чырвоную (разам з блізкімі ёй), жоўтую (ад светлай да аранжавай уключна), сінюю і зялёную разам з блакітнай і салатнай, але калі сіняя і зялёная сутыкаюцца непасрэдна, тады, не могучы адрозніць зялёнай ад сіняй ці блакітнай – называе сіняй" [164, с. 288].

Такім чынам, змест народнага выхавання ў шырокім сэнсе прадугледжвае засваенне сацыяльнага вопыту папярэдніх пакаленняў, мае сінкрэтычны характар і рэалізоўваецца комплексна, на працягу ўсяго жыцця. Структурныя кампаненты зместу аб'яднаны патрабаваннямі народнай маралі, сістэмай рэгіянальных забарон, выкананне якіх кантралявалася грамадскай думкай.

Асноўныя напрамкі рэалізацыі зместу народнага выхавання прадстаўлены ў табліцы 1.3.

**Табліца 1.3 – Змест выхавання ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся**

| Маральнае выхаванне |
|---|
| ▪ павага да старэйшых, засваенне норм традыцыйных узаемаадносін у сям'і;<br>▪ замацаванне станоўчых звычак з дзяцінства, фарміраванне глыбокіх маральных пачуццяў;<br>▪ асабістая адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей і грамадскі кантроль за вынікамі выхаваўчай дзейнасці;<br>▪ з'яўленне дзяцей з пэўнымі асаблівасцямі як вынік парушэння бацькамі ці пазней і самім выхаванцам народных звычаяў і маральных норм;<br>▪ паводзіны за сталом і адносіны да хлеба як паказчык агульнай культуры чалавека;<br>▪ нормы ўзаемаадносін паміж членамі сям'і і, паміж дзецьмі;<br>▪ народная мараль – рэгулятар выхаваўчай дзейнасці і ўзаемаадносін;<br>▪ адзінства маральнага і рэлігійнага выхавання ў сям'і;<br>▪ грэх і яго асноўныя ступені: вялікі грэх, грэх, грашно;<br>▪ маральныя паняцці "сорам", "праўда", "крыўда", "око запарушано" як аснова ўнутранай, глыбокай духоўнасці;<br>▪ адносіны да зайздрасці, гордасці, гняўлівасці, брыдкаслоўя; |
| **Разумовае выхаванне** |
| ▪ праяўленне клопату аб нараджэнні разумных, псіхічна здаровых дзяцей;<br>▪ захаванне бацькамі і членамі сям'і рэгіянальных забарон і норм народнай маралі;<br>▪ узаемасувязь разумовага развіцця і маўлення, агульнай культуры, выхаванасці;<br>▪ ранняе развіццё памяці і мыслення выхаванцаў сродкамі народнай педагогікі: забаўлянкі, дзіцячыя песні, загадкі, загадкі-задачы;<br>▪ перадача традыцыйнай сумы ведаў і разумення сутнасці жыццёвых з'яў ад старэйшых – малодшым;<br>▪ высокая ацэнка беларусамі-палешукамі прыроднага, практычнага розуму, без чаго немагчыма эфектыўнасць выхаваўчага ўздзеяння;<br>▪ зацікаўленасць бацькоў у інтэлектуальным развіцці дзяцей, удасканаленні памяці, увагі, лагічнага мыслення;<br>▪ традыцыйная працоўная дзейнасць як аснова разумовага развіцця;<br>▪ адносіны беларусаў-палешукоў да навукі, вучобы, інтэлектуальных заняткаў; |

| Працоўнае выхаванне |
|---|
| ▪ ранняе выяўленне і развіццё ў сям'і прыродных здольнасцей да той або іншай традыцыйнай дзейнасці; ▪ паслядоўнасць працоўнага выхавання: уздзеянне сугестыўнага характару з дапамогай абрадаў і рытуалаў, арганізацыя імітацыйных працоўных гульняў, сумесная са старэйшымі працоўнай дзейнасць; ▪ адзінствам працоўнага і фізічнага развіцця дзіцяці, пастаянныя працоўныя даручэнні адпаведна полу і ўзросту; ▪ узаемасувязь працоўнага і эстэтычнага выхавання, разнастайнасць мясцовага фальклору працоўнай тэматыкі, што аблягчала працу і надавала ёй эмацыянальна-выхаваўчы змест; ▪ строгая дыферэнцыяцыя традыцыйных відаў дзейнасці па полу, што абгрунтавана мясцовымі звычаямі і забаронамі; ▪ мэтанакіраванае выхаванне будучага гаспадара або гаспадыні, здольнага да самастойнай дзейнасці ва ўмовах патрыярхальна-натуральнай гаспадаркі; ▪ фарміраванне станоўчых адносін да працы, грамадскае асуджэнне гультайства; ▪ выхаванне ў працы важнейшых чалавечых якасцей: калектывізму, настойлівасці, самастойнасці і інш.; ▪ абумоўленасць зместу рэгіянальнымі працоўнымі заняткамі, рамёствамі і промысламі; |
| **Фізічнае выхаванне** |
| ▪ разуменне адзінства духоўнага і фізічнага здароўя членаў роду, сям'і; ▪ высокія патрабаванні да здароўя маладых у сувязі з будучым дзетанараджэннем; ▪ рэгіянальныя традыцыі догляду дзяцей да года і спецыфіка лячэння дзіцячых хвароб; ▪ фізічнае выхаванне як састаўны элемент працоўнага жыцця на ўлонні прыроды і побыту; ▪ народныя спартыўныя гульні і святы ў традыцыйнай культуры рэгіёна; ▪ успрынящце здароўя як каштоўнага дару прыроды, высокая ацэнка фізічнай моцы і даўгалецця: родная прырода як ідэал здароўя, праца – як яго выток; ▪ фізічнае выхаванне як працэс загартоўкі арганізма ў натуральных умовах: жыццё ў акружэнні лясоў, у драўляных, экалагічных будынках; ▪ арганізацыя сну і адпачынку ў залежнасці ад пары года; |

| |
|---|
| ▪ мясцовыя традыцыі прыгатавання ежы і харчавання дзяцей;<br>▪ насычанасць жыцця дзяцей усемагчымымі фізічнымі нагрузкамі; гульні на прыродзе ў залежнасці ад сезону: зімовыя забавы, арэлі, скокалкі; загартоўка пры пасьбе жывёлы, паходах ў лес, на рэчку і інш.; |
| **Экалагічнае выхаванне** |
| ▪ практычная узаемасувязь этыкі, эстэтыкі і экалогіі, што выступалі рэгулятарам паводзін чалавека ў прыродным асяроддзі;<br>▪ вуснае засваенне сістэмы эмпірычных ведаў (агратэхнічных, метэаралагічных, ветэрынарных) аб прыродных працэсах і з'явах;<br>▪ спецыфіка зместу і перадачы рэгіянальнага мясяцовага і сонечнага календара;<br>▪ гульні і забавы на прыродзе, удзел у разнастайных відах прыродакарыстальніцкай дзейнасці;<br>▪ фарміраванне аптымальных (утылітарных і ідэальных) узаемаадносін з прыродай, заснаваных на самаарганізацыі, экалагічнай раўнавазе;<br>▪ анімістычныя ўяўленні, вера ў магчымасць пераўтварэння чалавека ў прыродныя аб'екты, што фарміравала перакананне аб пакаранні за няправільныя адносіны да прыроды;<br>▪ адносіны беларусаў-палешукоў да роднай зямлі як да жывой істоты, адзінства чалавека і прыроды;<br>▪ найбольш шануемыя ў рэгіёне птушкі, звяры, насякомыя, дрэвы і расліны;<br>▪ экалагічнае выхаванне сродкамі дзіцячага фальклору: заклічкі, прыгаворкі, звароты да прыродных аб'ектаў і з'яў (рытуалы выклікання дажджу і ўдзел у іх дзяцей і падлеткаў); |
| **Эстэтычнае выхаванне** |
| ▪ адзінства мастацтва і працы, засваення народнай творчасці і рамёстваў, фарміраванне эстэтычнага густу сродкамі прыроды і побыту;<br>▪ мэтанакіраванасць эстэтычнага развіцця дзяцей, існаванне народнай сістэмы масавага навучання спевам, танцам і інш.;<br>▪ дыферэнцыяцыя эстэтычнага выхавання па полу і ўзросту, прафесіі і сацыяльным статусе;<br>▪ адносіны да прыгожага, да эстэтычнай дзейнасці, самавыражэнне ў музыцы, песні, танцы;<br>▪ выкарыстанне ў выхаваўчай дзейнасці маральна-павучальнай сутнасці фальклору, вера ў стваральную, выхаваўчую сілу народнага мастацтва;<br>▪ патрабавальнасць палешукоў да эстэтычна-мастацкага і эстэтычна-працоўнага развіцця моладзі, любоў да народнай музыкі і песні; |

- масавае і абавязковае эстэтычнае развіццё асобы сродкамі прыроды, народнага мастацтва, эстэтычна значнай традыцыйнай працоўнай дзейнасці;
- асноўныя жанры фальклору, рэгіянальныя звычаі і абрады як састаўныя часткі зместу эстэтычнага выхавання;
- дзіцячы фальклор як сведчанне клопату аб эстэтычным развіцці новых пакаленняў.

Падсумоўваючы вышэйсказанае трэба адзначыць, што самабытная традыцыйная культура Мазырскага Палесся заўсёды прыцягвала ўвагу навукоўцаў. Значны ўклад у яе вывучэнне ўнеслі дарэвалюцыйныя (З. Даленга-Хадакоўскі, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, А. Кіркор, К. Машынскі, Ч. Пяткевіч, А. Сержпутоўскі, І. Сербаў, П. Шпілеўскі), савецкія (В.К. Бандарчык, І.М. Браім, М.Я. Грынблат, А.Я. Крукоўскі, Г.М. Курыловіч, Н.І. Лебедзева, Л.А. Малчанава, І.Д. Назіна, М.Ф. Піліпенка) і сучасныя даследчыкі (А.В. Гурко, К.П. Кабашнікаў, Г.І. Каспяровіч, В.С. Новікава, І.У. Чаквін, І.Ф. Штэйнер і інш.).

Навуковыя крыніцы сведчаць, што ў рэгіёне ва ўмовах ізаляванасці і абмежаванасці кантактаў, па-першае, адбылася кансервацыя выхаваўчых поглядаў старажытных славян, якія з дагістарычных часоў засялялі ўзбярэжжа Прыпяці; па-другое, павялічылася разыходжанне паміж рэгіянальнымі супольнасцямі, што паступова прывяло да фарміравання адметнай выхаваўчай культуры, якая ўтрымлівае архаічныя элементы этнічнай выхаваўчай практыкі.

Адпаведна абраным метадалагічным падыходам, традыцыйная культура рэгіёна разглядаецца як закрытая, ізаляваная ад знешняга ўплыву самаарганізаваная сістэма, неад'емнай часткай якой з'яўляюцца народныя выхаваўчыя традыцыі. Народная педагогіка Мазырскага Палесся аналізуецца як аўтаномная адкрытая сацыяльна-педагагічная сістэма, якая мае тэндэнцыю да самаўзнаўлення, абмену інфармацыяй з асяроддзем, але толькі ў межах рэгіёна. Асноўным элементам (аб'ектам) народнай педагогікі з'яўляецца чалавек, структурнымі кампанентамі – выхаваўчы ідэал, мэта, змест, прынцыпы, метады і сродкі выхавання.

Народны выхаваўчы ідэал – выпрацаванае стагоддзямі ўяўленне аб дасканалым чалавеку, узор, мера народнага выхавання. Прадстаўлены два ўзаемазалежных ідэалы – ідэал дзяўчынкі, дзяўчыны, маладзіцы, жанчыны і ідэал хлопчыка, юнака, мужчыны. Пры гэтым характэрна прысутнасць не толькі індывідуальнай, але і калектыўнай ацэнкі (славы) роду і сям'і – сукупнасці ідэальных якасцей прадстаўнікоў дадзенага рэгіёна.

Выхаваўчы ідэал абумоўлены менталітэтам і нацыянальна-псіхалагічнымі асаблівасцямі беларусаў-палешукоў (жыццёва-матывацыйнымі,

эмацыянальна-валявымі, інтэлектуальна-пазнаваўчымі, камунікатыўнымі), якія перадаюцца генетычна або набываюцца ў працэсе выхавання і сацыялізацыі. У народнай педагогіцы яны праяўляюцца наступным чынам: патрабавальнасць, імкненне павучаць, кантраляваць; выхаванне на аснове высокай маральнай адказнасці; эмацыянальная стрыманасць; мэтанакіраванае фарміраванне жыццёва неабходных якасцей: працавітасць, цярплівасць, сіла волі, мясцовы патрыятызм; псіхалагічны пачатак у выхаванні, увага да развіцця дзяцей ранняга ўзросту; адсутнасць дробязнай апекі; перавага практычных метадаў выхавання; фарміраванне ўяўленняў аб ідэальнай асобе ад супрацьлеглага, з дапамогай камічнага, метадам асуджэння і высмейвання; істотная, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі, роля міфалагічных уяўленняў у выхаваўчай практыцы.

Паводле традыцыйных уяўленняў, нараджэнне ідэальнага, псіхічна і фізічна здаровага дзіцяці магчыма пры пэўных умовах: добрая спадчыннасць; адпаведны мясцовым умовам менталітэт; захаванне бацькамі рэгіянальных забарон і прадпісанняў; спрыяльны для нараджэння стан прыроды. Выхаванне асобы адбываецца на працягу ўсяго жыцця і абапіраецца на ўнутраныя (спадчыннасць, актыўнасць асобы), знешнія (прыроднае асяроддзе, сямейнае і грамадскае выхаванне) і ірацыянальныя фактары (лёс, доля, планіда, талан).

Мэта выхавання – на аснове засваення рэгіянальнай культуры выхаваць чалавека духоўна і фізічна загартаванага, надзейнага ў практычна-жыццёвым плане, добрага працаўніка, гаспадара і майстра, носьбіта і захавальніка традыцый продкаў.

Змест выхавання прадугледжвае перадачу і засваенне вопыту продкаў (жыццёва-практычнага, эмацыянальнага, творчага) з улікам полу выхаванца. Асобна разгледжаны наступныя складаемыя зместу народнага выхавання: маральнае (павага да старэйшых; адносіны да хлеба; замацаванне станоўчых звычак з дзяцінства; грамадскі кантроль над вынікамі выхаваўчай дзейнасці бацькоў; глыбіня маральных пачуццяў); разумовае (клопат аб нараджэнні здаровага дзіцяці; развіццё памяці і мыслення сродкамі фальклору; перадача разумення сутнасці жыццёвых з’яў ад старэйшых – малодшым); працоўнае (выхаванне будучага гаспадара або гаспадыні; імітацыйныя працоўныя гульні; пастаянныя працоўныя даручэнні адпаведна полу і ўзросту; сумесная са старэйшымі працоўная дзейнасць); фізічнае (ідэалізацыя фізічнага здароўя; высокія патрабаванні да здароўя маладых у сувязі з будучым дзетанараджэннем; рэгіянальныя традыцыі догляду дзяцей да года; загартоўка арганізма ў натуральных умовах); экалагічнае (адухаўленне прыроды як рэгулятар паводзін; перадача агратэхнічных, метэаралагічных і медыцынскіх ведаў і рэгіянальнага календара); эстэтычнае (адзінства мастацтва і працы; сістэма навучання спевам; фарміраванне эстэтычнага густу сродкамі прыроды і

побыту; маральна-павучальная сутнасць фальклору). Пры гэтым менавіта народная мараль выступае падмуркам зместу выхавання, пранікае ва ўсе нюансы ўзаемаадносін паміж дарослымі і дзецьмі. Хвароба, з'яўленне дзяцей з пэўнымі асаблівасцямі разглядаюцца як вынік парушэння бацькамі ці пазней і самім выхаванцам народных звычаяў і маральных норм. Падобныя перакананні маюць тэндэнцыю да пераасэнсавання і выкарыстання не толькі ва ўмовах традыцыйнай, але і сучаснай культуры.

# ГЛАВА 2
# АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫХАВАННЯ Ў НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ МАЗЫРСКАГА ПАЛЕССЯ

## 2.1 Прынцыпы народнага выхавання

Прынцыпы вызначаюць асновы выхавання чалавека ў традыцыйнай культуры рэгіёна. У беларускай народнай педагогіцы даследчыкамі вылучаны наступныя прынцыпы: "выхаванне ў працы, сувязь з жыццём, з навакольным светам, гуманізм, цэльны і ўсебаковы падыход да выхавання, пераемнасць у выхаванні, заахвочванне ініцыятывы і творчасці дзяцей, непарыўнасць выхаваўчага ўздзеяння" [63, с. 7].

Прынцыпы народнай педагогікі Мазырскага Палесся – гэта патрабаванні да выхаваўчай дзейнасці, якія забяспечваюць эфектыўнасць фарміравання асобы на аснове рэгіянальнай культуры і вынікаюць з агульных, устойлівых і паўтараемых заканамернасцей, характэрных для традыцыйнага ладу жыцця. Да агульных, глыбінных заканамернасцей адносяцца: а) узаемасувязь чалавека і прыроды, сусвету; б) цыклічнасць прыроднага, гаспадарчага і сацыяльнага быцця і фальклору; в) жыццё ў працы, натуральны характар гаспадаркі; г) адзінства духоўнага і матэрыяльнага, рацыянальнага і ірацыянальнага ў жыцці; д) пераемнасць традыцый, кансерватызм, культ продкаў.

Адпаведна выхаванне будзе неэфектыўным, калі: а) нанясеш шкоду прыродзе – атрымаеш суровы жыццёвы ўрок; не будзеш улічваць спадчыннасць, пол, узрост і змалку выхоўваць дзіця – вырасце недарэкаю, не зможа рэалізаваць свой жыццёвы патэнцыял, зганьбіць славу роду; б) не створыш сям'ю – перарвеш сувязь пакаленняў у вечным жыццёвым колазвароце; не прымеш удзелу ў гуканні вясны – парушыш гадавы цыкл прыроды і не вырасціш добрага ўраджаю; в) не прывучыш дзіця да працы, не навучыш рамяству – вырасце гультаём, не зможа пракарміць сябе і блізкіх, будзе пагарджанае людзьмі; г) бацькі, члены сям'і не баяцца граху, не прытрымліваюцца рэгіянальных забарон – дзіця народзіцца з псіхічнымі і фізічнымі адхіленнямі, атрымае цяжкую долю; д) адцураешся ад бацькоў, забудзеш магілы продкаў – будзеш у старасці пакараны ўласнымі дзецьмі.

На аснове названых заканамернасцей у даследаванні вылучаны пяць асноўных прынцыпаў народнай педагогікі Мазырскага Палесся: 1) прыродазгоднасці; 2) цыклічнасці; 3) сувязі з працай; 4) адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага; 5) культуразгоднасці. Прынцыпы прыродазгоднасці і культуразгоднасці – універсальныя ў педагагічнай навуцы;

прынцып сувязі з працай – бясспрэчны для народнай педагогікі, хаця традыцыйныя заняткі часцей разглядаюцца як метад або сродак выхавання. Прынцып цыклічнасці абапіраецца на рытм прыроднага і сацыяльнага жыцця, што дазваляе надаць выхаванню ўстойлівы і мэтанакіраваны характар. Вылучэнне прынцыпу адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага ў выхаванні – самастойны і ў многім дыскусійны вынік дадзенага даследавання, зроблены на аснове аналізу традыцыйнай культуры рэгіёна.

Пры гэтым асноўным з’яўляецца прынцып цыклічнасці, паколькі на эфектыўнасць народнага выхавання істотна ўплываюць, арганізуюць яго наступныя складаемыя: цыклічнасць прыроды і чалавечага жыцця (прынцып прыродазгоднасці), цыклічнасць фальклору і ладу жыцця (прынцыпы культуразгоднасці, адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага), цыклічнасць сельскагаспадарчай працы (прынцып сувязі з працай).

Прынцыпы выхавання ўваходзяць у звод няпісаных, але паслядоўна ажыццяўляемых палажэнняў народнай педагогікі Мазырскага Палесся і вызначаюць агульны напрамак ажыццяўлення выхаваўчай дзейнасці. Прынцыпы ўтрымліваюць у сабе больш дэталізаваныя патрабаванні: сувязі з навакольным светам, уліку ўзроставых асаблівасцей, даступнасці, зразумеласці, паступовасці, сістэматычнасці, заахвочвання ініцыятывы і творчасці дзяцей, арганічнага ўключэння выхаванцаў ва ўсе сферы жыццядзейнасці і г.д.

Прынцыпы выхавання выяўляюць узаемасувязь усіх састаўных частак выхаваўчага працэсу (ідэал, змест, метады, формы, сродкі), надаючы яму сістэмны характар. Адметнасць вылучаных прынцыпаў у тым, што ўлічваюцца не толькі асаблівасці развіцця асобы, але і ўзровень развіцця грамадства, нацыянальны характар і менталітэт, рэгіянальныя звычаі і традыцыі.

**Прынцып прыродазгоднасці**

Прынцып прыродазгоднасці ўпершыню сфармуляваны ў XVII ст. Я.А. Каменскім, але ідэя з’явілася значна раней, у працах антычных філосафаў. Прынцып усебакова абгрунтавалі І.Г. Песталоці, Ж.-Ж. Русо, Л.М.Талстой, К.Дз. Ушынскі, П.Ф. Капцэраў, В.А. Сухамлінскі. Яго сучасная трактоўка мае на ўвазе, што выхаванне павінна грунтавацца на прыярытэце агульных законаў прыроды, узаемасувязі прыроднага і сацыяльнага, выпрацоўваць экалагічнае мысленне [158, 122].

Цесная сувязь беларусаў-палешукоў з прыродным асяроддзем вылучыла прынцып прыродазгоднасці, што вядомы яшчэ з антычнасці і сфармуляваны Я.А.Каменскім, у якасці асноўнага ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся. Па-першае, нованароджаны ўспрымаецца як састаўная частка сусвету – улічваецца супадзенне моманту, часу нараджэння з адпаведным станам прыроды, што вызначае асаблівасці яго будучага лёсу і праяўленняў характару.

Па-другое, асновай для выхавання прызнаецца генатып, пол, спадчынны патэнцыял, прыналежнасць да пэўнага роду, сям’і. Па-трэцяе, фарміраванне асобы ва ўмовах натуральнай гаспадаркі і адпаведнай арганізацыі побыту ў значна большай ступені чым зараз адбывалася на ўлонні роднай прыроды, у пастаянным, сістэматычным узаемадзеянні з навакольным асяроддзем. Канкрэтнае напаўненне прынцыпу прыродазгоднасці складае патрабаванне ўліку індывідуальных і полаўзроставых асаблівасцей выхаванцаў, у залежнасці ад якога адбываецца выбар сродкаў і метадаў выхавання.

Прынцып прыродазгоднасці выхавання выкарыстоўваўся ў палешукоў шматпланава. Па-першае, пастаянна ўлічваўся фактар спадчыннасці: “*Які куст, такі і адростак*” [18], “*Бацька – рыбак і дзеці ў воду глядзяць*” [14], “*На вярбе грушы не растуць*” [15]. Па-другое, выхаванне абапіралася на прыроду чалавека – полаўзроставыя і індывідуальныя асаблівасці дзяцей: “*Дзеткі аднае маткі, ды не роўныя*” [6, 133], “*Якія годы, такі і розум*” [6, 136], “*Дзеці дзецям розніца*” [19]. Па-трэцяе, многія з’явы прыроднага ўладкавання па аналогіі пераносіліся і на выхаванне дзяцей: “*Гні галінку, пакуль маладзенькая*” [19], “*Дзіця як цесто, як замяшаў, так і вырасце*” [14], “*Гэта яшчэ цвет, а ягады будуць*” [10, 234].

Асаблівая ўвага надавалася гадаванню дзяцей у залежнасці ад полу і ўзросту. Гадаванне хлапчукоў і дзяўчынак мела такія істотныя адметнасці, што дазваляе сцвярджаць аб існаваўшых самастойна-значных працэсах са сваімі мэтамі і сродкамі. Калі з першых рыхтавалі дбайных гаспадароў, на плечы якіх ускладвалася адказнасць за сямейны дабрабыт, то з дзяўчынак павінны былі вырасці руплівыя гаспадыні, якія дапамагалі мужу ва ўсіх канкрэтных справах [7, 57].

Сувязь выхавання з жыццём была настолькі ярка выражанай, што ў традыцыйнай педагагічнай культуры выхаванне амаль не выдзяляецца ў самастойны працэс, а сінкрэтычна знітавана з усімі праявамі штодзённай рэчаіснасці. У гэтым сэнсе народнае выхаванне амаль тоесна сучаснаму разуменню сацыялізацыі асобы.

Дзіця ў традыцыйнай культуры рэгіёна разглядалася як неад’емная частка прыроды, выхаванне будавалася на натуральных прыродных пачатках, і жыццё чалавека мела перыядызацыю адпаведна порам года. Згодна ўстойлівых уяўленняў, зачацце, нараджэнне і развіццё чалавека, яго псіхіка, разумовыя і творчыя здольнасці падпарадкоўваюцца касмічным законам, залежаць ад асяроддзевых фактараў: часу сутак, пары года, фазы месяца і інш.

Лёсавызначальным лічыўся адпаведны стан прыроды: *“добра нарадзіцца ў пагоду або калі “царэўна плача”, значыць, калі дождж ідзе і сонцэ грэе, горш – у непагадзь і зусім дрэнна – падчас віхру”* [164, с. 348]. Палешукі

верылі, што ёсць добры час і злы час. Добры час нясе ўдачу, здароўе, шчасце, поспех; злы (*"ліхая гадзіна"*) – хваробу, гора. Таму для ўсякай справы (сяўбы, будаўніцтва, лячэння, вяселля, сур'ёзнай сямейнай размовы) стараліся выбраць спрыяльны час або вытлумачыць і пэўным чынам падкарэкціраваць.

Характар і будучае жыццё нованароджанага залежалі ад пары года: дзеці, якія нараджаюцца ўзімку – кволыя, але старанныя і добрыя работнікі; маёвыя дзеці – нешчаслівыя, але з іх бываюць добрыя музыкі і певуны; улетку – нараджаюцца гарачыя і сярдзітыя, але адыходлівыя людзі; па восені – заможныя і гаспадарлівыя [173, с. 173-174]. Добрая прыкмета – нарадзіцца ад поўначы да паўдня, горш – пасля паўдня або пад вечар, на заходзе сонца – дзіця будзе няўдалае, нехлямяжнае [173, с. 172]. Нешчаслівымі для нараджэння з'яўляюцца панядзелак, пятніца; шчаслівымі – аўторак, чацвер, нядзеля [173, с. 173]. Згодна народнаму календару, добрай прыкметай лічылася нарадзіцца на маладзіку, пад поўню, неспрыяльнай – на сходніх днях. Гэтыя прыкметы вар'іруюцца, але прызнаецца той факт, што час сутак, дзень тыдня, фаза месяца, пара года, калі нарадзіўся чалавек, вызначаюць яго характар, жыццё.

У народзе лічыцца, што людзі ад нараджэння няроўныя ў сваіх магчымасцях: *"Ат самаго пачатку свету Бог так даў, што ні горы, ні лес, ні людзі не роўныя. Яны цяпер не роўныя і ніколі не параўняюцца"* [173, с. 64]. Тлумачыцца гэта не толькі ўздзеяннем навакольнай прыроды, але і індывідуальнымі характарыстыкамі, спадчынным патэнцыялам: *"У адной маткі дзеткі featuresрознай закваскі"* [5]. Сутнасць, прырода чалавека ўспрымаецца як дваістая (чалавек добры або злы, ліхі), пры гэтым з'яўляецца прыроджанай, дадзенай ад нараджэння: *"Гарбатага магіла справіць"* [36].

На аснове аналогій са светам жывёл і раслін, у народзе па-свойму вырашалі складанае філасофскае пытанне аб тым, што пераважае ў фарміраванні асобы: гены (прырода) ці выхаванне? У цэлым, не адмаўляецца значнасць выхавання: *"Умеў дзіця радзіць, умей і вучыць"* [113, с. 135], *"Гні дрэва, пакуль маладое"* [197, с. 40], *"Дзіця як цеста, як замешаў, так і вырасце"* [12]. Тым не менш, народная педагогіка Мазырскага Палесся часцей разглядае выхаванне ў якасці сродку карэкціроўкі прыроджаных якасцей і схільнасцей чалавека, а асноўнай дэтэрмінантай развіцця прызнае спадчыннасць: *"Яблычка ад яблыні недалёка коціцца"* [113, с. 136], *"Яно з пялёнак такое ўпартае"* [113, с. 136], *"Няма чаго дзівавацi, такая была і маці"* [113, с. 134]. Прыродныя задаткі – гэта, па перакананню народа, перш за ўсё, прадукт фізічных і псіхалагічных дадзеных бацькоў: *"Кабыла цяляці не прывядзе"* [113, с. 170], *"Сава не прывядзе сакала"* [113, с. 170].

У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся свядомасць дзіцяці не разумеецца як *"чыстая дошка"* ("tabula rasa"). Менавіта спадчыннасць

з'яўляецца асновай для выхавання. Прыроджаныя, генатыповыя фактары лічацца вядучымі, дамінуючымі над фактарамі асяроддзя, хаця іх колькасныя, працэнтныя суадносіны не ўказваюцца. Адпаведна прызнаецца магчымасць і неабходнасць ўдасканалення асобы, фарміравання светапогляду і паводзін пад уплывам выхавання, працоўных заняткаў, прыроднага і сацыяльнага асяроддзя. Выхаванне рэкамендуецца пачынаць як мага раней: *"Вучы дзіця, як упоперак лаўкі ляжыць, а не тады, калі ўдоўж ляжа"* [69, с. 169].

Існуе перакананне, што дзіця не толькі фізічна падобна да сваіх родных, але атрымлівае ў спадчыну маральна-духоўны патэнцыял, дасягнуты бацькамі і больш аддаленымі продкамі: іх здольнасці, асаблівасці праяўлення характару, схільнасць да прафесійных заняткаў, а таксама працавітасць, акуратнасць, або, наадварот, ляноту, неахайнасць, што перадаюцца, як кажуць, *"па раду"*. Маральныя якасці дзіцяці, як і фізічныя, абумоўлены прыналежнасцю да пэўнага роду, што вызначае месца кожнага ў ланцугу пакаленняў. Дзіця – увасабленне продкаў, носьбіт станоўчых і адмоўных характарыстык папярэднікаў, нашчадак традыцый сям'і: *"Па роду і куры чубатыя"* [163, с. 128]. Прыроджанымі ("ад Бога") на Мазырскім Палессі лічацца музычныя здольнасці: *"Музыка ўжэ такі родзіцца, бо не кожны, мажэ, наўчыцца йграць, а музыка сам наўчыцца"* [173, с. 104].

Перавага спадчыннасці над выхаваннем прасочваецца ў казцы "*Кавальчук і паніч*", запісанай А.К.Сержпутоўскім на Мазырскім Палессі [174]. У казцы панскі і кавалёў сыны наўмысна паменяны месцамі і выхоўваюцца ў супрацьлеглых свайму становішчу ўмовах, але праяўляюць сябе адпаведна спадчынных якасцей. Нягледзячы на пэўны сацыяльны кантэкст твора, вывад не супярэчыць агульнапрынятаму ў народнай творчасці: "Які комін, такі й дым, які бацька, такі й сын" [174, 131]. У цэлым такі падыход уступае ў супярэчнасць з высновамі навуковай педагогікі, якая ўлічвае генатып, але вызначальным для фарміравання асобы прызнае ўплыў сацыяльнага жыцця і выхавання. У разуменні фактару спадчыннасці, як асновы для далейшага развіцця дзіцяці, праяўляецца адметнасць народнай педагогікі Мазырскага Палесся, менталітэту насельніцтва дадзенага рэгіёна.

Народны вопыт даказаў, што эфектыўнасць уздзеяння на асобу знаходзіцца ў залежнасці ад прыродных задаткаў, індывідуальных, узроставых асаблівасцей і палавых адрозненняў выхоўваемага. Спадчынныя задаткі імкнуліся выяўляць у працэсе выхавання: *"Як дзіця пачынае бавіцца з цацкамі, навучыцца хапаць іх ручкамі, трэба перад ім палажыць розныя рэчы. За што дзіця хопіцца, к таму яно ў жыцю будзе здолным, тое яму будзе шанцаваць. Тое трэба прыкмячаць і ў той бок кіраваць дзіця, калі хочэце, каб з яго вышаў добры чалавек"* [173, с. 184]. Такім чынам, выхавальнікі імкнуліся раскрыць уласцівае дзіцяці ад нараджэння, не парушыць прадвызначанае прыродай.

Для народнай педагогікі Мазырскага Палесся істотным з'яўляецца пол выхаванца – паказчык яго фізічнай прыроды і будучай сацыяльнай ролі. У сям'і па-рознаму адносіліся да нараджэння сыноў ці дачок: *"Ясна ночка, ды не дзень, добра дочка, ды не сын"* [113, с. 248]. Нараджэнне сына было пажаданым, але адсутнасць дзяцей успрымалася як пакаранне, трагедыя для сям'і [174, с. 39].

Вялікае значэнне надавалася адпаведнасці знешнасці і паводзін дзяцей прыналежнасцю да пэўнага полу. Уменне забяспечваць догляд за валасамі, правільна насіць галаўны ўбор – паказчык выхаванасці, акуратнасці, павагі да акружаючых. Адпаведна палескай традыцыі, існавалі строгія забароны на выкананне мужчынскіх і жаночых работ прадстаўнікамі супрацьлеглага полу, на што звярталася ўвага падлеткаў. Іх парушэнне магло прывесці да непажаданых наступстваў: з'яўленню фізічных (грудзі ў мужчын, барада ў жанчын) або псіхічных прыкмет (страх, трывога, баязлівасць, нерашучасць у мужчын; змена голасу і паводзін у жанчын), уласцівых супрацьлегламу полу.

Мужчынскі–жаночы – базавыя катэгорыі традыцыйнай культуры рэгіёна, таму ў выхаванцаў з ранняга дзяцінства фарміраваліся адпаведныя мадэлі паводзін, давалася іх ацэнка. За паводзінамі дзяцей наглядалі бацькі і акружаючыя, у выпадку парушэння норм падлеткам рабілі заўвагі, высмейвалі, давалі зняважлівыя мянушкі. Тых, хто паводзіў сябе неадпаведна дадзенаму прыродай полу, называлі *"хлапчур"* або *"хлапчурка"* – дзяўчынка, якая любіць хлапечыя забавы; адпаведна *"дзяўчур"* і *"дзяўчурка"* – хлопчык, які паводзіць сябе як дзяўчынка: *"Дзеўчур вон, а не хлопчак"* [130, с. 33].

Дзеці і падлеткі на Мазырскім Палессі разглядаюцца як неад'емная частка прыроды, не вылучаюцца з яе, а збліжаюцца з іншымі маладымі істотамі, птушанятамі: *"Голопецкэ – маладая істота, дзіця або птушаня без пер'я"* [130, с. 27]; *"подлеток"* з націскам як на першым, так і на другім складзе – дзіця і птушаня [186, с. 97]. Агульнапрынята, што дзеці растуць, шмат часу праводзячы ў прыродным асяроддзі, без празмернага ўмяшання дарослых.

Прасочваецца пастаянная сувязь паміж прыродай (дрэвамі, раслінамі, птушкамі, насякомымі) і чалавекам, а шырэй – прыродай і сям'ёй, родам. Па народных вераваннях, дзяцей знаходзяць у капусце, на агародзе, у каноплях [177, с. 185]. Працэс гадавання дзіцяці ў свядомасці палешукоў атаясамліваецца з ростам дрэва: *"Калі дзіця не расце, яго ставяць дзе-небудзь каля дзерава й роўно з галоўкаю робяць зарубку. Ат такое меркі дзіця пачынае хутко расці"* [173, с. 192]. Захоўваецца звычай пры нараджэнні дзіцяці садзіць дрэўца і па яго росце меркаваць аб здароўі, лёсе чалавека. Дрэвы прысвячаюць тым, хто з'ехаў далёка ад дому, дзяўчыне, калі яна выходзіць замуж. Вясельнае дрэўца (елка) – абавязковы атрыбут мясцовага вяселля, сімвал дзяўчыны-нявесты.

На аснове заглыблення дзіцяці ў жыццё прыроды адбывалася ўсебаковае развіццё асобы. У пару сенакосу, уборкі ўраджаю, збору ягад,

грыбоў, жалудоў, арэхаў малыя знаходзілі сабе ў прыродным асяроддзі і смачны сняданак, і цікавы занятак, і вясёлыя забавы. Немагчыма вылучыць канкрэтны выхаваўчы змест, які суправаджае такі звычайны занятак, як пасьба жывёлы: гэта і любаванне ўсходам сонца, і назіранне, знаёмства з прыкметамі надвор'я, і фізічная загартоўка, і гульні з аднагодкамі, і выраб інвентару, і вялікая адказнасць за даручанае, і ўдзел у абрадавых дзеяннях пры выгане жывёлы.

Навукоўцы, якія даследавалі жыццё, побыт і норавы палешукоў, адзначалі, што адной з умоў эфектыўнасці народнай педагогікі былі адзінства, пастаянства і нефармальная ўзгодненасць выхаваўчых намаганняў усіх, хто меў прамое ці ўскоснае дачыненне да гадавання дзяцей. На мове палешукоў гэта азначала "*біць у адзін хамут*" [24]. Дзякуючы пераемнасці міжпакаленная сувязь у сем'ях была вельмі цеснай. У выхаванні самы актыўны ўдзел прымалі бабулі і дзядулі, дзядзькі і цёткі і іншыя кроўныя сваякі. Такое кола выхавацеляў пашыралася за кошт названых сваякоў – хросных, бабкі павітухі. Не заставаліся ў баку ад выхаваўчых працэсаў суседзі, аднавяскоўцы. З пазіцый сучаснасці можна сказаць адбывалася педагагізацыя навакольнага асяроддзя. І ўсё ж прыярытэт у выхаванні належаў непасрэдна сям'і. "*Не навучыў бацька, не навучыць і дзядзька*" [16], – прыходзілі да высновы на Палессі.

Адной з істотных адметнасцей народнай педагогікі Палесся з'яўляюцца досыць мяккія, добразычлівыя адносіны да дзяцей: "*Ласка горы разбівае*" [21], "*Няшчасныя тыя дзіцяткі, якіх не жураць ні бацькі, ні маткі*" [6, 134], "*Як не дапаможаш слаўцом, то і не дапаможаш дубцом*" [21], "*Крыкам дзіця не вучаць*" [25], "*Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі*" [14], "*Ад дубцоў дурнеюць, ад слоўцаў разумеюць*", – разважалі палешукі [10, 99]. Фізічныя пакаранні выкарыстоўваліся ў выпадку выражанага непаслухмянства, і крайне рэдка пры выхаванні дзяўчынак. Часцей за ўсё іх замянялі патрабавальнасць, запалохванне, пагрозы: "*Не паможа кіў не паможа і кій*", – раіла народная педагогіка [19].

Традыцыйная педагагічная культура Мазырскага Палесся ў маральным выхаванні няўхільна прытрымлівалася прынцыпа сістэматычнасці. У народзе існавала перакананне, што настойлівасць, упартасць і карпатлівасць абавязкова прывядуць да маральнага ўдасканалення асобы: "*Капля камень не сілай доўбіць, а як часта на яго падае*" [24], "*Ціхая вада берагі рве*" [6, 244].

Прынцып прыродазгоднасці набывае актуальнасць ва ўмовах умяшання ў жыццё прыроды: асушэння палескіх балот і вырубкі лясоў, глабальнай катастрофы на ЧАЭС, па прычыне чаго назіраецца разрыў сувязей дзіцяці з роднай зямлёй, як вытокам духоўнага і фізічнага здароўя, эталонам народнага разумення прыгажосці, крыніцай для асэнсавання выхаваўчай дзейнасці.

**Прынцып цыклічнасці**

Развіццё асобы ў народнай педагогіцы ў значнай меры вызначаецца цыклічнасцю традыцыйнай культуры. Цыклічнасць разумеецца як сукупнасць узаемазвязаных з'яў і працэсаў, якія ствараюць закончанае кола развіцця на працягу пэўнага прамежку часу, абумоўленых прыроднымі рытмамі і тэрмінамі сельскагаспадарчых работ. Цыклічнасць уплывае на арганізацыю выхавання: "Праграма выхавання часам з'яўлялася размеркаванай па гадах, месяцах і нават днях тыдня і была цесна звязана з гадавымі працоўнымі цыкламі" [87, с. 59].

Цыклічнасць прадвызначае многія асаблівасці мясцовага побыту, паколькі народная культура грунтуецца на цыклічнасці быцця: сутачнага, тыднёвага, гадавога, жыццёва-біялагічнага, аграрнага, паўсядзённага і святочнага. Прыродны час на Мазырскім Палессі складаецца з сонечнага астранамічнага цыкла – год, поры года (перамены), суткі і месяцавага – месяц, фазы месяца [175, с. 449-452]. Сутачны час палешукі вызначалі па паводзінах жывёл і птушак, найперш крыку пеўня. Перавага аддавалася месячнаму календару, які адпавядае і ўнутрыўтробнаму развіццю дзіцяці.

Народнае выхаванне мела ўзроставa-цыклічны характар. Цыклічнасць – неад'емная прыкмета чалавечага жыцця як фізічнага, так і духоўнага. Выхаваўчы працэс вызначала, па-першае, *узроставая*, *жыццёвая* *цыклічнасць* і адпаведны цыкл сямейна-бытавой паэзіі, а, па-другое, *гадавая* *цыклічнасць*, звязаная з пэўнай працоўнай дзейнасцю, каляндарна-абрадавай паэзіяй і падмацаваная рытмічнай зменай пор года: зіма, вясна, лета, восень. На аб'яднанні сутачнага і жыццёвага цыклаў пабудавана народная загадка: *"Хто ходзіць зранку на чатырох, днём – на дзвюх, а вечарам – на трох нагах?"* [33].

У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся прысутнічае як поўная перыядызацыя чалавечага жыцця, так вызначаны і асобныя перыяды развіцця дзіцяці. Поўны выхаваўчы цыкл – гэта жыццё чалавека ад нараджэння да смерці – *век*. Рытм з'яўляецца састаўным элементам цыклу, адпаведна жыццёвы век дзеліцца на асобныя перыяды – *узрост*. Вылучаюцца тры асноўныя ўзросты: *дзеці*, *дарослыя* (*"у парэ"* – у росквіце жыццёвых сіл), *старыя*. Старымі лічацца пасля вяселля апошняга дзіцяці.

Па народных меркаваннях, кожны павінен абавязкова пражыць свой жыццёвы век, тэрмін, на працягу якога чалавек праходзіць усе этапы фізічнага і сацыяльнага сталення і рэалізуе свой патэнцыял – жыццёвую сілу. Пахаванне дзяцей і маладых, незамужніх, якія не пражылі *"свой век"* спалучае пахаванне і вяселле, каб дадаць прапушчанае звяно. Спыненне жыццёвага цыкла (забойства, самагубства) – грэх, пагроза парадку ў сусвеце [175, с. 448–450].

Узроставая цыклічнасць (малады – стары) дапаўняецца сацыяльнай: халасты – жанаты, разведзены, удавец і ўдава. У народзе асуджалі бяздзетных і

людзей без пары: дзевак-векавух, старых халасцякоў (у меншай меры – удоў), якіх адпаведна называлі: *“бездзетуха”* [183, с. 49], *“покіданец”*, *“покіданка”* – кінутая мужам або жонкай [186, с. 130]. Такое становішча лічылася пакараннем за грахі або нядобрым знакам лёсу, вынікам бацькоўскага пракляцця [175, с. 166-167]. Пераход з адной сацыяльна-узроставай групы ў другую захоўваецца ў гаворцы: “*дзеўка”, “маладзіца”, “баба”* [175, с. 405-407].

Беларусы-палешукі не прытрымліваліся строгай узроставай перыядызацыі дзяцінства, часцей вызначалі ўзрост адпаведна выконваемай працоўнай дзейнасці (нянька, пастух, аратай) або сацыяльнаму статусу (жаніх, нявеста). Узроставыя ступені дзяцінства вылучаюцца толькі прыблізна: *“дзеці большые, а маленькіе – дзіценята”* [184, с. 19]; “*большуха”* – дзяўчына-падлетак. *“Чого ты плачэш, большуха?”* [130, с. 11]; *“хлопчак”* – хлопчык-падлетак [130, с. 140]; подлеток: *“Вон ужэ добры подлеток, казалі, свіней сам пасе”* [186, с. 97]. У кнізе А.К. Сержпутоўскага “Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў” ёсць раздзелы: “Гадоўля дзяцей”, “Гадоўля падшпаркаў і іх жытка”, “Жыццё моладзі”, дзе паводле ўзросту названы: дзеці – падшпаркі – моладзь.

Прафесар Г.П. Арлова вылучае ў беларускай народнай педагогіцы тры ўзроставыя перыяды: “I – ад нараджэння да шасці–васьмі гадоў; II – ад шасці–васьмі да чатырнаццаці гадоў; III – ад чатырнаццаці да шаснаццаці– дваццаці аднаго года [63, с. 89]. Л.В. Ракава падзяляе дзіцячы ўзрост на чатыры перыяды: “маленства – ад нараджэння да 6–8 гадоў; дзяцінства – ад 6–8 да 12–14 гадоў; падлеткавы ўзрост – ад 12–14 да 16–17 гадоў і юнацтва – ад 16–17 да 18–20 гадоў” [166, с. 10].

Абапіраючыся на дадзеныя даследаванні і сабраны матэрыял, у народнай педагогіцы Мазырскага Палесся мэтазгодна вылучыць наступныя ўзроставыя перыяды: перыяд унутрыўтробнага развіцця і нованароджанасці (першы этап: ад зачацця да 40 дзён; другі этап: ад 40 дзён да 1 года); перыяд маленства, кармлення грудзьмі (ад нараджэння да 1–3 гадоў); перыяд дзяцінства (3–9); падлеткавы ўзрост (10–14); маладосць, маладыя гады (15–20).

Першы з названых перыядаў вызначае адметнасць рэгіянальнай выхаваўчай культуры, у якой найбольш адказным лічыцца перыяд унутрыўтробнага развіцця дзіцяці і нованароджанасці. Менавіта ў першыя 40 дзён стараюцца пахрысціць дзіця, даць імя, да гэтага часу да нованароджанага адносяцца з вялікай асцярогай, не паказваюць чужым і не называюць выбранае імя пасля заходу сонца, у размове не ўказваюць на пол, а называюць словам ніякага роду – *“дзіця”*. Лічыцца, што праз чатыры тыдні пасля нараджэння бываюць *“месячыны – не хвароба, але такі час, калі кождае дзіця хутко можэ занепасці”* [173, с.191]. Перыяд кармлення грудзьмі,

непасрэднага кантакта з самым блізкім чалавекам, па словах інфарматараў, звычайна працягваўся да года, але нярэдка – і да 2-3 гадоў [33]. Падлеткавы ўзрост, у залежнасці ад полу дзіцяці, можа быць названы перыядам мужчынскага, бацькоўскага выхавання для хлопчыкаў або жаночага, мацярынскага выхавання – для дзяўчынак. Маладыя гады – час, калі дзеўкі і хлопцы хадзілі на вячоркі, шукалі сабе пары.

Для беларусаў-палешукоў развіццё дзіцяці бачыцца як зусім натуральны працэс, які адбываецца сам сабой, аналагічна непазбежнасці змены пор года. На Мазырскім Палессі адзначаўся толькі першы дзень нараджэння дзіцяці, святкаванне наступных дзён нараджэння членаў сям'і не практыкавалася. Як правіла, бацькі не імкнуліся запомніць год нараджэння дзіцяці, але дзень, тыдзень, месяц, дэтэрмінаваны святам або прысвяткам, пастом або мясаедам – ведалі абавязкова: нарадзіўся на Пятра, за тыдзень перад Пакровай і інш. Такім чынам, цыклічнасць чалавечага жыцця рэалізуецца праз царкоўныя, каляндарныя і сямейна-бытавыя абрады: радзіны, вяселле, пахаванне. Вечны кругазварот жыцця працягваецца дзякуючы працы, нараджэнню дзяцей і ўнукаў: *"Паміраць збірайся, а жыта сей"* [69].

Прынцып цыклічнасці функцыянаваў у цеснай сувязі з традыцыяй і дзейнічаў паўсямесна: у працы, побыце, народным мастацтве. Сямейна-бытавыя традыцыі вызначалі, калі мэтазгодна спраўляць вяселлі, а працоўныя – калі пачынаць сяўбу, жаць жыта. Вясельную песню можна было пачуць толькі на вяселлі (пераважна ўвосень), калядную – зімой і г.д. На Мазырскім Палессі *"свадзьбу часцей ігралі осенью, кагда ўбралі ўраджай ілі после Крешчэнья, на Піліпаўку. Большой грех было празноваць во время пастоў"* [137, с. 205].

Цыклічнасць дапамагала захаванню адметнасці будняў і святаў. Гулянне не ў пару выклікала асуджэнне: *"Хто ў пятніцу спявае, той у нядзелю плача"* [197, с. 117]. Парушэнне рэгіянальных традыцый магло прывесці да пакарання і нават смерці, што адлюстравана ў распаўсюджанай на Мазыршчыне легендзе пра каменныя валы: *"Дзед араў на Паску, не верыў, што нельзя араць, і валы парабіліся каменныя, і міскі. Вот яны паселі абедаць і ўсё акаменело"* [137, с. 281]. Калі дзеці білі валы каменнем, то старыя людзі на іх сварыліся, бо з акаменелых валоў пырскала кроў [123].

Дзякуючы цыклічнай арганізацыі народных святаў, жыццё набывала рытм, дасягалася масавасць, пераемнасць у выхаванні. Пры цыклічным падыходзе сфера народнай культуры практычна не магла пераўзысці сутнасных сіл і магчымасцей асобы, была даступнай і асабіста ўспрынятай кожным. Дзеці маглі спачатку толькі назіраць за ходам вяселля; пазней – выконваць у ім уласцівыя ўзросту ролі (несці каравай, прадаваць касу нявесты); у юнацтве прысутнічалі на вяселлі сяброў, знаёмых і аднойчы самі станавіліся яго

галоўнымі дзеючымі асобамі; каб у сталасці быць захавальнікамі традыцый. Псіхалагічныя адчуванні чалавека мяняліся, але асноўныя формы і змест выхавання заставаліся нязменнымі, што дазваляла кожны раз па-новаму, але ў добра знаёмых абставінах, перажываць сваю ролю. Канкрэтны абрад пры паўтарэнні ўспрымаўся інакш, скрозь прызму ўзбагачанага жыццёвага вопыту, у залежнасці ад узросту па-рознаму эмацыянальна перажываўся і ацэньваўся.

Народная педагогіка Мазырскага Палесся абапіраецца на пастаянна-цыклічны характар прыродных, сацыяльна-псіхалагічных, мастацка-эстэтычных, працоўных і выхаваўчых з'яў. Яна заснавана на цыклічнасці асобных кампанентаў і форм выхавання, якія ўздзейнічаюць паступова, паўтараючыся з году ў год. Развіццё асобы адбываецца паэтапна, адпаведна ўзросту і магчымасцям кожнага дзіцяці, пазбаўляючыся павярхоўнасці, паскоранасці. Узрост – састаўная частка цыклу чалавечага жыцця, адпаведна ўлік узроставых асаблівасцей – важнейшае патрабаванне арганізацыі выхаваўчай дзейнасці. Такім чынам, працэс народнага выхавання абнаўляўся штогод, развіваўся па спіралі і з'яўляўся пастаянна-цыклічным, дзякуючы чаму дасягаліся заглыбленасць, сістэматычнасць выхаваўчага ўздзеяння.

**Прынцып сувязі з працай**

Праца і яе вынікі знаходзіліся ў аснове светапогляду большасці народаў свету: "Педагогіка працы – самая вялікая з педагогік" [87, с. 35]. Развіццё і фарміраванне асобы ў беларускай народнай педагогіцы ў значнай меры адбывалася "у працы і дзеля працы" [63, с. 23].

Вялікае значэнне працы ў жыцці беларусаў-палешукоў дае падставу вылучыць прынцып сувязі выхавання з працай у якасці самастойнага ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся. Ідэя працоўнага выхавання – вядучая ў мясцовых прымаўках і прыказках: *"Папрацуй да поту – будзеш есці ў ахвоту"* [113, с. 132], *"І малое дзела лепш вялізнага бяздзелля"* [113, с. 132].

Прынцып сувязі выхавання з працай рэалізуецца пры захаванні шэрагу правіл, што раскрываюць спецыфіку яго праяўлення: шырокае азнаямленне з працоўнымі заняткамі мясцовага насельніцтва ў ходзе сямейнага выхавання; паступовае далучэнне дзяцей да канкрэтных відаў рэгіянальнай дзейнасці адпаведна полу і ўзросту; выкарыстанне пастаяннага імкнення дзяцей да дзейнасці, прыроднай актыўнасці і цікаўнасці; сувязь працоўнага выхавання з вырашэннем рэальных жыццёвых праблем. Выхаваўчае ўздзеянне грунтавалася на мэтанакіраваным уключэнні дзяцей ва ўсе сферы жыццядзейнасці сям'і. Эфектыўнасць выхавання значна павышалася дзякуючы перадачы працоўнага вопыту не толькі ад бацькоў дзецям, але і праз пакаленне.

Арганізацыя працоўнага выхавання ажыццяўлялася, па-першае, на аснове зносін з прыродай у ходзе сельскагаспадарчай дзейнасці; па-другое, на

аснове народных рамёстваў, якія заснаваны на працы, пераважна ручной, фізічнай: з дрэвам, каменем, металам, тканінай, фарбамі, скурай. Даследчыкамі вылучаюцца наступныя асаблівасці гэтага працэсу: 1) успрынящце працы як натуральнай жыццёвай неабходнасці; 2) уключэнне ў працу ў форме гульні самых маленькіх 5–6- гадовых дзяцей; 3) раздзяленне працы на мужчынскую, якой вучыў бацька і жаночую, якой вучыла маці; 4) авалоданне рамяством, працоўнымі навыкамі як аснова дабрабыту сям’і; 5) засваенне дзецьмі правіл вядзення сельскагаспадарчых работ праз характэрныя для беларусаў-палешукоў святы каляндарна-абрадавага цыклу; 6) выкананне большасці відаў працы разам з бацькамі і пад іх непасрэдным наглядам і кіраўніцтвам [193, с. 76].

Гультайства, лянота – найбольш непрыймальныя і асуджаемыя беларусамі-палешукамі чалавечыя якасці: *“Баялася, каб маці не казала гультайка, а людзі – лежабока”* [28]. У народнай педагогіцы прысутнічае ўсведамленне, што гультая вельмі цяжка перавыхаваць: *“Ленаму валу й пуга не памагае”* [113, с. 122]. Лянота, падобна хваробе, можа выступаць у вобразе шкодных чалавеку адушаўлёных міфалагічных істот: *“лежні загрызлі”* [113, с. 122]. Яе трэба ўсямерна асцерагацца, паколькі лянівы чалавек не здолее сістэматычна працаваць, а значыць, забяспечыць сям’ю, старасць бацькоў.

У свядомасці палешукоў любоў і здольнасць да працы выступае не толькі як набытая, але і як прыроджаная якасць, перадаваемая генетычна, ад бацькоў – дзецям: *“Есіп Карнееў, бо мае жонку працавітую, як мурашачка, сам працавіты, як вол, дак можна спадзявацца, што і дзеці, калі падрастуць, то будуць працавітыя і будзе спор у працы”* [164, с. 560]. Таму ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся сфарміравалася патрабаванне пачынаць працоўнае выхаванне яшчэ да нараджэння дзіцяці (пры выбары пары з працавітага роду, праз сістэму забарон для цяжарнай жанчыны).

З першых хвілін жыцця, што падкрэслівае надзвычайную важнасць гэтага працэсу, адбывалася вызначэнне будучых працоўных заняткаў, адпаведна полу дзіцяці. Для дзяўчынак пры перарэзванні пупавіны спрыяльнымі былі рэчы, якія адпавядалі жаночым заняткам, для хлопчыка – мужчынскім: *“Пупавіну хлопчыку баба атрэзвае, палажыўшы на дубовую дошку, каб хлопец быў моцны як дуб, ці на тапарышча, каб ён добрэ трымаў сакеру да быў лоўкі рабоцько. А дзеваццы пупавіну баба атрэзвае, палажыўшы на прасніцу або на чоўнік, каб яна як вырасце была ахвотніца да жаночае работы”* [173, с. 174].

Спадчынныя задаткі спалучаліся з індывідуальнымі інтарэсамі, выяўлена ўзаемасувязь паміж днём нараджэння і выбарам заняткаў у будучым: *“першую работу дзіцяці добрэ даць у тэй дзень, у які яно радзіласо, та яно*

*будзе мецьвялікую ахвоту да дзела"* [173, с. 185]. Першыя, нават і няўдалыя спробы дзяцей праявіць сябе ўхваляліся [173, с. 186].

Прысутнічае патрабаванне паступовасці, сістэматычнасці працоўнага выхавання адпаведна ўзросту. У рэгіянальным дзіцячым фальклоры тэма сумленных адносін да працы з'яўляецца вядучай: *"Сарока-варона дзецям кашу варыла"* [33]. Народныя гульні *"Рэдзька"*, *"Мак"*, *"Лянок"* імітуюць адпаведныя віды заняткаў. Дзяўчынкі выпякалі з пяску бліны, спрабавалі прасці, ткаць, шыць адзенне для лялек. Хлопчыкі будавалі з лучыны дамы, з вецця – шалашы, імітавалі касьбу, складалі стагі з саломы. Падобныя імітацыйныя гульні дазвалялі засвоіць этапы працоўных працэсаў, фарміравалі светапогляд, выпрацоўвалі характэрную сістэму каардынацыі рухаў. Старэйшыя падтрымлівалі, або ва ўсякім разе не перашкаджалі дзіцячым гульням, майстравалі прылады працы, паколькі лічылася, што *"ніколі не можна смяяцца з дзяцей, – Бог пакарае, бо дзіцем больш ніколі не будзеш, але за тое атпакутуеш на старасць"* [173, с. 185].

Аднак у цэлым народнае выхаванне абапіраліся не на *"гульню ў працу"*, а на патрабаванне сувязі працоўнага выхавання з жыццём, на рэальную карысную дзейнасць кожнага члена сям'і:*"У поле ішлі маленькія і вялікія, нікога не аставалася дома, як хто мог, так той і работаў"* [38]. У 5-6 гадоў дзеці атрымлівалі пасільныя працоўныя даручэнні: няньчылі малодшых братоў і сясцёр, дапамагалі мыць посуд, прыбіраць у хаце, збіраць яйкі. Удзельнічалі ў праполцы разам з дарослымі як толькі маглі адрозніць пустазелле ад культурных раслін [23]. Дзеці і падлеткі пасвілі хатніх птушак і жывёлу: гусей, качак, свіней, авечак, кароў і інш. Улетку хадзілі ў лес па ягады: суніцы, чарніцы, ажыны, брушніцы, журавіны [51]. Уносілі ўклад у бюджэт сям'і: *"Маці йдзе ў лес, і му памагалі, наберам ягад кашэль. Маці прадае і купляе ў Мозыры хлеб, нам дзеліць па кусочку"* [24]. Рана ўключаліся ў працу дзеці-сіраты або пры адсутнасці працаздольных: *"Бацька прыйшоў з вайны без ног. Я араў з 5 гадоў. Пугу не магу падняць, заверне мене на павароце і ару"* [52].

Кожная сям'я імкнулася падрыхтаваць дзяцей да будучага працоўнага жыцця: *"Бацька заўсёды казаў: "Рабі як я і вучыся"* [13]. Дзейсны характар выхавання прадугледжваў актыўнасць выхаванцаў ва ўласным развіцці: *"Хочаш усе іспробаваць, Хросная матка пасадзіць, не дастаю нагамі ніты, а тку, ена есці варыць, а я тку"* [38]. З узростам удзел у вядзенні гаспадаркі пашыраўся. З 15-16 гадоў хлопцы і дзяўчаты нароўні з дарослымі былі ўключаны практычна ва ўсе віды рэгіянальнай працоўнай дзейнасці.

На Мазырскім Палессі паслядоўна захоўваецца патрабаванне адпаведнасці працоўнага выхавання полу дзіцяці: *"Ой, чукі-чук, лучшэй дзеўка як хлапчук. / Дзеўка хату памяце і пачынак напрадзе. / Хлопчык дроў нарубае і*

*лучыны нашчапае"* [42]. Юнакі маглі праявіць сябе ў засваенні працоўных працэсаў: аранні, касьбе, складванні стагоў, будаўніцтве, занятках народнымі рамёствамі, рыбалоўстве. У Лельчыцкім раёне зафіксаваны прыклад "мужчынскага выхавання" хлопчыка-падлетка ў сям'і дзядзькі, брата маці, калі ў пасляваенны час у сям'і не засталося дарослых мужчын [11].

Жаночымі лічыліся ўсе работы, звязаныя з вырошчваннем і апрацоўкай лёну, прадзеннем кудзелі, бяленнем палотнаў – так званы *"ільняны цыкл"* [78]. Дзяўчатам патрабавалася ўменне ткаць, прасці, шыць, плесці карункі, вышываць, гатаваць традыцыйныя стравы, выхоўваць дзяцей згодна правіл народнага этыкету і падтрымліваць парадак у доме. Праца садзейнічала набыццю сацыяльнай сталасці: *"чым больш було наткано і вушыто ручнікоў, посцілок, настольнікоў, сорочок, тым большы гонор буў етой дзеўцы. Яна мала большы пасаг, значыць була больш працовітой і хутчэй вуходзіла замуж"* [26].

Народныя выхавальнікі знайшлі эфектыўную методыку выхавання юнага земляроба, жывёлавода, рыбака, паляўнічага і майстра-рамесніка. Перадача ведаў, навучанне дзяцей бытавым, працоўным, агратэхнічным навыкам і ўменням ажыццяўлялася ад сына да бацькі, ад маці да дачкі, ад майстра да вучня: "*Бацька бочкі рабіў, пасуду на гуркі, мукі. Дзед быў і музыкант, і бондар, і столяр. Пасуду рабіў з дзерава, боечкі. Я пабачыў як ен робіць, дай я ўжо так. Начовачкі. Кашалі плелі. З гліны рабілі гладышкі, з лазы лапці плелі. Кавалі булі харошые, на вайне пагіблі*" [24]. Адбывалася як навучанне канкрэтным працоўным аперацыям, так і рэалізоўваўся тэарэтычны аспект: выкарыстанне вопыту папярэднікаў, назіранне за ходам працоўных працэсаў: "*Падрос, раму вучыўся рабіць. Сто лет было дзеду, дак хадзіў гледзець. Верацёны дзелаў і на базар насіў прадаваць"* [52]. Такім чынам, авалодванне прафесійным майстэрствам ажыццяўляецца непасрэдна метадам уключэння ў рэальную прафесійную дзейнасць.

У народнай педагогіцы прысутнічае патрабаванне прафесіянальнага ўніверсалізму, шырокага азнаямлення дзяцей з асноўнымі відамі заняткаў у рэгіёне праз уключэнне ў рэальную дзейнасць. У ходзе выхаваўчай практыкі было выяўлена, што ў дзіцячым узросце лепш адбываецца засваенне асацыятыўных магчымасцей і непаўторнай фактуры прыродных матэрыялаў: гліны, дрэва. Эфектыўнасці навучання спрыяюць і павышаная эмацыянальнасць, інтэнсіўнае развіццё пачуцця колеру, формы, рытму, слыхавай і зрокавай успрымальнасці, уласцівыя дзецям. Веды, практычныя навыкі, атрыманыя ў раннім узросце, надоўга захоўваюцца ў памяці, вядома сіла дзіцячых уражанняў, іх жывучасць і даўгавечнасць. Масавасці працоўнага выхавання садзейнічала і спецыфіка народных рамёстваў, дзе ўяўленне аб ствараемым прадмеце не замацоўваецца ў запісе, а ўтрымліваецца ў свядомасці.

Прынцып сувязі выхавання з працай – выпрабаванае стагоддзямі патрабаванне народнай педагогікі Мазырскага Палесся, дзе выхаванне асобы ў

значнай меры ажыццяўлялася для будучага працоўнага жыцця. Нават людзей з абмежаванымі магчымасцямі, перш за ўсё, прывучылі працаваць, далучалі да пасільных заняткаў. Самавыяўленне ў рэгіянальнай працоўнай дзейнасці з’яўлялася масавым, працоўныя працэсы і прырода складалі сінтэз з народнай творчасцю і выхаваннем.

**Прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага ў выхаванні**

Народная педагогіка Мазырскага Палесся абапіралася на выпрацаванае стагоддзямі патрабаванне пачынаць выхаванне дзіцяці на самых ранніх этапах і пры гэтым спалучаць рацыянальныя і ірацыянальныя прыёмы, уздзейнічаць не толькі на розум, але і на структуры падсвядомасці. Паводле перакананняў беларусаў-палешукоў, менавіта такі падыход дапамагаў зрабіць патрыятычнае, працоўнае, разумовае выхаванне больш эфектыўным, трывалым, забяспечыць непарыўнае адзінства дзіцяці з родным домам, продкамі, прыродай, бацькоўскай зямлёй. Рэальны выхаваўчы вопыт і веды спалучаліся з інтуіцыяй, прадчуваннем, рэлігійнымі перажываннямі, што садзейнічала тонкаму адчуванню псіхалагічных праблем дзіцяці.

Светапогляд жыхароў Мазырскага Палесся ў многім абапіраўся на міфалагічную аснову, што знаходзіць пацверджанне ў даследаваннях Т.В. Валодзінай, Т.І. Кухаронак, І.І. Крука, Л.В. Ракавай, Т.І. Шамякінай [83; 121; 129; 166; 196]. Уяўленні мясцовага насельніцтва не з’яўляюцца нечым выключным – падобны светапогляд уласцівы большасці народаў свету. Як правіла, яго асноўныя нормы не супярэчаць агульначалавечым каштоўнасцям, узбагачаючы выхаваўчую дзейнасць. Вучоныя лічаць: развіццё чалавека ў дзяцінстве (*антагенез*) абапіраецца на фетышызм, адухаўленне прыроды, сінкрэтызм асноўных паняццяў, што дзейнічалі на пачатковых этапах культурнага развіцця чалавецтва (*філагенез*).

Законы міфалагічнага мыслення вылучаны англійскім даследчыкам Д.Д. Фрэзерам. Згодна першаму: *“падобнае ўтварае падобнае, або вынік падобны на сваю прычыну”*; у адпаведнасці з другім – *“рэчы, якія хоць раз прыйшлі ў сутыкненне, працягваюць узаемадзейнічаць на адлегласці пасля спынення прамога кантакту”* [192, с. 19]. Гэта аб’ектыўныя, усеагульныя заканамернасці сусветнага цывілізацыйнага працэсу.

Ірацыянальныя фактары ўтрымліваюцца ў наступных элементах традыцыйнай культуры рэгіёна: сістэма прадпісанняў і забарон, міфалогія і народная творчасць, варажба і тлумачэнне сноў. Для абазначэння гэтых звестак ужываюцца дзеясловы *“ведаць”* і *“знаць”*, прычым слова *“ведаць”* выкарыстоўваецца пераважна пры тлумачэнні абстрактных паняццяў: *“Бог ведае, што з намі будзе на том сьвеці. – Толькі Бог ведае!”* [164, с. 74].

З дахрысціянскіх часоў шырокае распаўсюджанне мелі шматлікія **замовы**, якія акцэнтавалі ўвагу на справядлівае ўладкаванне грамадскага жыцця, удасканаленне яго духоўнай ауры, фарміравалі веру ў чалавечыя магчымасці і незвычайную моц роднага слова. Многія замовы накіраваны супраць амаральных якасцей людзей: "*Ад ворагаў*", "*Ад сплетнікаў*", "*Ад п'янства*" [11, 26]. Многія спалучаюць язычніцкую і хрысціянскую сімволіку: "*На памяле еду, а вужам паганяю, а гадзюку зануздаю, а вам суддзі, сэрца замаўляю. Замаўляю сэрца хлебам і соллю і святою паскаю, каб стрэлі мой суд харошаю ласкаю*" [8].

Прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага абапіраецца на сінтэз народнай педагогікі з традыцыйнай медыцынай, магіяй і міфалогіяй. Народнае выхаванне зберагала маці і дзіця ад неспрыяльных сіл і хвароб – ахоўвала, захоўвала. З'яўленне чалавека на свет ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся звязана з сакральнымі, тайнымі ведамі. Адзін з самых паважаных жаночых заняткаў – прымаць роды, *"бабіць дзіця"*. Нованароджанага прадстаўлялі прыродным сілам (небу, сонцу, зямлі) і роднаму дому, хаце (печ, парог): *"Дзіця ложілі на перкаль і повітуха выносіла яго на двор, показать Господу, шо б загорэлас на небі его зорка, што б добрая була жызнь у малого. Потом несла назад і ложыла под печ (куда кладут дрова), для того, што б буў рабоцяшчым і здаровенькім. Бо печ у той час була корміліцой"* [54].

Кіруючыся і рацыянальнымі, і ірацыянальнымі ведамі, народная педагогіка Мазырскага Палесся ставіць за мэту садзейнічаць фарміраванню здаровага, псіхічна і фізічна дасканалага дзіцяці на самых ранніх этапах развіцця, яшчэ ва ўлонні маці. Адхіленні ў развіцці дзяцей беларусы-палешукі звязваюць з недастатковым клопатам аб здаровым патомстве пры стварэнні сям'і, няўвагай да ўнутрыўтробнага жыцця, уздзеяннем шкоднай магіі, парушэннем бацькамі норм народнай маралі.

Вылучаюцца наступныя дзеянні, важныя для фарміравання дзіцяці ў будучым: эмоцыі і паводзіны цяжарнай жанчыны і адносіны да яе акружаючых; абставіны пры нараджэнні; працэс адразання пупавіны і дзеянні з дзіцячым месцам; першае купанне нованароджанага; выбар імя; адведкі; радзіны; хрэсьбіны [173, с. 164-195]. Сыходзячы з меркавання, што падобнае ўтварае падобнае, на Мазырскім Палессі цяжарнай жанчыне забаранялася: скакаць праз агонь і пляваць на яго (бо ў дзіцяці будзе рожа); пазычаць самой (бо дзіця будзе злодзеем); не пазычаць нікому (бо дзіця будзе жыць у беднасці); глядзець у люстэрка (бо ў дзіцяці будуць балець вочы); не глядзець на нябожчыка, не быць на пахаванні (бо дзіця будзе беднае) [20].

Асаблівае значэнне адводзілася прадметам (*рэчы, якія хоць раз былі ў кантакце, працягваюць узаемадзейнічаць на адлегласці*), на якіх пераразалася пупавіна. Лічылася, што яны садзейнічалі палавой дыферэнцыяцыі і выбару будучых заняткаў. Клапаціліся і аб зямным, матэрыяльным дастатку, для чаго бабка прымала нованароджанага не голымі рукамі, у час апошняга кармлення маці саджала дзіця на вывернуты кажух [175, с. 225]. Істотнае значэнне надавалася дзеянням з пупавінай і плацэнтай: *"Пупавіну дзяўчынкі закопвалі туды, дзе карова стаіць"* [38], *"Пaслед (дзіцячае месца) закопвалі пад парогам або пад печчу"* [20]. Такім чынам ажыццяўлялася патрыятычнае выхаванне.

Важным было першае купанне нованароджанага: *"Ек родзіцца дзевачка, купалі ў любісціку, што б хлопцы любілі. Хлопчыкаў у светой вадзе купалі, ены ў армію ідуць"* [15]. Пры купанні прыглядаліся, каб не было пашкоджанняў: *"Баба абавязкова змервала дзіцятка. У вадзе зыход рабілі: локцік да ножкі і другі локцік да ножкі. Так і папраўлялі ўсякія вывіхі. Купалі часта, сыпалі цвяточкі "брацікі", сушылі і прымянялі румянак"* [48]. Нованароджанага туга спавівалі і перавязвалі поясам – спавівачам [51].

На Мазырскім Палессі ўсталявалася перакананне, што лёс дзіцяці ў многім прадвызначаны ад нараджэння: *"Якая чалавеку будзе жытка на гэтум свеце, яму яшчэ на раду назначано"* [173, с. 64]. Прысутнічае патрабаванне з дапамогай спалучэння рацыянальных і ірацыянальных прыёмаў садзейнічаць асабістаму шчасцю, удачы, будучаму матэрыяльнаму дабрабыту нованароджанага. Уступаючы ў жыццё, дзіця нясе долю свайго роду, а пасля нараджэння атрымлівае долю асабістую: *"А дай жа, божа, гэтаму дзіцяці / Усякую долю ўзяці: / І хлебавую, і салянную, / Трэццю – здаравейкую"* [56]. У славянскіх народаў лічыцца, што нельга галасіць над дзіцям аб няшчаснай долі, каб сапраўды не наклікаць яе.

Лепшыя якасці і ўдачу імкнуліся перадаць у ходзе хрэсьбін: *"Дзіця хрысціць лепш усяго везці на валох, та яно будзе добрым гаспадаром ці гаспадыняю. Калі ж няма валоў, та вязуць на конях, каб ліхое за ім не ўгналасо. Але ніколі не можна пешкі несці дзіця, як бы ні было блізко, бо гэто яму можэ зашкодзіць"* [173, с. 178]. Шмат залежала ад выбару кума і кумы: *"Кум і кума павінны на хрысцінах много праміж сябе гаварыць, каб дзіця было гаваркое да да людзей прыхільнае "* [173, с. 180].

На Мазырскім Палессі радзінныя звычаі найбольш поўна рэалізаваны ў рытуале падзелу бабінай кашы [137, с. 155]. Без гэтай стравы, што, як лічылася, валодае магічнаю сілаю як у адносінах да нованароджанага, так і акружаючых, не абыходзяцца сямейныя ўрачыстасці: *"Мёд клалі, каб дзіцятка, як вырасце, дак старацельным було, як пчолка. Бо пчолка ж гарапашная, маленькая самая, а меду сколькі выносіць"* [137, с. 154]. Замацоўваюцца пол і будучыя заняткі

дзіцяці: *“Часамі, як вязуць хрысціць дзіця, та кала парога ў хаце кладуць сакеру, долато, калі гэто хлопчык, ці лён, іголку – калі дзевачка, каб яны, як выростуць, былі добрымі гаспадаром і гаспадыняю”* [173, с. 178].

Прысутныя кладуць *“на кашу”* грошы і падарункі, што суправаджаецца добрымі пажаданнямі. Нованароджанаму жадаюць усяго найлепшага (хай расце вялікі, разумны, дужы, здаровы, багаты, хай будзе бацькам пацехай у маладосці і кармільцам на старасць) [4]. Дар, абмен дарамі або паслугамі – абавязковая састаўная частка народнага этыкету, сімвалічнае прызнанне нованароджанага грамадой, надзяленне яго доляю, здароўем. Прыносяць грошы, адзенне або тканіну, хлеб, зярно, пірагі, малочныя прадукты: *“Баба не прыходзіць з пустымі рукамі, пялёнкі несла, не адну, а дзве, хлеб, а няма, то місачку мукі, два яйца”* [48]. Паказальны звычай існуе ў сербаў: тым, хто не прыносіць падарунка, мажуць твар сажай, закідваюць шапку за печ [176, с. 16–20].

У народнай педагогіцы, якая спалучалася з ведамі медыцынскага і прафілактычнага характару, патрабавалася абмяжоўваць кантакты дзяцей з навакольным светам і незнаёмымі або нядобразычлівымі людзьмі. На Мазырскім Палессі існавала меркаванне, што дзіця трэба расціць у цішыні, не паказваць чужым людзям, каб не спалохаць, не сурочыць, каб не пашкодзіць фізічнаму і псіхалагічнаму развіццю: *“У нас до году, пака зубоў нема ў роце, по-колішнёму дзіця з дзіцям не стрэчаліся, бо зносы будуць, а як заболеюць – несуць бабам шэптаць”* [187, с. 186]. Гэта датычылася і старэйшых дзяцей: *“Пакуль дзіця яшчэ блазнота, яно павінно жыць сабе, як само хочэ; на яго не трээ зварочваць увагі, не вельмі паказваць людзям, не дзівавацца яго зграбнасцю, не прымушаць яго пасвіць гусі ці што, бо тагды яму вельмі лёгко могуць пашкодзіць”* [173, с. 185]. Працэс фатаграфавання або пільнага разглядвання дзіцяці, празмерная пахвала могуць прывесці да суроку.

Асноўнымі захворваннямі дзяцей ранняга ўзросту ў народнай медыцыне лічацца *“урок”*, *“ляк”*, *“прыстрэк”*, *“узносы”* (*“зносы”*). Ляк, спалох, пуд, перапуд – страх, душэўнае ўзрушанне, якое прыводзіць да хваробы. *“Жоўтачка з ляку нападае”* [130, с. 71]. *“Урок”* – хвароба ад дрэннага слова ці думкі; *“падзіў”* – хвароба ад нядобрых вачэй; *“падвей”* – хвароба ад ветру; *“прыстрэк”* – хвароба з урокаў: *“Трэбо тобе прыстрэка пошэптаць”* [130, с. 112]. *“Узносы”* – хвароба па прычыне выпадковай сустрэчы немаўлят. Спалох (ляк) на Мазыршчыне лечаць featureнымі спосабамі: выліваюць, змываюць, выкочваюць, палаюць перад печчу, перапякаюць, акурваюць, закладваюць валасы ў дзірку ў сцяне, выкідаюць адзенне хворага на дарогу, працягваюць дзіця праз дупло дрэва. Ад уроку – выкочвалі хлебам ці яйкам, апырсквалі вадой, уціралі падалом, абкурвалі, надзявалі навыварат адзенне і інш. [71; 147].

Па народных уяўленнях, шмат непрыемнасцей нованароджанаму прыносяць Начніцы, Плаксы, Крыксы. Гэтыя істоты (жанчыны, якія не мелі дзяцей, забілі або не дагледзелі дзіця; памерлыя ў маленстве ці праклятыя бацькамі дзеці) вечна пакутуюць, зайздросцяць шчасцю жывых [148, с. 138]. Распаўсюджаны былічкі аб маці, якая памерла, але прыходзіць уначы карміць і калыхаць дзіця.

Міфалагічныя персанажы (Дамавік, Лесавік, Палявік, Балотнік, Вадзянік) перасцерагаюць ад неабдуманых учынкаў, фарміруюць культуру паводзін у сям'і, сочаць за паводзінамі дзяцей у адсутнасці бацькоў. Такім чынам, міфалогія – сродак выхавання і захавання традыцый.

Сёння міфалогія разумеецца як падмурак культуры: сінтэз філасофіі, рэлігіі, мастацтва, увогуле сімвалічная мова, сістэма знакавай інфармацыі з высокай ступенню абстрагаванасці, сінтэтычнасці, універсальнасці [196]. Лічыцца, што ў аснове міфаў розных народаў знаходзяцца самыя архаічныя формы свядомасці або архетыпы (паводле К. Юнга прыроджаныя псіхічныя структуры і вобразы, якія складаюць змест калектыўнага несвядомага і ляжаць у аснове агульначалавечай сімволікі сноў, міфаў і казак, мастацкай фантазіі [158, с. 19]), таму міфалогія разглядаецца як сродак актывізацыі калектыўнай родавай памяці, традыцый.

Вучоныя лічаць: развіццё чалавека ў дзяцінстве (антагенез) абапіраецца на законы (фетышызм, адухаўленне прыроды, сінкрэтызм асноўных паняццяў і ідэй), якія дзейнічалі на пачатковых этапах культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва (філагенез). Гэта аб'ядноўвае міфалогію з дзіцячым светаўспрыманнем, якому ўласцівы вобразнасць, сімвалізм, зварот да інтуіцыі, творчага пачатку.

Рэгіянальная міфалогія адлюстроўвае вядучыя выхаваўчыя ідэі народнай педагогікі. Міфалагічныя персанажы надзяляюцца рысамі характару чалавека, маральна-выхаваўчыя ідэі даносяцца праз эмацыянальны, сімвалічна-вобразны спосаб пазнання рэчаіснасці.

Даследчыкі гісторыі педагогікі (А.Н. Джурынскі, Г.Б. Карнетаў) адзначаюць, што ў старажытнасці выхаваўчы вопыт ацэньваўся як тайна: значны сэнс надаваўся ўздзеянню на чалавечы след, маральным запаветам бацькоў, ініцыяцыі [131]. У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся гэтыя элементы (благаславенне бацькоў, абрад кумлення, выпрабаванне маладых на вяселлі) часткова захаваліся да нашага часу, што надае ёй архаічныя рысы. Таму для даследавання рэгіянальнай культуры актуальны падыход этнолагаў: "Мы не павінны супрацьпастаўляць магію і навуку: іх трэба размясціць паралельна, як два спосабы пазнання, што вядомыя чалавецтву" [169, с. 115].

Роля ірацыянальных фактараў у тэорыі выхавання вывучана недастаткова, хаця ў народнай педагогіцы яны з’яўляюцца неад’емным элементам пераемнасці, забяспечваюць сувязь паміж пакаленнямі. Прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага выяўляецца, па-першае, на індывідуальным узроўні, як сродак інтэнсіфікацыі духоўнага жыцця асобы, па-другое, на ўзроўні калектыўнай свядомасці, як сродак умацавання кансерватыўных аспектаў выхаваўчай дзейнасці, надання ёй рэгіянальнай адметнасці.

**Прынцып культуразгоднасці**

Ідэя аб неабходнасці культуразгоднага выхавання прысутнічае ў працах Дж. Лока, К. Гельвецыя, І. Песталоцы. Прынцып быў сфармуляваны ў XIX ст. Ф. Дыстэрвегам. Аб ідэях народнасці пісалі К.Дз. Ушынскі, Л.М. Талстой, С.І. Гесэн, П.Ф. Капцераў, С.Т. Шацкі, В.А. Сухамлінскі, А. Пашкевіч, М. Багдановіч, Я. Колас і інш.

Сучасная трактоўка прынцыпу культуразгоднасці мае на ўвазе, што выхаванне павінна грунтавацца на агульначалавечых каштоўнасцях культуры і будавацца згодна адпаведным нацыянальным нормам і асаблівасцям пэўных рэгіёнаў, якія не супярэчаць першым. Мэты, змест і метады выхавання з’яўляюцца культуразгоднымі ў тым выпадку, калі ўлічваюць гістарычна склаўшыяся ў пэўным соцыуме традыцыі і стыль сацыялагізацыі [158, 217]. Прынцып патрабуе выкарыстання ў выхаваўчым працэсе рэгіянальнай культуры, забяспечвае пабудова нацыянальнай сістэмы адукацыі, якая найбольш адпаведае менталітэту канкрэтнага народа, што спрыяе станаўленню нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці асобы.

У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся прынцып культуразгоднасці выхавання гучыць наступным чынам: *“Усялякія людзі маюць свой звычай, бо што сяло, та нораў, што галава, та розум, а што край, та звычай, але ўсе ж людзі трымаюцца таго звычая, які пашоў ад дзядоў да прадзедаў, бо яго ўстанавіў сам Бог”* [173, с. 121]. Ад нараджэння выхоўвалася адданасць роднаму дому, продкам, бацькоўскай зямлі: *“Свая хатка, як родная матка”* [27]. Сімвал радзімы ў шырокім сэнсе – родная зямля, якая лічыцца святой па той прычыне, што ў ёй пахаваны дзяды, продкі. Родная зямля атаясамліваецца з маці, адпаведна: *“Чужына не родная матка, хлеба не дась”* [50].

Патрыятызм палешукоў вызначаецца лакальным, абмежаваным, нават сямейна-родавым характарам. Увасабленнем радзімы выступае родны дом: *“Лепш за ўсё сяліцца на старой сядзібе, дзе жылі дзяды й прадзеды”* [173, с. 116]. Нованароджанага далучалі да роднай хаты: *“Каб дзіця кахало сваю хату й пілнаваласо яе, кума ахрышчонае дзіця як прынясе ў хату, абносіць яго*

*тры разы кругом стаўпа печы, пахістае перад чалешнікамі й тагды атдае мацеры”* [173, с. 180].

Прынцып культуразгоднасці грунтуецца на рэгіянальных выхаваўчых традыцыях, якія ахопліваюць усю сферу ўяўленняў, вераванняў, жыцця сям’і і грамадства, вызначаюць узаемаадносіны дзяцей і дарослых. Яны захоўваюцца дзякуючы калектывізму, значнасці грамадскай думкі, сумеснаму пражыванню прадстаўнікоў розных пакаленняў. Выхаваўчыя традыцыі рэгулююць два ўзаемазвязаныя працэсы: працэс *“урастання”*, паступовага ўваходжання новага пакалення ў жыццё дарослых і працэс мэтанакіраванай перадачы назапашанага вопыту. Для палешукоў характэрна прыхільнасць традыцыям: *“Старая пасловіца век не зломіцца”* [113, с. 241]. Кансерватыўнасць у выхаванні праяўляецца ў адносінах дзяцей да года, абавязковасці ўласцівых пэўнаму полу норм паводзін у падлеткавым узросце.

Як і ўвогуле ў народным выхаванні, на Палессі адной з умоў эфектыўнасці гадавання дзяцей з’яўлялася апора на традыцыі. Традыцыналізм, які вызначаў калектыўны маральны вопыт кандэнсаваўся ў пэўныя традыцыі, набываў выражаную стэрэатыпнасць і адначасова вырыятыўнасць. Шматлікія народныя традыцыі з іх усеагульнасцю, устойлівасцю ў часе, эмацыянальнай прывабнасцю з’яўляліся эфектыўнымі сродкамі маральнага выхавання. Традыцыяналізм забяспечваў выкарыстанне апрабаваных выхаваўчых намаганняў, ствараў умовы шматкратнага ўздзеяння на дзяцей, паўтараемасць падыходаў на працягу многіх пакаленняў. Такім чынам, традыцыналізм замацоўваў і развіваў маральную культуру як у межах канкрэтнага пакалення, так і на працягу гістарычнага шляху этнасу ўвогуле. Традыцыі продкаў беражліва захоўваліся, наваўвядзенні не ламалі існаваўшае, а дапаўнялі, абагачалі яго.

Прынцып культуразгоднасці рэалізоўваўся з першых дзён жыцця дзіцяці: *“Покуль дзіцяці не хрысцяць, яму не можна класці сарочачкі, яго толькі кладуць у пялёнкі, зробленыя з старызны: сарачок маткі, бацька, бабкі, дзеда ці каго-небудзь з старшых. Робляць гэто дзеля таго, каб дзіця ва ўсём было, як яго бацькі, дзяды ці другія сроднікі”* [173, с. 174]. Фарміравалася адчуванне прыналежнасці да пэўнага роду, сям’і: *“Што б дзеці былі дружныя ў сям’і, то іх у той жа самай рубашачцы нада хрысціць”* [137, с. 255].

Міжпакаленная сувязь у сем’ях палешукоў была цеснай. У выхаванні актыўны ўдзел прымалі бабулі і дзядулі, дзядзькі і цёткі і іншыя кроўныя сваякі. Адзінства вялікіх палескіх родаў падтрымлівалася народнымі звычаямі: сумесная праца (дажынкі, дакопкі), гасцяванне, бяседа, адзначэнне радзін, хрысцін, вяселляў: *“Асенні мёд раздаюць па-троху ўсім родным. Вуллі з самымі лепшымі пчоламі дораць на вяселле, на радзіны”* [35]. Сем’і на Мазырскім

Палессі, як правіла, былі вялікія, нярэдкасць – ад 4–х да 10–ці дзяцей [51]. Працяг роду, паводле народных уяўленняў, гэта не толькі фізіялагічны працэс, але перадача і далейшае наследаванне духоўнага вопыту продкаў, таму істотна выхаванне дзіцяці як члена роду, фарміраванне адзінства, узаемнай адказнасці.

У цэлым на Мазырскім Палессі назіраецца больш трывалая сувязь дзіцяці з родам маці, чым з бацькоўскім родам. Брату маладой адводзіцца значная роля на мясцовым вяселлі. Дваюрадныя браты і сёстры называюцца *“стрэднія”*, ад славянскага *“стрый”* – дзядзька, брат маці, выяўляюцца рэшткі абраду *“дзядзькаванне”* [11]. Тэндэнцыя ўзмацнілася ў пасляваенны час, калі мужчыны не вярнуліся з вайны; назіраецца яна і зараз, калі маладыя людзі пазбягаюць несці адказнасць за нараджэнне і выхаванне дзяцей.

Даследчыкі традыцыйна-пабытовай культуры Мазырскага Палесся адзначаюць даволі высокае, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі, становішча жанчын. Тут яна карысталася грамадскай павагай і мела значна больш свабоды, чым у іншых рэгіёнах краіны. Асабліва ярка праяўлялася яе роля ў гадаванні дзяцей. Менавіта дзякуючы яе актыўнаму ўдзелу ў адзначаным працэсе, фарміраваліся такія якасці палешукоў, як гуманнасць, добразычлівасць, лірызм душы, мяккасць характару, разважлівасць, памяркоўнасць і інш.

Імя, якое атрымлівала дзіця пры нараджэнні, а таксама родавая мянушка і прозвішча – важнейшыя элементы пераемнасці традыцый сям’і, рэгіёна. Паводле мясцовага звычаю, першы сын атрымліваў імя дзеда па бацькавай лініі, другі – па мацярынскай, так і пры выбары імя дзяўчынцы. Пры гэтым нельга было называць адным іменем трох чалавек: бабуля Таццяна, дачка Таццяна і ўнучка Таццяна [17]. Верылі, што ад выбару імя залежаў далейшы лёс, характар, звычкі. Дзіця імкнуліся назваць у гонар сумленнага, прыгожага чалавека, спадзеючыся перадаць рысы характару, здольнасці. У пасляваенны перыяд дзецям давалі імёны родных, якія не вярнуліся з вайны [201].

Для выхаваўчых традыцый Мазырскага Палесся характэрны грамадская адказнасць за выхаванне асобы, павучальная скіраванасць. Мясцовыя жыхары невысока ацэньваюць веды, знешнія дадзеныя, якія не спалучаюцца з выхаванасцю, дабрынёй, спагадлівасцю, працавітасцю, адказнасцю, павагай да старэйшых. Выразы *“прыгожы”* і *“непрыгожы”* учынак (паводзіны) – не метафара, а спосаб народнага бачання свету і ацэнкі чалавека. У палешукоў існавала ўзаемная адказнасць за выхаванне дзіцяці ў шырокім разуменні (якім чалавекам вырасце) і ў вузкім – як паводзіць сябе ў канкрэтнай сітуацыі.

На Мазыршчыне існуюць багатыя гаспадарча-побытавыя традыцыі. Выяўляюцца істотныя рэгіянальныя адрозненні ў арганізацыі раслінаводства і развядзенні жывёлы: утрыманні буйной рагатай жывёлы (*“тавару”*), які на ноч заганялі ў кашару і вольным выпасе свіней у лесе або на аддаленых астравах.

Да XIX ст. у земляробчай практыцы выкарыстоўвалася лясная аблога і падсечна-агнявое – ляднае земляробства. Прадметамі вывучэння з’яўляюцца палеская саха, драўляная або плеценая барана, вершаліна і смык [145]. Значнае месца займала рыбалоўства, збіральніцтва, пчалярства, хатнія промыслы.

Сакрэты народных рамёстваў, працоўны вопыт з’яўляліся набыткамі родавымі, сямейнымі. Рацыянальныя прыёмы валодання тэхналогіяй, матэрыялам шліфаваліся і перадаваліся як спадчына ў ходзе сямейнага выхавання: *“Мой дзед атрымаў вуллі ад бацькі і з маленства ўмеў хадзіць за пчоламі. Бацьку ў вайну забілі і з 10 год дзядуля даглядаў пчолы сам. Лічыцца, што ў пчалаводстве павінны быць мужчынскія рукі”* [35].

Для рэгіёна Мазырскага Палесся былі характэрны пэўныя ўзоры і сюжэты арнаменту, стылістычныя асаблівасці, назвы інструментаў, прыёмы ткацтва, вырабу ручнікоў і г.д. Яны перадаваліся з пакалення ў пакаленне ў межах сям’і, вёскі, паселішча. Рэчы, зробленыя бабуляй, далёкімі продкамі, захоўваліся як рэліквія. У спадчыну ад маці да дачкі перадаваліся не толькі прадметы побыту, але і песні, замовы, казкі, узоры на ручніках. З цікавасці да спраў і заняткаў папярэднікаў у дзяцей узнікала жаданне працягваць працоўныя традыцыі сям’і, роду, паселішча і рэгіёна, а шырэй – працоўныя народныя традыцыі.

Прынцып культуразгоднасці выхавання ўключаў патрабаванне перадаваць дзецям не толькі практычныя ўменні і навыкі, але і адметнасць светапогляду, адносін да жыцця, асаблівасці зрокавага і слыхавага ўспрыняцця. Родная палеская прырода і традыцыйная культура рэгіёна станавіліся неад’емнымі састаўляючымі свядомасці дзіцяці. Выхаваўчую каштоўнасць мелі: святочны народны касцюм, ручнікі з узорамі, тканыя дываны, упрыгожаныя разьбой прылады працы, гліняны і драўляны посуд, народная песня і музыка. Пачынаючы з калыханак, у дзіцяці фарміравалася асацыятыўнае мысленне, прыхільнасць да пэўных пахаў і гукаў, мелодый і колераў. Для жыхароў Мазырскага Палесся адметнымі асацыятыўнымі магчымасцямі валодаюць стравы (водар свежага хлеба, грыбоў і спелых суніц), музыка (скрыпка, бубен) і песня, прыродныя матэрыялы (гліна, лён, дрэва).

Прынцып культуразгоднасці рэалізаваны ў мясцовым дзіцячым фальклоры, які мае адметную лексічную і фанетычную афарбоўку, адлюстроўвае асаблівасці побыту і народнай гаворкі дадзенага рэгіёна. Яшчэ да таго, як дзеці навучацца гаварыць, яны знаёмяцца з культурай, успрымаючы нормы паводзін, жэсты, інтанацыю тых, хто пра іх клапоціцца. Нават у творах для самых маленькіх прасочваецца адзінства з няпростым культурна-гістарычным лёсам народа: “Спі мая дочачка, бо іду я на работу. Прыду, тады калыхаць буду” [8].

Прыхільнасць да тых або іншых страў таксама закладваецца ў раннім узросце. Большасць традыцыйных страў (хлеб, каша, бліны, сыр, масла, яечня) стваралі аснову не толькі паўсядзённага, але і святочнага стала беларусаў-палешукоў.

Вынікі жыцця кожнага пакалення застаюцца ў народнай мове, праз мову дзіця *"прысвойвае"* вопыт папярэднікаў. У выхаванні асобы мова выступае інструментам уздзеяння на свядомасць, фарміруе духоўны свет. Культураадпаведнымі з'яўляюцца рэгіянальныя формы асабовых імёнаў, мянушкі і прозвішчы, назвы дзіцячага інвентару. Валоданне мясцовай гаворкай дазваляе ўспрымаць спецыфіку гумару, садзейнічае сацыяльнаму адзінству.

Мова кожнага народа адпавядае народнай этыцы і эстэтыцы, асноўным катэгорыям традыцыйнай культуры, эмацыянальна-псіхалагічнаму мясцовага насельніцтва. Устаноўлена сувязь мовы з акружаючай прыродай, натуральнай прыроднай акустыкай, гістарычным і гаспадарчым вопытам. Такім чынам, праз родную мову, яе лексічны і фанетычны склад адбываецца трансляцыя этнічнай рэгіянальнай карціны свету, народнага светапогляду і логікі мыслення.

Адпаведна сучасным падыходам, нацыянальныя мовы і іх дыялекты па шкале агульначалавечых каштоўнасцей ацэньваюцца высока: не проста як сродак камунікацыі, а як жывы сацыяльны арганізм, які мае свае законы развіцця і функцыянавання, валодае здольнасцю паміраць і адраджацца, узаемадзейнічаць з суседнімі мовамі і інш. Гаворкі Мазырскага Палесся, якія складаюць асобную групу паўднёва-заходняга дыялекту, маюць з беларускай літаратурнай мовай шмат агульнага ў лексічным складзе, але істотна адрозніваюцца вымаўленнем, націскам, наяўнасцю дыфтонгаў: [іе], [ое] (гаворыцца "іе" замест "ёсць"), канцавым гукам [о] ("тато", "мамо", "бацько"), адметнымі формамі зваротных дзеясловаў, так званае "саканне" ("памуласа", "адзеласа", замест "памылася", "адзелася"), дзеясловаў будучага часу ("рабіцьму", "жацьму" замест "буду рабіць", "буду жаць") і г.д. [202, с. 188-189]. Асаблівасці палескіх гаворак, якія склаліся яшчэ ў эпоху дрыгавічоў, вызначаюць лакальныя назвы ("сакуны", "гэтуны", "зюзюны") мясцовых жыхароў, з'яўляюцца нашай гісторыяй.

Мастацка-эстэтычнае выхаванне моладзі адбываецца шляхам перадачы рэгіянальнага мастацкага вопыту, адметнага бачання рэчаіснасці. Сістэма народных святаў захоўвалася ў калектыўнай памяці. Грамадская думка імператыўна патрабавала масавага ўдзелу моладзі ў абрадах, бо ад гэтага залежаў хуткі, дружны надыход вясны, будучы ўраджай. Пры гэтым музыказнаўцы адзначаюць: да чужых песень адносіны ў народзе хаця і зацікаўленыя, але без жадання іх пераняць. Незнаёмая манера выканання і фанетычныя асаблівасці ацэньваюцца як непрыгожыя [144, с. 62–65].

Неабходнасць ажыццяўляць выхаваўчую дзейнасць на аснове народных традыцый выклікана тым, што ў кожнай мясцовасці ёсць свае міфы, легенды,

працоўныя заняткі, якія патрабуюць не столькі асаблівага разумовага складу ці фізічных дадзеных, колькі адметнага светапогляду (сістэма забарон, народны этыкет, адданасць свайму селішчу, народны гумар), асаблівага стану душы (адзінства мастацкай творчасці і фізічнай працы, стрыманасць у праяўленні пачуццяў), блізкіх узаемаадносін з прыродай (земляробства і жывёлагадоўля, бортніцтва і рыбалоўства, збор дароў лесу), адчування прыродных матэрыялаў (гліна, дрэва, лён, саломка), праяўлення цярплівасці і эстэтычнага густу (ткацтва, вышыўка, лазапляценне), адпаведнай каардынацыі рухаў (народныя танцы, працоўныя заняткі), што трэба ўлічваць пры арганізацыі выхавання.

Чалавек нараджаецца і жыве ў канкрэтным культурным асяроддзі, што мае выхаваўчы кантэкст. Выхаванне ажыццяўляецца адпаведна народнаму светапогляду, рэалізуецца ў форме святаў і абрадаў, але і ўзровень развіцця народнай культуры залежыць ад выхаванасці, духоўнага ўзроўню асобы і грамадства. Прынцып культуразгоднасці забяспечвае пераемнасць паміж пакаленнямі, выкарыстанне выпрацаваных вопытам і выверанных часам выхаваўчых падыходаў, захаванне і ўзбагачэнне традыцый продкаў. Адпаведна яму задачы навучання і выхавання бачыцца ў развіцці патэнцыяльных творчых магчымасцей асобы і народа, якія маюць пэўныя прадумовы ў менталітэце, але выкарыстоўваюцца недастаткова.

У сукупнасці заканамернасці і прынцыпы выхавання, прадстаўленыя ў табліцы 2.1, характарызуюць пэўны ўзровень развіцця грамадства і вызначаюць патрабаванні да выхавання канкрэтнага тыпу асобы на аснове традыцыйнай культуры рэгіёна.

**Табліца 2.1 – Заканамернасці і прынцыпы народнай педагогікі Мазырскага Палесся**

| **Заканамернасці традыцыйнага ладу жыцця і адпаведныя ім прынцыпы народнага выхавання** | **Асноўны змест патрабаванняў да арганізацыі выхаваўчай дзейнасці** |
|---|---|
| узаемасувязь чалавека і прыроды, сусвету – **прынцып прыродазгоднасці** | –выхаванне дзіцяці, па-першае, як часткі сусвету, па-другое, як часткі акружаючай прыроды, адпаведна часу нараджэння, генатыпу, полу і ўзросту, каб не парушыць прыродную і сацыяльную гармонію;<br>–патрабаванне ўлічваць фактар спадчыннасці, узаемаабумоўленасць прыроджаных фізічных, інтэлектуальных, псіхалагічных асаблівасцей і духоўна-маральнага патэнцыялу продкаў у развіцці асобы дзіцяці;<br>–выбар характару выхаваўчага ўздзеяння ў адпаведнасці з індывідуальнымі псіхалагічнымі асаблівасцямі, узростам і полам выхаванца;<br>– яскрава выражаны дыферэнцыраваны падыход да выхавання хлопчыкаў і дзяўчынак, адпаведна рэгіянальнай сістэме падрыхтоўкі да сацыяльных і сямейных роляў;<br>–патрабаванне ажыццяўляць усебаковае развіццё асобы на аснове заглыблення ў свет роднай прыроды і выкарыстоўваць мясцовыя прыродныя фактары для фізічнай загартоўкі дзяцей;<br>–фарміраванне экалагічнага мыслення, любві да роднай зямлі, што абумоўлена з аднаго боку яе практычнай каштоўнасцю, а з другога – светапоглядам, анімістычнымі адносінамі да свету прыроды; |
| цыклічнасць прыроднага, гаспадарчага і сацыяльнага быцця і фальклору – | –арганізацыя выхавання ў адпаведнасці з самабытнай узроставай перыядызацыяй (перыяд унутрыўтробнага развіцця і нованароджанасці (першы этап: ад зачацця да 40 дзён; другі этап: ад 40 дзён да 1 года); перыяд маленства, кармлення |

| | |
|---|---|
| **прынцып цыклічнасці** | грудзьмі (ад нараджэння да 1–3 гадоў); перыяд дзяцінства (3–9); падлеткавы ўзрост (10–14); маладосць, маладыя гады (15–20), што характарызуецца асаблівай увагай да ранніх этапаў развіцця дзіцяці, разуменнем іх уплыву на станаўленне асобы;<br>–патрабаванне сістэматычнага характару выхаваўчага ўздзеяння, адпаведна кругазвароту, цыклічнасці быцця: прыроднай (зіма-лета-восень-вясна); астранамічнай (сонечны і месячны цыклы); часавай (дзённы, сутачны, тыднёвы цыклы); сельскагаспадарчай (сяўба – выспяванне ўраджаю – жніва – апрацоўка і яе этапы); мастацкай (каляндарна-абрадавая і сямейна-абрадавая паэзія); рэлігійна-побытавай (будні і святы, пасты і мясаеды); жыццёва-біялагічнай (ад зачацця, нараджэння да смерці і ўваскрашэння ў дзецях і ўнуках); сямейнай (вяселле – нараджэнне дзяцей – выхаванне дзяцей – замужжа, жаніцьба – гадаванне ўнукаў, догляд састарэлых бацькоў); міжпакаленнай (бацька – сын – дзед – унук); родавай (продкі – сучаснікі – нашчадкі); сацыяльнай (халасты – жанаты – удавец), што гарантавала паступовасць фарміравання асобы; |
| жыццё ў працы, натуральны характар гаспадаркі – **прынцып сувязі з працай** | –мэтанакіраваны пачатак працоўнага выхавання і вызначэння будучых працоўных заняткаў яшчэ да нараджэння (пры выбары пары, праз сістэму забарон для цяжарнай жанчыны), а таксама на ранніх этапах развіцця адпаведна полу дзіцяці;<br>–дыферэнцыраваны і сістэматычны характар працоўнага выхавання, які паглыбляўся і ўскладняўся з узростам;<br>–дзейсны характар працоўнага выхавання, яго сувязь з вырашэннем рэальных жыццёвых праблем (дабрабыт сям’і, узаемадапамога, падрыхтоўка пасагу);<br>–практычнае далучэнне дзяцей да асноўных напрамкаў рэгіянальнай працоўнай дзейнасці адпаведна полу, узросту, спадчынных задаткаў і індывідуальных інтарэсаў, сямейна-родавых традыцый;<br>–усямернае асуджэнне гультайства, ляноты і ўслаўленне працоўнага чалавека, сумленнай працы; |

| | |
|---|---|
| пераемнасць традыцый, кансерватызм, культ продкаў – **прынцып культуразгоднасці** | –патрабаванне выхоўваць дзіця як члена сямейна-родавай групы, у якой існуе адчуванне еднасці і ўзаемадапамогі і дзе інтэлектуальны, жыццёва-практычны, гаспадарчы, мастацка-эстэтычны вопыт перадаецца не толькі ад бацькоў – дзецям, але і праз пакаленне;<br>–патрабаванне ўзгадняць ідэал, мэту, змест, метады і формы выхавання з акружаючай прыродай, ладам жыцця, народнымі звычаямі, менталітэтам карэнных жыхароў, асаблівасцямі сацыялізацыі асобы;<br>–патрабаванне выхавання дзіцяці як спадкаемцы традыцый (рэлігійных, маральных, працоўных, эстэтычных, сямейных, сацыяльных, побытавых) свайго роду, сям'і і рэгіёна, носьбіта мясцовай гаворкі і светапогляду, адметнага ўспрыняцця часу, прасторы, прыроды і інш.;<br>–патрабаванне забяспечваць эфектыўнасць выхавання, абапіраючыся на рэгіянальныя традыцыі, несці асабістую адказнасць за выхаванне ўласных, і грамадскую – за паводзіны чужых дзяцей; |
| адзінства духоўнага і матэрыяльнага, рацыянальнага і ірацыянальнага ў жыцці, у сусвеце – **прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага ў выхаванні** | –неабходнасць улічваць, што на фарміраванне асобы дзіцяці і яго далейшы лёс могуць аказаць уздзеянне не толькі матэрыяльныя фактары, але і адпаведны стан прыроды, эмацыянальны настрой блізкіх, станоўчыя або адмоўныя думкі і пажаданні, выкананне абрадаў і рэкамендацый народнай медыцыны;<br>–патрабаванне ашчаджаць псіхалагічнае здароўе дзіцяці і спалучаць рэальны выхаваўчы вопыт з інтуіцыяй, прадчуваннем, рэлігійнымі ўяўленнямі;<br>–патрабаванне садзейнічаць фарміраванню псіхічна і фізічна здаровага дзіцяці яшчэ да нараджэння, ахове ад шкоднага ўздзеяння, замацаванню сувязі з продкамі, родным домам, сусветам;<br>–патрабаванне праз рэгіянальную сістэму абрадаў і аказанне сугестыўнага ўздзеяння далучыць нованароджанага да соцыуму, спрыяць далейшаму шчасліваму лёсу, правільнай палавой арыентацыі. |

## 2.2 Метады народнага выхавання

Метад народнага выхавання ў дадзеным даследаванні разумеецца як спосаб вырашэння выхаваўчых задач і ажыццяўлення мэтанакіраванага або ўскоснага выхаваўчага ўзаемадзеяння. Айчынныя даследчыкі народнай педагогікі вылучаюць наступныя выхаваўчыя метады: праца, прыклад і аўтарытэт, назіранне, гульня, наказ, перакананне, парада, прывучэнне, унушэнне, тлумачэнне, расповед, гутарка, іспыт, спаборніцтва, практыкаванне, грамадская думка, ушчуванне, заахвочванне і ўхваленне, благаславенне, асуджэнне, пакаранне, вымова, пагроза, праклён і інш. [63, с. 16].

Сістэма метадаў народнай педагогікі Мазырскага Палесся не з’яўляецца выпадковай: яна склалася гістарычна, вынікае са светапогляду, ладу жыцця, працы, прыроды, традыцый. Выбар канкрэтных метадаў вызначаўся ўзростам і полам дзяцей, іх індывідуальнымі асаблівасцямі і задачамі выхавання на пэўным этапе. Да мудрай высновы прыходзілі ў народзе: “*Аб камень ступіш, камнем і навострыш*” [16].

Праведзены аналіз народна-выхаваўчага вопыту дае падставы падзяліць метады народнага выхавання на тры асноўныя групы: вербальныя (перакананне, павучанне, гутарка, грамадская думка, заахвочванне, высмейванне і асуджэнне); практычныя (перайманне, прыклад, практыкаванне, прывучэнне, групавое і індывідуальнае спаборніцтва, выпрабаванне); метады эмацыянальна-магічнага ўздзеяння (пажаданне, благаславенне, прысяганне, адрачэнне, пакаянне, ахвяраванне, запалохванне, пагроза, фізічнае пакаранне з элементамі эмацыянальна-магічнага ўздзеяння).

У якасці крытэрыя дадзенай класіфікацыі выступае спосаб уздзеяння на свядомасць і падсвядомасць выхаванца з мэтай фарміравання пэўных звычак і перакананняў: вербальныя – уздзеянне словам; практычныя – уласным прыкладам і дзеяннем, праз дакладна зададзеную арганізацыю жыцця; эмацыянальна-магічныя – псіхалагічнымі і ірацыянальнымі шляхамі або словам, якое мае магічную сілу.

І калі вербальныя і практычныя метады вылучаюцца большасцю даследчыкаў, то вылучэнне метадаў эмацыянальна-магічнага ўздзеяння ў асобную групу выклікана адметнасцю народнай педагогікі Мазырскага Палесся, якая склалася гістарычна, адпавядае светапогляду і пацверджана сабраным эмпірычным матэрыялам. Дадзеныя метады абапіраюцца на рэгіянальны прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага, у выніку чаго пры ўздзеянні на асобу ўжываюцца не толькі слова або дзеянне, а ў спалучэнні з міфалагічнымі і рэлігійнымі вобразамі, элементамі магіі і ўнушэння,

рытуальнага і фізічнага ўздзеяння, што патрабуе іх дадатковага разгляду, дазваляючы абагуліць многія факты і з'явы традыцыйнай культуры рэгіёна.

Метады народнай педагогікі маюць наступную спецыфіку: па-першае, у якасці настаўнікаў, выхавальнікаў выступаюць не прафесійныя педагогі, а бацькі, блізкія людзі, вопыт передаецца з пакалення ў пакаленне; па-другое, гэта метады передачы не пісьмовай, фіксаванай інфармацыі, а вуснай, непісьмовай культуры, заснаванай на паўтарэнні і запамінанні; па-трэцяе, у народнай педагогіцы метады навучання і метады выхавання не раздзяляюцца, таму што навучанне дзяцей канкрэтным відам дзейнасці цесна звязана з фарміраваннем духоўнага свету асобы. Акрамя таго, развіццё дзіцяці ў традыцыйнай культуры адбываецца двума асноўнымі шляхамі: па-першае, шляхам мэтанакіраванага планамерна ажыццяўляемага дарослымі выхавання; па-другое, у кантэксце ненакіроўваемага ўздзеяння на асобу самых розных бакоў жыцця, у якія чалавек заглыблены і ўплыву якіх можа нават не заўважаць. У выніку дзеці не адчуваюць пастаяннага ўплыву дарослых, што з'яўляецца адной з умоў эфектыўнасці народнага выхавання.

У межах названых груп вылучаны асобныя прыёмы выхавання – састаўная частка рэалізацыі таго ці іншага метада (метад – перайманне, прыём – паказ; універсальны для ўсіх груп метадаў прыём – паўтарэнне) або мадыфікацыя метада (метад – гутарка, прыём – ускосная гутарка; метад – пагроза, прыём – нямая пагроза). У працэсе іх комплекснага выкарыстання дасягалася шматварыятыўнасць выхаваўчага ўздзеяння, захоўвалася рэгіянальная адметнасць народнага выхавання. Выбар метадаў залежаў ад канкрэтнай сітуацыі, псіхалагічнага клімату сям'і, узросту і полу дзіцяці, індывідуальных асаблівасцей і задач выхавання на пэўным этапе.

### I Вербальныя метады народнага выхавання

У народным выхаванні значная роля належыць слову, вербальным метадам і прыёмам ўздзеяння, паколькі мова з'яўляецца асновай чалавечых зносін, мае істотныя эмацыянальна-эстэтычныя характарыстыкі. І менавіта слова прызнаецца народам найбольш дзейсным у выхаванні асобы: *"Вала вяжуць матузом, а чалавека словам"* [197, с. 9]. Палешукі кажуць, што бацькоў трэба слухаць, слухацца, што характарызуе пераважна вусны характар выхаваўчага ўзаемадзеяння: *"Бацькоў паважалі і слухалі"* [10].

Да асноўных вербальных метадаў выхавання адносіцца метад пераканання, які мог быць рэалізаваны ў форме гутаркі, расповеду, тлумачэння, парады, заахвочвання, асуджэння, угаворвання, загаду, павучання, пажадання, папроку, папярэджання, тлумачэння, разбору памылак, заўвагі і інш. Вербальныя метады ў народнай педагогіцы характарызуюцца сінтэзам інтэлектуальнага і эмацыянальнага ўздзеяння. Значэнне мае не толькі змест

паведамлення, але і тое, як і пры якіх акалічнасцях яно сказана: *"Не частуй мяне ні піўцом, ні вінцом, а прывітай мяне шчыранькім слаўцом"* [72, с. 155].

Найважнейшым сродкам выхавання з'яўлялася вусная народная творчасць. З маленства дзеці былі не толькі сузіральнікамі, а і актыўнымі ўдзельнікамі шматлікіх звычаяў і абрадаў. Адбывалася адначасовае ўздзеянне на розум і пачуцці выхаванцаў, якое істотна павялічвала эфектыўнасць гэтага працэсу. Відавочна, што працэс выхавання ў народнай педагогіцы ў значнай ступені выкарыстоўваў спецыфічна мастацкія формы фальклору, праз пачуццёвае ўспрыманне ўздзейнічаў на развіццё вобразна-мастацкага мыслення, што ў сваю чаргу садзейнічала эфектыўнаму фарміраванню маральнай свядомасці. Не дзіўна, што ў адрозненне ад інстытуталізаванага выхавання, народная педагогіка сур'ёзную ўвагу ўдзяляла магічнасці. Апора на магічнасць павінна разглядацца не толькі з пункту гледжання дасягненняў сучаснай навукі, калі часта магія тлумачыцца як шарлатанства, а трэба мець на ўвазе, што многім рэчам і з'явам надавалася звышнатуральная сіла. Ствараўся своеасаблівы эмацыянальны фон, які шматкратна павялічваў выхаваўчыя магчымасці звычайных сродкаў. Так, агульнавядома магічная сіла слова, якая тварыла сапраўдныя цуды. Многія народныя прыкметы засцерагалі ад дрэнных учынкаў, скіроўвалі паводзіны ў жадаемае рэчышча.

Дзейснымі сродкамі метаду пераканання з'яўляліся на Палессі гутаркі, павучанні, угаворы, растлумачэнні, парады, унушэнні: "*Умеў дзіця радзіць, умей і вучыць*" [6, 135], "*Разумным дзіця не радзіцца*" [13]. Такія метады і сродкі маральнага выхавання, як благаславенне, добрае або ліхое пажаданне, папрок, абяцанне, клятва, праклён, адрачэнне і інш. Пры ўздзеянні на эмацыянальна-пачуццёвую сферу яны альбо стымулявалі актыўнасць чалавека на ўдасканаленне сваіх рыс і якасцей, альбо садзейнічалі папярэджанню негатыўнага ў свядомасці і паводзінах выхаванцаў.

Неацэннае выхаваўчае значэнне мелі на Палессі народныя песні. Пачынаючы з калыханак у дзяцей фарміравалася ўласнае светабачанне, узбагачаўся і ўзвышаўся ўзровень маральнага развіцця. Вось прыклад адной з такіх калыханак, запісаных на Мазыршчыне:

*Люлі-люлі,*
*Усе дзеткі паснулі.*
*Адна Ганначка не спіць,*
*Яна угору ўсё гледзіць*
*Думае пра мамку,*
*Думае пра татку.*
*Яшчэ думае а том,*
*Як добрэ жыць нам утраём* [20].

У песнях палешукоў значнае месца ўдзяляецца духоўным перажыванням і памкненням чалавека, разважанням аб чалавечых узаемаадносінах. Народныя песні раскрываюць складаныя ўзаемаадносіны ў традыцыйнай міжпакаленнай сям'і: паміж маці і дачкой, свякрухай і нявесткай, мужам і жонкай. Асабліва папулярныя народныя песні-балады: "*Цячэ рэчанька-невялічанька, скочу-пераскочу…*", "*А ў полі бероза, у полі кудравая*", "*Аддала мене маці да ў чужую старану…*" [24].

Як у іншых народаў багацейшы выхаваўчы патэнцыял утрымлівалі народныя казкі з іх павучальным ухілам, выразным размежаваннем дабра і зла, аптымістычнай упэўненасцю ў перамозе апошняга. Казкі не толькі раскрываюць змястоўнае напаўненне маральнасці асобы, а і вучаць, як будуваць адпаведную лінію паводзін. Нездарма лічылася, што "*байкі дзяцей гадуюць*" [16].

Сапраўднай скарбонкай народна-педагагічнай мудрасці з'яўляюцца прыказкі і прымаўкі. Яны, як правіла, маюць афарыстычную форму і павучальны змест, дзе народам адабрана і выкрышталізавана ўсё каштоўнае са свайго сацыяльна-гістарычнага вопыту, у тым ліку і з выхаваўчай практыкі. Да сённяшняга часу паўсядзённая мова насельнікаў Мазырскага Палесся дапаўняецца крылатымі выслоўямі для падмацавання сваіх довадаў, разваг, бо існуе ўпэўненасць, што "*без прымаўкі і прыказкі гаворка, што ежа без солі*" [14]. Аналіз прыказак і прымавак палешукоў падводзіць да высновы, што пераважная большасць з іх напрамую ці ўскосна скіраваны на працэс выхавання і перш за ўсё на маральнае ўдасканаленне асобы: "*За цярпенне дае бог спасенне*" [6, 231], "*Колькі смаку, столькі і граху*" [6, 233], "*Людзей не судзі, лепш на сябе паглядзі*" [6, 234], "*Як гукнеш, так і адзавецца*" [6, 248].

Выхаваўчае ўздзеянне на асобу часта ажыццяўлялася з дапамогай прыказак і прымавак у эмацыянальна-афарбаванай форме. Высока ацэньваліся жарты, вострае, дасціпнае слова: *"Сказаў, як звязаў"* [72, с. 157], *"Не тое кажы, што ведаеш, а тое, што ў рыхт"* [72, с. 155].

Абавязковым лічылася выкананне калыханак, твораў дзіцячага фальклору. Асаблівай папулярнасцю на Мазырскім Палессі карыстаюцца забаўлянкі: *"Ладушкі-ладкі"*, *"Кую, кую ножку"*, *"Сарока-варона"*, *"Кошыкі-кошыкі"*, *"Кудры-кудры"*, *"Ласачка"*, *"Ішла каза рагатая"* і інш. Забаўлянкі ўзбагачаюць дзіця станоўчымі эмоцыямі, прыносяць задавальненне ад кантактаў з блізкімі людзьмі, навакольным светам, дапамагаюць дарослым супакоіць дзіця ад плачу, рассмяшыць, пераключыць увагу. Яны актывізуюць дзяцей, уключаюць у сумесную гульню: *"Кую-кую ножку"* [22]. Большасць рэгіянальных твораў суправаджаецца жэстамі: дотыкі, пагладжванне, пацопванне, пастукванне, лёгкі масаж, падкіданне наназе або на каленях,

імітацыя галасоў жывёл і птушак. На эмпірычным узроўні народнымі выхавальнікамі было выяўлена, што гульні з пальчыкамі, актывізацыя рухаў рук садзейнічаюць разумоваму развіццю дзіцяці.

У народнай педагогіцы пры размовах з дзецьмі малодшага ўзросту слова спалучаецца з жэстамі: шырока ўжываюцца жэсты, якія супакойваюць – пагладжванне па галаве, прыцісканне ўказальнага пальца да губ; жэсты адабрэння і падтрымкі – ківанне галавой, выцягнутыя насустрач рукі, паляпванне па плячы, пляскание ў ладкі і інш. Жэсты дапамагаюць устанавіць эмацыянальны кантакт, дапаўняюць вербальныя метады ўздзеяння.

Блізкія імкнуліся больш гаварыць з дзецьмі, па магчымасці адказваць на іх пытанні і прыслухоўвацца да таго, што кажа дзіця [173 с. 185]. Тлумачэнне, гутарка дыферэнцыраваліся ў залежнасці ад полу і ўзросту. Гутаркі з дзяўчынкамі маглі праводзіцца маці або сёстрамі, старэйшымі жанчынамі на вячорках, у час выканання спецыфічна жаночых відаў работ. Мелі месца і гутаркі бацькі з сынам у час выканання мужчынскіх відаў работ. У залежнасці ад сітуацыі і ўзросту гутаркі маглі набываць характар павучання, настаўлення. Старэйшыя тлумачылі, як апранацца, паводзіць сябе ў канкрэтнай сітуацыі або ў грамадскім месцы, каб заслужыць адабрэнне акружаючых. Гутаркі з падлеткамі (спецыяльна арганізаваныя або ўзнікшыя ў ходзе сумеснай дзейнасці) адрозніваліся дастаткова высокім інтэлектуальным узроўнем, утрымлівалі аналіз і ацэнку паводзін, сыходзячы з поглядаў і ўяўленняў народа.

Адным з прыёмаў рэалізацыі метаду пераканання ў народнай педагогіцы была ўскосная, пасіўная гутарка, калі дзеці актыўна не ўдзельнічалі ў размове, а слухалі размовы дарослых у паўсядзённым жыцці ці ў ходзе народных святаў, на вячорках. Прадстаўнікі старэйшага пакалення давалі сваю ацэнку паводзін і ўзаемаадносін, падзей і з'яў, тым самым арыентуючы моладзь на засваенне агульнапрынятых каштоўнасцей. Ацэнка выказвалася ў прысутнасці дзіцяці, у выніку чаго засваенне правіл народнай маралі адбывалася з дапамогай прыкладаў, асэнсавання выхаваўчых сітуацый. Маналогі-успаміны або апавяданні пра арганізацыю свят у мінулым, пра народных майстроў стымулявалі інтарэс дзяцей да асабістага самаўдасканалення ў сферы працоўных рэгіянальных заняткаў.

У традыцыйнай палескай сям'і жылі разам, як правіла, тры пакаленні і вопыт перадаваўся не толькі ад бацькоў да дзяцей, але і ад бабуль, і дзядуль да ўнукаў. Усведамляючы сваю выхаваўчую місію ў дачыненні да ўнукаў, яны расказвалі дзецям казкі, перадавалі працоўны вопыт, давалі жыццёвыя парады.

Абапіраючыся на магчымасці фальклору і вуснага, жывога слова, дарослыя імкнуліся раскрыць перад дзецьмі (як адзначаецца гадоў да васьмі, не больш) прыгажосць наваколля: яснага сонейка, рунных палёў, якія зеленеюць

збожжам пасля цёплага веснавога дажджу, густых зялёных лясоў, якія звіняць ад птушыных спеваў [164, с. 528]. Пазнанне прыроды падлеткамі праходзіла надзвычай актыўна, але арганічна, у натуральных умовах, таму амаль незаўважна для асобы. Пры ўспрыняцці прыгажосці прыроды пераважалі назіранне, любаванне, параўнанне. Фарміраванне любві і беражлівых адносін да прыроды ў народнай педагогіцы рэалізоўвалася, па-першае, у ходзе паўсядзённага жыцця і працоўнай дзейнасці; па-другое, у ходзе засваення народнай творчасці, арганізацыі святаў і абрадаў. Істотна ўздзейнічалі звароты з памяншальна-ласкальным значэннем, вобразна-псіхалагічныя паралелізмы, параўнанні, эпітэты: *"Ах ты, ластавачка!"* [164, с. 322]. Казкі, прыказкі ў нязмушанай форме тлумачылі правілы паводзін у прыродным асяроддзі: *"Хто ўб'е бабра, таму не будзе дабра"* [164, с. 592].

Гутаркі ў народнай педагогіцы спалучаліся з павучаннямі ў эстэтычна-мастацкай форме, якія маглі ўзнікаць у ходзе калектыўных відаў працы, дзе ўспаміналіся былічкі, абмяркоўваліся міфалагічныя сюжэты. Непаслухмянасць малых дзяцей, якія недастаткова ўсведамляюць магчымыя вынікі сваіх учынкаў, народная педагогіка карэкціруе з дапамогай казкі, гульні, выказваючы наказ, забарону, просьбу, перасцярогу ў эстэтычна значных вобразах. Павучальнасцю характарызуюцца гульні *"Крумкач"*, *"Мышка"*, *"Проса"*, *"Іванка"*, казка *"Коцік, пеўнік і ліса"*, дзе коцік ратуе сябра з бяды дзякуючы ігры на скрыпцы. Выхаваўчы эфект абапіраецца на тое, што ў дзіцячым узросце спасціжэнне свету адбываецца пераважна ў працэсе гульні.

Народнае мастацтва выкарыстоўвалася як метад народнай педагогікі. Так, размовы на інтымныя тэмы з маладымі людзьмі дашлюбнага ўзросту на Мазырскім Палессі не ўхваляліся: *"Божэ ўпасі паказаць, што хлопец ету дзеўку любіць. Яна далжна ўцякці пасля гульні, што б ён ее не праважаў. Можа ёй і сказаў украдкі, што б ена ждала, але не трэба паказваць у адкрытую"* [51]. Асабістыя перажыванні, як правіла, глыбока схаваны ў душы беларуса-палешука: *"Кожнае асцярожнае звяртанне на нешта такое, што не мае практычнага прымянення ў штодзённым жыцці, лічыцца гультайствам, непаваротлівасцю і нетактоўнасцю"* [164, с. 526-527]. Выказаць свае надзеі, памкненні маладыя людзі маглі ў песні, танцы.

Метад пераканання мог рэалізоўвацца ў форме заахвочвання або асуджэння. Заахвочванне (пахвала) эмацыянальна пабуджала дзяцей да прыгожых, адабраемых грамадствам учынкаў і паводзін, выклікала творчы пад'ём, развівала патрэбу ў супрацоўніцтве, садзейнічала фарміраванню пачуцця асабістай годнасці і ўпэўненасці ва ўласных сілах. Своечасовая падтрымка дарослых спрыяла поспеху ў любой дзейнасці: імкненню падтрымліваць чысціню і парадак у хаце, асвойваць народныя промыслы,

вучыцца ігры на музычных інструментах і інш. Заахвочванне выказвалася ў выглядзе эмацыянальнай падтрымкі, адабрэння вербальнага або невербальнага характару: усмешка, жэст, інтанацыя, погляд, падзяка, пахвала, зварот і інш. Эфектыўным лічылася ласкавае, добразычлівае слова, якое ў прыказках і прымаўках часта параўноўваецца з сонцам. Канкрэтнымі відамі заахвочванняў магла быць паездка ў горад, на кірмаш, на прадстаўленне батлейкі і інш.

Трэба адзначыць, што ўзнагарода, пахвала выкарыстоўваліся не так часта, затое ўзважана і абгрунтавана. У народзе лічылі, што "*лепей не дахваліць чым перахваліць*" [24], таму характар выхаваўчага ўздзеяння быў больш вытрыманы, строгі. Усё рабілася для таго, каб недапусціць перарастанне выхавання ў пеставанне дзяцей, бо "*з пестуна нічога не будзе*" [6, 133]. Любоў да дзяцей павінна спалучацца з высокай патрабавальнасцю і строгасцю: "*Любі дзіця, як душу, а калаці, як грушу*" [6, 134], "*Дзеці балуюцца ад матчынага блінца, а разумнеюць ад бацькавага дубца*" [6, 133]. У народзе таксама разумелі, што фізічныя пакаранні самі па сабе не заўсёды эфектыўны сродак, таму заключалі: "*Разумнае дзіця баіцца гразы, дурное – лазы*" [6, 135]. З гэтай нагоды досыць часта выкарыстоўваліся перасцярогі, забароны і пагрозы. Лічылася, што страх перад магчымым пакараннем перасцеражэ ад непажаданых учынкаў, паступова сфарміруе пэўную лінію паводзін і ў выніку павінен перайсці ў страх перад уласным сумленнем.

Народная педагогіка Мазырскага Палесся перасцерагае бацькоў ад пастаяннага падкрэслівання поспехаў дзяцей, празмернага захаплення іх здольнасцямі. Каб заахвочванне было дзейсным, яно павінна быць заслужаным, адзначаць не выпадковы поспех, а добрасумленныя адносіны да справы, праяўленне самастойнасці. Выкарыстанне заахвочвання патрабуе асцярожнасці і пачуцця меры, паколькі залішняя ўвага можа прывесці да ганарліўства, імкнення рабіць усё напаказ, дэфармуе характар, аказвае адмоўны уплыў на асобу: *"Пахвальба – малайцу пагуба"* [163, с. 338]. Лічылася, што дзеці і нават дарослыя ад празмерных пахвал становяцца нясціплымі, разглядаюць выкананне сваіх паўсядзённых абавязкаў як нешта выключнае: *"Пусты колас заўсёды нос кверху дзярэ"* [197, с. 50]. Па гэтай прычыне, а таксама з-за бояззі сурочыць чалавека або пачатую справу, у народзе часцей хвалілі *"за вочы"*, чым *"у вочы"*, а ў народных казках словы падзякі адрасуюцца не непасрэдна заслужыўшаму яе, а бацьку з маці, якія выхавалі добрага сына або дачку.

У цэлым, для народнай педагогікі Мазырскага Палесся, характэрна арыентацыя на стрыманасць пачуццяў, строгасць і некаторую сапраўдную або і паказную суровасць, імкненне не дапусціць празмернага пеставання дзяцей. Паўсямесна лічылася: *"Дзеці мусяць слухацца бацькоў, дзяцей няможна "распускаць"* [43]. Беларусы-палешукі, як і іншыя народы, жыццё якіх

адбывалася ў складаных прыродных і сацыяльна-гістарычных умовах і абапіралася на дастаткова аскетычныя рэлігійныя патрабаванні, скупыя на пахвалу: *“Гадаваліся дзеці ў любві, але ў строгасці”* [29]. Па народных уяўленнях, любоў да дзіцяці, увага да яго духоўных і матэрыяльных патрэб павінна быць разумнай (абмяжоўваць бацькоўскія пачуцці розумам), спалучацца з высокай патрабавальнасцю: *“Любі дзіця, як душу, а калаці як грушу”* [113, с. 134], *“Няшчасныя тыя дзіцяткі, якіх не жураць ні бацькі, ні маткі”* [113, с. 134]. Адпаведна мясцовым звычаям, пяшчоту да дзіцяці магла публічна выказваць толькі маці і то гадоў да шасці, не больш. Сапраўдныя адносіны паміж сямейнікамі часта хаваліся за знешняй грубасцю і праяўляліся не столькі на словах, колькі ва ўчынках [164, с. 528 ].

Выхаванне асобы ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся адбывалася на аснове высокай маральнай адказнасці, таму ў паводзінах дзяцей, асабліва падлеткаў, адзначалася пераважна негатыўнае, а не станоўчае, часцей выказвалася асуджэнне, а не пахвала. Асуджэнне ўтрымлівала элементы іроніі, характарызавала дзеянні або асабістыя якасці выхаванца: *“І шыла, і мыла, і прала, і ткала – і ўсё языком”* [197, с. 12]. Сітуацыя магла змяняцца ў залежнасці ад канкрэтнай сям’і, узросту і індывідуальных асаблівасцей дзіцяці.

Добра разумеючы сілу слова, дарослыя імкнуліся быць асцярожнымі пры яго выкарыстанні: *“Рана загаіцца, а злое слова — ніколі”* [69, с. 169], *“Прыказкі, як сабакі на прывязі”* [69, с. 169]. Ужываліся такія выхаваўчыя прыёмы, як намёк, папярэджанне, ускоснае тлумачэнне. Пасля намёку, ускоснай заўвагі падлеткі часта без лішніх слоў прымаліся за работу. Эфектыўнасць узмацнялася тым, што не абражалася годнасць асобы, але тлумачэнне станавілася даступным, пабуджала да дзеяння.

Метад пераканання ў народнай педагогіцы рэалізаваны ў форме грамадскай ацэнкі ці грамадскай думкі (адмоўнай або станоўчай). У іх аснове знаходзілася калектыўнае перакананне сельскай абшчыны, якое грунтавалася на нормах звычаёвага права, рэлігійных забаронах. У сукупнасці грамадская думка асэнсоўвалася як запавет продкаў, жыццёвая неабходнасць, абавязковыя для выканання людзьмі ўсіх узростаў. Грамадская ацэнка магла быць катэгарычнай, аўтарытарнай і сурова асуджала людзей, якія парушалі правілы маралі. Але і ўхваленне сельскага калектыву высока цанілася, было стымулам для самавыхавання: *“Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць”* [113, с. 214].

Грамадская думка магла выказвацца ў форме павучання, забароны, асуджэння, дражнення, высмейвання, абзывання. Гэты метад выкарыстоўваўся незалежна ад узросту: ні дзеці, ні дарослыя не маглі пазбегнуць людскога асуджэння. Востра крытыкаваліся гультаі, няўмекі: *“Жняю, што жала горш за ўсіх, заставалася апошняй, абзывалі лежнем, лянівай”* [137, с. 136]. Матэрыял

для абмеркавання давалі святы, падзеі вясковага значэння, якім выносілася калектыўная ацэнка. Аналізаваліся паводзіны падрастаючага пакалення з пункту гледжання ўмення трымаць сябе *“на людзях”*, у калектыве, у чужых: *“Калі маці адпраўляла да суседзяў, то заўсёды наказвала: не забудзь павітацца. Скажы даруйце, што маці не сама прыйшла. Не забывай казаць “дзякуй”* [28]. Строга ацэньваліся паводзіны патэнцыяльных жаніхоў і нявест. Неахайнай дзяўчыне, якая не дбае пра сваю знешнасць, маглі сказаць: *“Чучала гарохава! Цябе б у каноплях паставіць на страх вераб’ям”* [164, с. 620].

Да дасягнення паўналецця дзяўчына павінна падрыхтаваць пасаг, а юнак – навучыцца выконваць усе віды сельскагаспадарчых работ. Моладзь абодвух палоў імкнулася ў поўнай меры засвоіць народную мастацкую культуру: выконваць народныя песні, з густам апранацца, прыгожа танцаваць. Няўмелыя выканаўцы крытыкаваліся і маглі быць асмеяны, у тым ліку з выкарыстаннем грубай лексікі: *“Кракавяка – добры танец, хто не ўмее, той засранец”* [22]. Дражненне, высмейванне, кпіны, крыўдныя мянушкі характэрны для большасці славянскіх народаў. Вядомыя з рускага фальклору *“непряха”*, *“неткаха”*, *“безлапотник”* – гэта той, хто не навучыўся, прасці, ткаць, плесці лапці [176, с. 129]. Указанне на недахопы стымулявала самавыхаванне.

Грамадская думка актыўна выказвалася не толькі індывідуальна, але і калектыўна (*“на міру”*), сродкамі народнага мастацтва, што рабіла яе дзейсным метадам выхаваўчага ўздзеяння. У час народных абрадаў і святаў гучала крытыка жыхароў свайго або суседняга сяла, якія парушылі сацыяльныя і маральныя нормы, праяўлялі скупасць, нелюдзімасць. На Мазырскім Палессі, дзе папулярны калядныя абрады і жартоўныя песні-шчадроўкі, кожны гаспадар з сям’ёй чакаў прыходу самадзейных артыстаў не без хвалявання, узгадваючы падзеі года. У рэгіёне вядомы абрад *“валачыць калоду”*, сутнасць якога ў высмейванні хлопцаў і дзяўчат, што своечасова не ўступілі ў шлюб.

Грамадская ацэнка (думка) рэгулявала ўзаемаадносіны паміж людзьмі і кантралявала як агульную выхаванасць індывіда, так і наяўнасць у яго канкрэтных навыкаў у галіне народнага мастацтва, унутранай патрэбы жыць і дзейнічаць згодна народнаму ідэалу, прычым добраахвотна, без пастаяннага кантролю і прымусу, каб не было сорамна перад людзьмі. Эфектыўнасць народнага выхавання ў значнай меры тлумачыцца ўплывам грамадскай думкі, якая не дапускала парушэння правіл спрадвечнага ладу жыцця, вызначалася абавязковасцю, імператыўнасцю.

У цэлым метады выхавання словам, вербальныя накіраваны пераважна на развіццё духоўнага свету асобы, фарміраванне свядомасці, паглыбленне ведаў, стымуляцыю і матывацыю дзейнасці.

## II Практычныя метады народнага выхавання

У народнай выхаваўчай практыцы пэўную перавагу мелі практычныя метады выхавання, якія фарміруюць асобу праз арганізацыю адпаведных практыкаванняў, уключэнне ў дзейнасць, што дыктуецца неабходнасцю трывалага засваення народных традыцый для забеспячэння іх вуснай, непісьмовай перадачы. Практычныя метады народнага выхавання забяспечвалі перадачу вопыту ў працэсе навучання, ад настаўніка да вучня, адпаведна падыходу "*рабі як я*". У большасці сялянскіх сем'яў дзяцей рыхтавалі да фізічнай працы, таму перавага аддавалася выпрацоўцы практычных уменняў і навыкаў: *"Рамяство піць-есці не просіць, а само корміць"* [197, с. 67].

У адрозненні ад акадэмічнай педагогікі народна-выхаваўчая сістэма палешукоў прыярытэт аддавала метаду практыкаванняў ці прывучэння. На эмпірычным узроўні было прыкмечана, што адпаведныя дзеянні, учынкі, якія шматкратна паўтараюцца, фарміруюць звычкі маральных паводзін, якія нярэдка ўжо на наступных этапах замацоўваюцца ў свядомасці. Перадача старэйшымі пакаленнямі назапашанага сацыяльнага вопыту, у тым ліку і духоўна-маральнага, адбывалася праз пэўную дзейнасць. З дапамогай канкрэтных практыкаванняў, прывучэнняў фарміраваліся станоўчыя звычкі, якія былі падмуркам народнага выхавання. Дзеці не падвяргаліся з боку дарослых дробнай апецы, а ўключаліся ў шматлікія віды дзейнасці, якія паступова ўскладняліся. Выніковасць маральнага выхавання ў палешукоў падмацоўвалася многімі звычаямі, абрадамі, народнымі святамі.

У традыцыйнай культуры рэгіёна спасціжэнне свету адбывалася пераважна ў ходзе яго практычнага асваення, у выхаванні пераважаў практычна-дзейсны падыход: *"Што ўмець – за плячыма не насіць"* [113, с. 245]. Выбар практычных метадаў выхавання, эфектыўнасць якіх грунтуецца і на адметнасці чалавечай псіхалогіі, і на арганізацыі жыцця ў традыцыйнай культуры, вылучаўся разнастайнасцю: *"На ўсё спосаб знойдзецца"* [162, с. 148].

Выхаваўчы вопыт беларусаў-палешукоў сведчыць, што для самарэалізацыі асобы ў жыцці неабходны пастаянная прывычка і здольнасць да працы, практычныя навыкі (дзеянне, сфарміраванае шляхам паўтарэння, якое характарызуецца высокай ступенню засваення і адсутнасцю паэлементнай свядомай рэгуляцыі і кантролю [158, с. 156]) і ўменні (засвоеныя чалавекам спосабы выканання практычнага або разумовага дзеяння, забяспечваемыя сукупнасцю набытых ведаў і навыкаў [158, с. 295]). Неабходна было далучыць кожнага чалавека (незалежна ад дадзенага прыродай) да спрадвечных народных здабыткаў у галіне духоўнай (прыказкі і прымаўкі, дзіцячы фальклор, музыка, спевы, харэаграфія, арганізацыя святаў і абрадаў) і матэрыяльнай культуры (будаўніцтва, раслінаводства, жывёлагадоўля, мясцовыя рамёствы і промыслы,

дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), развіць прыродныя здольнасці, выпрацаваць уменні і навыкі ў жыццёва-практычнай сферы.

Надзвычай важнае месца ў народным выхаванні займае метад прыкладу. У народзе заўважалі схільнасць дзяцей да пераймання, таму стараліся, каб у жыцці пастаянна прысутнічалі ўзоры для пераймання. У якасці такіх маглі выступаць героі казак, калыханак, легенд і іншых фальклорных твораў. Асабліва дзейсны ўплыў аказвалі прыклады з навакольнай рэчаіснасці. Цэнтральнае месца адводзілася прыкладу бацькоў. Палешукі актыўна выкарыстоўвалі натуральны дыдактычны прыём “Рабі як я”. У якасці перасцярогі ад непажаданых дзеянняў і ўчынкаў актыўна выкарыстоўваліся адмоўныя прыклады.

Істотным для развіцця асобы на ўсіх узроставых ступенях было перайманне. У народзе так і гаворыцца: *“пераняць узор”*, *“пераняць песню”*, што падкрэслівае актуальнасць метаду пераймання. У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся вылучаюцца тры асноўныя этапы рэалізацыі працэсу пераймання: І этап – пасіўнае ўспрыманне і назіранне; ІІ этап – непасрэдна перайманне; ІІІ этап – самастойная актыўна-творчая дзейнасць. У ходзе навучання і пераймання названыя этапы рэдка існуюць адасоблена, часцей – узаемадзейнічаюць і трансфармуюцца ў залежнасці ад індывідуальнасці.

Вядомы звычай палескіх жанчын браць немаўлят у агарод або на жніва, дзе яны знаходзяцца ў калысках побач з маці, дыхаюць свежым паветрам, слухаюць працяжныя жніўныя песні, якія замяняюць калыханкі. Немаўля, слухаючы жніўную песню або калыханку, знаходзіцца на першым этапе, падрастаючы, можа праяўляць даступную ўзросту актыўнасць: пераймаць пэўныя гукі, словы ці мелодыю. Старэйшыя дзеці будуць пераймаць дзеянні дарослых, іх манеру выканання, але адначасова ўносіць і асабісты ўклад: арганізоўваць імітацыйныя гульні, аказваць пасільную дапамогу. У працэсе працы маладыя жнеі актыўна пераймаюць працоўнае і песеннае майстэрства старэйшых жанчын, спачатку прыглядаючыся да асноўных дзеянняў, услухоўваючыся ў мелодыю, а потым падхопліваючы яе, пастунова засвойваючы рэпертуар у поўным аб’ёме. Адбываецца перайманне непасрэдна ў дзеянні, дзе дасягнуты ўзровень ацэньваецца прысутнымі.

Важнымі прыёмамі рэалізацыі метаду пераймання з’яўлялася пасіўнае ўспрыманне і назіранне, у ходзе якіх адбываліся першыя, але псіхалагічна неабходныя крокі выхавання і навучання. Назіраючы за старэйшымі дзецьмі, малодшыя пераймалі лічылкі, гульні, што мела значны выхаваўчы эфект. Перайманне ў дзіцячым асяроддзі як правіла не суправаджалася тлумачэннем ці іншымі вербальна-лагічнымі метадамі, а адбывалася непасрэдна праз перайманне стэрэатыпаў рухаў, у спалучэнні з танцам, песняй, мелодыяй.

Падлеткі прыглядаліся да работы народных майстроў, гаспадарчай дзейнасці: *“Калі білі кабаньчыка, хлопцы назіралі, пераймалі”* [11]. Як правіла, выхаванцам не забаранялася назіраць ні за дзейнасцю дарослых, ні за ходам народных святаў і абрадаў. Гэта дыктавалася і выхаваўчымі задачамі, і вусным характарам перадачы традыцый, і асаблівасцямі светапогляду: па народных уяўленнях, удзел дзяцей і моладзі ў рытуальных дзеяннях быў абавязковым, забяспечваў іх поспех. Дзіцячая цікаўнасць свядома або несвядома заахвочвалася: *“Дзяцей вадзілі на вячоркі, асоба дзевачак, каб вучыліся працы. Дзеўкі пасядуць на лавы, прадуць і расказваюць пра жаніхоў, а я стану і слухаю ці падглежу як хто вышывае”* [39]. Паступова дзіця далучалася да справы, да якой на першым этапе яно толькі прыглядалася. Навучанне ажыццяўлялася ў выніку папярэдняга засваення тэхналагічнай схемы працоўнай дзейнасці.

Перайманне ў дзейнасці – асноўны прыём навучання ў народнай педагогіцы. Метадам пераймання дачка вучылася ад маці прасці, ткаць, плесці карункі; сын пераймаў працоўныя, рамесніцкія ўменні бацькі. Працоўны вопыт передаваўся ў межах роду, сям’і: *“Маці ткала. Яна ўсякее ўмела: у коскі ўмела, на два, на чатыры ніты. Седай да тчы, яна паказвае, наступай на адзін ніт, закідай нітку – і ляпай бердом – і зноў так”* [36]. Такім чынам, выхаванец назірае ўсю паслядоўнасць аперацый і, зразумеўшы іх логіку, паступова ўключаецца ў рэальную дзейнасць. Неабходныя дзеянні засвойваюцца і адточваюцца непасрэдна ў працэсе працы.

У дзейнасці адбывалася выяўленне інтарэсаў, запатрабаванняў дзяцей, стымуляванне іх прыроднай, спадчыннай схільнасці да таго або іншага віду заняткаў. Прыкметай здольнасцей, якія вызначаліся эмпірычна, з’яўляліся ўстойлівы інтарэс да пэўнага віду дзейнасці, назіральнасць, паспяховы першапачатковы вопыт, хуткасць авалодання неабходнымі ўменнямі і навыкамі, станоўчыя эмацыянальныя перажыванні. Лічылася, што веды, якія не прайшлі праз сэрца, не будуць у поўнай меры ўспрыняты розумам: *“Не дойдзе да галавы, як не пабывала ў сэрцы”* [197, с. 22].

Сярод практычных прыёмаў у народным выхаванні шырока ўжываўся паказ: *“Вер не сказу, а паказу”* [197, с. 61]. Дарослыя спецыяльна паказвалі, як выконваць дзеянне: *“Лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць”* [197, с. 203]. Паказ суправаджаўся тлумачэннем і дэманстрацыяй канкрэтных узораў (прадзенне і ткацтва, народныя песні і вышыўка, вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва), паўтарэннем і кантролем, выказваннем канкрэтных заўваг ці адабрэння. Цаніліся стараннасць, руплівасць, цярпенне, настойлівасць, здольнасць засвойваць простае, паступова пераходзячы да больш складанага.

Пры гэтым у народнай педагогіцы Мазырскага Палесся прысутнічае ўстойлівая тэндэнцыя: паступова змяншаць дапамогу дарослых у авалодванні

спосабамі самастойных дзеянняў [81]. Народнае выхаванне, у сілу традыцыі і агульнай занятасці дарослых, было пазбаўлена празмернай, дробязнай апекі, таму дзецям прадастаўляліся шырокія магчымасці ў выбары заняткаў: *“Адзін добры вопыт важней за сем мудрых павучанняў”* [72, с. 246]. Як правіла, бацькі не перашкаджалі праяўленню ініцыятывы дзяцей, падтрымлівалі самастойнасць: *“Той, хто ўсіх слухае, не навучыцца і дровы калоць”* [197, с. 24].

Істотным для рэалізацыі метаду перайманя было выкарыстанне ўніверсальнага для народнай педагогікі прыёму – паўтарэнне. Шляхам шматкратнага паўтарэння засвойваліся і вусная народная творчасць, і народныя рамёствы, і працоўныя працэсы. Ужыванне прыёму паўтарэння абумоўлена як патрэбамі выхавання, так і спецыфікай самога фальклору як вуснага мастацтва, заснаванага на паўтарэнні дзеянняў і рытуалаў, мелодый і элементаў арнаменту. Актыўнае ўспрыняцце, паўтарэнне, перайманне і ўзнаўленне, не разлічанае на запіс або іншую фіксацыю, забяспечвала эфектыўнасць народнага выхавання.

Запатрабаванымі ў народным выхаванні былі метады практыкавання і прывучэння: *“Да ўсяго трэба практыкі”* [162, с. 148]. Гэтаму садзейнічалі арыентацыя на практычную перадачу вопыту ў ходзе арганізацыі жыццядзейнасці, ранняе ўключэнне дзяцей у грамадска-карысную працу, устойлівыя побытавыя традыцыі. Народны вопыт пераконваў, што без практыкі, адпрацоўкі, трэніроўкі нельга дасягнуць майстэрства, поспеху ў любым відзе дзейнасці: *“Без мучэння няма вучэння”* [197, с. 39].

Метады практыкавання і прывучэння садзейнічалі фарміраванню практычных дзеянняў, развіццю свядомасці, удасканаленню органаў пачуццяў (развіццё галасавых дадзеных і музычнага слыху, каардынацыі рухаў і вастрыні зроку). Нават такі занятак, як дранне пер’я карысны для развіцця рукі, выпрацоўкі цярплівасці [164]. Ухвалялася любая практычная дзейнасць: *“Што ўмееш, за плячыма не насіць”* [113, с. 240].

Метадам прывучэння (у адрозненні ад практыкавання) адбывалася пераважна фарміраванне маральнай свядомасці асобы, замацаванне правіл паводзін і зносін. Метадам прывучэння фарміраваліся станоўчыя звычкі: гаварыць праўду, слухацца бацькоў, з павагай адносіцца да старэйшых, вітацца першымі і інш. Цаніліся ветлівасць, добразычлівасць: *“Як прывітаешся, так і адкажуць”* [197, с. 78], *“Як ты да людзей, так і людзі да цябе”* [72, с. 78]. Выхаваны чалавек выклікаў павагу, сімпатыю і адабрэнне акружаючых, да адмоўных звычак і якасцей характару імкнуліся сфарміраваць агіду, асуджэнне.

На Мазырскім Палессі існавала ўстойлівае перакананне, што розум дзіцяці не настолькі развіты, каб яно магло падпарадкоўваць свае паводзіны нават вядомым нормам і правілам: *“У дзіцяці дзіцячы й розум”* [113, с. 135]. Таму народнае выхаванне з самага ранняга ўзросту было накіравана на

арганізацыю канкрэтных дзеянняў і ўчынкаў, якія паступова пераходзяць у звычкі. Малодшым тлумачылі, што трэба ўстрымлівацца ад негатыўных учынкаў, непажаданых дзеянняў і слоў, пустога смеху і балбатні: *“Пяць раз падумай, адзін раз скажы”* [197, с. 53]. Дзяцей прывучалі да акуратнасці, догляду за сваімі рэчамі, цацкамі, прадметамі працы і побыту, развівалі самастойнасць, ініцыятыўнасць, знаёмілі з агульнапрынятымі нормамі жыцця.

Засваенне норм народнага этыкету адбывалася пераважна шляхам мэтанакіраванага, планамернага ўздзеяння на выхаванца, свядома кантралявалася і ацэньвалася дарослымі. Няўменне або нежаданне бацькоў навучыць дзіця паводзіць сябе ў калектыве, *“у людзях”* асуджалася: *“Трэба, каб і малое дзіцятка ведала, каму сказаць “ты”, а каму “вы”* [72, с. 134].

Арганізацыя практыкавання і прывучэння мела на ўвазе асаблівую ўвагу бацькоў да ўсяго, што сустракалася ў жыцці маленькага чалавека ўпершыню, да першага вопыту дзіцяці. Звярталася ўвага на неахайнасць у адзенні, абыякавасць да парадку і выканання хатніх абавязкаў – увогуле на любое адхіленне ад ідэальных норм. Існавала перакананне, што першапачатковыя ўражанні асабліва моцныя, а няправільны навык паступова ўвойдзе ў звычку і стане ўстойлівым. Таму важна з самага пачатку сфарміраваць правільныя дзеянні і станоўчыя звычкі, каб у далейшым не давялося разбураць іх і перавыхоўваць дзіця. Такі падыход паслядоўна рэалізоўваўся дарослымі, але ў дзяцей мог выклікаць напружанасць, празмерную боязь памыліцца.

Паспяховаму фарміраванню навыкаў і звычак садзейнічала станоўчая ў эмацыянальным плане ацэнка дарослымі дзеянняў і ўчынкаў дзіцяці, выкарыстанне метадаў кантролю, даверу, пераканання. У ходзе сумесных заняткаў бацькі выпрацоўвалі ў дзяцей звычку выконваць даручаную справу якасна, прывучалі да самакантролю: *“Хадзіла на вечоркі. Хлопцы гуляюць, а му прадом. Матка не давала ніякае норму, самі зналі, што кудзелю трэба спрасці”* [1]. Увагу дзяўчынак акцэнтавалі на тым, каб вымеценую хату або засланы ложак (які быў упрыгожаннем сялянскай хаты і з асаблівым клопатам аздабляўся жанчынамі ўласнымі вырабамі) нікому не давялося перарабляць. Паступова вынікі працы пачыналі прыносіць задавальненне і маленькай гаспадыні, і акружаючым. Вышэйшая ступень пахвалы: *“Падлога жоўценькая, чыстая, хоць аблупленае яйцэ палажы, не ўмажэцца”* [36].

Рэалізацыя практыкавання і прывучэння ажыццяўлялася пераважна ў натуральных, а не штучна створаных умовах, у працэсе самаўзнаўлення форм народнай культуры. Прыёмам рэалізацыі метадаў практыкавання і прывучэння з’яўляліся даручэнні, заданні, якія насілі пастаянны характар або прымяркоўваліся да народных свят і абрадаў: выкананне роляў, выраб масак, пляценне вянкоў, распальванне вогнішча, тканне рытуальных ручнікоў, тканін-

абярэгаў і інш. Дзеці мелі пастаянныя працоўныя даручэнні: *“Маці навучыла мене лапці плесці і ізбавілася ад клопату. Надо было іцці ў лозу, надраць лазы, што б і на зіму хваціло. Іх хватало на 2 дні, абутку не було”* [24].

Для дзяцей малодшага ўзросту ствараліся і штучныя сітуацыі, якія абапіраліся на асабістую зацікаўленасць выхаванца, жаданне не адстаць ад аднагодкаў. Практыкаваліся просьбы дапамагчы старэйшым.

Метад прывучэння не даваў імгненнага выніку, а вымагаў ад бацькоў настойлівасці, цярплівасці, адзінства патрабаванняў у сям’і. У ходзе выхаваўчага ўздзеяння выяўляецца прысутнасць як свядома-асэнсаваных, так і катэгарычна-імператыўных падыходаў. Практыкаванне і прывучэнне ў народнай педагогіцы дапаўняліся метадамі прыкладу, заахвочвання і пакарання, запалохвання, прыёмамі кантролю і даверу, забарон, ацэнкі. Гэта стварала спрыяльнае асяроддзе для разумення адзінства слова і справы: *“Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму – хто ў справе стойкі”* [72, с. 62].

У народнай педагогіцы адбывалася ранняе фарміраванне працоўных, увогуле практычных уменняў і навыкаў на аснове прывучэння і практыкавання. Працалюбства беларусаў-палешукоў у значнай меры вызначалася прывычкай да працы, якая фарміравалася з дзяцінства ў ходзе сямейнага і грамадскага выхавання. Шматкратнае выкананне выпрацоўвала спрыт і ўпэўненасць рухаў, паглыбляла і замацоўвала веды, неабходныя ў дзейнасці. Папрактыкавацца было на чым, бо разнастайных вырабаў патрабавалася шмат, асабліва дзяўчыне-нявесце: *“Калі ішла замуж, у мяне было пяць просцілак, дзесяць рушнікоў простых і пяць вышытых з карункамі, дзве падушкі”* [39].

Эфектыўнасці метадаў практыкавання і прывучэння садзейнічалі і паўтаральнасць народных і рэлігійных святаў і такі дасканалы механізм, як традыцыя. Імператыўна патрабавалася ў пэўныя дні тыдня ці года (у суботу, да Каляд, да Вялікадня ў чысты чацвер, да вяселля) прыбраць у хаце: пабяліць столь, сцены, печ з комінам; памыць дзверы з вушакамі, касякі, падваконнікі, рамы, шыбкі; пашараваць мэблю: стол, лаву, зэдлік, калоду, падстаўку пад хлебную дзяжу, паліцы; вывесіць чыстыя ручнікі, замяніць настольнікі, перасланць пасцелі [164, с. 361]. Арыентуючыся на грамадскую ацэнку, нават самая неахайная жанчына не магла не прытрымлівацца існаваўшага спрадвеку парадку. Дзеці-падлеткі, дарослыя дочкі звычайна дапамагалі маці, што забяспечвала пераемнасць у выхаванні. Такому падыходу адпавядалі і працоўныя звычаі, напрыклад, жніўная пара: *“Зажынаючы жанчына не толькі сама мыецца й абраджаецца па-святочнаму, але й у хаце мые лавы, стол, засцілае яго чыстым настольнікам, каб як трэба, як павінно быць, прыняць новага госця – Божы дар – новы хлеб”* [173, с. 96].

Адным з найбольш дзейсных практычных метадаў выхавання, які ўздзейнічае і на свядомасць, і на паводзіны выхаванца, з'яўляецца метад прыкладу. Выхаваўчыя прыклады браліся з жыцця сям'і, акружэння дзіцяці, традыцый дадзенай мясцовасці. Вопыт выхавання засведчыў, што не трэба надакучаць парадамі і павучаннямі, а слова павінна падмацоўвацца справай: *"Не вер чужым рачам, ды вер сваім вачам"* [197, с. 61]. Сіла прыкладу бачылася не ў сляпым капіраванні, а ў выбары годнага ўзору для пераймання.

Уздзеянне прыкладу грунтавалася на аўтарытэце, высокай значымасці асабістых якасцей і жыццёвага вопыту старэйшых: *"Калі маці снавала кросны, якія займалі ўсю хату, то старэйшыя дзеці старанна выконвалі яе даручэнні, а малыя ціха сядзелі на печы і не перашкаджалі"* [51]. Аўтарытэт бацькоў у народнай педагогіцы Мазырскага Палесся не патрабаваў доказаў, а прымаўся як закон прыродны і сацыяльны: *"Хоць пажэняць і замуж пааддаюць, а сераўно сыны ідуць к бацьку спрашваць, што строіць і як, ацец рукавадзіць"* [47].

Асновай развіцця дзіцяці з'яўляецца атмасфера роднага дома, духоўны накірунак жыцця сям'і. Знешні бок паводзін (манеры, жэсты) і ўнутраны маральны воблік (погляды, меркаванні, перакананні) бацькоў аказваюць пастаяннае ўздзеянне на дзяцей. Дзяўчынкі больш вучацца ў маці, а хлопчыкі – у бацькі: *"Дзе сыноў лава, там бацьку слава, дзе дачок лава, там матцы слава"* [69, с. 169]. Вынікі выхавання ў многім залежаць і ад прыкладу (станоўчага або адмоўнага) бацькоў: *"Што робіць воўк, тое і ваўчаня"* [4], і ад перададзенага спадчыннага патэнцыялу: *"Харошых бацькоў харошыя дзеці"* [162, с. 126]. Інтарэсы членаў сям'і, іх адносіны да народнага мастацтва перадаюцца дзецям: *"Ацец іграў, на ўсю акругу, была трохрадка. Іграюць браты, дзед – музыкант, скрыпач, і его сыны ігралі на скрыпках, на гармоніку"* [24].

З выхаваўчай мэтай выкарыстоўваўся і прыклад продкаў, памерлых родзічаў, пра справы і маральныя якасці якіх расказвалі дзецям старэйшыя члены сям'і ў ходзе зносін або ў час адпаведных памінальных абрадаў. З узростам набывалася здольнасць крытычна мысліць, але звычкі, замацаваныя з маленства, падсвядома станавіліся асновай уласных паводзін і светапогляду.

Важным для малодшых быў прыклад сяброў, старэйшых братоў і сясцёр, таму бацькі імкнуліся, каб дзяцей акружалі добрыя таварышы: *"Злы прыклад і добрага псуе"* [197, с. 195]. Дзецям уласціва схільнасць да пераймання, адначасова – некрытычнасць, даверлівасць, недастатковасць жыццёвага вопыту: *"Да якіх прыстанеш, такі сам станеш"* [21]. Гэта абумовіла патрабаванне забяспечваць наяўнасць станоўчых прыкладаў, тлумачыць сутнасць узаемнай адказнасці братоў і сясцёр за далейшы лёс членаў сям'і: *"Сястра сястру замуж аддае, а брат брата жэніць"* [28].

Народны прыклад-ідэал найбольш поўна ўвасоблены мастацкай моваю, якая даступна дзецям на ўзроўні вобразнага мыслення, ужывання ў сітуацыю. Значную сілу выхаваўчага ўздзеяння мелі героі народных балад, легенд, гераічнага эпасу, паданняў пра асілкаў, барацьбу з татарамі, крыжакамі. Яны дэманстравалі ўзоры-прыклады прыгожых паводзін і адносін да бацькоў, да працы і народнага мастацтва, да роднай зямлі.

У народным выхаванні эфектыўна выкарыстоўваецца і адмоўны прыклад. Вядомы варыянты казак пра родную дачку і падчарку, маральныя якасці якіх супрацьпастаўляюцца. Казка выклікае асуджэнне непрыгожых паводзін, прычым дзеці адначасова маюць магчымасць ацаніць і станоўчы, і адмоўны прыклады. Метадам адмоўнага прыкладу дасягаецца выхаваўчае ўздзеянне народных жартаў і анекдотаў. Выхаванец, нібы прымяраючы камічную сітуацыю на сабе, імкнецца не паўтарыць яе ў рэальным жыцці.

На Мазырскім Палессі пры правядзенні калядных абрадаў была распаўсюджана крытыка *"наадварот"*, метадам ад супрацьлеглага, калі скупога гаспадара славяць як шчодрага, лянівага як шчырага да працы, панурага як вясёлага, сварлівую сям'ю ўслаўлялі як дружную і інш. [144, с. 55]. Падтэкст добра разумеўся прысутнымі і выконваў выхаваўчую функцыю. Такім чынам, народная педагогіка абапіраецца на рэальныя і ідэальныя прыклады-узоры (станоўчыя або адмоўныя), што з'яўляюцца ўзаемадапаўняльнымі.

У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся выкарыстоўваюцца метады групавога і індывідуальнага спаборніцтва. Патрэба ў спаборніцтве з'яўляецца прыроднай неабходнасцю развіцця асобы, часткай паводзін дзяцей і моладзі. Метад рэалізуецца дзякуючы адметнасці народнай культуры. Спаборніцтва адбываецца ў ходзе калядных ігрышчаў моладзі: у спевах, танцах, гульнях, вырабе масак, пераапрананні, дасціпнасці, спрыце і жартах. У ходзе сумеснай працы на вячорках (прадзення кудзелі, ткацтва, вышывання) наладжваўся працэс песеннага спаборніцтва. У час Гукання Вясны праходзілі спаборніцтвы паміж дзявочымі гуртамі розных вёсак або розных канцоў адной вёскі: *"Мы ек заспеваем у Міхайлаўке, дак у Грушаўке на масту людзі слухаюць"* [49]. Устойлівая традыцыя песеннага спаборніцтва, калектыўнага гумарыстычнага абсмяяння хлопцаў і дзяўчат, праяўлялася на Юр'е, на Купалу: *"Сёння Купайло, заўтра Іван, кідаў чорт хлопцаў цераз баркан. / А на паповой грушы чорт дзевок душыць"* [15]. На Палескім вяселлі адбываецца песеннае спаборніцтва сватоў маладой і маладога, таксама гасцей з супрацьлеглых бакоў і інш.

Прыкладам індывідуальнага народнага спаборніцтва, масавага вершаскладання з'яўлялася складанне і выкананне прыпевак, што цесна звязаны з рэгіянальнай паэтычнай, танцавальнай і музычнай культурай. Дадзенае спаборніцтва можна разглядаць як песенна-паэтычны, танцавальна-

музычны народны конкурс. Для прыпевак характэрны жыццярадаснасць, гумар, узаемныя кпіны. Тэмы песенных спаборніцтваў: каханне, разлука, саперніцтва, рэўнасць, шлюб, высмейванне гультайства, абыякавасці, неахайнасці і інш. На слухачоў яны аказваюць апасродкавае выхаваўчае ўздзеянне.

Са спаборніцтвам цесна звязаны метад выпрабавання, што мае індывідуальны характар. Адпаведна народных уяўленняў, кожны павінен прайсці жыццёвыя выпрабаванні: *“Бяда дакучыць, тады чалавека розуму навучыць”* [197, с. 46], *“Тагды чалавек розуму набярэ, як свая вош укусіць”* [164, с. 580]. Героі народных казак звычайна добраахвотна выпраўляюцца ў свет: людзей пабачыць і свайго шчасця пашукаць. Яны пераадольваюць выпрабаванні на фізічную загартоўку, майстэрства, любоў да прыроды.

Для юнакоў і дзяўчат выпрабаванні звязаны са сталеннем, з уступленнем у шлюб. Састаўной часткай вяселля было выпрабаванне акуратнасці, эстэтычнага густу, працоўных уменняў будучай гаспадыні, ведання традыцый, праверка характару (цярплівасць, добразычлівасць). Для юнакоў абавязковым лічылася ўменне араць, касіць, майстраваць прылады працы. Гэтыя якасці, як і фізічная сіла, спрыт выпрабоўваліся ў ходзе святаў, народных гульняў [138].

Выпрабаванне, як вясельны абрад, з рэгіянальнымі асаблівасцямі спраўляецца на Мазыршчыне: *“Прыданае прывезуць, усё вывешваюць на жэрдках у хаці. Прыезджаюць закасянкі з той і другой стараны. Ены вешаюць, паказваюць сколько рушнікоў, скацерок. Абсуждаюць, ек мало – ленавалася”* [47]. У ходзе абраду, які праходзіў з гульнямі, жартамі, музычным суправаджэннем, правяраліся практычныя ўменні маладой у выкананні жаночых відаў работ: *“Пасля, ек венка скінулі і платок аддзелі, уносяць цесто ў дзяжы і лапату. Трэ скачаць цесто й – на лапату. Хату падмесці”* [15]. У Ельскім раёне адбываўся жартоўны абрад *“прасці вучыць”*, калі выносілі прасніцу, лён, каб нявеста прала, паказвала сваё ўмельства ў жаночых работах [157, с. 436]. Удзельнікаў абраду за *“навуку”* маладая адорвала паясамі, ручнікамі, палатном, прыбірала бацькоў маладога ў святочнае адзенне [202].

Распаўсюджаным у народнай творчасці з’яўляецца выпрабаванне загадкамі: загадкі свякрухі нявестцы, сумеснае разгадванне загадак жаніхом і нявестай. Гэта метад праверкі разумення моладдзю народнага светапогляду: *“Яе нагамі топчуць, а яна ўсіх корміць”* (Зямля) [69, с. 173].

Шырока выкарыстоўваюцца практычныя выпрабаванні. Апісанне вячорак сведчаць аб наяўнасці элементаў гэтага метаду ў ходзе калектыўна выконваемай манатоннай працы, якая стымулюецца спаборніцтвам. У штодзённым побыце практычныя выпрабаванні рэалізуюцца ў сям’і, калі падлеткам даюцца канкрэтныя даручэнні і правяраецца іх выкананне.

## III Метады і прыёмы эмацыянальна-магічнага ўздзеяння

Народная педагогіка Мазырскага Палесся ў працэсе культурна-гістарычнага развіцця выпрацавала метады і прыёмы эмацыянальна-магічнага ўздзеяння, якія не ўласцівы інстытуалізаванаму выхаванню: добрае і ліхое пажаданне, папрок, ганьбаванне, абзыванне, дражненне, клятва і прысяганне, праклён, адрачэнне, запалохванне, пагроза, малітва, пакаянне, што маглі выказвацца як у свабоднай, так і афарыстычнай форме. Яны грунтуюцца на веры чалавека ў сілу слова, утрымліваюць ірацыянальныя элементы, якія ўзбагачаюць педагагічную дзейнасць, павышаюць яе эфектыўнасць.

Названыя метады абапіраюцца на традыцыю, на культ павагі да продкаў, на сугестыю – працэс вербальнага і невербальнага, эмацыянальна афарбаванага ўздзеяння на псіхіку чалавека з мэтай стварэння ў яго пэўнага стану, узнікнення некаторых уяўленняў, пабуджэння да дзеяння [158, с. 281]. Інтуітыўна знойдзеныя народам метады афарыстычнай сугестыі, мэтанакіравана скіроўваюць свядомасць выхаванца ў патрэбнае рэчышча.

У мясцовай выхаваўчай практыцы шырока выкарыстоўваліся павер'і, забароны, пажаданні, заснаваныя на міфалагічных уяўленнях і звязаныя з дзецьмі, іх паводзінамі, сталеннем, здароўем і ростам [137, с. 252–262]. Павер'і, забароны (забарона для цяжарнай жанчыны штурхаць і біць жывёлу, вітацца на парозе, пляваць на зямлю і ў агонь, выносіць смецце з хаты пасля заходу сонца, раскідваць свае валасы, пазногці і інш.) былі досыць эфектыўнымі для фарміравання паводзін, ахайнасці, густу, паступова ператвараючыся ў норму.

Забароны як метад выхавання ўтрымліваюць абгрунтаваныя рэкамендацыі і для выхавацеляў, і для выхоўваемых: *"Трэба ўтрымоўваць дзіця, каб яно не дражніло й не перакрыўляло ні людзей, ні жыўёла, бо яно само як вырасце зробіцца такою ж разявекаю"* [173, с. 186]. Прадпісанні існуюць практычна на ўсе выпадкі жыцця: *"Не стой на парозе, не павязе"* [6], *"Не ллі ваду ўслед другому чалавеку – гэта к бядзе"* [6]. Да нашага часу захоўваюцца забароны: для членаў сям'і – пазычаць што-небудзь у дзень з'яўлення дзіцяці – будзе без прытулку; у дзіцячым асяроддзі – хадзіць з адной абутай нагой – памрэ адзін з бацькоў. У іх – павучанні, жыццёвыя прынцыпы, ісціны-пастулаты, якія выконваюцца дзецьмі без абгрунтавання.

Метадам і сродкам народнай педагогікі Мазырскага Палесся з'яўляюцца замовы (*"шэпты"*), якія сінтэзуюць народную медыцыну і псіхалогію, выхаванне і магію слова. Дзецям, асабліва з адхіленнямі ў здароўі (заіканне, энурэз, залатуха) прынята *"шаптаць ляк"*, выкочваць яго з цела сырым яйкам, выконваць дзеянні з агнём і вадой. Лічылася, што з перапуду можна сур'ёзна захварэць або здарыцца *"парушэнне душы"* – адхіленне псіхічнага характару. Калі немаўля дрэнна спала, то звечара ставілі на акно хлеб-соль для начніц і

шапталі *“Вотначы”* [49]. Шырока выкарыстоўваюцца *“Перапалох”*, *“Прыстрэт”*, *“Вогнік”*, *“На добры сон дзіцяці”*, *“Дзяцінец”* [22]. Дзецям да года іх шапталі маці, родная бабуля, запрошаная суседка або знахарка.

Калі дзеці падрасталі, іх з мэтай самаахoвы вучылі мясцовым замовам: *“Як у лес ісці”*, *“Ад гадзюкі”*, *“Ад парушыны ў воку”*, *“Ад зубнога болю”* [33]. Старэйшыя дзеці па просьбе бабулі або дзядулі *“выгрызалі грызь”* – рэўматызм. Падлеткі ўдзельнічалі ў рытуалах абыходжання вёскі і выклікання дажджу [137, с. 254]. Варажба на каханне – частка рэгіянальнай маладзёжнай культуры.

Сярод прыёмаў эмацыянальна-магічнага ўздзеяння на Мазырскім Палессі распаўсюджаны зычэнні, добрыя пажаданні, благаславенні, якія спалучаюць слова, інтанацыю і пэўныя дзеянні (падкідванне, пагладжванне). Выслоўямі, пажаданнямі, ласкавымі словамі суправаджаліся звароты дарослых да дзяцей: *“Вялікі расці!”* [88, с. 182], *“Будзь здароў, як дуб, ды моцны, як зуб”* [88, с. 181]. Жадаючы выказаць замілаванне і пяшчоту, маці ўжывалі ласкавыя звароты і прымаўлялі да дзяцей: *“Мой жа ты салавейка!”* [164, с. 615],*”Ах, мая ж ты ягадка чырвоненька”* [164, с. 615]. Устойлівыя выразы і звароты выкарыстоўваліся як у паўсядзённым жыцці (калі даілі карову, білі масла, пры сяўбе і палявых работах, калі пралі, ткалі, мылі бялізну, пры сустрэчы, пры ўваходзе ў хату), так і ў ходзе сямейна-бытавых абрадаў: пажаданні маладым на вяселлі, нованароджанаму ў час адведак, на хрэсьбінах: *“Дай, божа, каб наша дзіця было крэпка як вада, багата як зямля, весела як пчала і красна як вясна!”* [4]. Людзі верылі, што добрыя пажаданні прыносяць удачу, дабрабыт: *“Дзень добры ў хату!”* [56]. Дзеці засвойвалі словы ветлівасці праз прыклад і прывучэнне, што садзейнічала павышэнню культуры ўзаемаадносін.

Добрымі пажаданнямі на Мазырскім Палессі суправаджаецца ўручэнне пачастункаў дзецям, якія маюць назвы: “гасцінцы”, “валачонае”, “зайчыкаў хлеб”. Распаўсюджаны ласункі, прысмакі, “палізохі” [186, с. 143] – гэта арэхі, зернета, пернікі, перапечкі, яйкі. Пачастунак трэба хутка з’есці або захоўваць да пэўнага часу. Частаваць арэхамі, бобам, гарохам прынята, каб дзіця было гаваркое, каб *“словы сыпаліся як гарох”*, каб не было *“кашы ў роце”*. Як правіла, пачастунак адпавядае ўзросту дзіцяці, прыносіць задавальненне: *“Пабег котка пад печку”* [2]. Уручэнне падарункаў або абмен імі прымяркоўваліся да народных каляндарна-абрадавых (Каляды, Вялікдзень) і сямейна-бытавых урачыстасцей. На свята ісці без падарунка ў хату, дзе ёсць дзеці, непрыстойна: *“Му ек ідом у госці до кумы, то навек госінцы дзецям бером. З пустымі рукамі не прыдзеш. Трэба на людскосць маць”* [185, с. 55].

Выкарыстоўвалася выхаваўчае ўздзеянне твораў народнага мастацтва: тканыя і вышываныя рэчы, дзе выхаваўчая ідэя перададзена мовай арнаменту.

Вышываючы пэўныя сімвалы, жанчыны прасілі здароўя, шчасця дзецям. З дапамогай мастацтва блізкія імкнуліся выхаваць у падлеткаў пажаданыя якасці характару (гаспадарлівасць, пашану да продкаў, любоў да бацькоў), для чаго адпаведныя вобразы ўключаліся ў дэкор кашуль. У якасці вясельных падарункаў пераважалі творы з павучальным зместам: з наказам добра працаваць, берагчы сям'ю, паважаць бацькоў, мець шмат дзяцей.

Ужываліся клятвы, прысяганні, якія ўключалі ў сябе ўрачыстае закліканне на сваю галаву сіл прыроды ў выпадку, калі дадзенае абяцанне будзе ілжывым, парушыць законы народнага этыкету: *"Далібог!"* [88, с. 195], *"Каб я так сваіх дзяцей аглядаў!"* [88, с. 197]. Клятва роднай зямлёй лічылася найбольш моцнаю ў беларусаў-палешукоў. Родная зямля, узятая з сабой на чужыну, адыгрывала ролю абярэга, пасля смерці яе клалі ў магілу [164, с. 447].

Адмоўным пажаданнем быў праклён, які мог прывесці да бяды, хваробы і пагібелі чалавека, сям'і або нават паселішча ці горада. У кожнай мясцовасці былі свае адметныя праклёны: *"Што б ты велікоднага яечка не даждаў!"* [164, с. 623], *"Што б ты долі не маў"* [164, с. 623], *"Што б цябе зямля не прыняла к сабе!"* [164, с. 623], *"Што б ты скамянеў!"* [164, с. 623], якія ўвасаблялі сістэму народных маральных каштоўнасцей. Як абярэг выкарыстоўваліся пажаданні нядобразычліўцу: *"Соль табе ў вочы, засланка ў плечы"* [37].

Самым страшным лічыўся мацярынскі праклён, што, паводле народных казак, міфаў і легенд, збываўся. Матыў мацярынскага праклёну гучыць у мясцовых паданнях аб паходжанні назваў населеных пунктаў Козенкі і Барыскавічы [94], у народнай казцы *"Пчолка і павук"*, запісанай на Мазыршчыне [69, с. 183-184]. Існуе гіпотэза, што ў даўнія часы на тэрыторыі Прыпяцкага Палесся было мора, аб якім расказаў грэчаскі гісторык Герадот (V ст. да н.э.) [139, с. 24]. Паводле мясцовых паданняў, гэта зямля зноў стане морам, калі збудзецца праклятце царыцы Кацярыны, якая праязджала тут і ўпусціла ў калодзеж дзіця. Вера ў незвычайную сілу мацярынскага слова – сапраўдны архетып, першавобраз народнай педагогікі Мазырскага Палесся.

Праклён выклікаў страх і выкарыстоўваўся ў выключных выпадках, часцей ужывалася толькі пагроза наслаць праклён. Праклінаць малых, несвядомых дзяцей катэгарычна забаранялася. Паводле агульнаславянскіх уяўленняў, калі маці кляне і лае дзяцей, то яны адвернуцца ад маці; калі дрэнныя словы ўжывае дзіця, то яго забяруць злыя сілы [175, с. 250-253].

У народзе распаўсюджаны такія прыёмы, як папярэджанне: *"Будзе ў мяне па нітачцы хадзіць"* [113, с. 116]; пагрозы: *"Што б твайго духу не было"* [113, с. 119]; пагрозы жартоўныя: *"Я вас, жэўжыкі"* [113, с. 119], якія дазваляюць зрабіць заўвагу і адначасова захаваць педагагічны такт.

Моцным выхаваўчым уздзеяннем валодала благаславенне і адрачэнне. Бацькі благаслаўлялі дзяцей на добрае жыццё, на шлюб, на ратныя подзвігі. Благаславенні гаварыліся тройчы: *"Як трэба невесту за стол садзіці, то старша дружка гаварыць: Благаславіце, ацец-маці, невесту за стол правадзіці. / – Бог благаславіць. / Другім разам, трэцім разам і так тры разы"* [47].

Адрачэнне бацькоў вяло да духоўнай ізаляцыі асобы, калектыўнага асуджэння, дзе грамадская думка, сіла слова выступалі рэгулятарамі паводзін індывіда. Праклён, адрачэнне, благаславенне ўвасабляюць веру палешукоў у сілу слова, асабліва сказанага ў пэўны час, у стане эмацыянальнай узрушанасці.

Метадамі перавыхавання былі пакаянні, малітвы, ахвяраванні, дзе ўдала спалучаны рэлігійна-царкоўныя і народныя метады ўздзеяння на асобу. У якасці ахвяраванняў выкарыстоўваліся творы народнага мастацтва: вышываныя ручнікі, саматканыя дываны, паясы, калектыўна і індывідуальна вытканыя аброчныя тканіны. Іх неслі ў храмы (незалежна ад канфесійнай прыналежнасці), і адначасова – на магілы продкаў, просячы добрай долі і ўраджаю, даравання грахоў перад людзьмі і вышэйшымі сіламі.

Выбар метадаў выхавання залежаў ад узросту дзяцей. У раннім дзяцінстве, па народным звычаі, дзяцей нельга было біць, крыўдзіць, абзываць. Увогуле да капрызаў немаўлят адносіліся спагадліва. У адносінах да малодшых выкарыстоўваліся пераважна станоўча арыентаваныя метады: асуджэнне, пераключэнне ўвагі, угаворванне, павучанні ў высокамастацкіх формах і г.д.

У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся шырока выкарыстоўваецца прыём адухаўлення нежывых прадметаў у выхаваўчых мэтах. Напрыклад, калі дзіця б'е ў дзверы, то маці, каб спыніць гэтыя дзеянні, гаворыць, што ў дзвярэй або іншай рэчы *"баліць галава"*. Адухаўленне з'яўляецца эфектыўным у адносінах дзяцей 2–5 гадоў, што фарміравала тактоўнасць, эмпатыю.

Выток многіх праблем бачыўся ў дзейнасці знешніх сіл, якія чалавеку непадуладныя і адмоўны ўплыў якіх трэба перачакаць або скіраваць у іншы бок. Прысутнасцю міфалагічных істот (Упіры, Скрут, Пламета) палешукамі тлумачыцца істэрыка, дзіцячая ўпартасць. Робіцца спроба знайсці іх прычыну: *"Чаго ж ето дзіцятко хімарадзіць цэлы дзень? Мо забалела?"* [130, с. 140]. Гэта стымулявала выкарыстанне непрымусовых метадаў уздзеяння, спрыяла ўвазе дарослых да перыядычных псіхалагічных і фізічных з'яў.

Капрызы старэйшых дзяцей, ва ўзросце 5–7 гадоў, лічацца праяўленнем спешчанасці, няправільнага сямейнага выхавання. Маці тады казалі: *"Мажэш ты свае дзіця – патураеш"* [185, с. 60]. У народзе дзіцячым капрызам даюць шматлікія назвы і азначэнні: *"конозліву"*, *"конозіцца"*, *"конозобіцца"* [184, с. 214]. У значэнні капрызіць ужываюцца таксама *"мікіціцца"* [185, с. 81], *"рэмза"*, *"рэмзаць"* [186, с. 347], *"румзы папусціць"* [186, с. 351], *"хімороды*

*строіць"*, *"хімарадзіць"* [187, с. 238]. Збалаваных, спешчаных дзяцей называлі: *"маза"*, *"мазаны"* [185, с. 59]; *"мазёпа"*, *"мазліву"*, *"мазун"*, *"мазуха"*, *"мазюка"* [185, с. 60]. Адпаведна *"мазацца"*, *"мазаць"* [185, с. 60].

Патрабаванні да падлеткаў на Мазырскім Палессі былі дастаткова строгімі: яны мелі пастаянныя даручэнні і асвойвалі рэгіянальныя працоўныя навыкі, сістэму паводзін, адпаведна свайму полу. Для дзяўчат, якія збіраліся на супрадкі, існаваў абавязковы *"урок"*, норма, якую неабходна выканаць. Маці кантралявалі якасць і аб'ём работы, што магло справакаваць выкарыстанне метадаў фізічнага ўздзеяння: *"Што ступень, то й лупень"* [187, с. 112].

Палешукі выхоўвалі дзяцей у строгасці, патрабавальнасці, пры неабходнасці ўшчувалі, нават каралі: *"Дзецей наказывалі, білі дубцэм, крапіваю, еслі шкоду зрабіў: узяў без разрашэння, разбіў, з'еў яйцо, што былі лічанымі на вялікую сям'ю. Крапівою білі. Вербой свечонай. Трапкачом білі, дзе з печы чагуны дастаюць"* [22]. Фізічныя пакаранні не з'яўляліся нечым выключным: *"Навука не ходзіць без друка"* [31]. Але ў цэлым спецыяльна арганізаванае, а не стыхійнае, "пад гарачую руку", пакаранне выкарыстоўвалася ў крайніх выпадках, і вельмі рэдка – пры выхаванні дзяўчынак.

На аснове жыццёвага вопыту і полаўзроставага падыходу ў народнай педагогіцы былі сфарміраваны агульнапрынятыя крытэрыі для выкарыстання фізічнага пакарання. Пакаранні не толькі дапускаліся нормамі звычаёвага права, але ў некаторых выпадках лічыліся неабходнымі: *"Ідзе стары мужчына, папробуй не паздаровацца, бацько так усыпле, век помніць будзеш"* [47].

У складаных выхаваўчых сітуацыях (крадзёж, непавага да старэйшых) прымяненне фізічнага пакарання заахвочвалася, а яго ігнараванне, празмерная паблажлівасць асуджаліся грамадскай думкай. Фізічны боль разглядаўся ў якасці стымула да карэкціроўкі паводзін, што надавала патрабаванням дарослых абавязковы характар. Метад фізічнага пакарання выкарыстоўваўся для барацьбы з негатыўнамі з'явамі, злом, чалавечымі заганамі. У народных казках за непавагу да старэйшых, нежаданне працаваць дзяўчыну, звычайна распешчаную бабіну дачку, чакала і фізічнае пакаранне, і ператварэнне ў свінню, жабу-рапуху і інш. Гэта прымушала крытычна ацэньваць свае дзеянні, хвалявацца за асабістую рэпутацыю, гонар роду і сям'і, арыентуючыся на знешнюю ацэнку (што скажуць акружаючыя) і на самаацэнку (пачуццё віны).

Народная педагогіка фарміравала ў дзяцей выключную адказнасць, самакантроль: *"Ні бацько нас ні біў, ні матка. Пужалі. Быў берозавы дубчык, летом з лісцем, а зімой без лісця. Затыкалі ў столь. Як шкоду зробяць, дак етага дубца беруць, і хто шкоду зробіць – па тым дубец"* [49]. Заўважаецца імкненне не столькі пакараць, колькі скіраваць на правільны шлях, адцягнуць увагу ад непрыгожых паводзін: *"Матка калі б'е, то вучыць"* [163, с. 81].

Часцей выказвалася толькі пагроза прымяніць фізічнае пакаранне: *“Не пабаяўся ківа – пабаішся кія”* [197, с. 39]. Гэта пацвярджаюць і жыццёвыя прыклады: *“Хлопцы ўкралі макацёр яец, гаспадар сказаў бацьку. Бацько ўзяў папругу і пасадзіў сына вечэраць, сын прызнаўся, дзе схавалі макацёр – на вільчыку хаты. Ён занёс макацёр гаспадару і больш ніколі не краў”* [47].

Пагрозы, грозьбы прымяніць фізічнае пакаранне шырока ўжывалася ў дачыненні да дзяцей і падлеткаў: *“Дам табе на арэхі”* [113, с. 117], *“Пакажу, дзе ракі зімуюць”* [113, с. 118], *“Вушы абарву”* [113, с. 117], *“Рэбры палічу”* [113, с. 118], *“Чупрыну выдзеру”* [113, с. 118], *“Ото ж няма чым выцяць”* [113, с. 118], *“Сваіх не пазнаеш”* [113, с. 118]. Пагрозы выкарыстоўваліся пры парушэнні норм народнага этыкету: *“Шчэ посвішчы – очкура дам”* [130, с. 92].

У якасці нямой пагрозы, на відным месцы размяшчаліся спецыяльныя або побытавыя прадметы для фізічнага пакарання: *“Пуга ў дзеда была але не біў, толькі ляскаў, на кручок вешаў. Як лясне, думаеш лясне па табе”* [15]. Некаторыя мелі нават асабістыя імёны: *“Бярозавы дубчык стаяў у куточку. Яго называлі “Сяргейчык у вугельчыку” ці “бярозавая каша”* [55].

Ужываліся такія метады фізічнага і псіхалагічнага ўздзеяння, як “ставіць на грэчку”, “ставіць на соль”: *“На грэчку ставілі, на соль у школе або ў каго мала дзяцей”* [22].

У народнай педагогіцы Мазырскага Палесся прысутнічае метад фізічнага пакарання з элементамі эмацыянальна-магічнага ўздзеяння. Выхаваўчы эфект меркавалася дасягнуць не жорсткасцю пакарання, а дзякуючы ўздзеянню на фізічнае цела і сутнасныя сферы асобы. Біццё ў народнай культуры – гэта рытуальнае магічнае дзеянне, якое мае пераважна прадуцыйную і адгонную функцыі: спрыяе з’яўленню дзяцей, здароўю, прыплоду ў гаспадарцы, здольна выклікаць дождж, адганяе злых духаў. Так, хворае дзіця білі венікам на парозе, каб пазбавіць ад ляку, хвароб. Забаранялася біць дзяцей верацяном або венікам – перастануць расці [175, с. 177]. Падобныя ўласцівасці выкарыстоўваліся і з выхаваўчай мэтай: *“Стаяў у куточку асінавы дубец, таму што ён нечысту сілу выганяе. Як б’юць – сагналі з цебе паганы дух”* [22].

Метады запалохвання або застрашвання грунтуюцца на ўласцівым чалавеку, і асабліва дзіцяці, страху перад невядомым, перад цемрай, незвычайнымі істотамі і сіламі прыроды. Запалохванне актыўна выкарыстоўвалася ў дачыненні да малодшых дзяцей, якія да ўзросту 5–7 гадоў лічыліся несвядомымі, неразумнымі: *“Якія годы, такі й розум”* [113, с. 136]. Гэта пацвярджае звычай захоўвання пупавіны, якую давалі дзіцяці, каб яно магло *“развязаць”* памяць або розум: *“Пупочак, што аставаўся, хранілі, а як у школу дзіця ішло, то трэба пупок развязаць, то і памяць развяжаш”* [48]. У

перыяды маленства (1-3) і дзяцінства (3-9) метады пераканання прызнаваліся неэфектыўнымі, таму ўжывалася магічнае і мастацкае ўздзеянне, даступныя на ўзроўні падсвядомасці, эмоцый, фантазіі.

На Мазырскім Палессі захаваліся ўяўленні пра дамавога, хлеўніка, русалак, цмока [137, с. 263–282]. Духі прыроды аказвалі ўплыў на светапогляд дзяцей, якія змалку збіралі ў лесе арэхі, грыбы і ягады, пасвілі жывёлу паблізу ад небяспечных месцаў. У вобразнай форме гучала перасцярога: *"Русалкі бэзнявінно нікому не робяць зла; яны сядзяць і ў вадзе, да ў самых глубінах, у самых кручынах (віры), кеб людзі зналі, што туды не лезь, бо ўтопішся"* [164]. Страх (пры захаванні пачуцця меры) эфектыўна выкарыстоўваўся ў выхаванні.

Метад запалохвання спалучаўся з прыёмам пераключэння ўвагі дзіцяці на з'явы прыроды, побытавыя рэчы або персанажы славянскай міфалогіі, апошнія з якіх ні выхавальнік, ні выхаванец не могуць назіраць у рэальнасці. Малых, якія не засыналі, палохалі Хапуном, Дамавіком, Марой [148]. Дзяцей страшылі цыганамі, жабракамі: *"Казалі: старцы заберуць, бо хадзілі з торбамі"* [38].

Такім чынам, народная педагогіка Мазырскага Палесся адлюстроўвала багацце жыццёвых выхаваўчых сітуацый. Заахвочваліся мяккія адносіны да дзяцей ранняга і малодшага ўзросту, таму перавага аддавалася непрымусовым метадам выхавання: вербальным, эмацыянальна-магічнага ўздзеяння, павучанням у эстэтычна-мастацкай форме. У дачыненні да падлеткаў і моладзі асабіста-арыентаваныя метады выхавання спалучаліся з аўтарытарным падыходам, бо з аднаго боку, неабходна было сфарміраваць асобу, якая падпарадкоўваецца звычаям; з другога – патрабавалася самастойнасць, праяўленне ініцыятывы, таму ўжываліся практычныя і вербальныя метады, не выключалася і фізічнае пакаранне, калі іншыя метады не дапамогуць.

Асноўныя паняцці, метады і прыёмы выхавання, а таксама асаблівасці іх рэалізацыі ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся прадстаўлены ў табліцы 2.2.

**Табліца 2. 2 – Метады народнай педагогікі Мазырскага Палесся**

| Метад, прыём або паняцце | Асаблівасці выкарыстання |
|---|---|
| **I. Метады выхавання словам, вербальныя** | |
| **Слухаць, слухацца – не слухаць, не слухацца, неслух** – паняцці народнай педагогікі | Асноўныя паняцці народнай педагогікі, што характарызуюць ступень паслухмянасці дзіцяці, уменне падпарадкоўвацца вусным распараджэнням дарослых. Сведчаць аб пераважна вербальным характары выхаваўчага ўзаемадзеяння. Спалучаюцца з метадамі кантролю, пакарання, выпрабавання. |
| **Павучанне, тлумачэнне, гутарка** – метад выхавання | Метад дыферэнцыраваны ў залежнасці ад полу і ўзросту. Гутаркі з дзяўчынкамі маглі праводзіцца маці або сёстрамі, старэйшымі жанчынамі на вячорках, у час выканання спецыфічна жаночых відаў работ. Мелі месца і гутаркі бацькі з сынам у час выканання мужчынскіх відаў работ. Гутаркі ўзнікалі ў ходзе калектыўных відаў працы: уборка ўраджаю, збор дароў лесу. Штодзённыя або спецыяльна арганізаваныя гутаркі маглі набываць характар павучання, настаўлення, мэтанакіраванай перадачы жыццёва-практычнага вопыту. |
| **Ускосная гутарка** – выхаваўчы прыём | Прыём народнага выхавання, калі дзеці актыўна не ўдзельнічалі ў размове, але слухалі размовы дарослых у паўсядзённым жыцці ці ў ходзе народных святаў, на вячорках. Асуджэнне або адабрэнне пэўнага ўчынка адбывалася ў прысутнасці дзіцяці з выхаваўчай мэтай. Выхаванне ажыццяўляецца не ў форме павучання, а праз успрыняцце канкрэтнай выхаваўчай сітуацыі. |
| **Павучанне ў эстэтычна-мастацкай форме** – метад выхавання | Наказ, забарона, просьба, перасцярога гучыць у народных казках і гульнях з павучальнымі сюжэтамі. Выхаваўчы эфект абапіраецца на тое, што ў дзіцячым узросце спасціжэнне свету адбываецца пераважна ў працэсе гульні, лепш успрымаецца ў эмацыянальна-вобразнай форме.<br>Для моладзі істотна магчымасць выказаць свае перажыванні эмацыянальна-вобразнай |

| | |
|---|---|
| | песеннай мовай, паколькі размовы з бацькамі на інтымныя тэмы з маладымі людзьмі дашлюбнага ўзросту на Мазырскім Палессі не ўхваляліся. |
| **Параўнанне, зварот** – выхаваўчыя прыёмы | На выхаванне дзяцей і фарміраванне іх адносін да людзей, да прыроды істотна ўздзейнічалі звароты з памяншальна-ласкальным значэннем, вобразна-псіхалагічныя паралелізмы, параўнанні, эпітэты і інш. У іх вербальны пачатак прысутнічае, але не дамінуе, паколькі дэманстраваць празмернае замілаванне лічыцца неэтычным. |
| **Заахвочванне і асуджэнне** – метады выхавання | Заахвочванне (пахвала) эмацыянальна пабуджала дзяцей да прыгожых, адабраемых дарослымі паводзін, выклікала эмацыянальны пад'ём, развівала патрэбу ў супрацоўніцтве, садзейнічала фарміраванню ўпэўненасці ва ўласных сілах. Заахвочванне магло выказвацца ў выглядзе эмацыянальнай падтрымкі, адабрэння вербальнага або невербальнага характару: усмешка, жэст, інтанацыя, погляд, падзяка, пахвала, зварот і інш. |
| | Для беларусаў-палешукоў характэрна арыентацыя на стрыманасць, строгасць, сапраўдную або і паказную суровасць, імкненне не дапусціць празмернага пеставання дзяцей. Адпаведна ў паводзінах дзяцей, асабліва падлеткаў, адзначалася пераважна негатыўнае, а не станоўчае, часцей выказвалася асуджэнне, а не пахвала. Хвалілі пераважна "*за вочы*", а не "*у вочы*", па-першае, каб адзначыць сапраўдны, а не выпадковы поспех, па-другое, каб не сурочыць, не пашкодзіць. |
| **Намёк**, **ускосная заўвага, папярэджанне** – прыёмы выхавання | Думка выказвалася ў форме прыказкі або прымаўкі, утрымлівала параўнанне, але канкрэтных асоб або дзеянняў не называла і такім чынам пабуджала да дзеяння, самаўдасканалення. |
| **Станоўчая або адмоўная грамадская ацэнка (думка) ў форме павучання, забароны, асуджэння** – метады выхавання | Грамадская думка асэнсоўвалася як запавет продкаў, вызначалася абавязковасцю, імператыўнасцю. І асуджэнне, і ўхваленне сельскага калектыву высока цаніліся, з'яўлялася стымулам для самавыхавання. Адлюстроўвае калектывізм, грамадскую, узаемную адказнасць родных, сваякоў і |

| | |
|---|---|
| | аднавяскоўцаў за выхаванне сваіх і чужых дзяцей, па-першае, у вузкім, бытавым разуменні – кантроль за штодзённымі паводзінамі, учынкамі і выказваннямі выхаванца ў канкрэтных сітуацыях, па-другое, у шырокім сэнсе (якім чалавекам вырасце). |
| **Дражненне, высмейванне, абзыванне** – метады выхавання | Індывідуальны, грамадскі, у пэўнай ступені публічны метад уздзеяння на асобу, характэрны для славянскіх народаў. Не толькі ўказвае на недахопы, але стымулюе самавыхаванне. Як прыём народнай творчасці шырока прадстаўлены ў калядных абрадах, абрадзе “валачыць калоду”, што пашыраны на Мазырскім Палессі. |
| **II. Практычныя метады выхавання** | |
| **Перайманне** – метад выхавання | Перайманне – асноўны метад выхавання і навучання ў народнай педагогіцы. Метадам пераймання дачка вучылася ад маці прасці, ткаць, плесці карункі; сын пераймаў працоўныя, рамесніцкія ўменні бацькі. На першым этапе выхаванец назірае ўсю паслядоўнасць аперацый, а затым паступова ўключаецца ў рэальную дзейнасць. Неабходныя навыкі засвойваюцца і адточваюцца непасрэдна ў дзеянні. |
| **Пасіўнае ўспрыманне і назіранне** – прыёмы выхавання | Выхаваўчыя прыёмы, якія садзейнічаюць рэалізацыі метада пераймання, абапіраюцца на цікаўнасць, схільнасць дзяцей да пераймання і назірання за дзеяннямі дарослых. Дзіцячая цікаўнасць свядома або несвядома заахвочвалася. |
| **Паказ** – прыём, састаўная частка метаду пераймання | Суправаджаецца тлумачэннем і дэманстрацыяй канкрэтных узораў (прадзенне і ткацтва, народныя песні і вышыўка, вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва), паўтарэннем і кантролем, выказваннем канкрэтных заўваг ці адабрэння. Пры рэалізацыі прысутнічае ўстойлівая тэндэнцыя: паступова змяншаць дапамогу дарослых у авалодванні спосабамі самастойных дзеянняў. |
| **Ацэнка першага вопыту** – выхаваўчы | Выкарыстоўваецца пры арганізацыі практыкавання і прывучэння. Усяму, што робіцца |

| | |
|---|---|
| прыём | або прысутнічае ўпершыню (першы сноп, першая баразна, першая стрыжка, першае слова і г.д.) надаецца асаблівая ўвага ў традыцыйнай культуры рэгіёна: “Першае, што зробіць дзіця, трэба ўкінуць у вагонь, та яно будзе ахвотна й тэн’го рабіць, што схочэ ” [173 с. 185]. Існавала перакананне, што першапачатковыя ўражанні (эмацыянальныя, працоўныя) асабліва моцныя, а няправільны навык увойдзе ў звычку і стане пастаянным. |
| **Паўтарэнне** – універсальны для ўсіх груп метадаў прыём народнай педагогікі | Шляхам шматкратнага паўтарэння засвойваліся і вусная народная творчасць, і народныя рамёствы, і працоўныя працэсы. Ужыванне паўтарэння абумоўлена як патрэбамі выхавання, так і спецыфікай самога фальклору як вуснага мастацтва, заснаванага на паўтарэнні дзеянняў і рытуалаў, мелодый і элементаў арнаменту. Паўтарэнне, перайманне і ўзнаўленне, не разлічанае на запіс або іншую фіксацыю, забяспечвала эфектыўнасць вуснай педагагічнай традыцыі. |
| **Практыкаванне** – метад выхавання | Метад грунтуецца на паўтарэнні дзеянняў, тэхналагічных схем, арнаментаваных выяў, слоўных формул. З’яўляецца ўсеагульным для навучання ў вуснай, непісьмовай культуры. Рэалізацыі метаду садзейнічае арыентацыя на практычную передачу вопыту ў ходзе арганізацыі жыццядзейнасці, ранняе ўключэнне дзяцей у грамадска-карысную працу, рэгіянальныя звычаі і традыцыі. |
| **Прывучэнне** – метад выхавання | На Мазырскім Палессі існавала ўстойлівае перакананне, што розум дзіцяці не настолькі развіты, каб яно магло падпарадкоўваць свае паводзіны нават вядомым нормам і правілам, таму выхаванне з ранняга ўзросту было накіравана на арганізацыю канкрэтных дзеянняў і ўчынкаў, якія паступова пераходзяць у звычкі. Метадам прывучэння (у адрозненні ад практыкавання) адбывалася фарміраванне маральнай свядомасці асобы, замацаванне станоўчых звычак, правіл паводзін. Прывучэнне ажыццяўлялася ў |

| | |
|---|---|
| | натуральных умовах, у працэсе пастаяннага самаўзнаўлення форм народнай педагогікі, традыцыйных патрабаванняў (у пэўныя дні тыдня ці года: у суботу, да Каляд, да Вялікадня ў чысты чацвер, да вяселля) скончыць справы, прыбраць у хаце і інш. |
| **Заданні, даручэнні** – прыёмы рэалізацыі метадаў практыкавання і прывучэння | Мелі пастаянны, часовы або аднаразовы характар, залежалі ад полу і ўзросту, прымяркоўваліся да свят і абрадаў. У сям'і дзецi, як правіла, мелі пастаянныя побытавыя даручэнні: "Маці навучыла мене лапці плесці і ізбавілася ад клопату. Надо было іцці ў лозу, надраць лазы, што б і на зіму хваціло. Іх хватало на 2 дні, абутку не було" [24]. |
| **Аўтарытэт бацькоў і старэйшых** – закон, аксіёма народнай педагогікі Мазырскага Палесся, што грунтуецца на культе продкаў | У традыцыйным грамадстве дарослыя і старэйшыя мелі значна большую сацыяльную каштоўнасць, чым дзеці, моладзь. Палешукоў вызначае паслухмянасць волі бацькоў, бясспрэчнасць іх аўтарытэту. Дзеці, нават стаўшы дарослымі, звярталіся да бацькоў на "Вы", традыцыя часткова захоўваецца да нашага часу. |
| **Станоўчы або адмоўны прыклад** – метады выхавання | Выхаваўчыя прыклады браліся з жыцця сям'і, акружэння дзіцяці, традыцый дадзенага паселішча, мясцовасці. Грунтуецца як на імкненні дзяцей да пераймання, дзіцячай назіральнасці, цікаўнасці да падзей і людскіх паводзін, так і на ўменні "ўжывацца" ў сітуацыю, прымяраючы яе на сябе, а таксама такіх асаблівасцях нацыянальнага характару як схільнасць да высмейвання, доказу ад супрацьлеглага, крытыкі "наадварот". |
| **Прыклад-ідэал** – метад выхавання | Метад заснаваны на педагагічным патэнцыяле народнага мастацтва. Выхаваўчае ўздзеянне аказваюць героі народных балад, легенд, гераічнага эпасу, гістарычных паданняў пра асілкаў, барацьбу з татарамі, крыжакамі. |
| **Прыклад продкаў** – метад выхавання | Метад абапіраецца на культ продкаў, сілу народных традыцый. Выхаваўчае ўздзеянне ўзмацняецца ў ходзе памінальных абрадаў, апавяданняў-успамінаў. У дзяцей выхоўваліся |

| | |
|---|---|
| | ўдзячнасць продкам, гонар за іх справы і прыналежнасць да пэўнага роду. Рытуалы сведчаць аб веры палешукоў у бессмяротнасць душы, магчымасць падтрымліваць сувязь з памёршымі продкамі ў важныя выпадкі жыцця: нараджэнне, хрысціны, вяселле. |
| **Групавое або індывідуальнае спаборніцтва** – метады выхавання | Метад народнага выхавання і спосаб арганізацыі жыцця. Спаборніцтва адбываецца ў ходзе калядных ігрышчаў моладзі: у спевах, танцах, гульнях, вырабе масак, пераапрананні, дасціпнасці, спрыце і жартах. У ходзе працы на вячорках (прадзення кудзелі, ткацтва, вышывання) наладжваўся працэс песеннага спаборніцтва. У час Гукання Вясны праходзілі спаборніцтвы паміж дзявочымі гуртамі розных вёсак або розных канцоў адной вёскі. На вяселлі адбываецца песеннае спаборніцтва сватоў маладой і маладога, гасцей з супрацьлеглых бакоў і інш. Складанне і выкананне прыпевак – песенна-паэтычны, танцавальна-музычны індывідуальны народны конкурс. Метад рэалізуецца дзякуючы адметнасці традыцыйных форм працы і адпачынку, задавальняе патрэбу чалавека ў самавыражэнні. |
| **Практычныя выпрабаванні, выпрабаванне розуму** – метады выхавання | Выпрабаванні моладзі звязаны са сталеннем, з уступленнем у шлюб: абрады выпрабавання нявесты, агляд пасагу. Фізічная сіла, спрыт, працоўнае майстэрства выпрабоўваліся ў ходзе святаў, народных гульняў, на вячорках, сумесна выконваемай працы: касьба, жніва. Распаўсюджана выпрабаванне загадкамі – праверка інтэлектуальнага ўзроўню, разумення моладдзю народнага светапогляду. Метад заснаваны на значнасці грамадскай думкі, развівае самастойнасць, практычныя ўменні і навыкі |
| **Шкода, рабіць шкоду, лезці ў шкоду** – выхаваўчыя паняцці народнай педагогікі | Абазначае дзеянні, учынкі дзяцей, што маглі нанесці ўрон іх здароўю, дабрабыту сям'і: "Быў березавы дубчык летом з лісцем а зімой без лісця. Затыкалі ў столь. Як шкоду зробяць, дак етага дубца беруць і хто шкоду зробіць. Па тым дубец. У нашай |

| | |
|---|---|
| | пародзе не було такіх дзецей, што б шкоду рабіць. У грубу не лезлі” [49]. |
| **III. Метады эмацыянальна-магічнага ўздзеяння** | |
| **Павер'і, забароны, замовы** – метады выхавання | Утрымліваюць рэкамендацыі і для выхавацеляў, і для выхоўваемых, якія маюць жыццёва-практычнае або магічнае тлумачэнне. Метад эфектыўны для фарміравання паводзін, ахайнасці, густу, паколькі адабраемыя паводзіны пастунова ператвараюцца ў норму. У іх – павучанні, жыццёвыя прынцыпы, ісціны-пастулаты, якія выконваюцца дзецьмі без абгрунтавання. Абапіраецца на веру ў сілу слова, у ірацыянальны пачатак, сінтэзуюць народную медыцыну і псіхалогію, выхаванне і магію слова. Замовы выкарыстоўваліся для лячэння, варажбы, з мэтай самаахавы і інш. У адрозненні ад вербальных метадаў, галоўным з'яўляецца ўздзеянне на падсвядомасць. |
| **Варажба, прадказанні** – метады выхавання | Распаўсюджаны індывідуальныя, калектыўныя і агульна сямейныя гаданні на ўраджай, на замуства, на прадказанне долі. Выхаваўчую значнасць маюць: абавязковы, абумоўлены звышнатуральнымі здольнасцямі ўдзел падлеткаў у асноўных святах і абрадах, што садзейнічала пераемнасці традыцый; варажба моладзі прадшлюбнага ўзросту, якія абапіраліся на народны ідэал хлопца або дзяўчыны.<br>Са здольнасцю да магіі і чараўніцтва на Мазырскім Палессі суадносяцца прафесіі павітухі, ганчара, млынара, бортніка, каваля, якія маюць справу з асноўнымі стыхіямі і сіламі прыроды: нараджэнне чалавека, агонь, вада, паветра, зямля. |
| **Зычэнні**, **добрыя пажаданні, устойлівыя звароты** – метады выхавання | Імі суправаджаліся звароты дарослых да дзяцей у ходзе бытавых абрадаў: пажаданні маладым на вяселлі, нованароджанаму ў час адведак, на хрэсьбінах. Людзі верылі, што добрыя пажаданні прыносяць удачу, дабрабыт. Метад грунтуецца на веры ў сілу слова, у станоўчы эфект вербальнага, эмацыянальна афарбаванага |

| | |
|---|---|
| | пажададння.<br>Распаўсюджаны пажаданні здароўя, росту дзецям: "Вялікі расці!", "Добра гадуйся!", "Будзь здароў, як мядзведзь", "Насі на здароўе!", якія спалучалася з пэўнымі дзеяннямі (падкідванне, пагладжванне). |
| **Арнаментаваныя творы народнага мастацтва з павучальным і выхаваўчым зместам** – метад выхавання | Метад увасабляе адзінства духоўнага і матэрыяльнага ў выхаванні, сілу народнага мастацтва. Выхаваўчая ідэя (просьба аб здароўі, абароне, фарміраванні працавітасці, пашаны да бацькоў) перадаецца сродкамі арнаменту, для чаго адпаведныя вобразы ўключаюцца ў дэкор кашуль, ручнікоў, падарункаў нованароджанаму або вясельных. |
| **Пакаянні**, **малітвы**, **ахвяраванні** – метады выхавання і перавыхавання | Метад не столькі выхавання, колькі перавыхавання, дзе ўдала спалучаны рэлігійна-царкоўныя і народныя метады эмацыянальнага і магічнага ўздзеяння на асобу. Ахвяраваліся вышываныя ручнікі, саматканыя дываны, паясы, калектыўна і індывідуальна вытканыя аброчныя тканіны. У абрадах вырабу аброчных тканін прымалі ўдзел дзеці і падлеткі, бо існавала вера ў іх незвычайныя здольнасці. |
| **Гасцінцы**, **валачонае**, **зайчыкаў хлеб** – метады выхавання | Абмен падарункамі – састаўная частка традыцыйнай культуры рэгіёна, што гарантуе ўдачу таму хто прымае дар і дабрабыт таму, хто яго дае. Для нованароджанага сімвалізуе надзяленне доляю.<br>У залежнасці ад сітуацыі пачастунак трэба хутка з'есці або захоўваць да пэўнага часу. Частаваць арэхамі, бобам, гарохам прынята, каб дзіця было гаваркое, каб "словы сыпаліся як гарох", каб не было "кашы ў роце". Уручэнне падарункаў або абмен імі прымяркоўваліся да народных каляндарна-абрадавых (Каляды, Вялікдзень) і сямейна-бытавых урачыстасцей. На свята ісці без падарунка ў хату, дзе ёсць дзеці, лічыцца непрыстойным. У якасці гасцінцаў распаўсюджаны ласункі, прысмакі, "палізохі" – гэта арэхі, "зернета", пернікі, перапечкі, яйкі. |

| | |
|---|---|
| **Клятвы, прысяганні** – метады выхавання | Прысяганне, клятва дзецьмі, роднай зямлёй – гэта ўрачыстае заклікание на сваю галаву сіл прыроды ў выпадку, калі дадзенае абяцанне будзе ілжывым, парушыць законы народнай маралі. Метад абапіраецца на веру ў адзінства слова, думкі, пажадання і ўчынку, утрымлівае элементы абагаўлення прыродных стыхій. |
| **Праклён, пагроза наслаць праклён, мацярынскі праклён** – метады выхавання і перавыхавання | Вера ў незвычайную сілу мацярынскага слова – архетып, першавобраз народнай педагогікі Мазырскага Палесся. Метад абапіраецца на традыцыю, на культ павагі да продкаў, на сугестыю – працэс вербальнага і невербальнага, эмацыянальна афарбаванага ўздзеяння на псіхіку чалавека. Паводле агульнаславянскіх уяўленняў, калі маці кляне і лае дзяцей, то яны адвернуцца ад маці; калі дрэнныя словы ўжывае дзіця, то яго забяруць злыя сілы. Праклінаць малых, несвядомых дзяцей забаранялася. Таму часцей ужываецца толькі пагроза наслаць праклён. |
| **Благаславенне і адрачэнне бацькоў, блізкіх, аднавяскоўцаў** – метады выхавання і перавыхавання | Метад грунтуецца на аўтарытэце бацькоў і старэйшых, веры ў сілу слова (як адмоўнага, так і станоўчага), асабліва паўтараемага тройчы і сказанага ў пэўны (добры або ліхі) час, калі назіралася супадзенне эмацыянальнага стану чалавека са станам прыроды, космасу. Адрачэнне бацькоў вяло да духоўнай ізаляцыі асобы. |
| **Выслоўі-папярэджанні, выслоўі–пагрозы, пагрозы жартоўныя** – метады выхавання | Абапіраюцца на аўтарытэт старэйшых, выкарыстоўваюць эмацыянальна-вобразныя магчымасці роднага слова, адлюстроўваюць гуманізм, народны досціп: “Чупрыну выдзеру”, “Ото ж няма чым выцяць” [113, с. 118]. |
| **Пераключэнне ўвагі, адухаўленне нежывых прадметаў** – выхаваўчыя прыёмы | У раннім дзяцінстве, па народных уяўленнях, дзяцей нельга крыўдзіць, таму ўвагу дзіцяці стараліся пераключыць – “забавіць дзіця”. Падобны эфект дае пераключэнне ўвагі дзіцяці не толькі на з’явы прыроды, побыту, але і ўяўныя дзеянні міфалагічных персанажаў – Мары, Дамавіка.<br>Калі дзіця пераварочвае мэблю, б’е ў дзверы, то гаворыць, што ў дзвярэй або іншай рэчы “баліць |

| | |
|---|---|
| | галава”. Адухаўленне нежывых прадметаў дапамагае нейтралізаваць нематываваную істэрыку, дзіцячую ўпартасць. |
| **Фізічнае пакаранне, пагроза прымяніць фізічнае пакаранне** – метады выхавання | У складаных выхаваўчых сітуацыях (непавага да старэйшых, крадзёж) прымяненне фізічнага пакарання заахвочвалася, а яго ігнараванне, празмерная паблажлівасць і мяккасць да дзяцей – асуджаліся грамадскай думкай. У цэлым спецыяльна арганізаванае, а не стыхійнае, “пад гарачую руку”, фізічнае ўздзеянне выкарыстоўвалася мясцовымі жыхарамі ў крайніх выпадках, і вельмі рэдка – пры выхаванні дзяўчынак. Метад адлюстраваны ў народнай творчасці, абапіраецца на аўтарытэт старэйшых. |
| **Нямая пагроза** – выхаваўчы прыём | У якасці нямой пагрозы на відным месцы размяшчаліся спецыяльныя (бярозавы ці асінавы дубец) або побытавыя прадметы (пуга, трапкач), прызначаныя для фізічнага пакарання. |
| **Фізічнае пакаранне з элементамі эмацыянальна-магічнага ўздзеяння** – метад выхавання | Біццё – рытуальнае магічнае дзеянне, якое мае пераважна прадуцыйную і адгонную функцыі: спрыяе з’яўленню дзяцей, здароўю, прыплоду ў гаспадарцы, адганяе хваробу, злых духаў і г.д. Выхаваўчы эфект дасягаецца не жорсткасцю пакарання, а дзякуючы гаючаму ўздзеянню пэўных рэчаў (свячоная вярба, крапіва, асінавы дубец) на фізічнае цела і сутнасныя сферы асобы. |
| **Ставіць на грэчку, ставіць на соль** – прыём рэалізацыі метада пакарання | Спалучае фізічнае і псіхалагічнае ўздзеяння, пераключэнне ўвагі, выкарыстанне лекавых і адгонных уласцівасцей асобных прадуктаў. |
| **Запалохванне або застрашванне** – метад выхавання | Абапіраецца на першавобразы і імператывы народнага выхавання, што зафіксаваны ў міфалогіі. Выкарыстоўваюцца страх перад невядомым, адухаўленне прыроды і аб’ектаў матэрыяльнага свету, вобразнасць, багацце дзіцячай фантазіі.<br>Грунтуецца на ўласцівым дзіцяці, страху перад невядомым, перад цемрай, незвычайнымі істотамі. Ужываецца да ўзросту 5-7 гадоў, калі дзеці лічацца неразумнымі. Дзяцей палохалі Дамавіком, |

| | |
|---|---|
| | русалкамі, Жалезнай Бабай, Марой. |
| **Распуста: упіраваць, канозіцца, хімарады строіць, дурыць, мазацца і інш.** – народныя выхаваўчыя паняцці | Заснаваны на тлумачэнні псіхалагічных праблем дзейнасцю знешніх сіл, адмоўны ўплыў якіх трэба перачакаць або скіраваць у іншы бок. Прысутнасцю міфалагічных істот (Упіры прыляцелі, Скрут сеў) тлумачыцца істэрыка, дзіцячая ўпартасць.<br>Капрызы старэйшых дзяцей, ва ўзросце 5-7 гадоў, лічацца праяўленнем спешчанасці, няправільнага сямейнага выхавання. Дзіцячым капрызам даюць шматлікія азначэнні: “конозліву”, “конозіцца”, “конозобіцца”. У значэнні капрызіць ужываюцца таксама “мікіціцца” , “рэмза”, “рэмзаць”, “румзы папусціць”, “хімороды строіць”, “хімарадзіць”. Збалаваных дзяцей называлі: “маза”, “мазаны”; “мазёпа”, “мазліву”, “мазун”, “мазуха”, “мазюка”. Адпаведна “мазацца”, “мазаць”. Непаслухмянасць, сваволства характарызуюцца словам “распуста”, адпаведна “распуснік”, “распусніца”. “Дурыць”, “дурыць голаў” – дзіцячыя капрызы, неразумныя просьбы; “раздурнае” – распешчанае дзіця. |

## 2.3 Традыцыйныя формы і сродкі выхавання

Форма з’яўляецца знешнім выражэннем працэсу выхавання [158, с. 853]. Найбольш істотным крытэрыем для аналізу формы з’яўляецца колькасны. Адпаведна агульнапрынятай класіфікацыі, у народнай педагогіцы Мазырскага Палесся па колькасці ўдзельнікаў вылучаюцца формы індывідуальныя, мікрагрупавыя, групавыя (калектыўныя) і масавыя. Пераважаюць формы групавыя, калектыўныя, якія адлюстроўваюць грамадскі характар выхавання.

Узаемаадносіны паміж дзецьмі ў традыцыйнай культуры рэгіёна будуюцца на аснове ўзроставай іерархіі і палавой, гендэрнай ідэнтыфікацыі. Таму па палавой прыкмеце формы выхавання падзяляюцца на хлапечыя (мужчынскія), дзявочыя (жаночыя) і змешаныя; па ўзроставаму складу – аднаўзроставыя, рознаўзроставыя і шматпакаленныя.

Большасць мае змешаны, рознаўзроставы характар, прычым кожны пол і ўзрост меў дакладна вызначаныя ролі і абавязкі: хату ўпрыгожвалі да свята дзяўчаты, хлопцы наймалі музыку, рыхтавалі інвентар для гульняў і інш. Сем’і на Мазырскім Палессі былі вялікія, мнагадзетныя : *“ад пяці да 10 душ у кожнай хаце”* [26]. Індывідуальныя формы рэалізоўваліся пераважна ў сям’і, дзе пры вялікай колькасці дзяцей утвараліся рознаўзроставыя групы: *“Жылі*

*бедно. Я сама старша була, я рукавадзіла свамі сёстрамі і братамі. Дзеці старшые дровы насілі, меншые ў хаці седзелі. Як 7-8 гадоў – большые сталі"* [49]. Індывідуальныя формы выхавання, як правіла, не залежаць ад абрадаў.

Традыцыйнымі, спецыяльна арганізаванымі, масавымі формамі выхавання з'яўляюцца народныя звычаі, абрады і святы. У іх межах вылучаюцца калектыўныя формы: вячоркі (святочныя і паўсядзённыя), карагоды, гульні, творчыя аб'яднанні моладзі і інш. Адметнасць народных форм выхавання – іх устойлівасць і цыклічная паўтаральнасць, імкненне да самаарганізацыі, самаўзнаўлення, што закладзена ў спецыфіцы самога фальклорнага дзеяння. Гэта стварала пэўны рытм жыцця, фарміравала агульнапрынятыя ўяўленні аб народнай этыцы і эстэтыцы.

Мясцовыя абрады і святы звязаны з *каляндарна-земляробчым* (Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Грамніцы, Юр'я, Купалле, Дажынкі, Спас, Пакрова) і *сямейна-бытавым* цыкламі. Кожная з гэтых груп мае значны выхаваўчы патэнцыял, спецыфіку правядзення і арганізацыі. Яны спалучалі розныя віды народнага мастацтва (песня, танец, музыка, тэатр, касцюм), забяспечвалі комплекснае ўздзеянне на асобу, з'ўляліся прыгожай, эмацыянальнай формай далучэння дзяцей да сацыяльнага жыцця, да традыцый рэгіянальнай культуры.

Класіфікацыя форм выхавання прадстаўлена ў табліцы 2.3.

**Табліца 2. 3 – Традыцыйныя формы выхавання і сацыялізацыі асобы**

| Крытэрыі класіфікацыі | Традыцыйныя фрмы выхавання і сацыялізацыі |
|---|---|
| ***Адпаведна цыклічнасці фальклору і арганізацыі традыцыйнага ладу жыцця*** | • формы выхавання, абумоўленыя цыклам каляндарна– земляробчых звычаяў і абрадаў: зімой, вясной, летам, увосень;<br>• формы выхавання, абумоўленыя цыклам сямейна-бытавых звычаяў і абрадаў: радзінна-хрысцінны комплекс: валачобны абрад, прысвечаны сям'і і дзецям; вяселле і абрады, прысвечаныя маладой сям'і; пахавальны абрад і звычаі памінання продкаў (Радаўніца, Дзяды); |
| ***Па колькасці ўдзельнікаў*** | • індывідуальныя;<br>• мікрагрупавыя;<br>• групавыя (калектыўныя);<br>• масавыя; |
| ***Па ўзроставаму складу*** | • аднаўзроставыя;<br>• рознаўзроставыя;<br>• шматпакаленныя; |
| ***Адпаведна полу*** | • хлапечыя;<br>• дзявочыя;<br>• змешаныя. |

***Формы выхавання, абумоўленыя цыклам сямейна-бытавых звычаяў і абрадаў*** аб'ядноўваюць радзіны, вяселле і пахаванне, што адлюстроўваюць цыкл чалавечага жыцця. Да іх па зместу далучаюцца Радаўніца і Дзяды, якія спраўляюцца штогод.

Адведкі, радзіны, хрысціны на Мазырскім Палессі спраўляюцца паўсямесна: *"Бабку звалі, якая памыла, прыняла дзіцятка. Кума і куму. Варыць кашу. Сядаюць за стол. Маці дае падаркі куму і куме: куму – рубашку, куме – на плацце. Бабку вазілі на калясцы. Бяруць бабу на каляску і возяць па селе, а баба ім магарыч дае"* [38].

Кульмінацыйныя моманты абраду – разбіванне, продаж і падзел бабінай кашы: *"Каша падрасла, ета на дабро. Благаслаўлялі кашу разбіваць. Хто болей грошэй – той разаб'е. Кум далжон. Каша ек каравай, насілі дадому, што б дзеткі веліся"* [38]. Вышэйназваныя абрадавыя дзеянні (благаслаўленне, выбар кумаў, пачастунак гасцей, абмен падарункамі і інш.) сімвалізуюць як грамадскія адносіны да жанчыны-парадзіхі, так і прыняцце нованароджанага ў соцыум.

Адведкі, радзіны, хрысціны і зараз на Мазырскім Палессі спраўляюцца паўсямесна. Большасць бацькоў усведамляе значэнне абрадаў, звязаных з нараджэннем дзіцяці. Пры гэтым спецыяльная радзінная абрадавая паэзія практычна не захавалася, а царкоўныя і традыцыйныя абрадавыя дзеянні, пасутнасці, зліліся ў адно цэлае.

Далейшыя ўзаемаадносіны паміж бабай-павітухай і яе названым унукам, а таксама хроснымі і хрэснікам рэгуляваў валачобны абрад. На Мазырскім Палессі (у адрозненні ад агульнабеларускай традыцыі абыходжання двароў) абрад атаясамліваецца з кумаўством, адведваннем маладой сям'і і дзяцей, суправаджаецца ўзаемным абменам падарункамі: *"На Паску і Раждзество адведвалі хросніка. Валачонае неслі – крашаные яйца, пеклі булачкі, кулебякі"* [38]. Асаблівасці ўзаемаадносін падрабязна апісаны яшчэ А. Сержпутоўскім: *"На Вялікдзень жанкі, а часам і мужчыны ходзяць з сваімі маладзіцамі з валачобным к той бабе, каторая ў іх бабіла дзіця. Моо й слова валачобнае пашло з таго, што яны валакуць бабе пірагі, свянцонае, а то й просто два ці тры боханы хлеба, палатно ці наметку, пляшку гарэлкі або яшчэ што-небудзь"* [173, с. 12]. Звычай бытуе ў рэгіёне і ў наш час [137, с. 127]. Валачобны абрад – унікальны рэгіянальны абрад, прысвечаны сям'і і дзецям.

Вяселле на Мазырскім Палессі адбывалася па традыцыйнаму сцэнарыю (сваты, запоіны, непасрэдна вяселле і заключная частка – хвост) з пэўнымі рэгіянальнымі адрозненнямі. Для народнай педагогікі – вяселле – гэта своеасаблівая ініцыяцыя, узроставая і сацыяльная мяжа, калі чалавек становіцца дарослым, стварае ўласную сям'ю, каб паўтарыўся кругазварот жыцця. У час вяселля закладваюцца маральна-духоўныя асновы будучай сям'і.

Адметнасць пачатковага этапу вяселля на Мазыршчыне выяўляецца ў звычаі прыбіраць ёлку. Звычайна гэта рабілі дзяўчаты ва ўзросце 12–15 гадоў, за што яны атрымлівалі гасцінцы. Малады выкупляў ёлку, якая ўпрыгожвала вясельны стол. Дзяўчаты спявалі: *"Ёлачка барава, / У бару стаяла – шумела.*

*/ Йшла дарогаю – звінела. / У сені ўвайшла – саўяла. / У хату ўвайшла – на стале стала і заззяла"* [137, с. 132]. Так моладзь далучалася да традыцый, засвойвала абрадавыя песні і дзеянні.

Шырока вядомы ў рэгіёне абрад пасаду маладых. Цнатлівасць дзяўчыны як патрабаванне для заключэння шлюбу ва ўсходніх славян адзначаецца большасцю даследчыкаў. Мясцовы абрад характарызуецца тым, што на вывернуты кажух садзілі не толькі маладую, а абодвух [137, с. 192]. Гэта вызначала ўзаемную адказнасць маладых перад Богам і людзьмі, асаблівую патрабавальнасць палешукоў да ўсіх фактараў, звязаных з працягам роду.

Найбольш распрацаваная частка агульнай структуры Палескага вяселля – каравайны абрад, прысвечаны маладой сям'і і абрадаваму хлебу – караваю. Інфарматары адзначаюць, што самым адказным лічылася расчыненне цеста на каравай. Для гэтага запрашалі жанчын, якія вядомы тым, што ў іх першы муж, дружная сям'я, дагледжаныя і добра выхаваныя дзеці. Колькасць каравайніц вар'іруецца, але патрабаванні да іх застаюцца нязменнымі. Паўсямесна вясельны каравай мясілі далонямі, а не кулакамі, каб малады ніколі не біў маладую. Жанчыны крута замешваюць кожная свой кавалак цеста, затым складаюць іх разам і ляпяць каравай, садзяць яго ў печ. Адметнасць мясцовай традыцыі ў тым, што ў цеста клалі варанае або сырое яйка ці некалькі, якое затым аддавалі маладому [137]. Звычай, відавочна, звязаны са стымуляваннем дзетанараджэння.

Як правіла, на Мазырскім Палессі пякуць два караваі: у маладой і ў маладога. У некаторых вёсках каравай нявесты пякуць круглы, у форме сонца, а ў жаніха – паўкругам, у форме месяца [89, с. 266]. Сонца і месяц – галоўныя сімвалы народнай культуры, сонечны і месячны каляндар – аснова жыццядзейнасці. Каравай выпякаўся з высокаякасных прадуктаў: "У нашым караваі з трох ніваў пшаніца, / З трох рэк вадзіца, / Дзве дзежкі масла, / Дзве долечкі шчасця" [89, с.347]. Ён аздабляўся сімвалічнымі фігуркамі з цеста (шышкі, птушкі, крыжыкі), штучнымі кветкамі, таксама рутай, мятай, калінай: "Кветкі з каравая здымалі і раздавалі дзецям" [89, с. 236]. Прыгатаванне каравая адбывалася ў гурце, што дазваляла вопытным гаспадыням перадаваць традыцыі народнай кулінарыі моладзі.

Разам з дарослымі ў правядзенні каравайнага абраду ўдзельнічалі і дзеці: *"Несе каравай меншы брат ці сестра, калі сваіх малых дзецей нема, то каравай несе любое дзіця, чужэе ці свае"* [15]. Дзяўчынка 10–15 гадоў выконвала ролю свяцёлкі – трымала ў руках дзве свечкі – сімвалы маладога і маладой, пакуль дзялілі каравай [137, с. 245]. Для дзяцей рыхтавалася спецыяльнае печыва ў форме каравайчыкаў або гусачак, шышачак: *"Запарожцы ў вакно гледзелі, хлопцы-подлеткі. Дзецям на двор нясе маладая канхвет"* [15]. Пры гэтым *"калі хто ўкрадзе на вяселлі кусок каравая – у маладых можа не быць дзяцей"* [89, с. 362].

Многія абрадавыя дзеянні аберагаюць маладую сям'ю ад негатыву, звязаны з пажаданнем мець здаровых, разумных дзяцей: *"Во, даю табе медзі, што б былі дзеці, як мядзьведзі"* [89, с. 292]. Лапатай, на якой садзяць каравай,

б’юць мужчын па галаве: *“гэта зацем робіцца, каб ўсе дзеці ў маладых былі башкавітыя, разумныя, што бы роўна стаялі на зямле. Патаму што лапата эта крэпкая, ана зделана з дуба, дубовая, крэпкая такая”* [137, с. 171]. Такім спосабам робіцца спроба станоўча ўплываць на здароўе і інтэлект нашчадкаў.

Такім чынам, каравайны абрад нарадзіў сваю, каравайную творчасць: песні, гульні, замовы, магічныя дзеянні, рыфмаваныя прымаўленні і пажаданні: “*Нясуць каравай на лапаце і спеваюць: Печ рагоча, караваю хоча, / А прыпечак заліваецца, на каравай спадзяваецца*” [47]. Харавыя спевы, якія суправаджалі абрад дзяльбы каравая, самі па сабе з’яўляліся мастацкім відовішчам і аказвалі эмацыянальнае ўздзеянне на прысутных: “*Як дзеляць каравай, дак у нас спевалі мужчыны*” [47]. Гучаць сур’ёзныя і жартоўныя пажаданні маладой сям’і, па прыкметах вызначаецца будучае жыццё: “*Свечкі стаяць у караваі – чыя ясно гарыць, той доўго будзе жыць. Мігае – прыкмета пагана*” [49].

На Мазыршчыне і сёння папулярны старадаўні абрад абування цешчы ў лапці, які адбываецца ў маладога: *“Зяць садзіць яе на лаўку, мые ёй гарэлкай ногі, выцірае рушніком і абувае лапці, нявестка надзявае свякрусе сарочку, якую вышывала сама”* [89, с. 269]. Абрад дэманструе ўзаемную павагу да бацькоў, умельства і досціп маладых.

Пасля падзелу каравая завіваюць маладую – расплятаюць касу і завязваюць хустку, якую дарыць нявестцы свякруха. Дружкі спяваюць: *“Дай, матко, масла. / Я ж тваі карованькі пасла. / Ад расы да росы, / Памазаці косы”* [47]. У абрадзе прымаюць удзел малодшыя браты і сёстры: *“Я расплетала Лені, сестры, косы. Далі капейку, гадоў 8 було. На печы седзелі, znялі – да за стол”* [47]. Такім чынам умацоўваюцца сямейныя ўзаемаадносіны.

Камічным, гратэскным характарам характарызуецца заключная, паслявясельная частка, *“хвост”* – праяўленне смехавай культуры Мазырскага Палесся, народнага гумару.

Увасабленнем трагічнага з’яўляецца пахавальны абрад, дзе назіраецца спалучэнне народных (галашэнні, прыказванні, размовы на магіле з нябожчыкам, запрашэнне ў госці) і хрысціянскіх (свечкі, абразы) уяўленняў аб жыцці і смерці. Пахавальны абрад на Мазыршчыне вызначаецца шматлікімі перасцярогамі: завешваннем люстэрка, выкупам зямлі, разбіраннем даху ў выпадку смерці чараўніка, пасыпаннем жыта ўслед нябожчыку і інш. Многія рытуалы сведчаць аб веры палешукоў у бессмяротнасць душы, магчымасць падтрымліваць сувязь з памёршымі продкамі, каб у крытычныя моманты звяртацца па параду і атрымліваць дапамогу як у гаспадарчых, так і ў сямейных справах: выхаванне дзяцей, іх жаніцьба, выдача замуж, далейшы лёс і г.д.

Вялікае значэнне мае памінальны абед. Распаўсюджана прыказка: *“Наеўса ек дурэнь на помінках”* [36], якая падкрэслівае патрабавальнасць палешукоў да адпаведнасці паводзін трагічнаму моманту. Выбар страў рэгламентаваны: *“На помінкі вараць тры стравы борщ, каша і кампот, больш нічаго, водкі і віна не было. Патом стала беседа, і свадзьба, і пахараны – усё адзінакава”* [47]. Абрадавай стравай з’яўляецца сыта, якую прысутныя, аб’яднаныя сумесным смуткам, бяруць адной лыжкай з адной міскі па чарзе. У

цэлым, пахаванне разглядаецца як непазбежны этап у жыцці кожнага чалавека, і ўключае не толькі смутак па нябожчыку, але і ацэнку яго жыцця, урок жывым.

Свет жывых і свет мёртвых не мае ў традыцыйнай культуры строгай мяжы, яны ўзаемадзейнічаюць у важныя моманты жыцця, у тым ліку пры нараджэнні чалавека. У Лельчыцкім раёне, калі дзіця вязуць хрысціць, то на могілках пакідаюць хлеб-соль [176, с. 505]. Згодна звычаю, дзяўчына-сірата прыходзіць на магілу бацькоў прасіць благаславення на шлюб.

Да памінальных абрадаў, акрамя пахавання і памінання нябожчыка, адносяцца таксама Радаўніца і Дзяды. У іх вобразна выяўлены не проста звычаі шанавання памерлых родзічаў, а падмурак народнай педагогікі Мазырскага Палесся – культ продкаў. Абрады дазваляюць захоўваць і падтрымліваць сямейна-родавыя традыцыі, штогод узнаўляць хроніку роду, перадаваць гістарычную памяць, ажыццяўляць выхаваўчую функцыю [54].

Аснова абраду Дзяды – сумесны абед усяго роду, блізкіх, пры гэтым клапаціліся і пра тых нябожчыкаў, каго няма каму памінуць: *“У каго няма к каму зайці, прыходзьце да мяне, дзяды, на вячэру”* [137, с. 247]. На Дзяды ежу з міскі, якая прызначалася продкам, давалі дзецям, каб не хварэлі, не баяліся грому [176, с. 44]. Нават у трагічным беларусы-палешукі знаходзілі матэрыял для аказання выхаваўчага ўздзеяння, прыкладаў спачування і ўзаемадапамогі.

Радаўніца і ў наш час на Мазырскім Палессі спраўляецца вельмі масава і адпавядае сваёй назве, калі людзі на могілках не толькі смуткуюць, але і радуюцца разам з продкамі надыходу цёплай, сонечнай пары года: *“После Паскі на Радаўніцу ідом на кладбішчэ і там гаворым: “Добры дзень, старшым, маладым, малым, святым – святая зямелька!” Патом качаем яйца па магілцы, што б памёрлыя ўзналі, што Хрыстос уваскрэс”* [137, с. 108].

Ч. Пяткевіч запісаў на Палессі малітву да сонца, якую прымаўляюць у дзень веснавых памінанняў, на *Радаўніца* альбо *Наўскі Вялікдзень* на могілках: “*Сонейка яснае на небі, узайдзі ў іх непраглядныя цямніцы хаць адным тоненькім валаском залаценькім, крапелькаю расы гаручаю, тваім сьвятым агнём, хаць чарвячком купальным”* [164, с. 303].

Могілкі наведваюць усёй сям’ёй, што аказвае на дзяцей выхаваўчае ўздзеянне, мацуе повязь пакаленняў. У дзень памінання продкаў успамінаюць нябожчыкаў, іх настаўленні жывым, разважаюць пра будучыню, выхаванне дзяцей і ўнукаў.

***Формы выхавання, абумоўленыя цыклам каляндарных і земляробчых звычаяў і абрадаў***, адпаведна порам года падзяляюцца на чатыры сезоны: зіма, вясна, лета, восень. На Мазырскім Палессі добра захаваўся калядна-навагодні абрадавы комплекс (з 24 снежня па 19 студзеня). Палешукі строга прытрымаліся Піліпаўскага посту: *“У пост нічога не давалі, у бочках капуста, агурцы, грыбоў наносяць, серы борщ, мед”* [47]. Перад Калядамі забівалі кабаньчыка, гатавалі мясныя стравы, *“пеклі хлеб, самі пеклі, называўся ён “хлеб-каляда”. Кругленькі, каб пару кілаграм была хлебіна. Самі кушалі і раздавалі, хто прыходзіў калядаваць. Птушкам давалі”* [137, с. 88]. Варылі

куццю і тройчы клікалі: *“Мароз, Мароз, / Хадзі куццю есці! / Бабы з сярпамі, / Мужыкі з косамі”* [137, с. 90]. Масавым было гаданне дзяўчат аб замужжы.

Зімовыя звычаі характарызуюцца тэатралізацыяй, карнавальнасцю, пераўвасабленнем, грыміроўкай. Калядоўшчыкі выварочвалі кажухі, наймалі музыкі, рабілі маскі і вадзілі мядзведзя, бусла, ваўка, пераапраналіся цыганам і цыганкай, хадзілі са Звяздой. Але галоўны палескі калядны персанаж – Каза: *“Дзе каза нагою, там жыта стагою. / Дзе каза туп-туп, там жыта сем коп”* [15]. Як адзначаецца большасцю інфарматараў, калядавалі і хадзілі з Казой або Звяздой толькі хлопцы, мужчыны; шчадравалі – дзяўчаты [137, с. 71]. Узрост калядоўшчыкаў вар’іруецца: у адным населеным пункце казу вадзілі дарослыя хлопцы – гадоў па 20, у іншым – малыя хлопчыкі, а са Звяздой хадзілі дарослыя: *“проста казу вадзілі малыя, а звязду ўжо пасташэ ці нават дарослыя”* [137, с. 83]. У большасці населеных пунктаў *“дзеці каледавалі звечара, а ўзрослые ўсю ноч”* [22]. Хадзілі невялікімі групамі па 6–7 чалавек. Пры гэтым *“на Ражаство калядуюць, а на Новы год шчадруюць”* [137, с. 76]. Лічылася, што дом, які не наведалі каляднікі, чакае няшчасце.

У ходзе падрыхтоўкі да святаў узнікалі *часовыя творчыя аб’яднанні моладзі*, якія займаліся падрыхтоўкай рэквізіту, памяшкання або імправізаванай сцэнічнай пляцоўкі, вырабам масак для прадстаўленняў народнага тэатра.

На Мазыршчыне бытаваў старажытны абрад пасявання або засявання: *“Дзеці раненько пасявалі: Сею-сею, пасеваю, шчасця-радасці жалаю ў етом даму”* [22]. Удзельнікі абраду жадалі гаспадарам здароўя, багатага ўраджаю [137, с. 93]. Дзевачкі спявалі: *“Ой ў полі, у полі стаіць ябланька”* [15].

Часткай народных святаў – гадавых Каляд, Вялікадня, Тройцы, Спаса і менш значных, прастольных (Здзвіжанне, Змітрай, Ведзене), а таксама кірмашоў, *“ярмалак”*, сямейных урачыстасцей былі бяседа – святочнае застолле і гасцяванне – масавы збор гасцей з мэтай адзначэння пэўнага свята. Для дзяцей гэта быў час, калі ў госці прыязджалі стрыечныя браты і сёстры, дзядзькі або цёткі, прывозілі гасцінцы, жадалі ўдачы і здароўя, планавалі будучае моладзі.

Вясной на Мазырскім Палессі гулялі Стрэчанне, Запускі, Гуканне Вясны, Сарокі, Благавешчанне, Вербніцу, Радаўніцу, Юр’е, Макарэя, Міколу, Ушэсце [108]. Старажытны абрад Правады русалкі і русальныя песні ў жывым бытаванні не захаваліся, і прыгадваюцца інфарматарамі як даўнія, колішнія [137, с. 127-128]. На святах палешукі танцавалі *“Падыспанец”*, *“Кракавяк”*, *“Яблычка”*, *“Страданія”*, *“Кадрылю”*, *“Вальс”*, *“Польку”*, *“Каробачку”*, *“Матлёт”* [137, с. 123]. Удзельнікі ўбіраліся ў святочнае адзенне, гатавалі стравы, старэйшыя сачылі за адпаведнасцю паводзін моладзі патрабаванням народнага этыкету. Адметнасць веснавых святаў – яднанне чалавека з прыродай, родная зямлёй.

Адметнасць веснавых святаў – яднанне чалавека з космасам, роднай зямлёй. Каляндарна-абрадавыя ўрачыстасці, якія фіксуюць увагу чалавека найперш на стане роднай прыроды і яе харастве, у выхаваўчым плане блізкія да абрадаў любавання (месяцам, цвіценнем вішні) у японскай традыцыйнай

культуры. Аналогіі тут прасочваюцца даволі выразна, што падкрэслівае блізасць усіх традыцыйных культур і адпаведна арганізацыі выхавання ў розных народаў.

Вядомае народнае свята Саракі або Сорокі ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся мэтазгодна разглядаць як вясновае свята дзяцей і моладзі, традыцыйную форму фізічнага, эстэтычнага і экалагічнага выхавання. Свята прымеркавана да прылёту 40 выраяў птушак і выхоўвала гуманныя адносіны да пярнатага царства. Хлопчыкі-падлеткі перакідвалі цераз хату палкі, каб знайсці летам столькі ж птушыных гнёзд. Жанчыны пяклі бліны, пампушкі і частавалі імі членаў сям'і. Дзяўчаты варажылі аб сваім лёсе: *"Нада 40 дошчачак зламаць, што б 40 жаніхоў было. Гэта было 40 святых. І дзе 40-я дошчачка зломіцца, тады дзеўка і замуж пойдзе. Пасярэдзіне – тады ў сярэдзіне года"* [137, с. 105]. Наладжваліся масавыя гулянні моладзі з арэлямі, скокалкамі, варажбой, спаборніцтвамі ў сіле, спрыце, у перакідванні палак, пераломванні трэсак. У Стрэльску дзяўчаты гулялі ў скокалкі, а хлопцы рабілі 40 кацялкоў з дрэва, якія трэба было разбіць [137, с. 42].

Галоўнай забавай мясцовай моладзі ў час веснавога абуджэння прыроды былі арэлі, што ладзіліся звычайна на ўзвышшы, на высокім і моцным дрэве: *"З березы скручвалі качэлі ў лесе. Маткі не пускаюць, а ўродзе ек па шчавель пойдзеш"* [15]. Тут збіраліся дзеўкі і хлопцы, пелі вяснянкі, у тым ліку жартоўныя: "*Ой на горе корыто, корыто, / Поўнэ воды наліто, наліто. / Пчолкі крыльца помылі, / Дзеўкі воду попілі. / Хлопцы кажуць: дайце й нам. / Дзеўкі кажуць: мало й нам. / Дзеўкі ножкі помылі, / Хлопцы воду попілі. / Дзеўкі кажуць: дайце й нам. / Хлопцы кажуць: мало й нам"* [51].

Арэлі выкарыстоўваліся з вясны да пачатку лета: *"Арэлі павесяць на сасне, на горцы, і маладзёж туды хадзіла ўсягда, не толькі на свята"* [51]. Даследчыкі славянскай культуры адзначаюць, што гайданне на арэлях з'яўляецца абавязковым для маладых, забяспечвае ўдачу, здароўе, замуства, ураджай [176, с. 481]. Гэта масавая форма зносін і выхавання моладзі абодвух палоў, якая рэалізоўвалася на прыродзе, садзейнічала абуджэнню творчага пачатку.

На Мазырскім Палессі былі распаўсюджаны самадзейныя харавыя аб'яднанні моладзі. Песенныя групы, пераважна дзявочыя, фарміраваліся на вячорках, іх дзейнасць актывізавалася з надыходам цёплай пары года: *"У дзерэўні гулялі, сабіраліся кажны вечар. Тут група і там, кастры палілі, па ўзросту разбіваліся. Спевалі красіво, да падводзілі: "Посею гурочкі, шырокі лісточкі", "Цечэ рэчанька-невелічэнька", "Гаем-гаем, гаем зелененькім"* [22].

Песеннае майстэрства самадзейных калектываў правяралася і ўдасканальвалася ў час народных святаў, спаборніцтваў паміж хлапечымі і дзявочымі гуртамі, паміж хорамі розных вёсак. Калектыўная творчая дзейнасць садзейнічала ўсебаковаму развіццю сельскай моладзі, спрыяла ўзнікненню сяброўскіх адносін. Вясковы хор – адна з самых дэмакратычных, даступных і масавых форм эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы.

Абавязкова, нават у савецкі час, адзначалі Вялікдзень [47]. На Мазырскім Палессі найбольш распаўсюджана гульня "у біткі": *"На Велікдзень у біткі ўсе гуляюць: і хлопцы і дзеўкі"* [51]. Любілі велікодныя забавы дзеці: *"Качалі яйкі ў латках. Давалі качаць дзецям на дзеравенскіх начоўках. Начоўкі стаялі на палу, і дзеці качалі друг другу яйкі, пакуль не паб'юць"* [137, с. 115]. Святкаванне адрозніваліся ў населеных пунктах рэгіёна: *"В Каменке Мозырскага раёна палілі кастры на Пасху, сабіралі калбасы, гулялі"* [137, с. 125].

Большасць урачыстасцей спалучала народныя і рэлігійныя традыцыі, што прывяло да сінтэзу розных відаў выхаваўчага ўздзеяння: *"А Тройцу как у нас прызнавалі: тожа пазагаўляюцца, усяго нагатовяць. Бярозы ў нас ля кажнага акна закапвалі. А ў комнатах ерніку панакідаем, цвятоў панастаўляем у вокны, галінкаў клёну. А ў госці тожа так хадзілі, хто прыйдзе, дак угосцяць. На другі дзень кумілiся: спявалі, гулялі, выпівалі"* [137, с. 124].

Састаўной часткай урачыстасцей на Тройцу з'яўляецца абрад кумлення – старажытная форма абрадавага ўстанаўлення сяброўскіх адносін. Ён разглядаецца сучаснымі навукоўцамі як жаночая ініцыяцыя, што знаменаваў важны перыяд у жыцці дзяўчыны – наступленне шлюбнага ўзросту [202, с. 280]. На Мазырскім Палессі абрад кумлення спраўляецца на другі дзень святкавання Тройцы [137, с. 124]. Падрабязнага апісання Палескага рэгіянальнага варыянту абраду не выяўлена, але інфарматары прыгадваюць песні, гульні, узаемнае частаванне дзяўчат, якое заахвочвалася старэйшымі [15].

У Жыткавіцкім раёне добра захаваўся русальны абрад, які спраўлялі тры дні і называлі Тройцай. Яго актыўнымі ўдзельнікамі з'яўляюцца моладзь і дзеці, самі русалкі ўвасабляюць душы памерлых нехрышчоных дзяцей жаночага полу або маладых дзяўчат. Удзельніцы плялі вянкі, вадзілі карагоды, праводзілі русалку ў жыта адпаведным карагодам, "плятнём" [195]. Спраўляліся русальныя дзяды, у час якіх дзяўчаты вешаюць вянкі на крыжы, водзяць карагоды на могілках вакол насыпаных горак з пяску, на якіх сядзяць дзеці [32]. Рэгіянальныя міфалагічныя ўяўленні ўтрымліваюць пэўны выхаваўчы аспект.

Сярод летніх святаў на Мазырскім Палессі вядомы *Купала, Макавей, Пятро, Дзевятнік, Жніво, Спас.* Купальская абраднасць – частка традыцыйнай рэгіянальнай культуры: *"Распальваем берасцянкі Карагоды: йдом, йдом – і рассыпаліса. Заўязваюць хлопцам вочы і ўцякаем – каторы паймае, будзе судзьба твая. Стараешся, каго любіш. Берасцянкі дзержым, махаем і ўсоко пускаем. Усё ў агнях. Старыя ў вокны гледзяць, маткі"* [15]. У палескіх вёсках, аддаленых ад рэк, свята ўпамінаецца як колішняе, забытае [1].

Такім чынам, купальская абраднасць – сінкрэтычная з'ява традыцыйнай культуры і выхавання, якая выяўляе адзінства эстэтычнага, маральнага, экалагічнага ў развіцці асобы.

Адметным сродкам народнага выхавання з'яўляецца вянок з кветак, каласоў і траў. Элементамі ўпрыгожання прычоскі палескіх дзяўчат былі кветкі, вяночкі, стужкі, каснікі. Навык пляцення вянкоў пачынаў фарміравацца з дзяцінства і пастаянна ўдасканальваўся пры падрыхтоўцы да традыцыйных

урачыстасцей: *“На заканчэнне гульняў каля агню маладыя пускалі вяночкі на воду, а ў сярэдзіне вяночка рабілі перапляценне з сцяблоў лёну ці жыта і ставілі туды свечку. Калі пускалі венкі, то задумвалі якое-небудзь жаданне”* [4]. Дзяўчаты плялі вянкі звычайна ў групе, прычым колькасць удзельніц пляцення вянка ў Русальным абрадзе строга рэгламентавана: 6 або 12 дзяўчат [202, с. 433]. Гэта дазваляе вылучыць *пляценне* або *віццё вянкоў* у рэгіянальна адметную групавую форму выхавання, якая мае палавую дыферэнцыяцыю.

Універсальнай састаўляючай большасці народных святаў і найбольш культураадпаведнай формай эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы з’яўляўся карагод. Карагод характэрны не для ўсіх культур, а найперш для славянскіх, дзе пераважала калектыўная дзейнасць і масавыя формы выхавання. Пластыка карагодаў простая, не патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі, пры гэтым дазваляе быць удзельнікам практычна ўсіх народных святаў і абрадаў [182].

Касавіца, жніва, малацьба, уборка ўраджаю – сінкрэтычныя формы народнага выхавання, дзе спалучана мастацтва і праца, працоўнае і эстэтычнае выхаванне, індывідуальнае спаборніцтва і калектывізм. Тэмы ўзаемаадносін маладой маці і свякрухі, трагічнай страты дзіцяці – адна з асноўных у жніўных песнях: *“Ой, крапіўка мая, ты пякучая, / Ой, свякруха мая, ты сваручая”* [19].

Увосень беларусы-палешукі адзначалі Спасаўку, Дакопкі, Галавасек, Чудо, Здзвіжанне, Пакрову. Распаўсюджаным народным звычаем на Мазырскім Палессі з’яўляюцца вячоркі: *будзённыя* (попрадкі, супрадкі), дзе пераважаў працоўны характар і *святочныя* (ігрышчы, музыкі, гулянка), дзе дамінуючым выступаў мастацка-эстэтычны пачатак: сумесны пачастунак, песні, гульні, танцы пад музыку. Матэрыялы даследавання даюць падставу падзяліць вячоркі як формы выхавання і сацыялізацыі на тры асноўныя групы: змешаныя або рознаўзроставыя; вячоркі-попрадкі людзей старэйшага ўзросту; вячоркі моладзі шлюбнага ўзростуч. Вячоркі былі масавымі формамі выхавання і задавальнялі патрэбы ў зносінах розных узроставых груп.

Найбольшае пашырэнне мелі рознаўзроставыя вячоркі, дзе дзеці і моладзь праходзілі школу народнага этыкету, далучаліся да працы, традыцый. Змест вячорак раскрываецца ў занятках удзельнікаў: *“Дзеўкі прадуць, вяжуць кручком, вышываюць, хлопцы ложкі дзераўяныя выразаюць, лапці плетуць”* [22]. Часткай былі зычэнні, гасцінцы, мясцовыя стравы: “Вячоркі дзелалі, калі цёрлі і сушылі лён. Сабіраліся ўсе, хто ўмеў прасці, усё ўрэмя ў адной хаце. На вячоркі дзелалі стол: картошку тушылі, бабку пяклі, яйкі жарылі ў печы. Абязацельна спявалі, абязацельна!” [137, с. 139]. Прысутныя абменьваліся навінамі, расказвалі казкі, былічкі. Для дзяцей наладжваўся тэатр ценяў пры святле лучыны. З наступленнем цёмных вечароў хлопцы-падлеткі намазваліся сажай, рабілі маскі з гарбуза, палохалі дзяўчат.

Дзяўчаты выконвалі народныя песні *“Цячэ рэчэнька, невелічэнька, скочу-перэскочу”*, *“Ой, што-то за конь бежыць, его бела грыва”*, якія суправаджаліся музыкай або акампанементам калаўрота і верацён, стукам таўкача аб ступу і г.д. Спалучэнне мастацтва і калектыўнай працы садзейнічала

ўсебаковаму развіццю творчых здольнасцей. На вячорках адточваліся асноўныя практычныя ўменні і навыкі, ажыццяўлялася перадача рэгіянальнага вопыту.

Калі вячоркі супадалі з народным святам або “прыстольным празнікам”, то наладжваліся *“музыкі”*: *“Прыходзілі тагды з далёкіх сёл дзеўкі і хлопцы, наймалі музыкантаў, танцавалі “Кадрыль”, “Матлёты” Дзеўкі то пралі, то вышывалі, а хлопцы прыходзілі са скрыпкай. Многа тады ў нас музыкантаў было Маці пускала на вячоркі толькі тагды, калі быў добры пачынак, яго трэба было напрасці. Хлопцы нам памагалі, што б усім разам гуляці”* [137, с. 139].

У ходзе арганізацыі вячорак працоўнае выхаванне спалучалася і перапляталася з маральным і эстэтычным, суправаджалася песнямі, апавяданнямі з жыцця і павучальнымі гутаркамі старэйшых. Менавіта на вячорках адбываўся няспынны працэс перадачы рэгіянальнага светапогляду і працоўнага вопыту.

Народныя звычаі і абрады, як гістарычна ўзнікшыя формы выхавання, фарміравалі свядомасць моладзі, забяспечвалі масавае ўздзеянне, садзейнічалі вырашэнню праблем арганізацыі побыту і наладжванню міжасабовых зносін.

Да ***сродкаў выхавання*** ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся адносяцца матэрыяльныя і ідэальныя аб’екты, працэсы і з’явы як прыродныя, так і створаныя чалавекам, праца, чалавечыя ўзаемаадносіны, творы народнага мастацтва, з дапамогай, пасродкам якіх ажыццяўляецца ўздзеянне на свядомасць і паводзіны выхаванца і дасягаюцца асноўныя задачы выхавання. Песні, казкі, танцы, гульні – гэта не толькі элементы народнай культуры, але першыя сродкі выхавання. Кожны сродак традыцыйнага выхавання мае спецыфічныя спосабы ўздзеяння на чалавека. Многія заснаваныя на нагляднасці, іншыя дасягаюць мэты праз слова, а большасць арганічна спалучаюць і нагляднасць, і вобразнасць, і рухі, і слова. Выхаваўчай значнасцю валодае ўсё багацце акружаючага жыцця, таму колькасць сродкаў народнай педагогікі, па-сутнасці, невычэрпная (Гл. табліцу 2.4).

Усе названыя, а таксама не ахарактарызаваныя кампаненты народнай педагогікі Мазырскага Палесся, уваходзяць у агульную народную выхаваўчую сістэму, часткі якой, маючы пэўнае самастойнае значэнне, складаюць агульнае цэлае. Змены ў адным ланцугу выхаваўчай сістэмы непазбежна адбіваюцца на другім: адыходзіць у нябыт народны звычай ці абрад, а разам з ім знікаюць і традыцыйныя стравы, танцы, арнаментаваныя вырабы, павер’і, варажба, выконваемыя пры гэтым песні і інш. Нібы дзеля прадухілення страт, выхаваўчыя ідэі дубліруюцца не толькі словам, але і мовай арнаменту, харэаграфіі, музыкі і песні. У адзінстве прынцыпы, метады, формы і сродкі ствараюць канцэнтрычную праграму выхавання, дзякуючы чаму і адбываецца глыбокае пагружэнне выхаванцаў у стыхію народнага жыцця.

**Табліца 2. 4 – Сродкі народнага выхавання**

| Духоўная культура беларусаў-палешукоў | Матэрыяльная культура беларусаў-палешукоў | Праца і працоўныя заняткі мясцовага насельніцтва | Прырода Мазырскага Палесся |
|---|---|---|---|
| • *дзіцячы фальклор*: калыханкі і забаўлянкі, заклічкі і прыгаворкі, дзіцячыя песні, дражнілкі, лічылкі, гульні і забавы;<br>• *народныя казкі*: пра жывёл, чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя;<br>• *пазнавальна-гістарычныя сродкі*: міфалогія, легенды і паданні;<br>• *моўныя сродкі*: прыказкі, прымаўкі і фразеалагізмы; выслоўі, звароты, блаславенні, пажаданні сям'і і дзецям, вітанні пры сустрэчы і развітанні, пры пэўных занятках, падзяка і інш.;<br>• *уласныя імёны*, сямейныя і родавыя | • *землябобчыя прылады працы*, у тым ліку спецыяльна зробленыя для дзяцей;<br>• *народная архітэктура*: жыллё, яго ўтрыманне і аздабленне, спецыфіка жылых і гаспадарчых забудоў;<br>• *самаробныя дзіцячыя цацкі* (гліняныя, драўляныя, з саломы, кудзелі, тканіны, воўны);<br>• *народная кулінарыя*: паўсядзённыя і святочна-рытуальныя абеды (каляндарна-абрадавыя і сямейна-бытавыя);<br>• *традыцыйныя прадукты харчавання*: нарыхтоўка, прыгатаванне, нормы спажывання; | • *мужчынскія віды працы* і ўдзел у ёй дзяцей: нарыхтоўка дроў, сена, апрацоўка зямлі і інш.;<br>• *жаночая праца* і ўдзел у ёй дзяцей: прадзенне, ткацтва, вышыўка, пашыў адзення, уборка жылля і інш.;<br>• *раслінаводства*: земляробства, агародніцтва;<br>• *жывёлагадоўля*: гадоўля хатняй жывёлы, пастухоўства;<br>• *збіральніцтва*, калектыўны і індывідуальны збор дзікіх ягад, грыбоў і пладоў;<br>• *бортніцтва і пчалярства*, перадача рэгіянальнага вопыту; | • *нябесныя целы і прыродныя стыхіі*: неба, планеты, зямля, сонца, зоркі, вецер, агонь, вада;<br>• *зямля* як радзіма і святыня, як карміліца, як сродак працы земляроба;<br>• *хатнія жывёлы і птушкі*: догляд, вывучэнне паводзін, адлюстраванне ў народнай творчасці;<br>• *дзікія звяры, птушкі, насякомыя, гады*: вывучэнне паводзін, паляванне, ахова, адлюстраванне ў народнай творчасці;<br>• *свет нежывой прыроды* (дрэвы, расліны, камяні, крыніцы): назіранне, адносіны, працоўная і гульнёвая дзейнасць, выкарыстанне, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| мянушкі, назвы родных і сваякоў;<br>• *народны гумар*: жарты, анекдоты, з'едлівыя словы, кпіны і адказы на іх, жартоўныя праклёны і інш.;<br>• *народныя загадкі*: аб чалавеку, аб працы, аб прыродзе і інш.;<br>• *народныя песні*: каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, пазаабрадавыя;<br>• *народныя танцы і карагоды*: мужчынскія, жаночыя, дзіцячыя, сольныя, парныя, масавыя;<br>• *народная музыка*: вакальна-інструментальная, танцавальна-інструментальная, сольная;<br>• *народныя гульні*: каляндарна-абрадавыя; | спосабы ўпрыгожання вясельнага каравая, "бабінай кашы", вячэры на Дзяды і г.д.;<br>• *ткацкія вырабы* (ручнікі, дываны, посцілкі, паясы для дзяцей і дарослых) і прылады для прадзення і ткацтва;<br>• *народнае адзенне* (для дзяцей і дарослых, для хлопчыкаў і дзяўчынак, мужчынскае і жаночае, святочнае і паўсядзённае);<br>• *традыцыйны арнамент* (адпаведна кампазіцыйнай будове: раслінны або геаметрычны; у залежнасці ад матэрыялу і спосабу выканання: тканы, вышываны, плецены, набіваны, разьбяны) і адпаведныя вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; | • *паляванне* на дзікіх жывёл і птушак, прыёмы здабычы і высочвання;<br>• *рыбная лоўля*, лоўля ўюноў і выраб рыбалавецкіх прылад;<br>• *рамёствы і промыслы на аснове здабычы і апрацоўкі драўніны:* цяслярства, сталярнае рамяство, суднабудаванне, бондарства, выраб транспартных сродкаў, прылад працы і прадметаў побыту, лесанарыхтоўка і лесахімічныя промыслы;<br>• *народнае дойлідства*: будаўніцтва жылля, гаспадарчых і грамадскіх пабудоў, разьба па дрэве;<br>• *ганчарны промысел*: выраб і выкарыстанне, мясцовыя назвы глінянага посуду, рэгіянальныя | адлюстраванне ў народнай творчасці;<br>• *прыродакарыстанне*: правілы паводзін і ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці ў прыродным асяроддзі, арыентацыя ў прасторы і часе;<br>• *народны каляндар*: месячны і сонечны; сістэма сельскагаспадарчых і рэлігійных святаў і прысвяткаў; спосабы прадказання надвор'я;<br>• *прырода як сродак выхавання і загартоўкі арганізма дзіцяці*: гульні і забавы на прыродзе, праца і адпачынак на прыродзе, купанне ў рэках і азёрах, пастухоўства і догляд коней, збор грыбоў і ягад, рыбная лоўля і інш.;<br>• *нарыхтоўка і выкарыстанне прыродных* |

| | | | |
|---|---|---|---|
| сямейна-абрадавыя; гульні, не звязаныя з абрадамі;<br>• *народны тэатр*: каляндарныя і сямейна-бытавыя абрады з тэатральна-драматычнымі элементамі, інтэрмедыі, народная драма, батлейка;<br>• *народная медыцына*: лячэнне хвароб – дзіцячых, інфекцыйных, жаночых, псіханеўралагічных;<br>• ветэрынарная практыка; замовы, забароны, павер'і;<br>• *народныя звычаі, святы і абрады*: сямейна-бытавыя, каляндарна-абрадавыя;<br>• *народны этыкет і грамадскія традыцыі*: правілы паводзін і абыходжання, сямейна-бытавая культура, звычаі ўзаемадапамогі, | • *музычныя інструменты*: скрыпка, бубен, дудка, цымбалы, дзіцячыя музычныя забаўкі з прыродных, пабытавых і гаспадарчых рэчаў;<br>• *культавыя прадметы* і рэлігійныя збудаванні, святыні, крыжы, могілкі;<br>• *сродкі прыродакарыстання:* бортніцкія, паляўнічыя, рыбалавецкія прылады, прыстасаванні для збору грыбоў і ягад;<br>• *ганчарныя вырабы* і прылады працы, спецыфіка ўпрыгожання і выкарыстання;<br>• *вырабы з жалеза* і сродкі яго апрацоўкі, кузня і яе абсталяванне;<br>• *жывёлагадоўля*, апрацоўка скуры і скураныя вырабы. | цэнтры ганчарства (Парычы, Юравічы, Лоеў);<br>• *апрацоўка воўны і раслінных валокнаў*, прадзенне, ткацтва, выбельванне і фарбаванне палатна, пашыў адзення і яго рэгіянальнае аздабленне;<br>• *выраб і апрацоўка скуры*, пашыў кажухоў, галаўных убораў, абутку і прадметаў адзення са скуры;<br>• *выраб і настройка музычных інструментаў* (скрыпка, бубен, дудка, рог), інструментаў з прыродных матэрыялаў і гаспадарчых рэчаў;<br>• *вытворчасць і апрацоўка жалеза*, кавальства, слясарная справа, медніцтва і бляхарства. | *матэрыялаў* (дрэва, гліна, лён, воўна, лаза, салома, бяроста, рагоз, дранка) для вырабу прадметаў сямейнага і дзіцячага побыту: калысак, хадункоў, дзіцячых цацак, кошыкаў, посуду і інш.;<br>• *прырода як выток народнага мастацтва* і народнага разумення прыгажосці;<br>• *прырода як крыніца жыццезабеспячэння* і матэрыяльнага дабрабыту. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| патрабаванні да выхавання дзяцей і інш.;<br>• *рэлігійныя ўяўленні і вераванні*: маленні, просьбы, прысяганні, адносіны да царквы, уяўленні пра Бога, Анёлаў, Святых, нячыстую сілу, чалавечую душу, народнае разуменне граху. | | | |

## 2.4 Мадэль рэгіянальнага выхавання і яе выхаваўчы патэнцыял

Канцэптуальныя асновы народнай педагогікі Мазырскага Палесся прадстаўлены ў выглядзе мадэлі рэгіянальнага выхавання, якая дэманструе цыклічнасць выхаваўчага працэсу і ўзаемазалежнасць яго асноўных кампанентаў. У падмурку мадэлі – умовы нараджэння ідэальнага дзіцяці, паколькі па мясцовых уяўленнях, здаровае дзіця неабходна нарадзіць, а затым удасканаліць дадзенае прыродай. Ідэал і рэальна дасягнутая мэта выхавання адлюстроўваюць поўны выхаваўчы цыкл – жыццё чалавека ад нараджэння да смерці, у якім закладзена магчымасць далейшага ўвасаблення ў дзецях і ўнуках. Пры гэтым рэалізацыя жыццёвага патэнцыялу абумоўлена комплексным уплывам унутраных, знешніх і ірацыянальных фактараў. Выхаваўчае ўздзеянне залежыць ад узроставых перыядаў развіцця, сярод якіх найбольш адказным лічыцца перыяд унутрыўтробнага развіцця і нованароджанасці.

Змястоўнае напаўненне і ажыццяўленне выхаваўчага працэсу вызначаецца рэгіянальным разуменнем сутнасці паняцця “народнае выхаванне”. Народнае выхаванне на Мазырскім Палессі – гэта сістэма арганізацыі гадавання, навучання, нагляду, дзе гадаванне – забеспячэнне фізічнага і духоўнага развіцця дзяцей у сям’і да паўналецця, уступлення ў шлюб; навучанне – працэс набыцця жыццёва-практычнага вопыту і рэгіянальнага светапогляду ў сям’і, сацыяльным асяроддзі; нагляд – кантроль і ацэнка штодзённых паводзін, учынкаў і выказванняў выхаванца ў сям’і або соцыуме ў адпаведнасці з маральнымі патрабаваннямі. У змесце народнага выхавання, па-сутнасці, рэалізуюцца два асобныя працэсы: выхаванне хлопчыка, будучага мужчыны і выхаванне дзяўчынкі, будучай жанчыны. Сярод структурных кампанентаў зместу вядучым з’яўляецца маральнае выхаванне, паколькі менавіта народная мараль рэгулюе сацыяльнае і асабістае жыццё.

Цэнтральнае, звязуючае звяно – прынцыпы народнай педагогікі Мазырскага Палесся – патрабаванні да арганізацыі выхаваўчай дзейнасці, ад якіх залежыць рэалізацыя зместу, выбар метадаў, форм і сродкаў выхавання, і сярод якіх асноўным з’яўляецца прынцып цыклічнасці.

Метады выхавання выкарыстоўваюцца для ажыццяўлення мэтанакіраванага або ўскоснага ўзаемадзеяння, пры гэтым рэгіянальную адметнасць вызначаюць метады эмацыянальна-магічнага ўздзеяння, якія абапіраюцца на прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага. У якасці сродкаў выхавання выступае традыцыйная (духоўная і матэрыяльная) культура рэгёна, родная прырода, праца і працоўныя заняткі мясцовага

насельніцтва, як самастойныя феномены народнага выхавання Сукупнасць метадаў і сродкаў рэалізуецца ў традыцыйных формах выхавання, што забяспечваюць індывідуальнае і калектыўнае развіццё і сацыялізацыю асобы (Гл. малюнак 1).




**Малюнак 1 – Мадэль рэгіянальнага выхавання ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся**

Выкарыстанне выхаваўчага патэнцыялу народнай педагогікі Мазырскага Палесся ў сучасных умовах мэтазгодна ажыццяўляць праз рэгіянальны кампанент зместу адукацыі і выхавання. Звязуючымі звеннямі паміж народным выхаваннем і сучасным вучэбна-выхаваўчы працэсам з’яўляюцца сям’я і сямейныя традыцыі, сацыяльнае акружэнне і грамадскія традыцыі, а таксама такі адносна пастаянны паказчык, як прырода роднага краю, што аказвае фізічнае і псіхалагічнае ўздзеянне на кожнага, хто нарадзіўся і пражывае ў пэўным прыродным асяроддзі.

Рэгіянальны кампанент зместу адукацыі і выхавання прадугледжвае: засваенне сістэмы ведаў аб мясцовай культуры; набыццё вопыту практычнай дзейнасці; авалоданне спосабамі дзейнасці ў галіне рэгіянальнай культуры, яе эмацыянальна-творчае асваенне, у выніку чаго адбываецца маральна-духоўнае развіццё асобы, перадача менталітэту.

У школе рэгіянальны кампанент зместу адукацыі і выхавання можа быць рэалізаваны ў наступных вядучых накірунках: дашкольнае выхаванне; змест вучэбных прадметаў і факультатываў; прафарыентацыя, перадача практычнага вопыту рэгіянальнай працоўнай дзейнасці; выхаваўчая работа і арганізацыя вольнага часу на аснове форм народнай педагогікі; навукова-даследчая дзейнасць школьнікаў і студэнтаў.

Адзін са шляхоў удасканалення работы школы – умацаванне міжпрадметных сувязей, стварэнне стройнай сістэмы падачы фальклорнага матэрыялу з улікам пераемнасці. Звесткі аб рэгіянальнай культуры Мазырскага Палесся, прыродным асяроддзі, народных рамёствах і промыслах можна паспяхова дапасаваць да пэўных праграмных тэм па біялогіі, геаграфіі, гісторыі, матэматыцы, працоўнаму навучанню, роднай мове і літаратуры, выяўленчаму і музычнаму мастацтву (выкарыстанне мясцовага фальклору, навучанне ігры на музычных інструментах, распаўсюджаных у дадзеным рэгіёне) (Дадатак Б). Народны вопыт актуальны ў прафарыентацыі і працоўным выхаванні, падрыхтоўцы да жыцця з улікам сямейных традыцый. Перспектыўным з’яўляецца працоўнае навучанне на аснове народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народных рамёстваў і промыслаў, характэрных для рэгіёна Мазырскага Палесся. Істотна знаёмства з дзейнасцю народных майстроў не толькі ў тэарэтычным, але і практычным плане, удзел моладзі ў народных працоўных святах і абрадах. Функцыі школьных цэнтраў рамяства могуць выконваць краязнаўчыя музеі, якія сёння з’яўляюцца пераважна сховішчам прадметаў матэрыяльнай культуры, што дапаможа паглыбіць рэгіянальны кампанент у змесце адукацыі і выхавання (Дадатак В).

Вывучэнне мясцовых выхаваўчых традыцый актуальна пры падрыхтоўцы будучых настаўнікаў для школ Палескага рэгіёна. Большасць студэнтаў педуніверсітэта з'яўляецца патэнцыяльнымі носьбітамі традыцыйнай культуры рэгіёна, але недастаткова ўсведамляюць яе каштоўнасць, не бачаць магчымасцей выкарыстання ў прафесійнай дзейнасці па выбранай спецыяльнасці. Засваенне педагагічнай спадчыны сваёй малой радзімы будзе садзейнічаць павышэнню этнапедагагічнай кампетэнтнасці маладых педагогаў (Дадатак Г).

Самастойная навукова-даследчай работа ў галіне рэгіянальнай этнапедагогікі можа быць рэалізавана ў некалькіх асноўных напрамках. Па-першае, гэта тэарэтычныя даследаванні, вынікі якіх могуць быць выкарыстаны пры напісанні рэфератаў і дакладаў, курсавых і дыпломных работ, тэзісаў для ўдзелу ў студэнцкіх навуковых канферэнцыях, распрацоўцы праектаў і асобных тэм. Па-другое, шляхам арганізацыі эмпірычных даследаванняў, якія могуць уключаць удзел у краязнаўчых экспедыцыях, практычную работу па збору фальклорных і этнапедагагічных матэрыялаў у рэгіёне Мазырскага Палесся ад мясцовых жыхароў, даследаванне прадметаў народнага побыту (Дадатак А). Трэці напрамак – уключэнне этнапедагагічных матэрыялаў ва ўласную практычную выхаваўча-педагагічную дзейнасць пры праходжанні вытворчых практык. Студэнтамі могуць распрацоўвацца канспекты нестандартных урокаў, сцэнарыі пазакласных мерапрыемстваў на аснове народных святаў і абрадаў. Такая дзейнасць дапоўніць і актывізуе тэарэтычнае асэнсаванне і практычнае выкарыстанне традыцый народнай педагогікі. Адпаведна народныя формы выхавання, пераасэнсаваныя з улікам сучасных патрабаванняў, знойдуць прымяненне пры арганізацыі навучальнага працэсу і вольнага часу моладзі.

Матэрыялы дадзенай працы могуць быць выкарыстаны ў вышэйшых педагагічных навучальных установах пры вывучэнні курсаў народнай педагогікі, у працэсе абнаўлення зместу навучання, скласці змест спецкурса ці спецсемінара, расшыраць змест, метады і формы работы са студэнтамі пры вывучэнні спецкурсаў па народнай педагогіцы (Дадатак Д). Вывады, палажэнні і фактычны матэрыял будуць карыснымі пры выданні навуковай і вучэбна-метадычнай літаратуры, пры складанні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па этнапедагогіцы, гісторыі педагогікі. Змест псіхолага-педагагічных дысцыплін мэтазгодна ўзбагачаць этнапедагагічным матэрыялам, звесткамі аб прынцыпах, метадах і сродках народнага выхавання. Пры вывучэнні курса гісторыі педагогікі – паказваць уклад беларускага народа ў развіццё тэорыі і практыкі агульначалавечага

выхаваўчага вопыту. Такім чынам, адладжаная жыццём і часам народна-выхаваўчая сістэма Мазырскага Палесся можа выкарыстоўвацца для ўзбагачэння тэорыі і практыкі сучаснага працэсу выхавання, яго мадэрнізацыі на культураадпаведнай аснове, актуалізацыі традыцыйных сямейных каштоўнасцей (Гл. малюнак 2).




**Малюнак 2 – Выкарыстанне выхаваўчага патэнцыялу народнай педагогікі Мазырскага Палесся ў сучасных умовах**

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што на працягу культурна-гістарычнага развіцця ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся склалася наступная сукупнасць прынцыпаў выхавання: прыродазгоднасці, цыклічнасці, сувязі з працай, адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага ў выхаванні, культуразгоднасці. Яны абапіраліся на заканамернасці традыцыйнага ладу жыцця, якія мелі пастаянна-сістэмны характар: а) узаемасувязь чалавека і прыроды, сусвету; б) цыклічнасць прыроднага, гаспадарчага і сацыяльнага быцця і фальклору; в) жыццё ў працы, натуральны характар гаспадаркі; г) пераемнасць традыцый, кансерватызм, культ продкаў; д) адзінства духоўнага і матэрыяльнага, рацыянальнага і ірацыянальнага ў жыцці.

Прынцып прыродазгоднасці – патрабаванне выхоўваць дзіця ў адпаведнасці з індывідуальнымі і полаўзроставымі асаблівасцямі, характарам прыроды і рэгіянальнай працоўнай дзейнасці. Фактар спадчыннасці ўлічваецца не толькі ў сферы фізічнага развіцця, але і духоўнага станаўлення асобы.

Арганізацыя выхавання адбывалася ў адпаведнасці з прынцыпам цыклічнасці: прыроднымі і біялагічнымі цыкламі, працоўнымі і грамадскімі працэсамі, што гарантавала паступовасць фарміравання асобы. Састаўная частка жыццёвага цыклу – узроставыя перыяды развіцця дзіцяці, якія адлюстроўваюць рэгіянальную спецыфіку выхавання, што характарызавалася ўвагай да ранніх этапаў развіцця.

Прынцып сувязі з працай увасабляе лепшыя традыцыі народнай педагогікі Мазырскага Палесся: пачатак працоўнага выхавання ад нараджэння адпаведна полу дзіцяці, апора на спадчынныя задаткі і інтарэсы, дзейсны характар выхавання, шырокае азнаямленне з рэгіянальнымі працоўнымі заняткамі і рамёствамі, высокая ацэнка якасцей працоўнага чалавека.

Прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага садзейнічае фарміраванню псіхічна і фізічна здаровага дзіцяці на ранніх этапах развіцця, замацаванню эмацыянальнай сувязі з продкамі, родным домам, сусветам. Праз рэгіянальную сістэму абрадаў адбываецца далучэнне нованароджанага да соцыуму, аказваецца ўздзеянне сугестыўнага характару з мэтай спрыяць шчасліваму лёсу, правільнай палавой арыентацыі.

Адпаведна прынцыпу культуразгоднасці патрабуецца ўзгадняць характар выхаваўчага ўздзеяння з акружаючай прыродай, побытам і ладам жыцця, народнымі звычаямі, характарыстыкамі роднай мовы, менталітэтам карэнных жыхароў, асаблівасцямі сацыялізацыі асобы. Падмуркам прынцыпу

выступаюць рэгіянальныя традыцыі (выхаваўчыя, маральныя, побытавыя, гаспадарчыя, мастацкія, арганізацыі вольнага часу і інш.), якім уласцівы даўгавечнасць, масавасць, пераемнасць.

Метады традыцыйнага выхавання аб'яднаны ў тры асноўныя групы: практычныя, вербальныя, метады эмацыянальна-магічнага ўздзеяння. Асноўным вербальным метадам выхавання з'яўляецца метад пераканання, які мог рэалізоўвацца ў форме ацэнкі, павучання, тлумачэння, гутаркі, заахвочвання, асуджэння, угаворвання, пажадання, грамадскай крытыкі. Улічваўся не толькі змест, але і эмацыянальны бок выказвання. Культура асобы на Мазырскім Палессі ў значнай ступені выпрацавана з дапамогай практычных метадаў выхавання: пераймання, паўтарэння, практыкавання і прывучэння, групавога і індывідуальнага спаборніцтва, выпрабавання, прыкладу. Адметнасць рэгіянальнаму выхаванню надаюць метады эмацыянальна-магічнага ўздзеяння, якія абапіраюцца на светапогляд і лад жыцця.

На аснове аналізу этнаграфічных і фальклорных даследаванняў сістэматызаваны формы народнай педагогікі Мазырскага Палесся: па колькасці ўдзельнікаў – індывідуальныя, мікрагрупавыя, групавыя (калектыўныя) і масавыя; па палавой прыкмеце – хлапечыя (мужчынскія), дзявочыя (жаночыя) і змешаныя; па ўзроставаму складу – аднаўзроставыя, рознаўзроставыя і шматпакаленныя; адпаведна цыклічнасці фальклору і традыцыйнага ладу жыцця: па-першае, абумоўленыя цыклам сямейна-бытавых звычаяў і абрадаў, па-другое, цыклам каляндарна-земляробчых звычаяў і абрадаў. Установлена, што пераважалі формы групавыя, калектыўныя: народныя звычаі, абрады і святы, а таксама іх складаемыя – харавыя калектывы, карагоды, гульні, аб'яднанні моладзі. Найбольшае пашырэнне ў рэгіёне мелі вячоркі, дзе моладзь праходзіла школу грамадскага выхавання. Індывідуальныя формы рэалізоўваліся ў сям'і. Асобна вылучаны валачобны абрад як рэгіянальна адметная форма ўстанаўлення адносін паміж бацькамі, дзецьмі і іх грамадскімі выхавальнікамі, у адрозненні ад агульнабеларускай традыцыі. Вызначаны сродкі народнага выхавання: традыцыйная (матэрыяльная і духоўная) культура беларусаў-палешукоў, праца і працоўныя заняткі, родная прырода.

Узаемадзеянне ўсіх вышэй ахарактарызаваных кампанентаў выхаваўчага працэсу прадстаўлена ў выглядзе мадэлі рэгіянальнага выхавання, якая ўзнаўляе жыццёвы цыкл і раскрывае канцэптуальныя асновы народнай педагогікі Мазырскага Палесся. Мадэль паказвае, што хаця метадалагічныя асновы выхавання і не былі асэнсаваны народам тэарэтычна,

але пры гэтым на Мазырскім Палессі існавала агульнапрынятая, самаарганізаваная і самабытная выхаваўчая сістэма рэгіянальнага характару, якая адпавядала менталітэту і жыццёвым запатрабаванням мясцовага насельніцтва. Вызначаны асноўныя шляхі выкарыстання выхаваўчага патэнцыялу народнай педагогікі Мазырскага Палесся ў сучасных умовах: праз рэгіянальны кампанент зместу адукацыі і выхавання, актуалізацыю сямейных, грамадскіх і працоўных традыцый.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

На аснове аналізу духоўнай і матэрыяльнай культуры Мазырскага Палесся ў працы рэканструяваны народны выхаваўчы ідэал, ахарактарызаваны мэта і змест выхавання. Народны выхаваўчы ідэал адлюстроўвае грамадскую ацэнку заслуг не толькі індывіда, але сям'і і роду ў цэлым, пры гэтым абапіраецца на менталітэт і нацыянальны характар карэнных жыхароў Мазырскага Палесся, для якіх характэрны наступныя асаблівасці: жыццёва-матывацыйныя (працавітасць, гаспадарлівасць, кансерватызм, імкненне да ладу, спрадвечнага парадку, патрабавальнасць у адносінах да дзяцей, пачуццё мясцовага патрыятызму, адданасць роду і сям'і, асабістая сціпласць, рэалістычныя адносіны да жыцця і смерці); эмацыянальна-валявыя (цярплівасць, цягавітасць, настойлівасць, сіла волі, эмацыянальная стрыманасць, мяккасардэчнасць, развітая інтуіцыя, багатае ўяўленне, творчыя здольнасці, любоў да народнага мастацтва); інтэлектуальна-пазнаваўчыя (добрая памяць, прыродны, практычна-скіраваны розум, назіральнасць, самастойнасць, схільнасць да іроніі і самаіроніі, рэлігійнасць, вера ў ірацыянальнае, сумленнасць, праўдзівасць, прынцыповасць, глыбіня маральных пачуццяў); камунікатыўныя (гасціннасць, таварыскасць, самаахвярнасць, калектывізм, камунікабельнасць, узаемадапамога, даверлівыя адносіны да акружаючых, цярпімасць, сціпласць, замкнёнасць, недаверлівасць да малазнаёмых, асцярожнасць у выказваннях).

У народнай педагогіцы прадстаўлены два ўзаемазалежных ідэалы – хлопца (мужчыны) і дзяўчыны (жанчыны), што мелі выражаную полаўзроставую дыферэнцыяцыю. Мэта народнага выхавання – шматбаковае развіццё і выхаванне дзіцяці на аснове рэгіянальнай культуры ў выніку чаго ажыццяўляецца падрыхтоўка да жыцця і асноўных сацыяльных роляў (сына або дачкі, мужа або жонкі, гаспадара або гаспадыні) і адбываецца ўвасабленне народнага ідэалу ў рэальных асобах – юнака або дзяўчыны. Змест народнага выхавання – гэта сацыяльны вопыт папярэдніх пакаленняў, які ўключаў маральнае, разумовае, працоўнае, фізічнае, экалагічнае, эстэтычнае развіццё асобы на працягу ўсяго жыцця. Рэгіянальныя адрозненні зместу выхавання вызначаюцца: выразным полаўзроставым раздзяленнем; прыярытэтам маральнага выхавання, што выступае рэгулятарам выхаваўчай дзейнасці і ўзаемаадносін; высокай ацэнкай прыроднага, практычнага розуму; адзінствам працоўнага і фізічнага развіцця; экалагічнага выхавання на аснове фарміравання глыбокай павагі да роднай зямлі, вуснага засваення

дзецьмі народнага календара і спосабаў прыродакарыстальніцкай дзейнасці; эстэтычнага – патрабавальнасцю палешукоў да эстэтычна-мастацкага і эстэтычна-працоўнага развіцця моладзі, любоўю да народнай музыкі і песні. Нягледзячы на пэўную гістарычную і лакальна-тэрытарыяльную зменлівасць зместу народнага выхавання, можна канстатаваць яго адносную ўстойлівасць у рамках традыцыйнай культуры рэгёна.

На аснове шматлікіх крыніц станоўлены і навукова абгрунтаваны рэгіянальна адметныя патрабаванні да выхаваўчай дзейнасці, прынцыпы народнай педагогікі Мазырскага Палесся.

Прынцып прыродазгоднасці – гэта патрабаванне ўспрыняцця дзіцяці, па-першае, як часткі сусвету, па-другое, як часткі акружаючай прыроды; неабходнасць улічваць, што людзі ад нараджэння няроўныя ў сваіх магчымасцях; абапірацца ў выхаванні на генатып, спадчыннасць, прыналежнасць да пэўнага роду, сям'і; выбіраць характар уздзеяння ў адпаведнасці з узростам і полам выхаванца; ажыццяўляць усебаковае развіццё асобы на аснове сістэматычнага ўзаемадзеяння з навакольным асяроддзем.

Прынцып цыклічнасці – патрабаванне паступовага, упарадкаванага характару выхаваўчага ўздзеяння, адпаведна ўзроставаму развіццю дзіцяці (перыяд унутрыўтробнага развіцця і нованароджанасці (першы этап: ад зачацця да 40 дзён; другі этап: ад 40 дзён да 1 года); перыяд маленства, кармлення грудзьмі (ад нараджэння да 1–3 гадоў); перыяд дзяцінства (3–9); падлеткавы ўзрост (10–14); маладосць, маладыя гады (15–20) і кругазвароту, цыклічнасці быцця: прыроднай (зіма-лета-восень-вясна); астранамічнай (сонечны і месячны цыклы); часавай (дзённы, сутачны, тыднёвы цыклы); сельскагаспадарчай (сяўба – выспяванне ўраджаю – жніва – апрацоўка і яе этапы); мастацкай (каляндарна-абрадавая і сямейна-абрадавая паэзія); рэлігійна-побытавай (будні і святы, пасты і мясаеды); жыццёва-біялагічнай (ад зачацця, нараджэння да смерці і ўваскрашэння ў дзецях і ўнуках); сямейнай (вяселле – нараджэнне дзяцей – выхаванне дзяцей – замужжа, жаніцьба – гадаванне ўнукаў, догляд састарэлых бацькоў); міжпакаленнай (бацька – сын – дзед – унук); родавай (продкі – сучаснікі – нашчадкі); сацыяльнай (халасты – жанаты – удавец) і інш.

Прынцып сувязі з працай – гэта патрабаванне мэтанакіраванасці і сістэматычнасці працоўнага выхавання; вызначэння будучых працоўных заняткаў з першых хвілін жыцця; выкарыстання імкнення дзяцей да дзейнасці, прыроднай актыўнасці і цікаўнасці; сувязі працоўнага выхавання з вырашэннем рэальных жыццёвых праблем (дабрабыт сям'і, падрыхтоўка

пасагу); шырокага азнаямлення дзяцей з асноўнымі відамі працы ў рэгіёне з улікам полу і ўзросту, сямейных традыцый, спадчынных задаткаў і індывідуальных інтарэсаў.

Прынцып адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага – патрабаванне спалучаць рэальны выхаваўчы вопыт з інтуіцыяй, рэлігійнымі ўяўленнямі; улічваць, што на фарміраванне дзіцяці і яго далейшы лёс могуць аказаць уздзеянне не толькі матэрыяльныя фактары, але і адпаведны стан прыроды, эмацыянальны настрой блізкіх, станоўчыя або адмоўныя пажаданні прысутных, правільнасць выканання абрадаў і рэкамендацый народнай медыцыны.

Прынцып культуразгоднасці – патрабаванне забяспечваць эфектыўнасць выхавання, абапіраючыся на рэгіянальныя звычаі і традыцыі; умацоўваць сямейна-родавыя сувязі; перадаваць інтэлектуальны, жыццёва-практычны, гаспадарчы, мастацка-эстэтычны вопыт з пакалення ў пакаленне.

Устойлівасць прынцыпаў народнай педагогікі, якія вынікаюць з агульных заканамернасцей традыцыйнага ладу жыцця, дапамагала дабівацца эфектыўных вынікаў у фарміраванні канкрэтнага тыпу асобы, забяспечвала прасякнутасць выхаваўчым кантэкстам усіх сфер жыццядзейнасці.

У выніку вывучэння народнай педагогікі Мазырскага Палесся раскрыты выхаваўчыя магчымасці і сістэматызаваны метады, формы і сродкі традыцыйнага выхавання. Выяўлена, што ў народнай педагогіцы ўжываліся ўзаемадапаўняльныя групы метадаў выхавання: вербальныя, практычныя, эмацыянальна-магічнага ўздзеяння, якія садзейнічалі ажыццяўленню мэтанакіраванага або ўскоснага выхаваўчага ўзаемадзеяння. Уплыў на розум, пачуцці і волю выхаванца ажыццяўляўся з дапамогай славесных, вербальных метадаў: перакананне, павучанне, гутарка, грамадская думка, заахвочванне, папярэджанне, высмейванне і асуджэнне і інш. Эфектыўнасць выхаваўчага працэсу забяспечвалі практычныя метады і прыёмы: паказ, назіранне, паўтарэнне, даручэнне, заданне, практыкаванне, прывучэнне, станоўчы і адмоўны прыклад, групавое і індывідуальнае спаборніцтва, выпрабаванне, што абапіраліся на багатыя працоўныя, побытавыя і рэлігійныя традыцыі беларусаў-палешукоў. Метады эмацыянальна-магічнага ўздзеяння вызначалі адметнасць народнай выхаваўчай практыкі: добрае і ліхое пажаданне, папрок, ганьбаванне, абзыванне, дражненне, клятва і прысяганне, праклён, адрачэнне, запалохванне, пагроза, малітва, пакаянне, павер'і, забароны. Выбар канкрэтных метадаў абумоўлены ўзростам і полам дзяцей, іх індывідуальнымі асаблівасцямі і ў пэўнай ступені кантраляваўся грамадскай думкай: асуджаліся празмерная распешчанасць, крадзёж, непавага да бацькоў

і старэйшых. У адносінах да малодшай узроставай групы ўжываліся метады ўгаворвання, пераключэння ўвагі, адухаўлення, запалохвання; старэйшых – перакананне, даручэнне, патрабаванне, пагроза, фізічнае пакаранне і інш.

Сацыялізацыі асобы садзейнічалі традыцыйныя формы народнага выхавання, якія па колькасці ўдзельнікаў маглі быць – індывідуальнымі, мікрагрупавымі, групавымі (калектыўнымі) і масавымі; па ўзроставаму складу – аднаўзроставымі, рознаўзроставымі і шматпакаленнымі; па палавой прыкмеце – хлапечымі, дзявочымі або змешанымі. Выяўлена абумоўленасць спецыяльна арганізаваных форм выхавання, па-першае, цыклам сямейна-бытавых (радзіны, адведкі, хрысціны, абмен валачобным, комплекс вясельных абрадаў, пахавальны абрад, Радаўніца, Дзяды, гасцяванне); па-другое, цыклам каляндарна-земляробчых звычаяў і абрадаў (Каляды, Стрэчанне, Сарокі, Вялікдзень, Тройца, Купалле, Жніва, Спас). Адметнасць рэгіянальных форм выхавання праяўляецца ў змесце мясцовых звычаяў і абрадаў; месцы арганізацыі; полаўзроставым складзе ўдзельнікаў; існаванні мясцовых абрадаў, прысвечаных сям'і і дзецям; пашырэнні шматпакаленных форм узаемаадносін; масавым утварэнні маладзёжных творчых калектываў.

У якасці сродкаў выхавання выступае традыцыйная культура рэгіёна. Асобна вылучана родная прырода, паколькі яна не створана чалавекам, але з'яўляецца асновай яго існавання. Праца і працоўныя заняткі мясцовага насельніцтва знаходзяцца ў кантэксце як матэрыяльнай, так і духоўнай культуры, уяўляюць сабой практычную школу жыцця. Традыцыйным метадам, формам і сродкам выхавання ўласцівы масавасць, сінкрэтызм выхаваўчага ўздзеяння.

На аснове абагульнення значнага аб'ёму інфармацыі і абраных метадалагічных падыходаў распрацавана мадэль рэгіянальнага выхавання асобы ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся, вызначаны канцэптуальныя асновы выхавання. Мадэль з'яўляецца цыклічнай і ўключае наступныя сістэмаўтваральныя кампаненты: умовы нараджэння ідэальнага, здаровага дзіцяці; ідэал і мэта выхавання; фактары развіцця асобы; узроставыя перыяды развіцця дзіцяці; сутнасць народнага выхавання; змест выхавання; прынцыпы выхавання; метады выхавання; формы выхавання; сродкі выхавання. Характар іх змястоўнага напаўнення і ўзаемадзеяння раскрывае спецыфіку рэгіянальнай выхаваўчай практыкі, якая абапіралася на інтуіцыю, жыццёва-практычны вопыт і перадавалася вусна з пакалення ў пакаленне.

Выяўлены выхаваўчы патэнцыял народнай педагогікі Мазырскага Палесся ў сучасных умовах і ўстаноўлены яе рэгіянальныя адметнасці:

асаблівасці выхаваўчага ідэалу і менталітэту беларусаў-палешукоў; уздзеянне на фарміраванне асобы знешніх, унутраных і ірацыянальных фактараў; полаўзроставая дыферэнцыяцыя зместу выхавання пры прыярытэтнай ролі народнай маралі; цыклічнасць выхаваўчага працэсу; самабытная ўзроставая перыядызацыя; адзінства рацыянальнага і ірацыянальнага ў выхаванні; выкарыстанне метадаў эмацыянальна-магічнага ўздзеяння; мясцовыя формы і сродкі выхавання (валачобны абрад, вячоркі, народны каляндар, бортніцтва).

Можна зрабіць вывад, што падыходы да выхавання асобы ў народнай педагогіцы Мазырскага Палесся па сваёй сутнасці некалькі адрозніваліся ад агульнапрынятых у сучаснай педагагічнай навуцы (фактар спадчыннасці, метады выхавання, асаблівасці сацыялізацыі асобы, разуменне прадвызначэння чалавека), але давалі станоўчы выхаваўчы эфект і ў цэлым развіваліся ў агульным рэчышчы выхаваўчых прыярытэтаў беларускай народнай педагогікі, пры гэтым адлюстроўваючы спецыфіку рэгіёна.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

### Спіс інфарматараў

1. Абрамчук Ульяна Віктараўна, 1912 г.н., в. Заводны Востраў Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. Сычова І.С.

2. Акуліч Надзея Леанідаўна, 1935 г.н., в. Прыбаловічы Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 5 курса 1 гр. ф-та тэхналогіі МДПУ імя І.П. Шамякіна Дзекавец Надзея.

3. Анціпенка Любоў Іванаўна, 1949 г.н., в. Гажын Нараўлянскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 1 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Ліпаўскіх Надзея.

4. Астаповіч Алена Міхайлаўна, 1940 г.н., в. Мілашавічы Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 1 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Бачкарова Юлія.

5. Ахраменка Антаніна Цімафееўна, 1923 г.н., в. Міхайлаўская Рудня Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2009 г. студ. 5 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Радаўня Валянціна.

6. Бабына Ева Мітрафанаўна, 1920 г.н., в. Булаўкі Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Гулевіч Ірына.

7. Багданік Іван Цімафеевіч, 1938 г.н., в. Бабры Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Каўтуненка Таццяна.

8. Бойка Вольга Аляксееўна, 1944 г.н., г. Мазыр Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 8 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Андрусевіч Наталля.

9. Брышэвіч Кацярына Сяргееўна, 1921 г.н., в. Глушкавічы Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 2 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Кавалевіч Таццяна.

10. Буцук Юлія Іванаўна, 1934 г.н., в. Кабачок Петрыкаўскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 5 курса 1 гр. ф-та тэхналогіі МДПУ імя І.П. Шамякіна Марцінкевіч Лідзія.

11. Гаўрылавец Аксіння Фамінічна, 1932 г.н., в. Баравое Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 2 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Гвозд Наталля.

12. Гурын Вольга Васільеўна, 1934 г.н., в. Маркаўскае Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 8 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Навіцкая Людміла.

13. Гусак Таццяна Паўлаўна, 1930 г.н., в. Іванкаўшчына Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 1 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Чумакова Наталля.

14. Дамбоўская Яўгенія Антосеўна, 1931 г.н., в. Астражанка Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 5 курса 1 гр. ф-та тэхналогіі МДПУ імя І.П. Шамякіна Кляцкова Наталля.

15. Ермакавец Надзея Апанасаўна, 1926 г.н., в. Барыскавічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2006 г. Сычова І.С.

16. Жогла Вольга Антонаўна, 1940 г.н., в. Буйнавічы Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2009 г. студ. 5 курса 1 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Ражалоўская Валянціна.

17. Забенка Антаніна Іванаўна, 1932 г.н., в. Бабруйкі Ельскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2009 г. студ. 5 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Жук Святлана.

18. Змушко Алена Паўлаўна, 1938 г.н., Змушко Аляксей Міхайлавіч, 1932 г.н., г. Калінкавічы Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 2 курса 3 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Нарэзька Ганна.

19. Зубар Марыя Аляксееўна, 1889 г.н., Запіс захоўваецца ў краязнаўчым аддзеле Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А.С. Пушкіна г. Мазыра.

20. Ільіна Надзея Рыгораўна, 1930 г.н., в. Буйнавічы Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 1 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Кананові Таццяна.

21. Кадол Зінаіда Яўсееўна, 1939 г.н., в. Мялешкавічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 7 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Назарчук Ірына.

22. Калацэй Дар’я Лук’янаўна, 1935 г.н., г. Мазыр Гомельская вобл. Запісала ў 2005 г. Сычова І.С.

23. Калацэй Надзея Мікалаеўна, 1924 г.н., в. Махнавічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 2 курса 3 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Шруб Наталля.

24. Канопліч Пётр Фёдаравіч, 1921 г.н., в. Махнавічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. Сычова І.С.

25. Канопліч Фёдар Кірылавіч, 1905 г.н., в. Махнавічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісаў у 2008 г. студ. 5 курса 4 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Канопліч Васіль.

26. Кліменка Кацярына Сцяпанаўна, 1935 г.н., в Дзёрнавічы Нараўлянскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2009 г. студ. 5 курса 1 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Фешчанка Вольга.

27. Козыр Ганна Ціханаўна, 1929 г.н., в. Барыскавічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісаў ў 2007 г. студ. 2 курса 8 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Акуліч Яўген.

28. Крысько Галіна Рыгораўна, 1940 г.н., в. Асавец Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2010 г. студ. 2 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Зданевіч Святлана.

29. Кузняцова Ніна Нікіфараўна, 1926 г.н., в. Навікі Мазырскі раён Гомельскай вобл. Запісала ў 2009 г. студ. 5 курса 4 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Жмур Алена.

30. Кузьменка Кацярына Мікалаеўна, 1944 г.н., в. Каменка Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2005 г. Сычова І.С.

31. Куліцкая Любоў Фёдараўна, 1940 г.н., в. Дворышча Хойніцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Паўленка Вераніка.

32. Купрэвіч Ганна Васільеўна, 1932 г.н., Купрэвіч Ніна Пятроўна, 1932 г.н., в. Пухавічы, Жыткавіцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2009 г. студ. 5 курса 4 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Акунец Марыя.

33. Лаўда Настасся Сцяпанаўна, 1914 г.н., в. Казловічы Калінкавіцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 1997 г. Сычова І.С.

34. Лепянская Надзея Іванаўна, 1925 г.н., в. Дзвіжкі Ельскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 4 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навучання МДПУ імя І.П. Шамякіна Шэлест Ірына.

35. Лісіцкі Іван Пятровіч, 1936 г.н., в. Мілашавічы Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Лісіцкая Алеся.

36. Лобан Ульяна Міхайлаўна, 1930 г.н., в. Паўлаўка Ельскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2005 г. Сычова І.С.

37. Маджар Алена Паўлаўна, 1932 г.н., в. Крукавічы Калінкавіцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2009 г. студ. 5 курса 3 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Картыннік Алена.

38. Мазановіч Галіна Аляксееўна, 1937 г.н., в. Лучажэвічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2006 г. Сычова І.С.

39. Малашчанка Марыя Пятроўна, 1929 г.н., в. Лозкі Калінкавіцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2009 г. студ. 5 курса 5 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч МДПУ імя І.П. Шамякіна Цыбуліч Аксана.

40. Маркоўская Марыя Іосіфаўна, 1910 г.н., в. Маркаўскае Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 8 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Навіцкая Людміла.

41. Мельчанка Алена Міхайлаўна, 1929 г.н., г. Мазыр Гомельская вобл. Запісаў у 2007 г. студ. 2 курса 8 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Акуліч Яўген.

42. Пінчук Кацярына Яўстрацеўна, 1918 г.н., в. Дворышча Хойніцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 2 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Паўленка Вераніка.

43. Пырко Вольга Данілаўна, 1925 г.н., в. Прудок Калінкавіцкі раён Гомельскай вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Плешкава Наталля.

44. Рабенок Марыя Дзмітрыеўна, 1936 г.н., в. Вялікі Бор Хойніцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 2 курса 3 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Буднік Анжэла.

45. Рамашэўская Алена Пятроўна, 1936 г.н., г. Петрыкаў Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 1 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Кушнярэвіч Валянціна.

46. Рачыцкая Ганна Афанасьеўна, 1937 г.н., в. Касцюковічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 5 курса 3 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Нікіценка Наталля.

47. Ручнова Аляксандра Лук'янаўна, 1921 г.н., в. Махнавічы Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. Сычова І.С.

48. Сыч Марыя Лук'янаўна, 1921 г.н., в. Рамязы Ельскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 5 курса 1 гр. ф-та тэхналогіі МДПУ імя І.П. Шамякіна Кніга Валерыя.

49. Тамашова Марыя Пятроўна, 1924 г.н., в. Антонаўка Нараўлянскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2005 г. Сычова І.С.

50. Хадакова Кацярына Лявонцьеўна, 1941 г.н., в. Агароднікі Калінкавіцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Рыжкова Марыя.

51. Цалка Ганна Рыгораўна, 1935 г.н., в. Дубраўка Ельскі раён Гомельская вобл. Запісалі ў 2007 г. студ. 2 курса 1 гр. ф-та тэхналогіі МДПУ імя І.П. Шамякіна Барысава Наталля, Сычова І.С.

52. Цімошчанка Адам Іванавіч, 1931 г.н., в. Каменка Мазырскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2005 г. Сычова І.С.

53. Шарай Таццяна Рыгораўна, 1915 г.н., в. Якімавічы Калінкавіцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 8 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Андрусевіч Наталля.

54. Шаўчук Кацярына Сямёнаўна, 1929 г.н., в. Малішаў Жыткавіцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 5 курса 3 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Шаўчук Таццяна.

55. Шмуйла Вера Яфімаўна, 1922 г.н., в. Сініцкае Поле Лельчыцкі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2008 г. студ. 2 курса 2 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Шмуйла Алена.

56. Яцухна Ніна Цярэнцьеўна, 1934 г.н., в. Камуна Ельскі раён Гомельская вобл. Запісала ў 2007 г. студ. 2 курса 7 гр. філалаг. ф-та завочнай формы навуч. МДПУ імя І.П. Шамякіна Крывушкіна Таццяна.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

57. Анталогія беларускага народнага анекдота і жарта / уклад. і прадм. А.С. Фядосіка. – Мінск : Ураджай, 2001. – 236 с.

58. Анталогія даўняй беларускай літаратуры : XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; падрыхт. А. І. Богдан [і інш.] ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 1014 с.

59. Алексеев, Э. Фольклор в контексте современной культуры / Э. Алексеев. – Москва : Сов. композитор, 1988. – 237 с.

60. Алексеева, Л.С. Эстетическое воспитание в русской народной педагогике : дис. … канд. пед. наук : 13.00.01 / Л.С. Алексеева. – Пятигорск, 2002. – 184 с.

61. Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост. : Э.К. Дорошевич, М.С. Мятельский, П.С. Солнцев ; Акад. пед. наук СССР. – Москва : Педагогика, 1986. – 460 с.

62. Аристова, У.В. Народное искусство (костюм) как средство эстетического воспитания школьников : автореф. дис.… канд. пед. наук : 13.00.02 / У.В. Аристова. – Москва, 1999. – 17 с.

63. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 120 с.

64. Арлова, Г.П. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы / Г.П. Арлова. – Мінск : ГВЗАТ “Маладняк”, 1995. – 160 с.

65. Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал. : В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 702 с.

66. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі : са старажытных часоў да 1917 г. / аўт. кал. : М.А. Ткачоў [і інш.]. – Мінск : Нар. асвета, 1985. – 464 с.

67. Барташэвіч, Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору / Г.А.Барташэвіч ; рэд. К.П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 168 с.

68. Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / С. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

69. Беларускі фальклор у сучасных запісах : традыцыйныя жанры : Гомельская вобласць / уклад. В.А. Захарава [і інш.]. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.

70. Беларускія народныя казкі / склад. : Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 480 с.

71. Беларускія народныя прыкметы і павер’і : у 3-х кн. / уклад. прадм., пер. і паказ. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996–1999.

72. Беларускія прыказкі, прымаўкі і фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі. – 3-е выд., дапрац. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.

73. Беларусы / рэдкал. : В.К. Бандарчык [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Бел. навука, 1999. – Т. 3 : Гісторыя этналагічнага вывучэння / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 365 с.

74. Беларусы / рэдкал. : В.К. Бандарчык [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Бел. навука, 2001. – Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 433 с.

75. Беларусы / рэдкал. : В.К. Бандарчык [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Бел. навука, 2001. – Т. 5 : Сям’я / В.К. Бандарчык [і інш.]. – 375 с.

76. Беларусы / рэдкал. : В.М. Бялявіна [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Бел. навука, 2002. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў [і інш.]. – 606 с.

77. Беларусы / рэдкал. : В.М. Бялявіна [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Бел. навука, 2004. – Т. 7 : Вусная паэтычная творчасць / Г.А. Барташэвіч [і інш.]. – 586 с.

78. Белов, В.И. Лад : очерки о народной эстетике / В.И. Белов. – Ленинград : Лениздат, 1984. – 349 с.

79. Бобр, А.Г. Мой Мозырь : исторический очерк / А.Г. Бобр. – Минск : ФОРТ, 1996. – Часть 1: С древнейших времен до 1917 года. – 162 с.

80. Болбас, В.С. Этыка-педагагічная думка Беларусі (са старажытнасці да XVIII ст.) / В.С. Болбас. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 260 с.

81. Болбас, В.С. Этычная педагогіка беларусаў / В.С. Болбас. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 175 с.

82. Боровский, А.Н. Цветут над Припятью сады (по родному краю) / А.Н.Боровский, Ю.М.Герасименко. – Минск : Полымя, 1987. – 64 с.

83. Валодзіна, Т. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія 1999. – 167 с.

84. Веснавыя песні / склад. : Г.А. Барташэвіч, Л.М. Салавей ; склад. муз. часткі В.І. Ялатаў ; рэд. тома К.П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.

85. Володина, Л.О. Духовно-нравственные ценности воспитания в русской семье во второй половине XIX – начале XX века (по материалам Вологодской губернии) : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.01 / Л.О.Володина. – Вологда, 2006. – 25 с.

86. Волков, Г.Н. О традициях чувашского народа в эстетическом воспитании / Г.Н. Волков. – Чебоксары : Чуваш. кн. изд-во, 1965. – 60 с.

87. Волков, Г.Н. Этнопедагогика : учеб. для студентов сред. и высш. пед. учеб. заведений / Г.Н. Волков. – Москва : Академия, 2000. – 176 с.

88. Выслоўі / склад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. М.Я. Грынблата ; рэд. тома А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.

89. Вяселле на Гомельшчыне : фальклорна-этнаграфічны зборнік / уклад., сістэм., тэксталаг. праца, уступ. арт., рэдаг. В.С. Новак [і інш.]. – Гомель : ЛМФ “Неман”, 2003. – 472 с.

90. Вяселле : абрад / рэд. тома : В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 683 с.

91. Голенков, В.В. Подход к индивидуализации обучения на основе исследования межполушарной асимметрии головного мозга / В.В. Голенков, В.Б. Филиппова //Адукацыя і выхаванне. – 1997. – № 10. – С. 35–47.

92. Гульні, забавы, ігрышчы / склад. А.Ю. Лозка. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 534 с.

93. Гусев, В.Е. Эстетика фольклора / В.Е.Гусев. – Ленинград : Наука, 1967. – 318 с.

94. Деревни и люди Мозырщины : историко-документальная хроника Мозырского района, всех сельских советов и населенных пунктов региона (деревень, поселков и хуторов) / сост. М.А. Копач. – Мозырь : КПУП “Колор”, 2001. – 152 с.

95. Десять отрывков, разнообразнаго историческаго содержанія (из сочиненія) Михалона Литвина “О нравах татар, литовцев и москвитянъ” // Архив историко-юридических сведений, относящихся до России, издаваемый Н. Калачовым. – Москва, 1854. – Кн. 2, отделение 3. – С. 1–78.

96. Дзіцячы фальклор / рэд. К.П. Кабашнікаў ; склад. : Г.А. Барташэвіч, В.І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.

97. Дзяржаўны занальны архіў у г. Мазыры. Ф. 80. Воп. 1. Спр. 397. л. 90.

98. Дистервег, А. Избранные педагогические сочинения / А. Дистервег ; состав. В.А. Ротенберг, общ. ред. проф. Е.Н. Медынского. – Москва : Учпедгиз, 1956. – 373 с.

99. Дубянецкі, Э.С. Беларускі нацыянальны характар : спроба даследавання / Э.С. Дубянецкі // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – № 5. – С. 29–39.

100. Жарты, анекдоты, гумарэскі / склад. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 438 с.

101. Живописная Россия : отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении : Литов. и Бел. Полесье : репринт. воспроизведение изд. 1882 г. ; 2-е изд. – Минск : БелЭн, 1994. – 550 с.

102. Жлоба, С.П. Народная педагогика Полесья : по материалам этнографических исследований / С.П. Жлоба. – Брест : Изд-во Брест. ун-та, 2002. – 328 с.

103. Жніўныя песні / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 816 с.

104. Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В.А Жучкевич. – Минск : Изд.-во БГУ, 1974. – 448 с.

105. Загадкі / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 448 с.

106. Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч ; рэдкал. : А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2000. – 597 с.

107. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі : Гомельская вобласць / рэдкал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : БелСЭ, 1985. – 383 с.

108. Земляробчы каляндар : абрады і звычаі / рэдкал. : А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

109. Исаенко, В.Ф. Древняя история Восточного Полесья / В.Ф. Исаенко. Минск : Полымя, 1975. – 32 с.

110. Кадол, Ф.У. Праблема выхавання годнасці асобы ў беларускім фальклоры і народнай педагогіцы / Ф.У. Кадол // Рэгіянальныя асаблівасці мовы, літаратуры і фальклору : тэз. дакл. і павед. V Рэсп. навук. канф. / УА “Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны” ; рэдкал. : А.А. Станкевіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Гомель, 1994. – С. 69–70.

111. Калачова, І.І. Ад добрага кораня – добры парастак : этнапедагагічныя традыцыі беларусаў у выхаванні дзяцей : дапам. для педагогаў дашк. устаноў. – Мінск : НМЦэнтр, 1999. – 128 с.

112. Каляндарна-абрадавая паэзія. Беларускі фальклор : жанры, віды, паэтыка : / А.С. Ліс, А.І. Гурскі, В.М. Шарая, У.М. Савіцкі ; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Бел. навука, 2001. – Кн. 1. – 515 с.

113. Касько, У.К. Палескі дзівасіл : бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі : са скарбніцы А. К. Сержпутоўскага / У.К. Касько. – Мінск : Выш. шк., 2005. – 383 с.

114. Касько, У.К. Святло далёкай зоркі / У.К. Касько. – Мінск: Універсітэцкае, 1997. – 319 с.

115. Касьяровіч, М. Для чаго і як вывучаць быт дзяцей / М. Касьяровіч // Наш край.– 1930. – № 1. – С.15–20.

116. Каханоўскі, Г.А. Беларуская фалькларыстыка : эпоха феадалізму / Г.А. Каханоўскі, Л.А. Малаш, К.А. Цвірка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 288 с.

117. Кацар, М.С. Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М.С. Кацар ; навук. рэд. Я.М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1996. – 208 с.

118. Князева, Е.Н. Одиссея научного разума : синергетическое видение научного прогресса // Е.Н. Князева. – Москва : Российская Академия Наук. Институт философии, 1995. – 228 с.

119. Ковалевич, М.С. Педагогическая синергетика : учебно-метод. комплекс для студ. высш. учеб. заведений пед. спец. / М.С. Ковалевич ; УО “Брестский гос. ун-т им. А.С. Пушкина”. – Брест : БрГУ имени А.С. Пушкина, 2009. – 82 с.

120. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь // Зб. нармат. дак. Мін-ва адукацыі РБ. – 2007. – №2. – С. 9–40.
121. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – 2-е выд., стэр. – Мінск : Ураджай, 2000. – 448 с.
122. Крукоўскі, А.Я. Горад Мазыр і яго ваколіцы / А. Крукоўскі // Наш край. – 1927. – № 3. – С. 17–28.
123. Крукоўскі, А.Я. Каменныя валы / А. Крукоўскі // Наш край. – 1926. – № 4–5. – С. 53–54.
124. Крываносава, А.Э. Ідэі маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы : аўтарэф. дыс. … канд. пед. навук : 13.00.01 / А.Э. Крываносава. – Віцебск, 1998. – 19 с.
125. Крысько, В.Г. Этническая психология / В.Г. Крысько. – Москва : Академия, 2002. – 320 с.
126. Кузина, Т.Ф. Занимательная педагогика народов России : советы, игры, обряды / Т.Ф. Кузина, Г.И. Батурина. – 2-е изд. – Москва : Школа-Пресс, 2001. – 144 с.
127. Кукушин, В.С. Этнопедагогика и этнопсихология / В.С. Кукушин, Л.Д. Столяренко. – Ростов-на-Дону : Феникс, 2000. – 448 с.
128. Кулакоў, Т.П. Крукавіцкі сельсавет Азарыцкага раёну, на Мазыршчыне / Т.П. Кулакоў, М.С. Валатоўскі // Наш край. – 1930. – № 2. – С. 22–28.
129. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў : канец XIX–XX ст. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.
130. Кучук, І.М. Палескі слоўнік : Лельчыцкі раён / І.М. Кучук, А.К. Малюк. – Мазыр : МазДПІ імя Н.К. Крупскай, 2000. – 156 с.
131. Латышина, Д.И. История педагогики: история образования и педагогической мысли / Д.И. Латышина. – Москва : Гардарики, 2005. – 603 с.
132. Легенды і паданні / склад. : М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі ; рэд. тома А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.
133. Ліс, А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў : сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А.С. Ліс ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. – Мінск : Бел. навука, 1998. – 188 с.
134. Ляўкоў, Э.А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э.А. Ляўкоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 215 с.
135. Мазыр 850 год : у 3 т / С.В. Целяпень [і інш.]. – Гомель : КВПУП “Сож”, 2005.– Т. 1 : Мазыр : гісторыя і сучаснасць. – 352 с.

136. Мазыр 850 год : у 3 т. / Ф. Штэйнер [і інш.] ; пад агульнай рэд. праф. І.Ф. Штэйнера. – Гомель : КВПУП "Сож", 2005. – Т. 2 : Мазыр літаратурны. – 216 с.

137. Мазыр 850 год : у 3 т. / уклад., сістэм., тэксталаг. праца, уступ. арт., рэдаг. В.С. Новак [і інш.]. – Гомель : КВПУП "Сож", 2005. – Т. 3 : Спрадвечнай мудрасці скарбонка : сучасны стан традыцыйнай культуры г. Мазыра. – 296 с.

138. Макарцоў, М.Ф. Каб не перасыхала крыніца... : фальклорна-тэатральная традыцыя на Гомельшчыне / М.Ф. Макарцоў. – Гомель : Бел. агенцтва навук.-тэхн. і дзелавой інфармацыі, 1994. – 62 с.

139. Макарэвіч, А. Дзе было Герадотава мора... / А.Макарэвіч // Родная прырода. – 1997. – №5. – С. 24.

140. Мид, М. Культура и мир детства : избр. произведения / М. Мид ; пер. с англ. и коммент. Ю.А. Асеева ; сост. и послесл. И.С. Кона. – Москва : Наука, 1988. – 429 с.

141. Мирзоев, Ш.А. Народная педагогика Дагестана : содержание, формы и методы воспитания / Ш.А. Мирзоев. – Махачкала : Дагучпедгиз, 1986. – 124 с.

142. Міско, С. Беларускі карагод / С.Міско // Весці АН БССР. – Сер. грам. навук. – 1961. – № 2. – С. 113–121.

143. Міхайлава, А.Л. Фарміраванне маральнага і фізічнага здароўя асобы ў беларускай народнай педагогіцы канца XIX – пачатку XX стагоддзя : дыс. … канд. пед. навук : 13.00.01 / А.Л. Міхайлава. – Віцебск, 2009. – 189 л.

144. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии : опыт систем.-типолог. исслед. / З.Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.

145. Молчанова, Л.А. Материальная культура белорусов / Л.А. Молчанова. – Минск : Наука и техника, 1968. – 232 с.

146. Навагародскі, Т.А. Традыцыі народнага харчавання беларусаў / Т.А.Навагародскі. – Мінск : НІА, 2000. – 112 с.

147. Народная медыцына : рытуальна-магічная практыка / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі ; уклад., прадм. і паказ. Т.В. Валодзінай ; навук. рэд. А.С. Ліс. – Мінск : Бел. навука, 2007. – 776 с.

148. Народная міфалогія Гомельшчыны : фальклорна-этнаграфічны зборнік / уклад., сістэмат., тэксталаг. праца, уступ. арт., рэдаг. В.С. Новак [і інш.]. – Гомель : ЛМФ "Нёман", 2003. – 320 с.

149. Народная педагогіка беларусаў / А.А. Грымаць, Л.М. Варанецкая, У.В. Пашкевіч. – Мінск : Выд. Ул.М. Скакун, 1999. – 256 с.

150. Неменский, Б. Мудрость красоты : о пробл. эстет. воспитания : кн. для учителя / Б.Неменский. – 2-изд., перераб. и доп. – Москва : Просвещение, 1987. – 255 с.

151. Николаева, Е.В. История музыкального образования : Древняя Русь : конец X – середина XVII столетия : учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений / Е.В. Николаева. – Москва : Гуманит. издат. центр ВЛАДОС, 2003. – 208 с.

152. Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья / редкол. : В.К. Бондарчик (отв. ред.) [и др.] ; Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора АН БССР, Ин-т искусствоведения, фольклора и этнографии им. Рыльского АН УССР. (Льв. отд-ние). – Минск : Наука и техника, 1987. – 376 с.

153. Орлова, А.П. Теоретико-методологические основы исследования преемственности народной и научной педагогики /А.П. Орлова // Веснік ВДУ. – 1996. – №1. – С.17–22.

154. Орлова, А.П. Этнопедагогика : теория нравственного воспитания : учеб. пособ. / А.П. Орлова. – Витебск : ВГУ им.П.М. Машерова, 2001. – 186 с.

155. Орлова, А.П. Прогрессивные идеи и опыт народной педагогики в учебно-воспитательной работе школ Беларуси 1917–1941 гг. : дисс. … канд. пед. наук : 13.00.01 /А.П. Орлова. – Минск, 1982 – 225 с.

156. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Мазыра і Мазырск. р-на / уклад. М.А. Капач [і інш.] ; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск : Маст. літ., 1997. – 574 с.

157. Памяць : гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Ельскі раён / уклад. У.М. Вягера, М.А. Капач, П.П. Рабянок. – Мінск : Ураджай, 2001. – 487 с.

158. Педагогический энциклопедический словарь / гл. ред. Б.М. Бим-Бад ; редкол. : М.М. Безруких [и др.]. – Москва : Большая Рос. энцикл., 2008. – 528 с.

159. Пилипенко, М. Ф. Возникновение Белоруссии : новая концепция / М.Ф. Пилипенко. – Минск : Беларусь, 1991. – 143 с.

160. Полесье и полешуки (из путевых записок) В. Маракуева / В. Маракуев. – Москва : типография А. Клейнъ, 1879. – 32 с.

161. Промыслы і рамёствы Беларусі / В.К. Бандарчык, В.С. Цітоў, Л.І.Мінько і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 192 с.

162. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.

163. Прыказкі і прымаўкі ў дзвюх кнігах / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.

164. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч ; уклад., прадм. У. Васілевіча ; пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2004. – 672 с.

165. Радзінная паэзія / рэд. Г.І. Цітовіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 784 с.

166. Ракава, Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л.В. Ракава. – Мінск : Ураджай, 2000. – 111 с.

167. Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.] ; маст. А.А. Глекаў. – Мінск : БелЭн, 2001. – 368 с.

168. Савенков, А.И. Одаренные дети в детском саду и школе : учеб. пособ. /А.И. Савенков. – Москва : Издат. центр “Академия”, 2000. – 232 с.

169. Садохин, А.П. Этнология / А.П. Садохин, Т.Г. Грушевицкая. – Москва : Издат. центр “Академия”, 2000. – 304 с.

170. Салееў, В.А. Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы / В.А. Салееў. – Мінск : НІА, 1994. – 181 с.

171. Сербовъ, И.А. Поездки по Полесью 1911 и 1912 года / И.А. Сербовъ. – Вильна : типографія Іосифа Завадского, 1914. – 51с.

172. Сербовъ, И.А. Белоруссы-сакуны : краткий этнографический очеркъ / И.А. Сербов. – Петроградъ : типография императорской академии наукъ, 1915. – 180 с.

173. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі ; навук. рэд., прадм. У.К. Касько. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

174. Сержпутоўскі, А.К. Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі ; навук. рэд., прадм. У.К. Касько. – Мінск : Універсітэцкае, 1999. – 191 с.

175. Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / Ин.-т славяноведения и балканистики РАН ; под ред. Н.И. Толстого. – Москва : Междунар. отношения, 1995. – Т.1 : А-Г. – 584 с.

176. Славянские древности : этнолингвистический словарь : в 5 т. / Ин-т славяноведения и балканистики РАН ; под общей ред. Н.И. Толстого. – Москва : Междунар. отношения, 1999. – Т. 2 : Д-К. – 704 с.

177. Славянский и балканский фольклор : этнолингвистическое изучение Полесья / ред. кол. Л.Н. Виноградова [и др] ; Н.И. Толстой (отв. ред.). – Москва : Индрик, 1995. – 399 с.

178. Смоліч, А. Географія Беларусі / А.Смоліч ; пасьлясл. А. Ліса. – Мінск : Беларусь, 1993. – 382 с.

179. Современные концепции эстетического воспитания : теория и практика. – Москва : ИФРАН, 1998. – 300 с.

180. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Давед. Камент. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 573 с.

181. Сучкоў, І.І. Фальклорны тэатр і выхаванне асобы / І.І. Сучкоў. – Мінск : НІА, 2001. – 176 с.

182. Теория эстетического воспитания / АН СССР. Ин-т философии ; отв. ред. : Н.И. Киященко, Н.Л. Лейзеров. – Москва : Искусство, 1979. – 256 с.

183. Тураўскі слоўнік : у 5 т. / склад. А.А. Крывіцкі [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – Т. 1 : А–Г. – 255 с.

184. Тураўскі слоўнік : у 5 т. / склад. А.А. Крывіцкі [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – Т. 2 : Д–К. – 271 с.

185. Тураўскі слоўнік : у 5 т. / склад. А.А.Крывіцкі [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – Т. 3 : Л–О. – 360 с.

186. Тураўскі слоўнік : у 5 т. / склад. А.А.Крывіцкі [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. Т. 4 : П–Р – 271 с.

187. Тураўскі слоўнік : у 5 т. / склад. А.А.Крывіцкі [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – Т. 5 : С–Я. – 423 с.

188. Ушинский, К.Д. Избранные педагогические сочинения в 2-х т. / К.Д.Ушинский ; под ред. проф. В.Я. Струминского. – Москва : Учпедгиз, 1954. – Т. 1. – 637 с.

189. Ушинский, К.Д. Избранные педагогические сочинения : в 2-х т. / К.Д. Ушинский ; под ред. проф. В.Я. Струминского. – Москва : Учпедгиз, 1954. – Т 2. – 734 с.

190. Фадзеева, В. Беларускі ручнік / В.Фадзеева ; афарм. І.А. Дзямкоўскага. – Мінск : Полымя, 1994. – 327 с.

191. Філаматы і філарэты : зб. / уклад., пераклад польскамоўных твораў, прадмова, біяграф. даведкі пра аўтараў і камент. К. Цвіркі. – Минск : Бел. кнігазбор, 1998. – 399 с.

192. Фрезер, Д.Д. Золотая ветвь : исследование магии и религии / Д.Д. Фрезер ; пер. с англ. – 2-е изд. – Москва : Политиздат, 1986. – 703 с.

193. Чечет, В.В. Педагогика семейного воспитания / В.В. Чечет. – Минск : Изд-во ООО “Красико-Принт”, 1996. – 256 с.

194. Чистов, К.В. Специфика фольклора в свете теории информации / К.В. Чистов // Вопросы философии. – 1972. – № 6. – С. 108–118.

195. Чурко, Ю.М. Вянок беларускіх танцаў / Ю.М.Чурко. – Мінск : Беларусь, 1994. – 88 с.

196. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі : нарысы / Т.І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 400 с.

197. Шасцімоўны слоўнік прыказак, прымавак і крылатых слоў / Н.А. Ганчарова [і інш.] ; пад. рэд. Н.А. Ганчаровай. – Мінск : Універсітэцкае, 1993. – 255 с.

198. Шлюбскі, Ал. Другі год зьбірання фальклёрнага матэр’ялу / Ал. Шлюбскі // Наш край. – 1930. – № 3. – С. 19–27.

199. Шпилевский, П. Мозырщина / П. Шпилевский // Неман. – 1996. – № 9. – С. 212–246.

200. Шпилевский, П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю / П.М. Шпилевский. – Минск : Полымя, 1992. – 251 с.

201. Шур, В.В. Беларускія ўласныя імёны. Беларуская антрапаніміка і тапаніміка / В.В.Шур. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 239 с.

202. Этнаграфія Беларусі : энцыкл. / рэдкал. : І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

203. Moszynski, Kazimierz Polesie wschodnie : materjały etnograficzne z wschodniej części b. Powiatu mozyrskiego oraz z powiatu rzeczyckiego / K. Moszynski. – Warszawa Wydawnictwo Kasy im. Mianowskiego ; Pałac Staszica, 1928 . – 304 с.

## ДАДАТАК

### ДАДАТАК А

**Табліца А – Неапублікаваныя матэрыялы: традыцыі народнай педагогікі Мазырскага Палесся**

<table>
<tr><th>Парадкавы нумар у тэксце</th><th>Дадзеныя інфарматара</th><th>Асноўныя выхаваўчыя ідэі</th></tr>
<tr><td>11</td><td>Гаўрылавец Аксіння Фамінічна 1932 г.н. в. Баравое Лельчыцкага раёна Гомельскай вобл.</td><td>Вуснае апавяданне аб працоўным выхаванні будучага мужчыны, гаспадара ў сям'і дзядзькі, метадах народнай педагогікі, традыцыйным побыце.</td></tr>
<tr><td colspan="3">У сям'і нас было 8 дзяцей і маці з бацькам. Дзеўкі дапамагалі маці то ў хаце падграбці, то зацірку зварыць. Калі памёр бацька, маці засталася адна з дзецьмі. Род Гаўрылаўцоў быў вялікі. Сына маці аддала на выхаванне свайму брату, дзядзьку. Раней лічылася, што выхаваць мужчыну можа толькі мужчына. Дачок маці вучыла шыць, ткаць. Брат жыў і выхоўваўся ў сям'і дзядзькі, дзе было 3 хлопцы і 5 дзяўчынак. З братамі хадзілі на паляванне, загатаўлялі лучыну і дровы на зіму. Дзядзька вучыў усім гаспадарскім дзелам. Калі білі кабаньчыка, хлопцы павінны былі стаяць, назіраць за дзядзькам, пераймаць. Хлопцы абавязаны ўмець – касіць, плесці лукошкі, кашалі, даглядаць скаціну, землю пераварочваць – араць.<br><br>Калі брат падрос, то ён вярнуўся ў сваю сям'ю і мог замяніць гаспадара. Калі сядзелі вечарам каля лучыны, то брат расказваў як яму было ў сям'і дзядзькі. Дзядзька вучыў яго і сваіх дзяцей аднолькава, не шкадаваў больш або менш. Біць не біў, але мог так паглядзець, што станавілася не па сабе, лепш бы даў пару плётак, каб балела. За стол садзіліся разам, дзядзька пачынаў вячэраць, а затым усе астатнія, пасля вячэры гаспадар першым выходзіў з-за стала.</td></tr>
</table>

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 15 | Ермакавец Надзея Апанасаўна 1926 г.р. ураджэнка в. Барыскавічы Мазырскага раёна, жыве ў г. Мазыры | Каляды. Куцця, клопат аб ураджаі. Варажбы дзяўчат на будучае замужжа. Каза. Звязда. Пераапрананне ў цыган. Удзел у калядных абрадах дзяцей і падлеткаў. Жартоўныя спевы. |

Варaць куццю і ложаць сено. Заўязваюць вочы, і несе куццю: сколькі ў етом гаршчочку зернушок, столькі каб було ў маем гародзе гурочкаў, у курачак – яечак. На зеркала гадалі, замукалі калодзезь з крышкаю: сасніса і адмукні замка. Матка печэ бліна і бежыш на двор. Жэншчыну ўстрэціш – не выйдзеш. Ленты з галавы бралі і палалі, чыя вылеціць з начовак. Туфлі кідалі. Плот абнімалі: удавец-маладзец... Дрова бярэмкамі пад прыпечак кідалі – лічылі ці пара. Гадалі на зеркало, дзве свечкі. Мне паказалася вайна. Выйшла замуж за ваеннага. Загінуў.

Ой, каза-каза, дзе ж ты хадзіла, дзе ж ты блудзіла?
Ой, я хадзіла, ой, я блудзіла, дай пад тым сельцом, пад Міхайлаўцом,
Дзе хлопцы-стральцы радзяць радзіцу ўбіці казіцу.
Каза ўпала, здохла, прапала.
Устань, козанька, развеселіся, пану-хазяіну ў ножкі скланіся.
Хадзяін дась вялікі пірог, а хадзяюшка кусочак сала,
Што б наша козка на ножкі ўстала.
Да пабег казёл, да дарожкамі, да трапінкамі.
Дзе каза нагою, там жыта стагою.
Дзе каза туп-туп, там жыта сем коп.

Вадзілі Казу хлопцы, а дзеўкі спевалі, санкі везлі. У Прудок ідзём, тагды гуляем. Дзеці, подлеткі, хадзілі за намі, інцерасаваліся, іх не праганялі. Звезда була. Зрабіла звезду з рэшата. Устаўлялі свечку і ікону. Казу зрабілі: езычок, каб ляпала. рогі, бумагай абкруціць. Дзевачкі спевалі:

*Ой ў полі, у полі стаіць ябланька,*
На той яблыньцы свечачка гарыць,
З тае свечачкі іскрачка ўпала,
З тае іскрачкі рэчачка стала.
У той рэчачцы сам бог купаўся,
З Хрыстом нараджаўся.

За етым словам бувайце здарову.

Перадзеваліся ў цыган, варажылі. Дзеці меншые з казою хадзілі, а Дзеву Марыю дзеўкі спевалі, Звезду насілі велікіе хлопцы і дзеўкі, санкі вазілі, торбу павешалі, хто пірог кіне, хто каўбасу. Ето ек не пазволяць ужэ шчадраваць. Як не падорaць спяваем: *Ой, дзядзько, дзядзько, як памрэ Ганна, Возьмеш другую, возьмеш другую, сучку рудую.* І ўцякаем.

Працяг табліцы А

<table>
<tr><th>Парадкавы нумар у тэксце</th><th>Дадзеныя інфарматара</th><th>Асноўныя выхаваўчыя ідэі</th></tr>
<tr><td>19</td><td>Зубар Марыя Аляксееўна, 1889 г.н. г. Мазыр</td><td>Жніўная песня аб горкай долі маладой маці, адносінах свякрухі і нявесткі, адзінстве гадавання дзяцей з прыродай і працай.</td></tr>
<tr><td colspan="3">Ой, крапіўка мая, ты пякучая,<br>Ой, свякруха мая, ты сваручая,<br>Пасылала мяне ў поле жыцейка жаць.<br>А я жыта жала дзень да вечара.<br>А із вечара снапы зносіла,<br>Снапы зносіла, дзіця бросіла.<br>Ой, пайшла я малада, дай дарогаю адна,<br>Дай устрэціла я там тры ваўкі ішлі.<br>Ой, ваўкі ж вы мае, вы серэсенькіе,<br>Ці не бачылі вы, дзіцяці маего?<br>Першы воўк ісказаў:<br>– Я дзіця калыхаў.<br>Другі воўк ісказаў:<br>– Я дзіця забаўляў.<br>Трэці воўк ісказаў:<br>– Я дзіця разарваў.<br>Разарвалі дзіця, разарвіце і мяне,<br>Што б я малада, ды на свеце не жыла.</td></tr>
</table>

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 22 | Калацэй Дар'я Лук'янаўна 1935 г. н. ураджэнка в. Карма Ельскага раёна Гомельскай вобл., жыве ў г.Мазыры. | Узаемасувязь народнага мастацтва і выхавання. Сямейна-бытавая песня-балада аб маці, сыне і нявестцы, магчымасцях чаравання, пераўтварэння і пакарання за грахі. |

***У полі берёза, у полі кудрява,***
А на той берёзе зезюлька ковала.
А на той берёзе зезюлька ковала.
Ой, то не зезюлька, то радная маці.
Она выпроўляла сына ў салдаты.
Она выпроўляла сына ў салдаты.

Ідзі-ідзі, сынку, доўго не барыся,
Чэрэз тры гадочкі додому верніся.
Чэрэз тры гадочкі додому верніся.
Ждала я гадочок, ждала я другенькі,
На трэйці гадочок ідзе мой сыночок.
На трэйці гадочок ідзе мой сыночок.

– Чы ты рада, мамко, чы ты рада мною,

Налівае сынку а чарачку рому,
Маладой невесце зеленого яду.
А тая ж невеста да ўсе чары знала,
Будзь, мілы, здаровы, дай паразлівала.
А тая ж невеста да ўсе чары знала,
Будзь, мілы, здаровы, дай паразлівала.
Дай паразлівалі, дай павыпівалі.
Ой, божэ ж мой божэ, што ж я нарабіла,
Чэрэз чужэ дзіця, свае атравіла.

Пахавала сынка ў вішнёвом садочку,
Маладу невесту – у полі на грудочку.
Маладу невесту – у полі на грудочку.
Пасадзіла сынку чырвону каліну,

| | |
|---|---|
| Чы ты рада мною, моею жэною?<br>– Ой, рада ж я, сынку, рада я табою,<br>А не рада, сынку, твоею жэною.<br>А не рада, сынку, твоею жэною.<br>Посадзіла сынка, сынка за сталочком,<br>Маладу невесту ў парозі ў куточку.<br>Маладу невесту ў парозі ў куточку. | Маладой невесце калючу шэпшыну,<br>Маладой невесце калючу шэпшыну.<br>Над маім сыночком вераб'і не пеюць,<br>Маладой нявестцы гняздзечко веюць. |

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 22 | Калацэй Дар'я Лук'янаўна 1935 г. н. ураджэнка в. Карма Ельскага раёна Гомельскай вобл., жыве ў г.Мазыры | Дзіцячы фальклор з рухамі, гукаперайманнем, актывізуючымі гульнёвымі элементамі. Знаёмяць дзіця з народнымі стравамі, вопраткай, побытам, птушкамі і жывёламі. |

***Люлі-люлі, люлі, прылецелі гулі,***
Селі на вароцях
ў чырвоных чабоцях.
Сталі думаць і гадаць,
Што дзіцятку трэба даць.
Трэба даць добры сон а-а-а…

***Коцік-мурчык, наш галубчык.***
Лапкі м'яккі, зубкі востры.
Ходзіць коцік ціхо,
Будзе мышкам ліхо.

– ***Пасачка-парасачка,***
Дзе ты была?
– У бабкі.
– Што ты рабіла?
– Кашку ела,
Малачком запіла.
– І велікая расла...

***Кую-кую ножку,***
Паеду ў дарожку.
Дарожка крывенькая,
Кабылка сляпенька,
Нема чым пудкаваць,
Буда ўдома начаваць.

***Сарока-варона***
Дзеткам кашку варыла,
На прыпечку ставіла.
Ідзіце дзеткі па драва,
Ужэ кашка гатова.
Этаму дам, этаму не дам:
Вады не насіў,
Дзяжы не месіў,
Пірагоў не пёк,
І з хаты ўцёк.
Шугі-шугі-шугі…

Спевала багато, з семі год у няньках, п'яцеро чужых дзецей гадавала. А то ўзрослые жаласные песні спевала, как дле себе.

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 22 | Калацэй Дар'я Лук'янаўна 1935 г. н. ураджэнка в. Карма Ельскага раёна Гомельскай вобл., жыве ў г.Мазыры | Вуснае апавяданне аб тым, як раней нараджалі і гадавалі дзяцей. Як рабілі калыскі. Чым кармілі дзяцей. Замовы ад дзіцячых хвароб і способы іх перадачы. Спецыфіка метадаў фізічнага пакарання. |

Мая бабушка жала жыто, прышло ўрэм'е ражаць, а трэба дажаць аторку – палавіна загона. Яна радзіла ў разоры, аткусіла пупавіну сама і ўзяла дзіця ў падол, да канчала тую аторку. Прыйшла дадому, палажыла дзіця ў начовачкі на печы, да давай скарэй есці варыць, сям'я бальшая, далжна ўсе дзелаць невестка. Наварыла картошкі, насыпала на стол, паставіла расол, а ўсе ложкамі возьмуць картошку. Яна ўвіхаецца, начало плакаць дзіця, думалі каценя яўкае, кажуць: ето Прося радзіла.

Сначала ў начовачках, а патом у калысцы. А калыскі так дзелалі: мешок паложыць у вуглы картапліну, зашые і завяжэ, вероўкі завяжэ, зберэ вероўкі да места і к брусу прывяжуць. Картапліна пака ссохне. Кручком зацэпліваюць. Вероўка для нагі, каб калыхаць. Як німа мешка, сшывалі з палатна канаплянага для люлькі.

З лазы плелі пасталы, лапці. А з палок рабілі люлькі. Замачвалі тоўстую палку, выгіналі, каб калыхаць. Везалі ек кошыкі. Тоўсту лазіну мачылі і рабілі дугу. Дзіця ў люлькі, калышэш, на пол ставіш. Ето спецыялісты і ўрэм'е надо, а я сколько знаю, дак з мешка, калыхалі нагою.

Раньшэ ўсе дзецям давалі, нажуюць хлеба ў марлю – кукла, давалі смактаць. Кулеш варылі, кашу з малаком. Просо таўклі ў ступах. Картошку церлі з малаком.

Ці каралі дзяцей фізічна? Дзецей наказывалі, білі дубцэм, крапіваю, еслі шкоду зрабіў: узяў без разрашэння, разбіў, з'еў яйцо, калі прынеслі лічаныя на вялікую сям'ю. Стаяў у куточку асінавы дубец, таму што ён нечысту сілу выганяе. Як б'юць – сагналі з цебе паганы дух. Крапіваю білі. Берозавага не бачыла. Вербой свечонай. На грэчку ставілі, на соль у школе або ў каго мала дзяцей. Маці працягнула вяроўку, а я парвала, маці адлупіла качалкай. Яна папагаравала, воду цегала, сцірала, а я шкоду нарабіла. Трапкачом білі, дзе з печы чагуны дастаюць, такіе кружэва длінные.

***Спуг (ляк)***

Госпаду Богу памалюся, прысвятой прачыстай Божай Маці пакланюся. Скораму памочніку, божаму ўгодніку, Прыдзі памагаці хрышчонай (імя) ляк угавараці. Ляк мужчынскі, ляк жаночы, ляк дзявочы, ляк парабочы, ляк таварачы, ляк валовячы, ляк курыны, ляк гусіны, ляк мышыны, ляк сабачы, ляк кацячы, ляк гадзючы, ляк паўзычы, ляк вадзяны, ляк агняны, ляк земляны і ляк смярцельны. Тут табе не стаяць, пад грудзькі на падпіраць, у галаве не шумаваць, к спіне не прыпадаць, у чэрэсла не ападаць, крыві не разжыгаць, касцей не ламаць. Да цех пор ты мучыў і ламаў, пака я не стала ўгавараць, а стала я ўгавараць-умаўляць з галавы, з очэй, з плечэй, з ітавае косці, з гарачае крыві, з сорака сустаў, з сініх жыл, з румяного ліца, од шчырого серца. Не мой дух, а господні дух. *Падуць і сплюнуць тры раза.*

Пераняла шэпты ад бабы, мацерынай маці, яна шаптала ўдзень, або па дарозе ідзе і мяне вучыць. Лечылі только шэптом – подзіў, зглаз, наўрочылі. Еслі передаю, то сама забуваю.

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 24 | Канопліч Пётр Фёдаравіч 1921 г.н., в. Махнавічы Мазырскага раёна Гомельскай вобл. | Працоўнае і эстэтычнае выхаванне. Метад пераймання. Гігіена і побыт. |

Трудно було, голод бyў. Маці йдзе ў лес, і му памагалі, набером ягад кашэль, прадае і купляе ў Мозыры хлеб, нам дзеліць па кусочку. За яйца, 40 дзесяткоў – метр краму.

Ацец іграў, на ўсю акругу, была трохрадка. Іграюць браты, дзед – музыкант, скрыпач і его сыны ігралі на скрыпках, на гармоніку. Ены самі па сабе, пачуў радыё, танец ілі польку, ідзе і сабе іграе, пака не навучыцца. Гармошка сахранілась, у Маскве купляў за 120 рублей. Сам вучыўся і дзецей вучыў. Жанкі назбіраюць пірагоў, прынесуць, іграе ім цэлы дзень.

Прэстольны празнік – Ведзене, цэрква да вайны була, служылі Спас, поўные вазы яблак вазілі, венчаліся, свецілі Пасху, калакольня була. Малые на званіцу лазілі, усе званілі. Каледавалі.

Вечоркі. Дзеўкі кудзелю прадуць. У клубі сабіраліся, ішлі і старые й маладые, ніхто не седзеў. Танцы: Страданія, Кракавяк. Була глуханемая і

танцуе з дзеўкамі, сваімі равесніцамі, заметкі нема, што ена глуханемая. Маладые ўчыцеля прыходзілі к нам на хутар, бацько іграў, а ены вучыліся танцаваць. Кадрыля, да дракі даходзіла, хто пачынаць будзе. Патом у клубе танцавалі. Танцы: Чобаты, Нарэчанька, Падыспан, Кросны, Юрачка, Крыжачок, Матлёт, Полькі (“Дзедушка”, “Калхозна”, “Бонцікава”). Пажылые ні адна не седзелі. У Рамезох Хведора Саракоўка, на Пакрову хадзілі, ена ні аднаго танца не прапускала. Дзеўкі наймаюць бацька, што памогуць, картошку ці кудзелю пралі. Цепер буваюць празнікі ў клубе, не танцуюць, аджыло, а тагды ніхто не седзеў, і старые й маладые, клуб аж стогне.

Рамёствы. Бочкі рабіў, пасуду на гуркі, муку. Дзед быў і музыкант, і бондар, і столяр. Пасуду рабіў з дзерава, боечкі. Я пабачыў як ен робіць, дай я ўжо так. Начовачкі. Кашалі плелі. З гліны рабілі гладышкі, з лазы лапці плелі. Кавалі булі харошые, на вайне пагіблі. На бочках абручы не жалезные, а з арэшніку. Начоўкі для проса, як таўчэш крупу на кашу. Для мукі.

Маці навучыла мене лапці плесці і ізбавілася ад клопату. Надо было іцці ў лозу, надраць лазы, што б і на зіму хваціло. Іх хватало на 2 дні, абутку не було. Сукно, авечкі булі.

Па хутарах жылі. Йшлі ў калхоз, абрабатвалі картошку, адзін паводзіць, а другі акучвае. На пакосе копы насілі, стагі вершылі.

Нагрэў вады да памуўса, дай баня. У чом памуўса? Да ў чом папала. У начовачках дзецей купалі, ек радзілосо. Грэе вады, да памуе. А так і велікіе. Дома ў печы нагрэла вады, развела да й памуласа.

Чысты чацвер, хадзілі ў брод, у грэблю хадзілі купацца. Да Іллі можна купацца. А ў маі месяцы як вада нагрэецца, так і палошчуцца ўжэ дзеці.

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 25 | Канопліч Фёдар Кірылавіч 1916 г.н. жыхар в. Махнавічы Мазырскага раёна Гомельскай вобл. | Працоўнае выхаванне. Бортніцтва. Веды і працоўны вопыт. Разуменне народнай маралі ў апавяданні “Удзячнасць мядзьведзя”. Спартыўныя спаборніцтвы ў в. Махнавічы. Падняцце гіры – бабы як прыклад |

| | | |
|---|---|---|
| | | фізічнага выхавання палескіх волатаў. |

Мой дед был хорошим бортником и собирал мед от диких пчел. Улей делали из дуба или сосны: отрезали от толстого бревна полтора метра, долбили смотровое окно, вдалбливали внутреннюю часть древесины, сверлили леток – отверстие для пчел. Окно заделывали отдельным куском чесаного дерева, старались закрыть окно плотно, что бы не было больших щелей. Внутрь улья клали траву – маточник, для привлечения матки пчелиного роя. В каком улье останется матка – там останутся и рабочие пчелы. Пчелиная матка бывает только одна на один рой, и она размножает его. В системе роя есть так же и сторожевые пчелы, и пчелы, которые носят воду для нужд пчелиной семьи.

***Благодарность медведя***

Женщина из деревни Махновичи жала рожь в лесу на полянке, устала, затекла спина. Вдруг слышит, со спины кто-то топчется, оборачивается и видит медведя. Убегать бесполезно, да и медведь не проявляет агрессивности и показывает лапу. Так прошло несколько минут. Женщина заметила в лапе медведя большой осколок – щепку. Делать было нечего. Она взяла серп, немного прорезала шкуру и вытащила щепку из лапы медведя. Медведь одобрительно покачал головой, повернулся и пошел в направлении леса. Женщина продолжала свою работу. Через некоторое время она опять увидела медведя с корой в лапах. На коре был большой кусок – стельник мёда. Подойдя поближе, медведь положил на свежую стерню кору с медом, покачал головой, повернулся и ушел в лес. По окончании работы женщина пришла домой и принесла мёд, начала хвастаться перед мужем, бортником.

На следующее утро муж захотел угостить свою жену медом, пошел в лес к своему улью. Оказалось, что улей лежал на земле, сброшенный с дерева медведем, совершенно пустой.

***Спортивные состязания в деревне Махновичи***

Соревнования проходили каждый год весной. Что бы похвастаться своей силой и удалью, мужчины деревни выливали большую гирю, ее называли “бабой”. Каким был вес гири, никто сказать не может. В деревне проживало около 500 жителей, из них “бабу” поднимало только три человека. Это было в 20–30 годы XX века.

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 33 | Лаўда Настасся Сцяпанаўна (1914-2000) в. Казловічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобл. | Замовы і магічныя дзеянні пры гадаванні дзяцей ранняга ўзросту. Засцярогі пры сустрэчы дзвюх цяжарных. Абарона ад начніц – духаў ночы, якія шкодзяць дзіцяці. Сон – як аснова здароўя. |

***Перапалох***

Госпада Бога прашу, перапалох лячу. Дзявочы й хлапоцкі, і мужчынскі і жаноцкі, і бацькоў і мацерын, і панскі й цыганскі, і папоўскі й жыдоўскі, і каровячы й валовячы, свінячы й парасячы, і авечы й казячы, і каціны й сабачы, і грамову й дажджову. Умаўляю, угавараю з (імя) раджонага, хрышчонага, з белае касці, з чырвонае крыві, з сініх жыл, з жоўтага мозку, з румянага цела. Каб не вадзіла: ні схода, ні пад поўню, ні маладзіком, ні павек вяком, аніколі на свеце.

***Прыстрэт***

Першым разком, добрым часком, Госпаду Богу памалюся, а Прачыстай Божай Маці пакланюся. Прачыста Божа Маці, памагаеш Богу, памажы і нам.

У чыстым полі стары дуб стаіць, а на тым дубе тры какаты, а на тых какатах тры паны. Адзін шые світу, другі сарочку, а трэці сее мак. Прайдзіся майму дзіцяці прыстрэк і ўрок. Прыстрэт надуманы, нагаданы і прыгавораны. Я ўсе прыстрэкі сабіраю, да на сіня мора адпраўляю. А цябе, мае дзіця (імя), здароўем надзяляю. Каб ты піло й ело і добрэ спало, а прыстрэкаў і ўрокаў аніколі каб не знало.

***Пры сустрэчы дзвюх цяжарных або маці з дзецьмі да года***

Юрэй і Мікола, іх двое, жывіце дзеткі абое. Што думаюць дзеткі, тое нехай дзеткам, а што думаюць маткі, тое нехай маткам.

***Вотначы***

Госпада Бога прашу, вотначы лячу. Сям-там дзікае поле, а на дзікім полі, дзікі дуб, а пад дзікім дубам дзікая Бабка. Бабка-любка, пасватаймось, пабратаймось, да вазьмі ад майго дзіцяці начніцы, да нясі сваёй дачцэ на

памачніцы. Што б твая дачка крычала дай па лесу летала, а што б мае дзіця добрэ спало, дай прыбувало, дай етых начніцоў ніколі не знало. Даю вам, нацніцы, вады й хлеба-й-солі, давайце майму дзіцяці спаць даволі. *Хлеб-соль з вечара на ноч ставіць на акно*.

### *На добры сон дзіцяці*

Я цябе, маё дзіцятка, спаць лажу, спаць лажу, крыжам абгараджу. Ангелы па баках, а прачыста Божа Маці ў галавах. Прачыста Божа Матка, беражы майго дзіцятка з вечара да ночы, а з ночы да свету і да ўсяго веку.

### *Дзяцінец*

Ля сіняга мора стары дуб стаіць, а на тым дубе тры какаты. А на тых какатох тры паны: аднаму світа, а другому штаны, а трэйцяму мак, прайдзіся дзяцінец так.

Працяг табліцы А

| **Парадкавы нумар у тэксце** | **Дадзеныя інфарматара** | **Асноўныя выхаваўчыя ідэі** |
|---|---|---|
| 33 | Лаўда Настасся Сцяпанаўна (1914-2000) в. Казловічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобл. | Забаўлянкі маральна-павучальнага зместу з імітацыйнымі рухамі, пастукваннем, пагладжваннем і інш. Забаўлянка “Ласка” ілюструе спосаб народнага мыслення, дзе істотны парадак, лад, цыклічнасць жыцця, знаёміць з рэаліямі традыцыйнай культуры. |

***Сарока-варона***
Дзецям кашу варыла,
На прыпечку студзіла,
Палонікам махала,
Да ўсім дзеткам давала:
Етаму дала, етаму дала,
Етаму дала, етаму дала,
А етаму не дала:
– Ты, мал, круп не драў,
Вады не насіў,
Дзежкі не мясіў.
Табе кашка на паліцы,
А ложачка ў камясніцы.
Прыляцелі дзве цяцеры,
Кашку ўкралі дай уляцелі.

***Кую-кую ножку,***
Паеду ў дарожку.
Дарожка крывая,
Кабылка лянная,
А сакерка тупая,
А зайчык дарожку
перабягае…

*–Ласка, ласка, дзе была?*
– У Бога.
– Што рабіла?
– Кросна ткала.
– А што зарабіла?
– Кусок сала.
– А дзе ж тое сала?
– Кошка ўкрала.
– А дзе ж тая кошка?
– Пад печ схаваласа.
– А дзе ж тое падпечча?
– Згарэла.
– А дзе ж той агонь?
– Вадою залілі.
– А дзе тая вада?
– У землю пашла.
– А дзе тая зямля?
– Краскамі зарасла.
– А дзе тыя краскі?
– Дзеўкі парвалі.
– А дзе тыя дзеўкі?
– Хлопцы пабралі.
– А дзе тыя хлопцы?

– На войну пашлі.

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 35 | Лісіцкі Іван Пятровіч 1936 г.н., в. Мілашавічы Лельчыцкага раёна Гомельскай вобл. | Бортніцтва як традыцыйны занятак. Працоўнае выхаванне, сувязь чалавека і прыроды, перадача працоўных традыцый у межах сям'і. Народнае разуменне граху. Назвы прылад працы. Адорванне вуллямі і мёдам. Лячэнне мёдам. |

Мой дзед атрымаў вуллі ад бацькі і з маленства ўмеў хадзіць за пчоламі. Бацьку ў вайну забілі і з 10 год дзядуля даглядаў за пчоламі сам. Лічыцца, што ў пчалаводстве павінны быць мужчынскія рукі. Вулей звычайна вырэзваюць, абчэсваюць з сасны або дуба. З якога дрэва вуллі – на тое дрэва вешаецца вулей. У даўжыню ён 1,5 метра, унутры зроблены лаз. Вуллі заўсёды вешаюць на вельмі высокае дрэва ў гушчары леса.

Вялікі грэх красці мёд, скідаць чужы вулей, таму ніколі чужыя рукі не кратаюць не свае вуллі. Вулей на дрэва зацягвалі ў даўніну з дапамогай калёсаў. Зараз мой дзед уздымае вулей з дапамогай лябёдкі – катушкі з ручкай і да яе прывязаны трос.

Жэнь – вяроўка са скуры цялят плеценая касою, каб залезці на дрэва.

Курач – жасцяная прылада палкамі адпугваць пчол. У курача кладзецца парахно з асіны, бярозавая губа, якая дыміцца.

Стэй – шырокая даска каб адкрыць вулей.

Доўж – вузкая даска даставаць мёд з вулля.

Лазбень – авальная каробка з шырокай тонкай драўлянай кары для сбору мёду.

Заўсёды, каб селі пчолы, чытаў дзед спецыяльную малітву. Асенні мёд раздавалі патроху ўсім родным. На зіму, каб не згінулі пчолы, клалі цукар. Вясной правяралі як зімавалі, як селі пчолы. Воск ніколі не выкідалі – рабілі свечы. Хранілі мёд у каструлях у сотах. Вуллі з самымі лепшымі пчоламі дарылі на вяселле, на радзіны.

Служылі вуллі па 10, 50, 100 і больш гадоў. У аднаго бортніка звычайна было не больш 10 вулляў.

Мёдам лячылі кашаль, апёкі, страўнік. Амаль ніколі не разбаўлялі мёд з вадою, яго запівалі.

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 36 | Лобан Ульяна Міхайлаўна, 1930 г.н. в. Паўлаўка Ельскага раёна Гомельскай вобл. | Народныя сямейна-бытавыя песні: 1. аб становішчы нявесткі ў вялікай сям'і; 2 аб забароне для жанчыны сем год пасля замуства бываць у роднай хаце, і спробе брата забіць сястру, якая парушыла сямейна-родавыя традыцыі. |

***Дай аддала мене маць у велікую сем'ю.***
У велікую сем'ю да й у чужую старану.
А велікая сем'я ўся вечэраць пасела,
А меня маладу, атпраўляюць па ваду.
Ек па воду йшла – й спатыкалася,
А з вадою йшла – й прыслухалася.
Чую маці сына вучыць:
– Чаму жонку не б'еш,
Чаму жонкі не б'еш,
Чаму волі ёй даеш?
– Ох, ты мамко мая,
Мая перапёлка,
А за што ж ее біць,
Ена умее ўсе рабіць.
Ена умее ўсе рабіць,
Хлеба-солі заробіць,
Свае дзеткі пакорміць.

***Цечэ рэчанька-невелічэнька, скочу-перескочу,***
Аддай ты меня, мая мамачка, за каго я хочу.
Аддай ты меня, мая мамачка, за каго я хочу.
Маці аддала й выговор дала сем лет не буваці.
А як прыдзеш ты, донечку ж мая, то й выжэну з хаты.
Церпела я год, церпела я два, дэй не вуцерпела,
Ператварылась серай зеўзюляй, к роду палецела.
Полем лецела, поле крапіла горкімі слезамі.

Гаем лецела, галле ламала белымі рукамі.
Прылецела ў сад, у сад зеленёнькі да стала каваць.
Да стала каваць, шчэ й прыказуваць, што б пачула маці.
Яе родна маць украй акенечка рушнік вышывае,
А меншы браток, а меншы браток стралу зараджае.
Пазволь, мамачка, пазволь, родная, ту зяўзюлю ўбіці.
Не пазволю, сын, не пазволю я, ту зяўзюля ўбіці,
То не зезюлька, то мая донька, она хочэ жыці.

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 47 | Ручнова Аляксандра Лук'янаўна 1921 г.н., в. Махнавічы Мазырскага раёна Гомельскай вобл. | Вяселле, выпрабаванне маладой, каравай. Метады выхавання. Узаемаадносіны паміж малодшымі і старэйшымі, бацькамі і дзецьмі. |

Мая сестра замуж выйшла ў 17 лет, а ему было 16, у свекрові жылі, рабілі на полі ўсе. Багато было сыноў, было 11, жывых 7, па аднаму не було.

Свадзьба. Дружкі першая, другая і трэцяя. Як трэба невесту за стол садзіці, то старша дружка гаварыць:

*– Благаславі, ацец-маці невесту за стол правадзіці.*

*– Бог благаславіць. Втарым разам, трэцім разам і так тры разы.*

Кагда жаніх должан пад'ехаць:

*– Не седзі, Манечка, не седзі, адкрый акошачка, пагледзі.*
*Ці ясен месец на зарэ, ці харошы Ванечка на дварэ.*
*– Ужэ ясен месяц на зарэ, і харошы мой Ванечка на дварэ.*

Невеста не паёт, ета дружкі. Жаніх прыезджае і спевалі:

*Адступіцеся, падружкі, не заступайце дарожкі,*
*Да я ўпаду свайму татку ў ножкі.*
*У маго татка дарожанька беленька,*
*Ох, стань жа мне такая доля добранька.*

Маладую прывезуць, прыеджаюць закасянкі з той і другой стараны. Ены вешаюць, паказваюць сколько рушнікоў, скацерок. Вывешваюць на жэрдках у хаці. Абсуждаюць, ек мало, ленавалася. Невесці задавалі падмесці хату, яна венік пераверне і грабе. Гаворацъ, што ена не ўмее рабіць нічого.

У каравай лажылі яічка, ек месяць каравай. Пекуць чатыры чалавекі, замужніе, суседкі, ек з печы ўйімаюць, дак спеваюць. Дзеляць, дак спевалі мужчыны. Несе малы брат ці сестра, чужэе ці свае. Учыняць, замесяць, падойдзе. Наложаць, масла падалюць і ўсерэдзіну ложаць пару еец. Кажуць: выймаймо. А яйца спекліса? Спекліса. Іх ададюць маладому. Спеваюць: *каравай апаліў сабе плечы.*

Кагда дзеляць, дак хто што дарыць, хто карову, целіцу ці авечак, кабана. Даруюць тую целіцу, што скачэ з печы на паліцу.

Завіваюць маладу і спеваюць:

*Аддай, матко, масла.*

*Я ж твaі карованькі пасла.*
*Ад расы да росы,*
*Памазаці косы.*

Я расплетала сестры косы, далі капейку, гадоў 8 було, на печы седзелі, знялі да за стол. Дзеўкі закручвалі косы. Маладая заплетала косы, патом расплетаюць і ложаць абручом на голаў. Ложаць кужаль, калі сваіх не хапае.

Хоць пажэняць і замуж пааддаюць, а сераўно сыны ідуць к бацьку спрашваць, што строіць і як, ацец рукавадзіць. Ідзе стары мужчына, папробуй не паздаровацца, бацьку пажаліцца, ак бацько ўсыпле. На “вы” называлі, і бацьку і мацеру, і дзядзька.

Працяг табліцы А

| **Парадкавы нумар у тэксце** | **Дадзеныя інфарматара** | **Асноўныя выхаваўчыя ідэі** |
|---|---|---|
| 48 | Сыч Марыя Лук’янаўна 1921 г.н. в. Рамязы Ельскага раёна Гомельскай вобл. | Вуснае апавяданне: нараджэнне і гадаванне дзяцей ранняга ўзросту. Адзінства народнай педагогікі, медыцыны, рэлігіі і магіі. |

Нараджаецца дзіця, завуць вясковую бабу на дапамогу. Прыняла роды, аставайся бабай гэтага дзіцяці. Баба не прыходзіць з пустымі рукамі, пялёнкі несла, не адну, а дзве, хлеб, а няма, то місачку мукі, 2 яйца.

Баба прымала роды, брала нованароджанага. Брала ножыка (не нажніцы), адразала пупка, завязвала ніткай з льна. На парозе закопвалі адходы пасля родаў, клалі пад парог, каб сходзілі людзі. Пупочак, што аставаўся, хранілі, а як у школу дзіця ішло, то трэба пупок развязаць, то і памяць развяжаш.

Дзіцятка баба купала ў начоўцы. Ваду правярала локцем. Рассцілала пялёначку на начоўку, падсцілала пад галоўку, каб у вушкі вады не пабегла. Баба абавязкова змервала дзіцятка. У вадзе зыход рабілі: локцік да ножкі і другі локцік да ножкі. Так і папраўлялі ўсякія вывіхі. Купалі часта, сыпалі цвяточкі “брацікі” (растуць у агародзе, на полі), сушылі і прымянялі румянак.

Калі дзіцятка не спіць, падвячорак заносілі ў куратнік. Куры зараней сядаюць не седало, так і дзіцятко павінна легці і зараней спаць. *Малітва*: Святая прачыста божая маці, Прыдзі берагці маё дзіцё. З вечара да поўначы,

З поўначы да свету, А са свету да абеду. *Замова*: Спаць лажуся, крастом крашчуся, Ангелікі, прылятайце, беражыце майго дзіцяці душу.

Як дзіцятко расце, калі яго зносілі на сустрэчы, то маці старалася сваё дзіцятка падняць вышэй, каб яно і расло здаравей, весялей будзе, каб дзіцяці не нападалі зносы. Калі дзіцятка крэкчэ, то, гавораць, гэта ад таго, што цяжарная ўдарыла карову, ката, другую жывёлу. Дзіця купалі, у начоўкі клалі попел. Дзіця потым накрывалі рэдкай палатнянай трапачкай. Праз яе працэжвалі воду з попелам. Здымалі трапачку, а там было ўсякіх валос. Тады дзіцятка не крэкча. Стараліся, каб штосьці было свечанае, хрышчанае. Ніколі не паказвалі дзіцятка, каб не зурочылі. Надзявалі навыварат адзенне, майку пад нізом.

Дзіця хрысцілі. Бралі куму і кума першых устрэчных. Выйдзеш на вуліцу, будуць ісці па вуліцы людзі, каго сустрэнеш, тые і кумы. Калі хрысціны, то добра было, калі дзіця не спала ў гэта час. Значыць дзіця будзе абшчацца з народам.

Ніколі нельга класці дзіцятка, калі сонца заходзіла. Куры звечара заслепваліся, то і дзіця будзе заслепвацца. Нельга, каб пялёначкі начавалі на дварэ ноч. Зоры свецяць, прапальваюць адзенне, дзіця не спіць. Раней не было ўцюга – былі качалкі. Але нельга было дзіцяці качаць пялёнкі, строга запрэшчалі. Лучшэ ў руках пагладзь, бо ты ўрэд робіш. З маленькім дзіцяткам гаварылі, воспітвалі. Вучылі з агнём абходзіцца, казалі: “жыжа”. Калі чужыя людзі ў хаце, то дзецям прыказвалі: не бегайце, не крычыце. Некаторыя старыя лічылі, што дзеўку раней садзіць трэба – дзевачка будзе нізенькая і поўная. А хлопцаў пазней садзілі, то ён тады прысадзісты, пагоністы быў, рос угору. Як вучылася хадзіць, пута перарэзваць трэба нажом: перарэжу пута, каб дачка хадзіла. Каб не пугаць дзіця, трэба дзіця расціць у цішыні.

Працяг табліцы А

<table>
<tr><th>Парадкавы нумар у тэксце</th><th>Дадзеныя інфарматара</th><th>Асноўныя выхаваўчыя ідэі</th></tr>
<tr><td>49</td><td>Тамашова Марыя Пятроўна 1924 г.н. в. Каменка Мазырскага раёна Перасяленка з в. Антонаўка Нараўлянскага раёна.</td><td>Радзіны, хрысціны і бабіна каша. Тройца. Мікола. Эстэтычнае і маральнае выхаванне, узнікненне вулічных хораў. Вячоркі. Зімовыя гульні. Узаемаадносіны ў сям’і, метады народнага выхавання.</td></tr>
<tr><td colspan="3">Радзіны. Варылі кашу, пеклі картапляные варэнікі, картошку варылі, кампот з груш, кашу з пшана, яйца, сахара. Расла каша поўны горшчык, станавілі пасля ўсяго ўгашчэння. Кум і кума, баба. Цанілі кашу – 10 руб, 100 рублей. Кідаюць – хто больш. Кум разбівае, зрэзуюць верха, канхветы наверх. Кашу раздзеляць, разбіваюць і рэжуць на кускі. Б’е кум на ражок стала. Чарапкі на голаву маладым жэншчынам, што б дзеткі ражалі. Дзеткі седзелі на печы, паняцця не було за стол лезці. Грошы той, што радзіла. Песні ўсякіе падрад.<br><br>У вёсцы спраўлялі Міхайло, Тройца, Коледа.<br><br>Тройцу гулялі на вуліцы, хлопцы гарэлкі не пілі. Хаты абвешвалі клёном. Адна чацвертушка на 20 дзевок і 20 хлопцоў. Дома дзецям паняцця гарэлкі даваць не було. Старые немного пілі на празнік. Гарэлку гналі і куплялі. Суседзі дзелалі хату, дзесятую долю ў стопкі дзевачкам, хлопцы не хадзілі на гэту работу.<br><br>Знакомые і свае прыезджалі з другіх сёл. Садзіліся за стол. Песні якія прыдзёцца. Дзеўкі спевалі на вуліцы. Танцы: Нарэчанька. Падыспан. Каробачка. Седзелі зіму ў хаці, пер’е дралі, везалі, дзелалі мічкі (мычкі) і пралі іх на верацено.<br><br>Міколу спраўлялі дзеўкі з хлопцамі. Каму картошку сырую, каму яйцо ў варэнік – гэто смех. Зімой хлопцы седзелі з намі. Адна хата була. Мешок вісеў, лучыну лажылі на жалезо, пад ніз цэбер. Гралі на грэбені, самі ад сябе вучыліся іграць і танцаваць. У нас адна група была 20 дзевак і 20 хлопцаў. Іграць на грэбні – гэто такая дзецкая забава. На празнік танцавалі ўзрослые, а мы аддзельно, свой гарманіст.<br><br>Мы ек заспеваем у Міхайлаўке, дак у Грушаўке на масту людзі слухаюць.<br><br>Гульні. Было балото. Зімою ў лёд забівалі палку і круцілі, седалі з двух бакоў. Канькі дзераўяные хлопцы рабілі. Летам – скокалкі. Качэлі</td></tr>
</table>

| |
|---|
| дзераўяные на цэлае лета. Усе ўмесцi гулялi, не дзелiлiся.<br>Дзецi слухалi бацькоў, жылi бедно, у хацi булi, шкоду рабiць не було паняцця. Нi бацько нас нi бiў, нi матка. Я сама старша була, я рукавадзiла свамi сёстрамi. Браты большы i меншы. Елi на столочку, панiмалi, што там наша месца. Ек чужые людзi – дзецi на печы. Ек падраслi, тагды толькi з бацькамi. Суп варылi картапляны з пшаном – юшку. Малако, капуста, расол, шчаўлёвы або капусцяны боршч, суп малочны, картошка тушоная з м’ясом.<br>Пужалi. Быў берозавы дубчык: летом з лiсцем, а зiмой без лiсця. Затыкалi ў століь. Як шкоду зробяць, дак етага дубца беруць i хто шкоду зробiць – па тым дубец. У нашай пародзе не було такiх дзецей, што б шкоду рабiць. У грубу не лезлi.<br>Казалi “вы тато”, “вы мамо”, “мамо, наце”, “мамо, дайце”. Дзецi старшые дровы насiлi, меншые ў хацi седзелi. Як 7-8 большые сталi.<br>Мацi прала на 8 i 12 нiтоў. Я вязала наскi, кохты. У 12 год паказвала ткаць. На вечорках вучылiся што прыдзёцца. Мама прала i му вучылiся ў 8-10 гадоў. |

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 54 | Шаўчук Кацярына Сямёнаўна, 1929 г.н. в. Малiшаў Жыткавiцкага раёна Гомельскай вобл. | Вуснае апавяданне аб нараджэннi дзiцяцi, дзеяннях бабкi-павiтухi, адзiнстве народнай медыцыны, магii i выхавання. Пераемнасць традыцый, культуразгоднасць выхавання раскрываюцца праз побытавыя дэталi i рытуальныя дзеяннi. |
| ***Нараджэнне дзіцяці***<br>Раней ражалi дома, а не ў больнiцы. Да родоў ешчэ дзед абезательно (iлi мужчына, но не жэншчына) iшоў за повiтухой. Повiтухой была старэйшая баба. Она сначала прыходзiла, шчупала жывота i говорыла колi ўжэ почнуцца роды. На край стола ставiла гладышку малака i шла домоў. Потым, колi почыналiс роды, дзед, а ек дзеда не було, то екi мужчына, беглi до гэтой бабы, звалi. Усегда своiх детей трэбо было рожать у запечку, бо думалi, шо там собе добрэ место от сглазу. Ешчэ вешалi образ над головою, што б одгоняло злых духоў. Усегда на окне ў образа глаўного стояла ў стоканчыку свечона вода з пучком жыта, ею свецiлi место, дзе трэбо рожать. | | |

Калі прыходзіла бабка, то поклонялася 30 раз абразу і говорыла заклінанье: “Куды ты, молодіцэ, ідеш? – Іду, господі, до роду. – Крутый горы, раскруціцеса, господнія голоса, разыйдзіцеса. Як младенец – седай на коня, а младеніца – берыс до грэбеня”. Гэтые словы былі і на хлопчыка і на дзевачку, бо тады ж добрэ не ведалі, хто там будзе. Хоть гэтые бабкі зразу моглі сказать.

От колы помолілас, давала ў рот заўсёды косу (валосы), открывала вездзе дзверы, дажэй у печэ і грубі. Калі рожэніца крычала, то глечык на столе дрыжаў, і колі он падаў, то значыло, што дзіця роділос. Дітя ложілі на перкаль (льняная ткань) і повітуха выносіла дзіця на двор, показать Господу, шо б загорэлас на небі его зорка, што б добрая була жызнь у малого. Потом несла назад і ложыла под печ (там, куда кладут дрова), для того што б буў рабоцяшчым і здаровенькім. Бо печ у той час була корміліцой. Дітя стараліся скорэй перэкрыстіть, до хрысцін нікому нічого з хаты не давалі і нікому не говорылі імя малого, што б нічого не прыробілы.

Тожэ нічого не давалі з хаты, колі рожалось што жывэ (куры, телята, коты, собакі), калі хочэш шо б ены веліс для прыплоду.

Працяг табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 54 | Шаўчук Кацярына Сямёнаўна, 1929 г.н., в. Малішаў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобл. | Абрад “Дзяды”. Абрадавыя стравы і рытуальныя дзеянні. Малітва-зварот да нябожчыкаў як праяўленне культу продкаў, культуразгоднасць выхавання. |

***Абрад дзяды***

Гэты абрад праходіть кажны год. Усегда жонкі ранкам готовять еду. Обязательно трэба шо б було чотнэ чысло страў, бо гэты празнік для пакойніков і не трэба шо б он забраў ешчэ кого-небудзь.

На стол обязательно трэба шо б буў печэны хлеб і мочанне (творог со сметаной і соллю), куцця (у кого з грыбамі), а так усегда з пшоном добрэ ўпрэўшая ў печы і ешчэ хто што хочэ ці можэ.

На стол ставіцца абед. Усегда нада открывать дзверы, шо б небожчыкі моглі прыті к нам у хату. На стол отдельно ставіцца міска з ложкой, відёлкой і налітым стаканчыком. У тарэлку нічого не ложыцца, а ўжэ после обеду жонка (ніхто) не прыбірае стол, бо ўсе остоўлялос небожчыкам, шо б оны не зліліс на нас, своіх родных. У гэты празнік ніхто нічого не робіў. После обеду ідом на могілца, ешчэ раз зовём іх к нам на вечэру.

Вечэра проходіць только ў самых сторых родзічоў, старэйшых мужчын у роду. З собою молодейшые неслі стравы. Там ужэ самы стары дзед гаварыў та зазываў дзедоў. Так жэ ставілі (она ўжэ стояла) міску з усім шо і во ўсіх. Запальвалі свечку. І сразу, колі свечка горэла, дзед гаварыў: “Поможыце, мудрые дзеды, дайте нам да светых крыніц вечності. Для вас запалілі свечку, ек спрадвеку. Бо нам не жыць, колі не помніть вас”.

Заканчэнне табліцы А

| Парадкавы нумар у тэксце | Дадзеныя інфарматара | Асноўныя выхаваўчыя ідэі |
|---|---|---|
| 56 | Яцухна Ніна Цярэнцьеўна, 1934 г.н., в. Камуна Ельскага раёна Гомельскай вобл. | Хрэсьбінныя песні. У сям'і перавага аддаецца нараджэнню сына. Пажаданні добрай долі дзіцяці. Узаемаадносіны кума і кумы. |

***Парадзіха ў полазе ляжыць,***
А захацела яна віннага соку.
А пазавіце майго мілага з току.
– Ці не дастанеш мне віннага соку?
А ён пытаецца:
– Каго жана радзіла?"
Калі сына, я мёду дабуду,
Калі дачушку, я і так абайдуся.
Калі сына, я горад пастаўлю,
Калі дачушку – з кажухамі адпраўлю.

***А ў нядзелячку з параненечку***
На небе развіднела.
Кумочак ходзіць, дзіця носіць.
А ў бога долі просіць:
– А дай жа, божа, гэтаму дзіцяці

***На стале каша стаяла,***
Залатога верха ждала.
– Ой, ты, кумачку-пане,
Усадзі руку ў кішэню.
Вымі грошыкаў жменю.

***Ішоў кум па сялу,***
Кума па гародзе,
Нясе кум чапялу,
Кума скавароду.
Кум дроў насячэ,
Кума бліноў напячэ.
Кум бліноў не хоча,
Каля кумы рагоча.

Усякую долю ўзяці:
І хлебавую, і саляную,
Трэццю –
здаравейкавую.

## ДАДАТАК Б

### Апублікаваныя матэрыялы:
### традыцыі народнай педагогікі Мазырскага Палесся

ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

**Матчына праклянцце**

За сялом Глушкавічы ёсць месца, дзе на белым пяску стаіць вялікі камень. Ён падобны вельмі на дзеўку. Кажуць нават, што на шыі былі маністы. Потым нехта зняў.

Старыя людзі расказваюць, што калісь даўно не было тут белага пяску, а было пасеяна проса. Прывяла маці дачку і загадала проса палоць. Дзеўцы занядужылася, і яна адмовілася палоць гэтае проса. Тады маці сказала: "Што б ты стала каменем!" І дзеўка стала каменем, таму што матчын праклён збываецца. А там, дзе було проса, стаў белы пясок.

*Зап. Гарэлік Т. у 1974 г. у в. Глушкавічы Лельчыцкага раёна ад Савіцкай Т. 1934 г.н. – С. 196-197*

**Пчолка і павук**

Гэта було вельмі даўно. У пчолкі і павука была маці. І вось аднойчы прыляцела сарока да й сказала пчолцы, што маці яе памірае, просіць, каб дзеткі прыляцелі да яе павідацца ў апошні раз.

Кінула пчолка дзетак маленькіх, кінула й работу ўсю да й, вядома, паляцела да маці.

Прыляцела сарока к павуку, да й кажа яму тое ж самае: "Памірае твая маці і просіць, каб прыйшоў папрашчацца з ей". А павук у той час павуціну сваю плёў. Дак ён і не захацеў яе кідаць і кажа: "Мне трэба работу рабіць, павуціну плесці, няма калі мне да маці ісці".

Прыляцела пчолка да маці, папрашчалася з ей. А маці пытае: "А дзе ж сынку мой? Чаго не прыйшоў прасціцца?" А тут сарока прылятае, да й расказвае, што павук павуціну пляце, таму няма калі яму ісці прасціцца. Вельмі пакрыўдзілася тады маці на свайго сына і пракляла яго, каб ён увесь час павуціну плёў і плёў да й ніколі не канчаў. Так павук з тых пор і пляце ўвесь час.

*Зап. Федасенка С. у в. Рамязы Ельскага раёна ад Жыгадлы Ф. 1894 г.н. – С 183–184*

69. Беларускі фальклор у сучасных запісах: традыцыйныя жанры: Гомельская вобласць / Укладальнікі В.А.Захарава, Р.М.Кавалёва, В.Дз.Ліцвінка ; уклад. музычнай часткі У.І.Раговіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1989 – 384с.

## НАРОДНЫЯ ЗАГАДКІ

Яе нагамі топчуць, а яна ўсіх корміць (*Зямля*).

Белыя кветачкі ўвечар квітнеюць, а ранкам вянуць (*Зоркі*).

Дуб-дубавік, 12 галінак, на кожнай галіне па 4 гняздзіны, у кожнай гняздзіне па 7 птушанят, кожнае мае сваё імя. Хто адгадае, што за сям’я? (*Год, месяц, тыдзень, дзень*).

Дзяцей знаць не буду – чужым збуду (*Зязюля*).

Вясной весяліць, летам халадзіць, увосень пітае, зімой саграваe (*Дрэва*).

Малыя дзеці сядзяць на павеце, а як падрастаюць – на зямлю злятаюць (*Арэхі*).

У бацькоў на лапках – сыны ў пляцёных шляпках (*Жалуды*).

Сто братоў адным поясам абпярэзаныя (*Сноп*).

Дзед гарбаты, маці пляската, а дзеці пакручаны (*Гумно, ток, цапы*).

У чубатых дочак па сямсот сарочак, па сямсот спаднічак, а без чаравічак (*Куры*).

У цёмнай цямніцы ткуць бабы спадніцы, ткуць-пeратыкаюць, пальцамі перабіраюць (*Пчолы ў вуллі*).

Сто адзін брат, усе ў адзін рад, разам звязаны стаяць (*Пляцень*).

Старая баба дзетак усю зіму грэе (*Печка*).

Маці – таўстуха, дачка – краснуха, а бацька – Лявонка, пабег з хаты гонка (*Печ, агонь, дым*).

Мой брат Кандрат зрабіў будынак, дзе ні глянь – там і сям дзірка (*Карзіна*).

Пяць братоў у адну ноч нарадзіліся, а ростам не роўныя (*Пальцы*).

Два браткі ля аднае хаткі (*Вочы каля носа*).

Поўнае карыта белых лебядзей намыта (*Зубы*).

Што люблю – не куплю, чаго не любіш – не прадам (*Маладосць не купіш, старасць не прадасі).*

Мяккае, бухонае, на стале не бывала, а ўвесь свет узгадавала (*Грудзі*).

Чатыры чатыркі, пятая лубяначка, а шостая каханачка (*Каляска і дзіця).*

Стаіць два стаўбца, на стаўбцах – дзежка, а ў дзежцы – гладышка, а на гладышцы – гаршчок, а на гаршку – лес, а ў лесе тавар ходзіць (*Чалавек*).

За гарой за крамяной сіні агеньчык гарыць (*Лён*).

Маленькі Данілка ў пельцы ўтапіўся (*Гузік і іголка*).

У Андрушкі сем кажушкаў, а душа голая (*Капуста*).

Сонца-калонца, у сярэдзіне жывіца. Хто не адгадае, той да веку не будзе жаніцца (*Сланечнік*).

Стаіць палка, на той палцы – галка, а ў той галкі – семсот галчанят (*Макаўка*).

69. Беларускі фальклор у сучасных запісах: традыцыйныя жанры: Гомельская вобласць / Укладальнікі В.А.Захарава, Р.М.Кавалёва, В.Дз.Ліцвінка ; уклад. музычнай часткі У.І.Раговіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1989 – 384с.

## БЕЛАРУСКІЯ ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ, ЗАПІСАНЫЯ Ў МАЗЫРСКІМ ПАВЕЦЕ

Адна дачка не стоіць і пятачка.

Багатаму чорт дзяцей калыша.

Бессаромнае вока дыму не баіцца.

Былі дзеткі малыя – хатку сабралі, а як падраслі, то растраслі.

Вінавата хата, што спесціла Ігната.

Век чужым розумам не пражыць, а трэба і свой мець.

Гушча дзяцей не разганяе.

Дзіця любі як душу, а калаці як грушу.

Ліхія дзеці – бацьку-матцы слёзы.

Людзей не судзі, лепш на сябе паглядзі.

На злое вучыць не трэба – сам навучыцца.

Замок не для злодзея, а для добрага чалавека.

Паслухмянае дзіцятка дзве маткі ссе.

Пытайся не старога, а бывалага.

Пусты колас кверху тырчыць, пусты чалавек высока галаў трымае.

Рабіць не грэх, а грэх красці.

Пук саломы не пераломіш.

Тады скажаш гоп, як пераскочыш.

У вочы не хвалі, а за вочы не ганьбі.

Цяпер яйкі курэй вучаць.

Хто гаварун, той ілгун.

Шчасця не нажывеш – з ім трэба нарадзіцца.

Што стары кажа на глум, то бяры, малады, на вум.

Хто скуп – той няглуп.

Шчодры перадасць – яму больш бог дасць.

Хто заб’е бабра не мае дабра.

Чужая капейка бярэ рубель.

Чужымі рукамі жар заграбаць.

Які цесля – такі клін, які бацька – такі сын.

Ты, бацька, ідзі араць, а я пайду ў карчму: цябе валы ведаюць, а мяне людзі ведаюць.

У няўмекі рукі не баляць.

У каго сыны – гатуй кайстры.

У каго ўсе дочкі – будзе лапіць сарочкі.

Хата без хазяйкі, як пчолы без маткі.

У чужым краю песні не пяю.

113. Касько, У.К. Палескі дзівасіл: Бел. нар. прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы А. К. Сержпутоўскага / У. К. Касько. – Мінск: Выш. шк., 2005. – С. 226–248.

Бaцeня – сын ці дачка, падобныя на бацьку.

Блізнюк – двайнятка.

Бойструк (найдзёнок) – дзіця незамужняй жанчыны.

Большуха – дзяўчына-падлетак. "Чого ты плачэш, большуха?"

Вукорміць – выгадаваць "Вукорміла ўсе дзеці з хвартуха".

Голопецкэ – маладая істота, дзіця або птушаня без пер'я.

Дзеўчур і дзеўчурка – хлопец, які сябруе з дзяўчатамі. "Дзеўчур вон, а не хлопчак".

Дзеціна – дзіця ў песнях.

Дзецінство – хвароба. "На его напало дзецінство і мучаецца цэлы век".

Донька, донь, доня – зварот да дачкі, дзяўчыны, маладой жанчыны.

Кагал – род. "Вон жэ з токого кагалу, шчо брат з братом век б'юцца".

Камедно – смешна, не па-мясцоваму: "Камедно ты гаворыш".

Князь і княгіня – маладыя на вяселлі.

Крывота, крывотліву – зайздрасць, зайздросны.

Купайло – купалле. "На купайло соўнейко купаецца". "Хлопцы на Купайло назбіраюць постолоў, вувесяць на жэрдку і збіваюць, а дзеўкі песні спеваюць".

Курдупель – малы чалавек, дзіця, якое не расце.

Ляк – страх. "Жоўтачка з ляку нападае".

Небог, небож, небога – пляменнік і пляменніца.

Одзініца – адзіная дачка.

Очкур – рэмень. "Шчэ посвішчы – очкура дам".

Панчорка – падчарка. "Раз не твой сын, то пасынак, а дачка – панчорка".

Порацца – корпацца ў гаспадарцы.

Породзіха, жанчына, якая радзіла.

Породзіць – нарадзіць.

Породня – род, радня. "Така наша породня: лысеюць рано".

Прыстрэк – хвароба з урокаў. "Трэбо тобе прыстрэка пошэптаць".

Спевуха – спевачка.

Тайка – сяброўка.

Талан – шанцаванне, доля, лёс. "Такі мой талан".

Хмарадзіць – капрызіць. "Чаго ж ето дзіцятко хімарадзіць цэлы дзень? Мо забалела?"

Хлопчак – хлопчык.

Хрышчэнік – хросны бацько.

Хрышчэніца – хросная маці.

Цур – дзіцячая гульня: качаюць мяч па ямачках.

130. Кучук, І.М. Палескі слоўнік: Лельчыцкі раён /І.М.Кучук, А.К.Малюк. – Мазыр: МазДПІ імя Н.К. Крупскай, 2000. – 156 с.

## НАРОДНЫЯ ЗАДАЧЫ-ЗАГАДКІ

Ішло сем баб, у кожнае бабы па сем кіёў, на кожном кію па сем сукоў, на кожном суку па сем кашалёў, у кожном кашалю па сем кошак, у кожнае кошкі па семера кацянят. Сколькі ўсяго будзе?

Ляцела сто гусей, аж ідзе чалавек дай кажа:

– Здаровы, сто гусей!

– Здароў, чалавеча, – кажуць,– калі б нас яшчэ столькі, да яшчэ палавінка етаго, да яшчэ чвертка етаго і ты з намі, дак тагды б было нас сто.

## НАВУКА ІГРЫ НА СКРЫПЦЫ

Раннюю цягу да музыкі выяўляюць адзінкі – не столькі здольныя, колькі замілаваныя ў яе, аднак сваёй мэты дасягаюць пераважна настойлівыя. Здараецца таксама, што бліжэйшы ці далейшы дзядзька або нават дзед – экс-музыка нейкі (бо рэдка хто пасля 50 год жыцця яшчэ займаецца ігрой на скрыпцы) бескарысліва апякуе шматабяцаючага маладога чалавека, перадаючы яму свае веды і адслужылую скрыпку. Навука грунтуецца на паўтарэнні за настаўнікам кожнай ноты: з дапамогаю не толькі слыху, але і зроку.

Пасля некалькіх такіх урокаў, якія нярэдка цягнуцца даволі доўга, вучань ледзьве патрафляе запомніць перабіранне пальцамі і струны, а затым на працягу многіх дзён дадзеную мелодыю апрацоўвае дома, адкуль яго выганяюць, каб не слухаць фальшывага пілікання.

Будучы віртуоз мусіць туляцца па розных кутах з таварышкай сваёй нядолі, у трывожным чаканні бацькавага загаду спыніць ігру *(пакінь етыя рыпулькі-дрындушкі)* і ўзяцца за работу, *кеб людзі не калолі ў вочы, што такі здаровы бэйбус гуляе ў будні дзень.* Таму ён з сумам чакае святочнага пагоднага дня, калі яму выпадзе быць далёка ад дому на пашы зваламі ці з коньмі, дзе ён можа свабодна без турбот аддацца практыкаванням *(грацъ на цэлы смык і на ўвесь голас).*

Кожны наступны ўрок з’яўляецца паўтарэннем першага; пасля праверкі настройвання скрыпкі і пасля сумеснага прайгравання папярэдняй ці новай мелодыі вучань ідзе дадому працаваць далей над першаю альбо вучыць другую, каб зноў зносіць тыя самыя прыкрасці. Калі б гэта было толькі яго пакутаю; але часам і настаўнік па-варварску здзекуецца з яго, свята верачы, што робіць гэта дзеля дабра свайго вучня.

Славуты мясцовы музыка Іван Бурак успамінаў, што пачынаючы вучыць музыцы, загадаў унуку пакласці кісць левай рукі на лаве і біў

верацяном па пальцах датуль, пакуль віноўнік, не ў стане вытрываць болю, уцякаў; ён здзекаваўся з вучня, верачы, што такім чынам даб'ецца гнуткасці пальцаў, паколькі і сам ён зведваў такую аперацыю. У апавяданні Івана не было скаргі, але гучала нота нібыта ўдзячнасці свайму майстру – Дзед вялеў, што б я паклаў левую руку на лаві, а ён тагды біў верацяном па пальцах, покуль не пасінеюць да не пойдзе кроў. Калі, бывало, пальцы папухнуць так, што і сагнуць нельга, а я яму жалюся: "Ой, дзедку, саколік, вельмі баліць!", то ён кажа: "Дарма, мой голубе, як так папаб'ю з месяц, то будзеш добра перабіраць пальцамі" – і праўда, дзякаваць ёму!".

164. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Часлаў Пяткевіч; Уклад., прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л.Салавей і У.Васілевіча. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.

## ДАДАТАК В

**Табліца В – Выкарыстанне выхаваўчага патэнцыялу традыцыйнай культуры рэгіёна ў вучэбна-выхаваўчым працэсе**

| Напрамак вучэбна-выхаваўчай дзейнасці | Тэмы і прыкладны змест | Формы работы |
|---|---|---|
| **Разумовае выхаванне. Матэматыка, фізіка, астраномія як вучэбныя прадметы або факультатывы.**<br><br>*Розум не сякера, не пазычыш.* | Народныя загадкі як сродак разумовага выхавання.<br>Даўнія меры вагі, шырыні і даўжыні ў мясцовых прыказках і прымаўках.<br>Народныя задачы-загадкі.<br>Як вызначалі аб'ём, адлегласць нашы продкі.<br>Ветраныя і вадзяныя млыны як традыцыйны спосаб атрымання энергіі.<br>Астранамічныя веды беларусаў-палешукоў.<br>Традыцыйныя спосабы вызначэння часу і арыентацыі ў прасторы. | Калектыўны або індывідуальны запіс мясцовых загадак, задач-загадак, адзінак і спосабаў вызначэння вагі, аб'ёму, шырыні, даўжыні, адлегласці ад родных і знаёмых.<br>Вывучэнне дадатковай літаратуры.<br>Вопытная праверка рэкамендацый народнага календара.<br>Складанне картатэкі народных мер вагі, загадак, задач і інш.<br>Конкурсы, віктарыны. |

| | | |
|---|---|---|
| | | Прэзентацыя “Народны каляндар”. |
| **Працоўнае і эканамічнае выхаванне, прафарыентацыя. Тэхналогія як вучэбны прадмет або факультатыў.**<br><br>*Хто за сто работ бярэцца, ніводнай не зробіць.* | Гісторыя рамёстваў – што ўмелі нашы дзяды.<br>Традыцыйныя прафесіі і заняткі: бортніцтва, бондарства, лазапляценне, кавальства і інш.<br>Вырабы з дрэва ў жыцці палешука.<br>Гаспадарчыя будынкі ў архітэктуры Палесся.<br>Ткацтва і вышыўка на Мазырскім Палессі.<br>Тэхналогія афарбоўкі тканіны на Мазыршчыне.<br>Народная кулінарыя.<br>Харчаванне дзяцей.<br>Мясцовыя традыцыі прыгатавання і ўпрыгожання каравая.<br>Па чым у Мазыры сыр: сакрэты захавання і прыгатавання малочнай прадукцыі. | Творчыя майстэрні, сустрэчы з народнымі майстрамі, вядзенне імі практычных заняткаў ці факультатываў.<br>Стварэнне школьнага музея працы і рамёстваў.<br>Сачыненні, калажы, выстаўкі, праекты на тэму: “Прафесіі маёй сям’і”, “Прафесіі, запатрабаваныя ў рэгіёне: гісторыя і сучаснасць”.<br>Прэзентацыя меню паводле традыцыйных народных страў.<br>Складанне красвордаў.<br>Конкурс “Палеская гаспадыня”.<br>Прэзентацыя “Мазырскі кірмаш”. |

Працяг табліцы В

| | | |
|---|---|---|
| | Чым знакаміта Палеская саха (спецыфіка земляробчай працы ва ўмовах Палесся).<br>Што такое “тавар” або асаблівасці мясцовай жывёлагадоўлі.<br>Народная эканоміка: грашовыя адзінкі, спосабы гаспадарчага ўзаемаразліку на Мазырскім Палессі. | |
| **Мастацка-** | Сімволіка і кампазіцыя | Арганізацыя выхавання на |

| | | |
|---|---|---|
| **эстэтычнае выхаванне.**<br>**Музыка і выяўленчае мастацтва як вучэбны прадмет або факультатыў.**<br>**Гульнёвая дзейнасць, культура правядзення вольнага часу.**<br><br>*І швец, і жнец, і на дудзе ігрэц.* | народнага арнаменту.<br>Палескі ручнік.<br>Мясцовыя строі: Турава-Мазырскі, Калінкавіцкі, Брагінскі і інш.<br>Эстэтыка палескай хаты.<br>Дзіцячы музычны фальклор.<br>Народныя музычныя інструменты.<br>Песні і карагоды нашай вёскі.<br>Рэгіянальныя асаблівасці Мазырскага Палесся ў адзначэнні абраду калядавання. | аснове каляндарна-абрадавага і сямейна-бытавога цыклаў фальклору.<br>Азнаямленне з народнай музыкай: дні народнай музыкі, фестывалі, конкурсы, творчыя справаздачы.<br>Конкурс выканаўцаў прыпевак.<br>Арганізацыя святочных вячорак.<br>Гульнёвыя і пазнаваўчыя праграмы па народнай творчасці, кірмашы, аўкцыёны ідэй, ток-шоў, сямейныя святы.<br>Навучанне народным гульням, танцам і масавым карагодам, арганізацыя этнадыскатэк. |
| **Патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне.**<br>**Гісторыя і грамадазнаўства як вучэбныя прадметы або факультатывы.**<br><br>*Дома і сцены дапамагаюць.* | Зямля дрыгавічоў. Шлях з варагаў у грэкі.<br>Мазырская гімназія і яе славутыя выпускнікі.<br>Легенды і паданні нашага рэгіёна, населенага пункта.<br>Чаму наш горад (вёска) так называюцца?<br>Геральдыка Мазыршчыны.<br>Гісторыя мясцовых валуноў.<br>Гісторыя маёй сям'і, нашага роду.<br>Этнас як біясацыяльная сістэма. | Складанне псіхалагічнага партрэта беларуса-палешука.<br>Экскурсіі ў музей народнай культуры "Палеская веда".<br>Збор экспанатаў для школьнага музея, музея пад адкрытым небам.<br>Стварэнне віртуальнага этнаграфічнага музея.<br>Арганізацыя школьнага краязнаўчага сайта.<br>Падрыхтоўка праектаў і ўдзел у конкурсах, канферэнцыях. |

| | | |
|---|---|---|
| | | Складанне радаводу. |

Працяг табліцы В

| | | |
|---|---|---|
| | Нацыянальны характар беларусаў і псіхалагічныя асаблівасці жыхароў розных рэгіёнаў. | Удзел у рэспубліканскай акцыі “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”.<br>Турнір знаўцаў гісторыі роднага краю. |
| **Маральнае выхаванне і сацыяльная дзейнасць. Беларуская мова і літаратура як вучэбныя прадметы або факультатывы.**<br><br>*Які розум, такая і гаворка.* | Прымаўкі і прыказкі – маральны кодэкс палешукоў.<br>Народная лексіка і фразеалогія выхаваўчай тэматыкі.<br>Мясцовыя прозвішчы і мянушкі.<br>Дыялектызмы ў творчасці Івана Мележа.<br>Асаблівасці гаворкі нашага сяла.<br>Ужыванне ненарматыўнай лексікі: гісторыя і сучаснасць.<br>Мова як сведчанне агульнасці славянскіх народаў: архаізмы, архаічныя формы слоў і сінтаксічных канструкцый у мове беларусаў-палешукоў.<br>Звычай “дзядзькаванне” у фальклоры і літаратуры (творчасць Ул. Караткевіча). | Работа з народнай казкай: запіс, вывучэнне, чытанне і расказванне, аналіз, драматызаванае прадстаўленне казак “на новы лад” і інш.<br>Конкурсы: на лепшага выканаўцу скорагаворак, знаўцу народных прыказак і прымавак пэўнай тэматыкі (праца, сям’я).<br>Работа са слоўнікамі: дыялектызмаў, рэгіянальных гаворак, фразеалагізмаў, прыказак і прымавак, тлумачальным, гістарычным і інш.<br>Напісанне сачыненняў. |
| **Экалагічнае і фізічнае выхаванне, чалавек як частка прыроды. Фізічная культура** | Народная медыцына – дзецям.<br>Мясцовыя траўнікі.<br>Адносіны да шкодных звычак на Мазырскім Палессі. | Правядзенне народных гульняў.<br>Арганізацыя спартыўных спаборніцтваў, прымеркаваных да Вялікадня, іншага |

| | | |
|---|---|---|
| **і здароўе, прыродазнаўства, геаграфія, як вучэбныя прадметы або факультатывы.**<br><br>*Здароўе даражэй за золата.*<br><br>*Не роўны лес – не роўныя і людзі.* | Стан здароўя і фізічнага развіцця беларусаў-палешукоў: гісторыя і сучаснасць.<br>Роля сям'і ў фізічным развіцці дзяцей.<br>Асаблівасці выхавання хлопчыкаў і дзяўчынак.<br>Гульня як метад і сродак фізічнага выхавання. | народнага свята.<br>Конкурс "Палескія волаты".<br>Гутаркі, сустрэчы з доўгажыхарамі.<br>Тыдзень моцных, смелых і ўмелых.<br>Канферэнцыя юных эколагаў па праблемах вывучэння флоры і фауны Мазырскага Палесся. |

Працяг табліцы В

| | | |
|---|---|---|
| | Прырода Палесся як фактар умацавання фізічнага здароўя.<br>Полаўзроставае выхаванне ў традыцыйнай культуры рэгіёна.<br>Прыпяць – галоўная рака Мазырскага Палесся.<br>Бусел – сімвал роднага краю.<br>Запаведнік “Мазырскія яры”.<br>Асушэнне палескіх балот: станоўчае і адмоўнае.<br>Садаводства на Мазыршчыне.<br>Рэліктавыя расліны нашага краю.<br>Народная метэаралогія. Агранамічныя веды на Мазырскім Палессі: адзінства мастацтва і працы.<br>Народны каляндар як сукупнасць агранамічных, астранамічных і метэаралагічных ведаў.<br>Эстэтыка роднай прыроды ў заклічках і прыгаворках. | Акцыі па агароджванню крыніц, добраўпарадкаванню яроў.<br>Экалагічны фестываль “Палессе вачыма дзяцей”.<br>Экалагічныя прагулкі і экскурсіі.<br>Сямейныя і калектыўныя паходы ў грыбы, ягады.<br>Назіранні за надвор’ем, тэрмінамі прылёту птушак і іншымі з’явамі прыроды і параўнанне іх з рэкамендацыямі народнага календара.<br>Вусная газета “Школьны тэлебарометр”. |
| **Сямейнае і грамадскае выхаванне, узаемадзеянне з бацькамі і грамадскасцю.** | І людзей паглядзець, і сябе паказаць (выхаваўчы патэнцыял народнай казкі).<br>Філасофія народнага выхавання ў прыказках і прымаўках.<br>Народныя абрады як сродак пераемнасці | Лекцыі, семінары, гутаркі па фарміраванню адказнасці бацькоў за выхаванне дзяцей.<br>Адзначэнне народных святаў.<br>Бацькоўскія сходы, дзелавыя гульні, трэнінгі, |

| | | |
|---|---|---|
| *Нашто клад, калі ў сям'і лад.*<br><br><br><br><br>*Навука не ходзіць па лесе, а ходзіць па людзях.* | традыцый.<br>Тэма сям'і мовай арнаменту.<br>Культ продкаў у культуры народаў свету.<br>Адносіны да жанчыны на Палессі. Сямейныя святы і абрады. Вясельныя традыцыі беларусаў-палешукоў.<br>Запрашаем на вячоркі – знаёмства з традыцыямі і побытам канкрэтнай сям'і. | анкеты. Абмеркаванне педагагічных сітуацый з улікам вопыту народнай педагогікі.<br>Фарміраванне выхаваўчага актыву населенага пункта, мікрараёна, дома.<br>Прэзентацыі, праекты, конкурсы творчых работ на тэму "Мая бабуля самая лепшая", "Мая сям'я" і інш.<br>Дапамога ветэранам. |

Заканчэнне табліцы В

| | | |
|---|---|---|
| **Выхаванне дашкольнікаў і малодшых школьнікаў.**<br><br>*Птушка рада вясне, а дзіця мацеры.* | Народная псіхалогія: адносіны да дзяцей малодшага ўзросту на Мазырскім Палессі.<br>Скорагаворкі – узор народнай лагапедыі.<br>Дзіцячы фальклор – спрадвечная мудрасць і дабрыня народнай педагогікі.<br>Тэма дзяцінства ў народных казках.<br>Прыёмы догляду немаўлят.<br>Народныя гульні для дзяцей малодшага ўзросту.<br>Традыцыйныя пажаданні, гасцінцы дзецям. Народны этыкет, правілы ветлівасці. | Складанне картатэкі (фанатэкі) твораў дзіцячага фальклору.<br>Запіс і выкананне калыханак, забаўлянак.<br>Уручэнне падарункаў дзецям на аснове народных традыцый.<br>Паказ прыказак і прымавак, казак і загадак з дапамогай мімікі і жэстаў.<br>Арганізацыя народных гульняў з дзецьмі.<br>Казкатэрапія, псіхалагічныя трэнінгі на аснове фальклору.<br>Радзінны абрад у рэгіёне.<br>Традыцыі народнай педагогікі на першым годзе жыцця дзіцяці. |
| **Навукова-даследчая і вучэбна-творчая дзейнасць школьнікаў і студэнтаў.**<br><br>*Пяць раз падумай, адзін раз скажы.* | Вывучэнне літаратуры і друкаваных крыніц па народнай творчасці.<br>Навукова-даследчыя экспедыцыі па роднаму краю.<br>Запіс мясцовага фальклору. Збор звестак пра народных майстроў, сустрэчы з імі, навучанне рамёствам.<br>Дыдактычныя асаблівасці кумулятыўных казак як сродку народнай педагогікі.<br>Параўнальны аналіз | Навукова-даследчыя праекты. Рэфераты. Паведамленні. Удзел у канферэнцыях.<br>Наведванне і аналіз работы мясцовых музеяў.<br>Фарміраванне рэгіянальнага банка дадзеных па традыцыйнай культуры.<br>Складанне плана работы гуртка па народнай творчасці.<br>Распрацоўка сцэнарыяў мерапрыемстваў, канспектаў заняткаў на |

| | | |
|---|---|---|
| | педагагічных поглядаў розных народаў.<br>Падрыхтоўка праектаў: “Народная калядная варажба”, “Моднае адзенне з бабулінага куфэрка” і інш.<br>Шкала народных каштоўнасцей.<br>Этнапедагагічны аналіз народнай казкі.<br>Правядзенне кірмашоў, аўкцыёнаў народнай мудрасці, віктарын, тэле-гульняў на аснове рэгіянальнай культуры. | аснове фальклору.<br>Складанне красвордаў, сенквейнаў.<br>Аналіз педагагічных сітуацый з улікам ведаў па этнапедагогіцы.<br>Анкеты, дыягнастычныя методыкі, тэсты.<br>Складанне картатэкі сродкаў народнай педагогікі.<br>Падбор матэрыялаў для слоўніка народнай гаворкі сваёй вёскі, мясцовасці.<br>Распрацоўка мадэлі летняй лагернай змены на аснове фальклору. |

**ДАДАТАК Г**

**Табліца Г – Крытэрыі для вызначэння ўзроўню сфарміраванасці этнакультурнай кампетэнтнасці будучага настаўніка**

| | **Узровень этнакультурнай кампетэнтнасці** | | |
|---|---|---|---|
| | **1 нізкі** (неўсвядомлены, інтуітыўны) | **2 сярэдні** (дастатковы) | **3 высокі** (творчы, навукова-тэарэтычны) |
| **Вучэбнае заданне, форма работы** | **Мяркуемыя дзеянні студэнта** | | |
| **Удзел у лекцыйных і практычных занятках (успрыняцце, разуменне, абмеркаванне) па этнапедагогіцы** | Пасіўная пазіцыя, нежаданне ўдзельнічаць у праводзімых формах работы, негатыўныя адносіны да традыцыйнай народнай культуры | Выказвае асабістую думку, заснаваную на жыццёвым вопыце, але без уліку навукова-тэарэтычных ведаў. Працуе з абавязковай літаратурай па курсу. Выконвае заданні па ўзору. | Асабістая ініцыятыва, арганізацыя абмеркавання і форм калектыўнай дзейнасці. Аналіз розных пунктаў погляду, супастаўленне ўмоў выхавання ў традыцыйнай і сучаснай культурах. Знаёмства з дадатковай літаратурай па курсу. Выкананне заданняў праблемнага і творчага характару. |
| **Падрыхтоўка, чытанне і аналіз паведамленняў, рэфератаў, артыкулаў па** | Слухае, успрымае выступленні таварышаў, але ўласнай | Удзельнічае ў калектыўным абмеркаванні. Знаходзіць гатовы матэрыял | Абагульняе, сістэматызуе, працуе з дадатковай літаратурай і |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **этнапедагагічнай тэматыцы** | актыўнасці і цікавасці не праяўляе. | у кнігах Інтэрнэце, але прадстаўляе яго без навуковага асэнсавання, аналізу і сістэматызацыі. | рэгіянальным выхаваўчым матэрыялам. Арганізуе абмеркаванне навуковых артыкулаў, выказвае сваю думку з улікам тэарэтычных ведаў. Рыхтуе рэфераты, піша навуковыя артыкулы, курсавыя і дыпломныя работы па этнапедагогіцы. |
| **Аналіз народных казак, прыказак і іншых сродкаў народнай педагогікі** | Выбірае правільны варыянт адказу з некалькіх прапанаваных інтуітыўна або на аснове жыццёвага вопыту. У некаторых выпадках не разумее або трактуе няправільна сэнс і асноўныя выхаваўчыя ідэі прыказак і прымавак, змест народных святаў і абрадаў. | Разумее і тлумачыць вядучыя ідэі народнай педагогікі, але не суадносіць з сучаснасцю, асабістым вопытам, вучэбна-выхаваўчым працэсам. З цяжкасцю дае навуковае абгрунтаванне і аргументуе ўласную пазіцыю. | Актыўна ўдзельнічае ў абмеркаванні. Разумее выхаваўчую значнасць і прапануе творчыя рашэнні па выкарыстанню сродкаў народнай педагогікі ў сучасных умовах. Вывучае дадатковую літаратуру па этнапедагогіцы і этнапсіхалогіі. |

Заканчэнне табліцы Г

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Наведванне і аналіз дзейнасці гарадскога, школьнага музеяў народнай культуры, цэнтра рамёстваў і інш.** | Наведвае неахвотна, не бачыць сэнсу дзейнасці падобных устаноў у сучасных умовах. | Глядзіць, успрымае, знаёміцца з экспазіцыяй і формамі работы. Аналізуе, робіць вывады. | Зацікаўлены, прапануе ўласныя ідэі, шукае новыя формы работы, прасочвае сувязь з выхаваннем і навучаннем. |
| **Складанне радавага, генеалагічнага дрэва сваёй сям'і** | Ведае 1–2 пакаленні і не імкнецца даведацца больш. | Мае звесткі аб жыцці 3–4 пакаленняў, выказвае жаданне ведаць больш, распытвае, збірае і сістэматызуе інфармацыю. | Ведае 7 і больш пакаленняў, працуе з дадатковымі, у тым ліку архіўнымі крыніцамі і літаратурай, камп'ютэрнымі праграмамі па генеалогіі. |
| **Падрыхтоўка і правядзенне мерапрыемстваў, праектаў, прэзентацый на аснове традыцыйнай культуры, рэгіянальных святаў і абрадаў** | Не імкнецца зразумець спецыфіку арганізацыі выхавання на аснове народнага календара. Праяўляе пасіўнасць, неахвотна прымае ўдзел у калектыўных праектах. | Выкарыстоўвае гатовыя распрацоўкі. Актыўна ўдзельнічае, але праяўляе недастатковы ўзровень развіцця арганізацыйных уменняў і навыкаў, агульнай і прафесійнай культуры (маўлення, паводзін). | Самастойна складае сцэнарыі. Шукае новыя формы работы з фальклорам, выступае ў ролі арганізатара калектыўнай дзейнасці. |
| **Жаданне і** | Не бачыць такой | Праяўляе | Параўноўвае |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **разуменне неабходнасці выкарыстоўваць метады, формы і сродкі народнай педагогікі на ўроках па сваёй спецыяльнасці** | неабходнасці, не разумее выхаваўчай значнасці традыцыйнай народнай культуры. | зацікаўленасць, знаходзіць і выкарыстоўвае гатовыя метадычныя распрацоўкі, сцэнарыі. | інфармацыю з розных крыніц. Вядзе картатэку, абагульняе і самастойна падбірае цікавыя факты для далейшага выкарыстання. |
| **Збор і сістэматызацыя рэгіянальнага этнапедагагічнага матэрыялу** | Знаходзіць апублікаваны матэрыял, але да самастойнай даследчай работы цікавасці не праяўляе. | Запісвае самастойна, але без адбору і ўліку значымасці і ўзроўню выхаваўчага патэнцыялу розных жанраў фальклору. | Зацікаўлены, фіксуе рэгіянальныя традыцыі выхавання. Піша курсавыя і дыпломныя работы, выступае на канферэнцыях. |

**ДАДАТАК Д**

## Дыягнастычныя методыкі на аснове прыказак і прымавак

Методыка

“*Людзей слухай, а свой розум май*”

*Мэта*: па-першае, вызначыць які фактар развіцця асобы (спадчыннасць, асяроддзе або выхаванне) апытваемыя лічаць дамінуючым; па-другое, устанавіць наколькі актуальным з’яўляецца для сучаснага чалавека “народны” погляд на праблему.

На першым этапе прапануецца падумаць над кожнай прыказкай і паставіць супраць яе знак “+”, калі вы згодны з народным выслоўем, і “–”, калі не згодны. Калі сэнс прыказкі не зразумелы, то ацэньваць яе не трэба.

Колькасны аналіз дасць адказ на пастаўленыя пытанні.

На другім этапе выконваецца запіс рэгіянальных прыказак і прымавак.

Прыказкі ў калонках размеркаваны наступным чынам: I – спадчыннасць; II – асяроддзе; III – выхаванне.

**I**

1. Глупому сыну и родной отец ума не пришьет.
2. Горбатого могила исправит.
3. Не ўсякая мука хлебам стане.
4. Нораў не клетка, не пераставіш.
5. Овёс от овса, а пёс ото пса.
6. От свиней бобры не родятся.
7. От худого семени не жди доброго племени.
8. С хорошего

**II**

11. Все люди одинаковы.
12. Добрае на людзі ідзе з добрай сям’і.
13. Злы прыклад і добрага псуе.
14. Нягоднік не родзіцца, а робіцца.
15. От умного ума наберешься, а с глупым последний растеряешь.
16. Паршивая овца портит всё стадо.
17. Подле пчелки – в меду, подле жучка – в навозе.
18. С кем поведешься, от того и наберешься.

**III**

21. Детишек воспитать – не курочек пересчитать.
22. I звера людзі навучаць, не то чалавека.
23. Народила, да не научила.
24. Не кручаны – не рэмень, не вучаны – не чалавек.
25. Не тот отец, мать, кто родил, а тот, кто вспоил, вскормил, да добру научил.
26. Не учили, когда поперёк лавки ложился; а во всю вытянулся, так не научишь.
27. Ребенок как воск, что захочешь, то и вылепишь.

кусточка хорошая и ягодка.

9. Як бы ты ні вучыў зязюлю, спеваў яе не зменіш.

10. Якое карэнне, такое і насенне.

19. С кем хлеб-соль водишь, на того и походишь.

20. Як у сям'і лад, то і дзеці добра гадуюцца.

28. Умел дитя родить – умей и научить.

29. Чалавек невучоны, што тапор нетачоны.

30. Што ў дзяцінстве выхаваеш, на тое ў старасці абапрэшся.

Методыка

***“Сам сябе не хвалі, няхай людзі пахваляць”***

для вывучэння духоўна-маральных і жыццёва-практычных прыярытэтаў асобы

Студэнтам прапануецца выбраць тыя варыянты прыказак, якія яны лічаць правільнымі, абгрунтаваць свой выбар, выкарыстаўшы “Шасцімоўны слоўнік прыказак, прымавак і крылатых слоў” (Мінск, 1993) падабраць аналагічныя ў мовах іншых народаў, запісаць падобныя ад блізкіх і знаёмых у сваёй мясцовасці.

| | | |
|---|---|---|
| **Добрая слава, маральнасць – амаральнасць, бессаромнасць** | Счастлив тот, у кого совесть спокойна.<br>Добрая слава даражэй багацця. | Стыд не дым, глаза не выест.<br>Што па той чэсці, калі няма чаго есці. |
| **Адносіны да грошай, матэрыяльных каштоўнасцей** | Не хлебом единым жив человек.<br>Не заўсёды там шчасце, дзе дастатак і багацце. | Когда деньги вижу, души своей не слышу.<br>Хто мае грошы, той і харошы. |
| **Шчаслівае, бесклапотнае жыццё або цяжкасці, жыццёвыя выпрабаванні** | Кому счастье служит, тот не о чем не тужит.<br>Нарадзіўся ў сарочцы. | Жизнь прожить – не поле перейти.<br>Шчасце адно не ходзіць, бяду за сабой водзіць. |
| **Аптымістычныя, рашучыя або песімістычныя, асцярожныя адносіны да жыцця** | Только тот не ошибается, кто ничего не делает.<br>Паміраць збірайся, а жыта сей. | Не зная броду, не суйся в воду.<br>Пяць раз падумай, адзін раз скажы. |
| **Мэтанакіраванасць або абыякавасць, існаванне па прынцыпу: мая хата з краю** | Всяк сам своего счастья кузнец.<br>Хто ўперад заедзе, той уперад змеле. | Лбом стены не прошибешь.<br><br>Напроці ветру не падзьмеш. |
| **Альтруізм, вера ў людзей або эгаізм, жыццё па прынцыпу: ты – мне, я – табе** | Мир не без добрых людей.<br>Для сябра свайго сэрца ўкалупнуў бы. | Делай людям добро, да себе без беды.<br>Свая сарочка бліжэй да цела. |

| | | |
|---|---|---|
| **Калектывізм, уменне сябраваць або індывідуалізм, падазронасць** | Доброе братство лучше богатства.<br>Чалавек без друга, што дрэва без карэння. | На обеде – все соседи, а пришла беда, они прочь, как вода.<br>Дружыць дружы, ды камень за пазухаю дзяржы. |
| **Адносіны да ведаў, навукі: абыякавасць або разуменне іх каштоўнасці** | Корень учения горек, да плод его сладок.<br>Лепей вучоны, як залачоны. | Много будешь знать, скоро состаришься.<br>Век жыві, век вучыся, а дурнем памрэш. |
| **Адносіны да працы – станоўчыя або адмоўныя** | Без труда нет добра.<br>Праца чалавека корміць, а лянота псуе. | От трудов праведных не наживешь палат каменных.<br>Работа не заяц, не ўцячэ. |
| **Адносіны да захавання закону: істотна або не** | Где тверд закон, там всяк умен.<br>Сілай калодзеж капаць – вады не піць. | Закон как дышло, куда поворотишь, туда и вышло.<br>Чыя сіла, таго і права. |